КАРЭЛ ВАНЭК

ПРЫГОДЫ ЎДАЛАГА ВАЯКІ ШВЭЙКА

ЧАСТКА ПЯТАЯ

Пераклад з расійскае мовы
Т. Кляшторнага і Зьм. Астапенкі

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
Л і М
МЕНСК 1932

Вокладка мастака *М. Малевіча*
Тэхрэдактар *К. Пуроўскі*
Карэктар *Б. Мікуліч*

Заказ № 2508. 5.000 экз. (12¾ арк.) Галоўлітбел № 2405.

Друкарня імя Сталіна

На тытульным аркушы пятай часткі „Прыгодаў удалага ваякі Швэйка“ напісана замест Гашэка прозьвішча Ванэк. Як было паказана ў чацьвертай частцы кніжкі, Яраслаў Гашэк памёр 3 студзеня 1923 году, сарака год ад нараджэньня, не дапісаўшы да канца гэтай часткі. Працу Гашэка, паводле матэрыялаў нябожчыка, скончыў яго блізкі сябра, літаратар Карэл Ванэк.

1

ШВЭЙК ВУЧЫЦЦА РАСІЙСКАЙ МОВЕ.

Тая акалічнасьць, што шалёная карова парвала ўсё, што зьвязвала ўдалага ваяку Швэйка з яго імпэратарам, за якога ён праліваў кроў на вайне, не парушыла душэўнай роўнавагі нашага героя.

Пад наглядам расійскага канвою ён ішоў насустрач невядомасьці ў расійскім палоне так спакойна, бесклапотна і даверліва, нібы ён толькі выйшаў купіць сабе сасісак на сьнеданьне.

Ён ані ня дзівіўся таму, што яго пераводзілі з этапу на этап, што заўсёды зьмяняліся вакол яго канвойныя, якія праводзілі яго ўсё далей і далей у глыбіню краіны. Ён браў ад іх хлеб, піў іхны рэдзенькі чай і адказваў на іхнія запытаньні, якіх ён, вядома, не разумеў, ласкавай добрай усьмешкай і прамяністым позіркам сваіх блакітных вачэй.

Яму было нават прыемна, што вакол яго зноў былі адны салдаты. і ён старанна шукаў у іх падабенства да сваіх знаёмых па батальёне.

Калі аднойчы барадач зьеў на вёсцы цэлую булку хлеба і запіў яе чатырма конаўкамі малака, Швэйк успомніў Балуна і спагадліва сказаў свайму падарожніку:

— У нас вось таксама быў адзін такі прорва, як ты. Звалі яго Балуном. Ты часам не сваяк яму? У яго, ведаеш, кішка была, як пажарны рукаў, і ён табе, расійскаму аб'ядайлу, у гэтых адносінах нічым-бы ня здаў. Ён табе, камрад, паказаў-бы, што гэта ёсьць аўстрыйскі салдат.

На гэта расіец замахаў у знак згоды галавой і сказаў: «так, так» і «добра», «добра», а Швэйк, канчаючы гутарку ўздыхнуўшы дадаў:

— Так, так, добра, добра! Хай-бы ты, чортава насеньне, навучыўся прынамсі гаварыць па-чэску, або па-нямецку, каб

цябе можна было зразумець! А то швэргаеш, як шпак, так што я нічога ня ўцямлю. Усё гэта таму, што мы з вамі адна нацыя.

Больш за ўсё дадзявала яму тое, што ён ня мог згаварыцца з расійцамі; ён прыпамінаў усе мітынгі ў Празе, на якіх, прамоўцы запэўнялі, што толькі братэрская Расія са сваім бацьмоўцы запэўнялі, што толькі братэрская Расія са сваім бацькам-царом магла прынесьці чэскаму народу вызваленьне, і каб цяпер хто спытаў у яго, якое засталося ўражаньне ў яго ад узаемаадносін паміж расійцамі і чэхамі, ён адказаў-бы:

— Што-ж, прамовы на тое, каб іх гаварыць, а піва—каб яго піць. Кожны з гэтых дэпутатаў вярзе глупства і такі тупы, як ступенькі сходаў на вышцы на Лаўрэнцявай гары ў Празе. Ніхто нічога не разумее. Гэта трэба бачыць самому, як тую п'есу, якую напісаў пан Кубік для «Арэны» ў Сьміхове.

Яго нічога не палохала таму, што расійскія салдаты аднасіліся да яго добра. Ён любіў сядзець з імі каля дарогі, калі яны перамотвалі потныя анучкі, і з цікавасьцю глядзеў, як яны падвязвалі да ботаў выразаныя з мяшкоў паскі; ён ужо ведаў, што «сядай, пан» азначала прапанову адпачнуць і што «хадзем», або «пайшоў» было сыгналам ісьці далей, і ён слухаўся гэтых двух загадаў, як добра вымуштраваны цыркавы конь.

Усе яго думкі былі накіраваны на тое, каб высьвятліць, што за цар быў у гэтых салдатаў і ён ахвотна запытаў-бы іх, ці называў ён іх таксама ў сваім маніфэсьце «Мае слаўныя ваякі». На кожнае пытаньне, якое ён задаваў у гэтым кірунку, ён чуў суцяшальнае «так, так», або паблажлівае «добра, добра», і таму рашыў, што расійцы, мабыць, нічога іншага ня ўмеюць гаварыць.

Ён склаў сабе канчатковы погляд на расійскага цара, калі аднойчы нейкі салдацік пачаставаў яго скваркай, цыгаркай і кавалачкам цукру, прычым зноў сказаў нешта такое, чаго Швэйк не зразумеў; і ён выказаў свой погляд, паклаўшы руку расійскаму салдату на плячо, такімі словамі:

— Слухай, паёк у вас ня дрэнны. Цар у вас, як відаць, сумленны чалавек.

І салдат зноў адказаў, нібы заведзены грамафон:

— «Так, так, добра, добра».

Але ў гэты самы дзень Швэйкаў слоўнік узбагаціўся, дзякуючы аднаму казаку, які вёў яго ў разьмешчаны ў тыле штаб

дывізіі. Казак абшукаў у Швэйка торбу, дастаў адтуль апошнюю бляшанку консэрваў і, адчыняючы яе, запытаў у палоннага:

— Толькі адна ў цябе і была, твою маць? Бачыш, пасьпеў ужо ўсё пажраць. А табака, ...тваю маць, у цябе ёсьць?

Швэйк, узрадваўшыся, што яму давялося злавіць лёгкі для запамінаньня і часты ва ўжытку выраз, адказаў:

— Консэрвы, добра, табака, так, так! Жары, зладзюга, удавіся,... тваю маць!

Дарогаю Швэйк заўважыў, што яго спадарожнік, размаўляючы, ніколі не забываўся ўжываць «выраз» у пачатку і ў канцы кожнага сказу і што салдаты, якія адказвалі яму, трымаліся такога самага правіла. З гэтага Швэйк вывеў, што гэта, напэўна, нешта накшталт формулы далікатнасьці, якая сьведчыць аб шляхетным выхаваньні і тонкіх манерах.

Таму, калі казак прывёў яго ў канцылярыю штаба дывізыі і нейкі маладзенькі обэр-афіцэр, падышоўшы да яго і дапытліва гледзячы на яго спытаў:

— Дзе цябе ўзялі ў палон,... тваю маць?—Швэйк ветла і без усякай палахлівасьці адказаў:

— Так што дазвольце далажыць, пане паручнік, пад Бродамі. Ля самай мяжы мяне і забралі,... тваю маць.

Пры гэтых поўных далікацтва словах афіцэр падскочыў, як падпечаны і на Швэйкавым твары з кожнага боку шлёпнула аплявуха.

— Хто цябе навучыў гаварыць «...тваю маць»?—зароў на Швэйка афіцэр. Нельга з афіцэрам так гаварыць. Разумееш, сукін сын, мацъ тваю...?

Па злосьці, ад якой паручніка літаральна трэсла, і па яго грозным крыку Швэйка зразумеў, што яго адказ афіцэра чамусьці не падабаўся. Зноў узяўшы пад казырок, ён праказаў.

— Шчыра прашу прабачэньня. У вас, мабыць, таксама ня можна перабіраць мерку. Так што дазвольце далажыць, што я крыху памыліўся. Я яшчэ ня добра навучыўся гаварыць па-расійску, пане паручнік, і ведаю адно толькі гэта слова.

Афіцэр зьмерыў Швэйка пагардлівым поглядам і куляй выляцеў з канцылярыі, бразнуўшы дзьвярыма.

Пасьля таго, як ён пайшоў, пісар устаў ад сваёй машынкі і сказаў, захлынаючыся сьмехам, Швэйку па-нямецку:

— А ты, камрад, не пераказвай усяго таго, што пачуеш ад салдатаў. Я наогул параіў-бы табе трымаць у Расіі язык за зубамі, пакуль ты ня будзеш разумець, што гавораць навокал. Інакш табе ліха ня мінуць.

Потым ён растлумачыў Швэйку, што гэтыя словы, якія так часта ўжываюцца, найстрашнейшая лаянка, і што афіцэр яшчэ досыць мякка абыйшоўся з ім. Ён вывеў Швэйка з канцылярыі, паклікаў нейкага салдата і, паказаўшы на палоннага, загадаў:

— Завядзі яго да іншых, каб запісалі яго на ўтрыманьне і на паёк. Ну, бывайце, шчасьліва заставацца, ...твою маць!

І дадаючы гэтыя сакрамэнтальныя словы, ён лёгка выцяў Швэйка нагой у зад.

Салдат паказаў рукой наперад. Швэйк зразумеў і паддаўся да вялікай пуні, дзе ўжо знаходзілася некалькі чалавек палонных пад вартай, і, зьдзяючы з плеч торбу, вясёла сказаў:

— Якога палку, таварышы? Так што нашага брата тут знойдзецца ня мала? Што-ж, дрэнны прыклад заўсёды пераймаецца. Я так мяркую, што раз мы ўжо прарвалі фронт, дык да Масквы нам цяпер не далёка.

Ніхто не азваўся. Два немцы і адзін мадзьяр адсунуліся ад іншых у самы куток і пагражалі адтуль кулакамі. Тады Швэйк лёг, падклаў сабе пад галаву ранец, выцягнуў зморaныя ногі і завёў сваю філёзофію.

— Так, так, яго вялікасьць, цар-імпэратар, вядома, ведаў, які будзе пачатак, а чым з намі скончыцца, ён гэтага ня ведаў. Хлопцы, няўжо мы сапраўды ўжо ў Расіі? А мне ўсё здаецца, што тут такое-ж надвор'е, як і ў нас.

— Так, так, мы сапраўды ў Расіі,—уздыхнуў побач са Швэйкам стары капрал.—Але толькі тут зусім ня так, як мы сабе ўяўлялі. Я сам тож падняў рукі і здаўся, а мне ўсё-ж такі набілі па мордзе, гадзіньнік у мяне адабралі, брытву ўкралі, партманэт з кішэні выцягнулі, і нават люстэрка мне не пакінулі. Двое сутак есьці не даюць. І нават пагаварыць, як сьлед, з імі нельга.

— Сёньня, мабыць, дадуць есьці,—паспрабаваў суцешыць яго Швэйк,—пісар загадаў. Гэта, браце ты мой, таму нам тут так не салодка прыходзіцца, бо пра тое, што мы тут—іхні імпэ-

ратар, або як яго завуць яшчэ—цар, нічога ня ведае. Гэта, як быццам, шляхетны чалавек, братцы, а нас, чэхаў, ён нават страшэнна любіць і душа яго наогул славянская і чэская. Гэта я ведаю ад самога доктара Крамаржа.

І Швэйк пераказаў тое, што чуў недзе на нейкім мітынгу, нібы цар толькі і думае аб вызваленьні чэхаў і славян. І, выказваючы ўсе гэтыя прыгожыя рытарычныя сказы, абабітыя і зашмальцаваныя на мітынгах і сходах, ён пакрысе і зусім распаліўся.

— Таму, што, сябры,—разьдзіраўся ён,—як толькі цар даведаецца, што мы тут, ён нас бадай запросіць да сябе ў Пецярбург, каб паказаць нам, як ён кіруе Расіяй. Спачатку, панове, будзе аўдыенцыя, потым ганаровы абед, а ўвечары баль і бог ведае што яшчэ. Ён нас усіх, можа, пакладзе спаць з прыдворнымі дамамі. Я, братцы, вазьму блёндыначку, якую-небудзь такую княгіню або графіню, ня вельмі тоўстую, а так толькі пульхненькую і ня вельмі гарачую. Гэтага я ня люблю... Я іхнаму гофмайстару так і скажу: «Шляхетную, спакойную, для старога пана».

— А як-бы ты з ёй стаў размаўляць? «Добра, добра, так, так?»—кпліва спытаў капрал.—Ты-ж не патрапіў-бы з ёй дамовіцца.

— Ты праўду кажаш, дружа, цяжка паразумецца з жыхарамі варожай краіны, а асабліва, калі яны гавораць чужой мовай,—сур'ёзна азваўся Швэйк.—А іншы раз і муж ня можа дагаварыцца з сваёй уласнай жонкай. Вось у Крочагляве жыў адзін шахцёр, нехта Янда, дык той пасварыўся з жонкай і яна кінула з ім гаварыць. Ну дык ён, каб адпомсьціцца, таксама не гаварыў з ёю, і калі ім што-небудзь было патрэбна, дык яны пісалі крэйдай на стале. Тым часам ён захварэў і цэлы тыдзень пралежаў дома, а ў суботу доктар вызнаў яго за здаровага і сказаў яму: «Ну, пане Янда, у панядзелак вам прыдзецца пайсьці на работу». Прыходзіць наш Янда ў нядзелю ўвечары з піўнiцы, жонка чакае яго вячэраць, а ён павячэраўшы піша на стале: «Заўтра раніцой выходжу на працу, разбудзі а чацьвертай». Жонка прачытала і нічога не сказаўшы лягла спаць. Раніцой ён прачынаецца, глядзіць—жонка ўжо каву змалола, на дварэ—дзень, і гадзіньнік паказвае палавіну на восьмую. Ён перапалохаўся, стаў лаяць жонку і крычаць: «Што-ж ты мяне

не разбудзіла?» А яна не адказвае і адно ківае на стол. Ён пахыходзіць і бачыць—пад яго надпісам: «Заўтра раніцой выходжу на работу, разбудзі а чацьвертай», рукой яго жонкі напісана: «Уставай, чатыры гадзіны», а потым: «Уставай, ужо нават чвэртка на пятую!».

Швэйк з хвіліну падумаў, а потым сказаў далей:

— Або ўзяць хоць-бы Халечыка, які жыў у Разьдзялове. Ён і ягоны друг-прыяцель Фэрда-Бэран—абодвы былі чэхі, а вось таксама ня здолелі паразумецца. Іншы раз у мове няма дасканалага выразу на што-небудзь, і праз гэта могуць быць не мапыя няпрыемнасьці. Дыплёматам прыходзіцца нават спэцыяльна вучыцца па-француску, таму што гэта такая ўжо дасканалая мова, у якой нічога іншага ня збрэшаш, апроч таго, што думаеш і што хочаш сказаць... Ну дык вось гэты Халечык ажаніўся з нейкаю Эмаю Петржылек з Унгошту, а Бэран, гэты самы раней таксама да яе заляцаўся і, калі яна выйшла замуж, вельмі на яе разахвоціўся. Яна была нішто сабе маладзіца, пампушачка такая, уся мяканькая... Задок у яе быў, як падушачкі, і ходзячы яна ім віхляла так, што ў мужчыны сьлінкі цяклі... Аднойчы сядзіць гэты Бэран з Халечыкам у піўніцы і кажа Халечыку, як той зладзіў ісьці дадому: «Зайздрошчу я, браце, табе, што ў цябе такая прыгожая жонка. Далібог, Пэпі, пяцьдзесят крон не пашкадую, каб палэпаць яе па задку. І з таго часу, калі яны сустракаліся, ён ні аб чым іншым не гаварыў, як толькі аб гэтым «палэпаць». Усе вушы ён Халечыку пратрубіў: «Разумееш, Пэпі, толькі крышачку палэпаць, і я табе ахвотна дам пяцьдзесят крон». Халечык расказаў гэта сваёй жонцы, а тая сказала: «Ну і хлюст-жа твой прыяцель, калі ў яго гэткія думкі. Але толькі ведаеш што, Пэпі? Бадай табе варта было-б яму дазволіць. Я куплю сабе на гэтыя пяцьдзесят крон новенькі палітон, мне-ж ад гэтага нічога ня стане, але толькі ўмоўся з ім, каб ты мог падглядаць. Таму, што мужчыны не здавальняюцца пад час абеду адным крупнікам, а калі возьмуцца за лыжку, дык хочуць зьесьці ўвесь абед». І вось, Пэпі Халечык, калі Фэрда-Бэран усё чапіўся да яго сваім «палэпаць», дамовіўся з ім на нядзелю, але з тэй умовай, што будзе падглядаць у шкляныя дзьверы з кухні, каб, калі што-якое, умяшацца ў справу, а Барэн зноў-жа паставіў умову, каб Эма была толькі ў аднэй цененькай спаднічцы. У нядзелю прышоў Бэран, а Халечык адхінуў фіранку

ў дзьвярох і глядзіць, вылупіўшы вочы. Бэран увайшоў да яго жонкі, падсеў да яе на дзіван, узяў яе левай рукой за стан, прыцягнуў да сабе, а правай пачаў гладзіць яе па паўкулях. Пяць хвілін гладзіў правай, потым пяць хвілін левай, потым зноў пяць хвілін правай... Яна ўся расчырванелася, а Халечык сядзіць быццам на вугольлі. А калі мінула тры чвэрткі гадзіны, ён ня вытрымаў, урынуўся да іх і крычыць: «Ну, годзе! Выкладай зараз свае пяцьдзесят крон!» Але Фэрда засунуў рукі ў кішэні, сьмяецца ды кажа: «Не, браце, гэта ня лічыцца! Бо я-ж па яе міленькім, прыгожанькім задку яшчэ зусім не палапаў. Ты-ж сам бачыў, што яго толькі гладзіў». Гэта справа, даражэнькі мой, была ў Разьдзялове пад Кладно, а ты і ня можаш вымагаць, каб я адразу пачаў гаварыць у Пецярбурзе з прыдворнай дамай аб сучасным драматычным мастацтве, тым больш, што гэтая дама можа быць якой-небудзь эскімоскай, баронэсай з паўночнага канцавосься.

— У нас, у Вадзерадзе,—успомніў капрал,—здарылася нешта падобнае. Але там гэта было з адным Слабодам, які быў глухі, як пень. Прыходзіць да яго настаўнік з газэтай і кажа: «Пане Слабода, на мяжы наша войска ўшчэнт разьбіла расійцаў», а ён яму ў адказ: «Ну, вядома, разьбілі, ніколі ў Выслоўцы кірмаш ня бывае без таго, каб каму-небудзь галаву не разьбілі. Зноў доктару работы прыбавілася!?—«Ды, ня тое-ж, пане Слабода, я кажу пра расійцаў, якія на Сане»,—папраўляе яго настаўнік, і торкае яму пад нос газэту. А Слабода зноў: «Як гэта так—на санях, пане настаўнік? Надвор'е сапраўды ядранае, але ніколі яшчэ ў верасьні ў нас сьнегу ня было». Тут настаўнік зусім быў зьбянтэжыўся, бо вельмі ўжо яму карцела, каб Слабода даведаўся, якое наша становішча на фронце і як мы ідзем ад перамогі да перамогі. Ён паказаў пальцам на адно месца ў газэце і кажа: «Вось тут усё напісана. Расійцы перайшлі ўжо мяжу». А Слабода ўтаропіўся ў газэту і адказвае: «А сапраўды зайшлі-б вы да мяне, пане настаўнік, як будзем парсюка біць. Але гэта будзе не раней як у студзені, бо я хачу дакарміць яго, прынамсі, да паўтараста кілё».

— Што-ж, рознае бывае, калі людзі ня могуць паразумецца,—зноў узяў слова Швэйк.—Знаў я аднаго Зямельку з Барова, дык той быў музыка і вандраваў па сьвеце з музыкамі. Зімою яны былі недзе ў Баварыі, а калі час падыходзіў пад

вялікдзень, іхні дырыжэр і кажа, што, бач, кожны добры хрысьціянін павінен на вялікдзень паспавядацца і прычасьціцца. «Таму што,—кажа ён ім,—вы, нягоднікі, кожны дзень бываеце п'яныя, а ўсю масьлянку жэрлі адну сьвініну, а пра цела боскае, якое вы прымаеце пры сьвятым прычасьці, нават і ня думалі. Тут у Нэйбурзе мы крыху затрымаемся і вы, малойчыкі, павінны схадзіць да споведзі. Ты, Блаха, не забудзься пакаяцца, што круціў у «дваццаць адно», ты, Новак, павініся, што стыбрыў пару ботаў, ты, Бэрэум, не забудзься сказаць свайму духоўніку, што ты ў адным гарадку зьнік, не заплаціўшы кельнэршы за яду, ды яшчэ скаратаўшы з ёю ноч; а ты, Зямелька, так і скажы, што гэта ты сьпёр гусіную смажонку ў пастара ў Шанфэльдзе, якую пастарыха вынесла ў сенцы, каб стыла. Ну дык вось, хлопцы, гайда! І вяртайцеся чыстыя і белыя, як мытыя перад стрыжкай авечкі». Пайшлі яны, значыцца, і выслалі наперад Зямельку, які быў у іх самы кемлівы ў такіх сур'ёзных справах. Але вось—ён дрэнна ведаў нямецкую мову. Калі падышла да яго чарга спавядацца, ён укленчыў і маўчыць. Поп пытае яго па-нямецку: «Was ist?[1])". Яму трэ' было адказаць: «Я, нягодны грэшнік, спавядаюся перад вамі, духоўны ойча, як перад служыцелем боскім, у тым што...» і пайшло і пайшло. А ён ня ведаў, як сказаць гэта па-нямецку і таму ўсё маўчыць. Поп зноў да яго: „Was ist?". А ён зразумеў, што яго пытаюць «Басіст?» і адказвае па-чэску: «Так, сапраўды басіст. А клярнэтыст, скрыпач і флейтыст яшчэ на цьвінтары чакаюць. Яны, ваша прападоб'е, хочуць спачатку даведацца, чым скончыцца справа са мной. Я спавядаюся перад вамі, шаноўны ойча, які ёсьць намесьнік божы, перад усім магутным богам і прачыстай дзевай Марыяй, што я ўкраў у пастара ў Шэнфэльдзе смажаную гусіну, якую паставілі ў сенцы астыць, але толькі, ваша прападоб'е, гусіна гэта была каляная, недасоленая, бяз ніякай прыправы; каб у мяне жонка прыгатавала так гусяціну, дык я-б шпульнуў ёй гэтую гусяціну ў морду».

Поп нахіліў сваё вуха бліжэй, каб нічога з грахоў не прапусьціць і зноў пытае: „Was ist?" А Зямелька адказвае: «Ну, так, басіст, контр-басіст. Мы, контр-басісты, вялікія грэшнікі. Таму што, ваша прападоб'е, калі іграць праз цэлы дзень і цэлую

[1]) У чым справа?

ноч, дык гэта, прабачце, ня жарты. Трэба добра наесьціся, каб гэта, значыцца, вытрымаць. Ваша прэпадоб'е, вы мне ўжо даруйце. Я ніколі больш ня буду красьці гусіну, калі яна будзе стаяць ня ў сенцах, а ў замкнутай кухні». Ну, поп дараваў яму адпушчэньне грахоў, а потым Зямелька вышаў і кажа сваім прыяцелем: «Вы яму проста так і кажэце, хлопцы, хто вы такія, бо ён разумее нашы музыканцкія грахі. Можа ён нашай пароды, бо страшэнна падобны да старога Ганшпаха са Стрункавіцэ, каб лёгкай яму зямля была, які туляўся больш тут, у Баварыі, чым у сябе на радзіме».

І Швэйк пачаў уважліва разглядаць расійскіх салдат, што хадзілі ўзад і ўперад перад пуняй, з доўгімі вінтоўкамі і трохканцовымі штыхамі на плячох, і з заклапочаным выглядам дадаў:

— Вось так і з намі тут можа ўсякае ліха здарыцца, пакуль мы не навучымся, як сьлед, гаварыць. На практыцы яно не заўсёды так «проста і хутка», як па самавучыцелю Вымазалю. Адзін бог сьвяты ведае, колькі разоў мяне яшчэ будуць лупцаваць па мордзе, калі я буду верыць прыказцы, што ласкавым словам усяго дамагчыся можна. Але самае галоўнае—гэта, што нельга нікому, у каго срэбныя або залатыя пагоны, гаварыць: «...тваю маць».

— Табе што?—спытаў расійскі салдат, пачуўшы апошняе Швэйкавае слова.—Курыць?

Салдат палез у кішэню, выцягнуў нейкую маленькую пачку, адсыпаў Швэйку нечага ў жменю і пайшоў.

У Швэйка, які, вядома, не зразумеў салдата, засталася ў жмені кучка крошак, падобных да дробна пасечанай кукурузнай саломы. Швэйк, капрал і рэшта палонных разглядалі невядомыя зерняткі, якія бясспрэчна мелі якое-небудзь прызначэньне, але ніхто ня ведаў, што з імі рабіць.

— Есьці іх, як быццам, нельга,—зазначыў Швэйк, паклаўшы некалькі гэтых крошак у рот.—Пячэ, каб на яго ліха.

— А можа гэта парашок ад вошай?—здагадаўся капрал.— Сьмярдзіць ад яго здорава. І ўсё тут ня так, як у нас.

— Гэта хутчэй за ўсё расійскі чай,—утыкнуўся ў тутарку адзін з палонных.—Я бачыў, як расійцы прыносілі вунь адтуль з катла вар і перш, чым разьліць яго ў чайнікі, нешта туды засыпалі. Дай, браце, сюды крыху ў гэтую бляшанку, а я прынясу вады.

Швэйк высыпаў усю жменю ў манерку, і палонны вышаў з ёю з пуні. Расійскі салдат схапіў вінтоўку і строга крыкнуў:

— Стой! Куды?

Убачыўшы, што палонны пайшоў да катла, ён распусьціў рот у шырокую ўсьмешку і сказаў:

— Ага, чаю захацеў? Ну, ну, вазьмі вару, ды глядзі ня ўздумай уцякаць, а то кулі цябе ўраз здагоняць.

Палонны набраў у манерку вару і прынёс яго Швэйку; той паспрабаваў і ў той-жа момант плюнуў.

Пасьля яго, страшэнна крывячы твар, пакаштаваў капрал; нарэшце, пакаштаваў і гаспадар манеркі, які прынёс ваду, і з агідай адставіў яе ў бок.

— Ліха ведае, дзіўны ў іх чай,—прасіпеў Швэйк.—У мяне ўвесь рот апаліла. Горш, чымся чысты сьпірытус.

— Можа, ня трэ' было засыпаць так многа?—сказаў салдат.—І потым гэтая штука страшэнна тхае табакай. Ці ня трапіла туды табачнага соку з тваёй люлькі, камрад? У нас у роце гатавалі аднойчы чай, дык ён пах тым-жа самым, што і гэты, але раздавальнік кляўся і бажыўся, што гэта было проста таму, што яму далі дрэннага рому. І толькі тады, калі ён управіўся ўжо раздаць увесь чай і зачарпнуў нейкую зялёную гушчу, ён раптам крыкнуў: «Ой, братцы, даруйце, у мяне люлька трапіла ў кацёл».

— А ўсё гэта таму,—загаварыў капрал,—што на кухню прызначаюць людзей, якія ні на што іншае няздатны. У нашай роце фэльдфэбэль паслаў на кухню аднаго танцмайстра і рэдактара аднэй газэты, дык калі яны ўпяршыню варылі гуляш, нам прышлося матыкамі выломваць з катла і сячы яго сякерамі ці рыдлёўкамі.

— Гэта, як з тэй актрысай, якая засыпала ў суп адразу два кілё рысу,—дадаў Швэйк,—і якой потым давялося ўцякаць з кухні, каб ён яе не задушыў. Бо рыс так набубнеў, што выціснуў вакно і кавалак гэтага рысу забіў аднаго пажарнага з Нусьле, калі той памкнуўся прыставіць да вакна драбіну. З намі адбываецца тое-ж самае, што было з аднэй вясковай маладзіцай з Вінорша, якая аддала сваю дачку ў пансыён у Парыжы. Тая паслала ёй да дня імянін кілё сырой кавы з пажаданьнем, каб яна прышлася ёй да смаку. Была гэтая справа даўно, і ў тыя часы ў нас яшчэ ня ўсе ведалі, што гэта кава. Дык гэта дурніца-

баба і на масьле смажыла яе і ў хрушчы падсыпала і пад таматным соусам гатавала, а ў яе ўсё ніякага смаку. З рэшты яна яе выкінула, а дачку сваю ледзь не пазбавіла спадчыны, бо ўзяла сабе ў галаву, што тая хацела яе атруціць. І папу з Карліну давялося нямала папрацаваць, пакуль пераканаў яе, каб яна ня думала так дрэнна аб сваёй роднай дачцэ, а каб сваю маемасьць лепш аддала дамініканцам, або францысканцам на Малым баку. Вось у нас рыхтык такая-ж гісторыя з гэтай брыдотай. Прыдзецца яе выліць. Ці можа цяпер стала лепш?

Швэйк зноў пакаштаваў крыху чай з манеркі, але зараз-жа так энэргічна цыркнуў яе праз зубы, што трапіў у твар расійскаму салдаціку, які з цікавасьцю глядзеў, як аўстрыякі без перастанку зазіралі ў манерку і аб нечым радзіліся.

А потым Швэйк паваліўся на падлогу і, трымаючыся за жывот, пачаў стагнаць.

— Ой, я атруціўся! Ой, надыйшла мая апошняя гадзіна! Кланяйцеся ад мяне Празе, фрау Мюллер, маёй прыгожай Чэхіі і гаспадару рэсторану Палівецу!.. Ой, ой, ой!..

Расійскі салдат, пачуўшы гэтыя трагічныя стогны, выцер рукавом запырсканы твар, спусьціў з пляча вінтоўку і падышоў да Швэйка.

— Што такое? Хворы ты, ці што? Нудзіць, га?

Гучна стогнучы, Швэйк паказаў пальцам на манерку. Салдат паглядзеў і зайшоўся вясёлым нястрымным рогатам:

— Эх, вы дурні! Гэта-ж табака, а ня чай. Ці ты ня ведаеш, як з ёй абыходзіцца?

Расіец дастаў з кішэні пачку зусім такую-ж, як тая, з якой Швэйку адсыпалі карашкоў, і выцягнуў з халявы кавалак газэты, адарваў чвэртку, скруціў сабачую ножку, насыпаў туды карашкоў з пачкі, закруціў канец, узяў яе ў рот, запаліў вольнай рукой канец запалкі і з асалодай выпусьціў хмарку дыму.

— Вось, глядзі, як гэта робіцца,—сказаў ён.—Гэта, брат, табака, расійская табака, махорка.

Праз гадзіну Швэйк набыў у аднаго салдата за грыўню пачку махоркі, скруціў з кавалку «Прагер Тагеблят», з якога паручнік Лукаш вычытаў калісьці аб вялікіх перамогах аўстрыйскай зброі і які нейкім чынам захаваўся ў ранцы, сабачую ножку і запрапанаваў яе капралу, з якім пасьпеў ужо здружыцца, са словамі: «На, бяры, зрабі сабе такую-ж штучку. Гэта

завецца тут ў іх «сабачыножка». Чорт іх ведае, што гэта азначае. А ці ведаеш, дружа ты мой, чаго больш за ўсё мне шкада? Што я не магу падпісацца тут на «Народну Політыку». Некалькі пачак такой табакі і аднаго нядзельнага нумару гэтай газэты хапіла-б нам двум на цэлы год. Бо гэтую Расію, таварышы, нам давядзецца яшчэ пазнаць, як сьлед. Але памаленьку ды пацішэньку. Добра! Так, так!.. тваю маць!

Праз дзесяць хвілін іх абступіў натоўп навабранцаў, што вярталіся з заняткаў у вёску. Яны разглядалі Швэйкаву люльку, якая тырчэла ў яго з бакавой кішэні, глядзелі, як ён курыць сабачую ножку і засыпалі яго пытаньнямі:

— Добра, га? Здароў, браце? А вайна хутка скончыцца? Афіцэры ў вас таксама ёсьць?..

І Швэйк, зьзяючы ад здавальненьня, што зьяўляецца асяродкам увагі, паўтараў:

— Добра, так, так, та-а-а-ак,—расьцягваючы пад канец гэта «так, так», як курыца на куросадні.

У полудзень раздавальнік прынёс ім два бачкі, разьлічыў палонных на групы па дзесяць чалавек і моўчкі паказаў ім на бачок. Яны сталі на калены вакол бачка і пачалі сёрбаць капусту. Потым той-жа раздавальнік вярнуўся з усторкнутымі на лучыну кавалкамі мяса і зноў знакамі растлумачыў, што мяса таксама, як і дзьве булькі хлеба, пакладзеныя каля кожнага бачка, належаць ім. Нарэшце, ён прынёс у шапцы цукар, даў кожнаму па два кавалкі на рукі і яго праставатае добрадушнае аблічча прасьвятлела.

— Добра, га?—сказаў ён.—Ня будзеце больш ваяваць? У Расіі, у лягеры вам будзе нядрэнна.

Але пад вечар да пуні, махаючы бізунамі, пад'ехалі казакі і з крыкамі: «Уставай, пайшоў уперад», пагналі палонных на двор, а са двара на рынычны пляц.

На рыначным пляцы пашыхавалася войска, неагляднымя шэрагі гарматаў і фурманак з хлебам, а збоку зыбаўся нязьлічоны, шэра-блакітны натоўп палонных.

Да іх далучылі казакі і купку, у якой знаходзіўся і Швэйк, а потым шчытным колам абступілі палонных. Па камандзе: «Уперад—марш!» яны ўскочылі на коняй і ўся маса рушылася ўздоўж дарогі; палонных падганялі час-ад-часу казакі сваімі нагаямі.

На ўсіх шляхох і дарогах, куды ня кінь вокам, відаць было адступаўшае войска і абозы. Расійцы зноў шпарка і бязладна адыходзілі назад.

Праз гадзіну транспорт палонных нагнала цяжкая артылерыя, якая ўрэзалася ў самую гушчу. Казакі нагайкамі зганялі аўстрыякаў з дарогі. А потым выявілася, што дарога для гарматаў і фургонаў наогул надта вузкая, і палонным давялося ісьці ўвесь час па полі, па лузе і па балоце.

Так ішлі яны без адпачынку да самае раніцы. Дасьвецьцем палонных прывялі на нейкае шырокае, роўнае, адкрытае месца і зрабілі на гадзіну адпачынак.

Неўзабаве пачулася бязупынная гарматная страляніна, і зноў загадны голас:—Пайшоў, пайшоў!—Разьбітыя, змораныя, недаспаныя і галодныя людзі, пайшлі далей. Да полудня прайшлі Крамянец, да ночы дабраліся да Шумску. Там іх прыняла новая этапная каманда. Зьявіліся фэльдфэбэлі з ліхтарамі і пачалі крычаць:

— Па чатыры ў рад стройся!

Потым яны пачалі хадзіць узад і ўперад, лічылі, блыталіся, зноў пачыналі, спрачаліся, вярталіся, зноў блыталіся, пачыналі спачатку і зноў спрачаліся. Нарэшце, яны разьвялі палонных па бараках. Але як толькі змораныя людзі ўправіліся пакласьціся, зьявіліся салдаты і загучэла каманда:

— Уставай! На паверку!

Усе вышлі з баракаў. Ззаду і сьпераду палонных паставілі па чатыры чалавекі ў рад і нейкі афіцэр пачаў хадзіць туды і сюды, торкаючы першага ў радзе пальцам і лічачы: раз, два, тры, чатыры... А дайшоўшы да лічбы, якую ён назваў словам «сорак», зблытаўся, вярнуўся назад і пачаў усё нанава. На лічбе «сорак», ён зноў штосьці пераблытаў і стаў крычаць:

— Так іх, паскуднікаў, да самай сьмерці ня зьлічыш. Трэ было ім усім морды набіць.

А Швэйк, зьдзіўлены гэткай слабасьцю ў матэматыцы, ня мог, калі афіцэр праходзіў каля яго, стрымацца ад заўвагі:

— Эх, хлопча, ня ўмееш, як відаць, лічыць. Езус-Марыя, калі я ў цябе згублюся, дасьць табе пэнту твой бацюшка-цар.

Так іх лічылі да самай раніцы, то заганялі ў баракі, то зноў выганялі на двор і ніяк не маглі справіцца з падлікам. Нарэшце афіцэр паслаў іх да чортавай мацеры, сказаў ім замест «добрай

ночы!»—«...вашу маць, сукіны дзеці», і Швэйк, які не разлучаўся з капралам, меў нарэшце зусім заслужаны адпачынак.

Этапны комэндант Шумску, палкоўнік Лазараў, быў сумленны, пасьлядоўны чалавек, шчыры патрыёт, усёй душой ненавідзеў немцаў і ўсіх іншых ворагаў Расіі. Калі яму раніцой далажылі, што прыгналі шэсьць тысяч новых палонных, ён апрануўся, наведаў некалькі баракаў і выявіў неапісаную радасьць, даведаўшыся, што чэхі здаліся расійцам добраахвотна. Ён спытаў Швэйка, адкуль той родам, і пачуўшы, што з Прагі, з усьмешкай сказаў:

— Ах, Прагу я ведаю. Адтуль прышлі да нас сьвятыя Кірыл і Мяфодзі. Зараз, вядома, жывуць там адны немцы, але французы хутка іх адтуль прагоняць, таму што гэта зусім не далёка ад Парыжу. А Пільзэн вы ведаеце, дзе вараць такое цудоўнае піва? Мы гэты самы Пільзэн, Чэхію і ўсіх славян вызвалім.

І Швэйк, з пашанаю аддаючы чэсьць, адказаў на гэты ўрачысты маніфэст:

— Мы будзем вельмі рады, ваша высокародзьдзе. Я, праўда, ня ўсё зразумеў, але думаю, што вы кажаце такое-ж глупства, як наш падпаручнік Дуб, які таксама заўсёды хацеў нам штонебудзь паказаць. Добра, так, так!

На гэтым яны разьвіталіся.

Шэсьць тысяч палонных, якія павінны былі, паводле загаду начальніка арміі, атрымаць у Шумску абед, хлеб, цукар і чай, а ў выпадку немагчымасьці выканаць гэты загад—па 25 кап. на чалавека, нарабілі палкоўніку Лазараву нямала клопату.

На арыфмомэтры, які стаяў на століку ў канцылярыі, ён вылічыў, што гэта абыйдзецца яму ў паўтары тысячы рублёў, а паштоўка з цудоўнай галоўкай дзяўчыны, прышпіленая да сьцяны над арыфмомэтрам, нагадала яму яго дачку, чый пасаг ён да гэтага часу акуратна прагульваў у карты. У яго душы ўзьнялася жорсткая барацьба.

«Паслаць у інтэндацтва хоць па хлеб», думаў ён. Гэта будзе каштаваць у кожным разе пяцьсот рублёў. Даць ім яшчэ цукру і чаю? На гэта пойдзе рублёў паўтараста-дзьвесьце. Божухна-бацюхна, вось гора, што тут не адны немцы!»

Дзьве гадзіны ён добрасумленна змагаўся са спакусай, што падказвала яму помсьціцца ворагам, а потым пазваніў і, як прышоў ад'ютант, рашучым тонам загадаў яму:

— Палонных неадкладна падрыхтаваць да адпраўкі! Накормяць іх на наступным этапным пункце, куды я паведаміў ужо па тэлефоне. Загадайце згатаваць для іх ваду, і хай п'юць колькі хочуць. Паміж іх шмат гэтых нягоднікаў і падлюг немцаў, гэтай погані мадзьяр, а таксама ёсьць і чэхі—слаўная нацыя, якая змагаецца за нас.

Ад'ютант, кіўнуўшы галавой і пазвоньваючы сваімі шпорамі, вышаў. Палкоўнік сеў на крэсла і выцер хустачкай потны лоб, замілавана паглядзеўшы на паштоўку і арыфмомэтр, а потым раптам ускочыў, адчыніў дзьверы і крыкнуў усьлед ад'ютанту:

— «Загадайце паліць гатавальнікі як мага, каб вада мела прынамсі 120 градусаў; ва ўсякім выпадку, тая, якую будуць піць славакі, сербы, палякі і чэхі. Хай бачаць, што матушка Расія спачувае славянам і хай ведаюць расійскую гасьціннасьць і добрае расійскае сэрца.

Неўзабаве пачуліся крыкі канвойных, якія разбудзілі палонных, і гучны голас ад'ютанта, што камандваў каля гатавальнікаў і прапаноўваў палонным піць, колькі ўлезе, таму што, бач, хлеба ў Расіі досыць, а вада ніколі ня высахне.

Зноў пачалася бесканцовая праверка і цягнулася, бадай, да поўдня. Потым прыйшлі расійскія апалчэнцы ў чорных шапках, на якіх цьмяна паблісквалі латунныя крыжы, пастроіліся паміж палоннымі, разьдзяліўшы іх на два атрады, і крыкнулі—Ну, хлопцы, варушэцеся! Уперад!

— А я думаў, што нам дадуць тут есьці,—сказаў Швэйку капрал.— Зірні-тка, як з гэтых гатавальнікаў шугае пара.

Адданы глыбокай развазе, Швэйк не адказаў. Воддаль зноў загрымелі гарматы. Швэйк кінуў позірк на шэраг гатавальнікаў, якія дрыжэлі пад ціскам пары, што са злосным сіпеньнем вырывалася з вэнтылей, і толькі праз некалькі часу буркнуў праз зубы:

— Есьці так і ня далі! Усё гэта яны самі зьмелюць!

Транспарт палонных пайшоў па палявой дарозе, нібы раскінуты статак. Канвойныя апалчэнцы, простыя і добрадушныя людзі, закінулі, калі горад зьнік у далечы, за плечы сваю зброю, на якой замест рамянёў боўталіся акраўкі вяроўкі, наламалі каля канавы доўгіх дубцоў і з пацехаю гналі палонных перад сабой, нібы чараду гусей.

Яны былі зьдзіўлены такому мноству палонных і думалі, што вайна хутка скончыцца і самі яны прымеюць мірна вярнуцца дахаты. Убачыўшы такую плойму людзей, яны заспрачаліся, што ў Аўстрыі, мусіць, няма больш салдатаў, таму што расійцы забралі ўсіх у палон і гэтыя, як відаць, самыя апошнія.

Пэрспэктыва блізкага сканчэньня вайны надала ім добрага настрою. Калі хто-небудзь з палонных валіўся ад зморы, яны весела падганялі яго і праходзіла ня менш, як дзесяць сэкунд, першы чым яны пачыналі ўзнагароджваць змардаванага палоннага кулакамі або біць прыкладамі.

У абыходжаньні з тымі, што адсталі і сядзелі са спушчанымі порткамі павешанымі на шыю паясамі абапал дарогі, адзін стары расійскі фэльдфэбэль, які замыкаў працэсію, выяўляў асабліва шмат спрыту і вынаходзтва.

У правай руцэ ў яго быў доўгі дубец з трыма галінкамі на канцы. У левай ён трымаў больш кароткі, тоўсты і гнуткі дубец. І як толькі ён заўважваў палоннага, які спускаў порткі, ён станавіўся ззаду ў яго, каб бачыць усё хараство, якое адкрывала ўзьнятая кашуля, і з выразнай цікавасьцю назіраў за неэстэтычнай фізыолёгічнай функцыяй.

Потым ён выцягваў дубец і пачынаў казытаць ім таго, хто сядзеў на карачках, ніжэй сьпіны, або абмахваў гэтую частку цела, як еўнух якога-небудзь султана.

Нарэшце, ён лічыў да дзесяці, лічыў з хуткасьцю маланкі, мяняў дубец і сьцёбаў ім па голым целе кароткімі з адцяжкай моцнымі ўдарамі. Ён не зважаў ні на якія протэсты і довады, што процэдура яшчэ ня скончана, а толькі крычаў:

— Не разумею... такі загад... марш уперад!

Такі-ж горкі лёс напаткаў і ўдалага ваяку Швэйка, які зьеў раніцой нашчак некалькі зялёных ігруш. Ён зьвярнуў з дарогі і спусьціў порткі.

Фэльдфэбэль паруліўся скончыць з другім, падняўшы яго моцнымі ўдарамі па азадку, стаў за Швэйкам і ўзяўся за сваю забаву. А калі Швэйк з прычыны моцнай вольнасьці жывата, ад якое засталіся сьляды і на галінках, на канцы дубца, ня змог скончыць своечасова сваю справу, фэльдфэбэль, размахнуўшыся ўдарыў яго тоўстым кіем.

— Дармо,—добрадушна кракгануў Швэйк, закруціўшыся на адным месцы,—але толькі, калі ласка, не перашкаджайце мне. Каб вы зрабілі такую самую штуку з мэдыкам, які прыходзіў у «Поўную чашу», ён вам сказаў-бы: «Казытаць вы мяне казытайце, гэта мне нават прыемна. Але не перапыняйце сваім недалікатным урываньнем плынь маіх лепшых ідэй. Вам, мабыць, невядома, што самыя шырокія, сьмелыя і высокія думкі зьяўляюцца тады, калі чалавек сядзіць у прыбіральні». Дык гэта цененькім дубцом вы забаўляецеся, не саромцеся, але толькі я яшчэ ня скончыў думаць, і таму прашу даць мне дадумаць.

Фэльдфэбэль падскочыў.

— Канчай, канчай! Такі загад!

Па Швэйкавым целе сьцебануў другі, яшчэ больш моцны ўдар. Гэта было так балюча, што ў Швэйка сьлёзы выступілі на вачох. Ён скончыў думаць, нацягнуў порткі і ў момант зашпіліў іх. Потым ён выцягнуўся перад сваім добрадзеем і, прыклаўшы руку да казырка, далікатна сказаў:

— Так, так, загад. Ах, дазвольце, пане фэльдфэбэль, я зганю ў вас муху. Вось!

І не дачакаўшыся ягонае згоды, адламаў кончык дубца пад самымі галінкамі і некалькі разоў сьцебануў гэтымі мокрымі, бруднымі галінкамі фэльдфэбэля па вуснах, па носе, па шчоках і вачох, аж зусім заляпіў іх брудам. Тады ён кінуў дубец і, з пашанай запытаўшыся, ці добра пану начальніку, у момант ушыўся ў натоўп, згубіўшыся сярод палонных.

На крык зусім зьбянтэжанага фэльдфэбэля падбегла некалькі вартавых, якія адвялі яго да канавы, дзе ён памыўся. Потым ён стаў абыходзіць шэрагі палонных, стараючыся знайсьці вінаватага, але ня мог яго пазнаць. Усе былі аднолькава брудныя, замурзаныя, змораныя і зусім ня розьніліся адзін ад аднаго.

Гумар, які асьвятляў жыцьцё фэльдфэбэля, пакінуў яго. Ён злосна біў сябе дубцом па халявах, глядзеў у вочы палонных такім позіркам, як глядзіць пытальнік з белага аркушу паперы. Але потым раптам ён зразумеў дарэмнасьць сваіх клапот і яму стала адразу ясна, што ён ня бачыў вінаватага з твару, а ўсіх задоў цяпер усёроўна не перагледзець, апроч таго яны ўсе так падобны

адзін да аднаго... Тады ён штосьці мармычачы сабе пад нос, з лаянкай зноў заняў сваё месца ў хвасьце колёны.

А за два крокі ад яго наперадзе бадзёра ішоў удалы ваяка Швэйк: і ў той час, як іншыя, тужэй падпаразаўшы дзяжкамі жываты, якія бурчэлі ад голаду, зусім зажурыліся і пасумнелі, ён засьпяваў старую разудалую салдацкую песьню, якую, бяручы пад увагу псыхолёгію салдата, знарок прыдумалі, каб узмацніць у шэрагах арміі веды нямецкай мовы.

2

ЦЯРНІСТЫ ШЛЯХ.

Наступны этапны пункт знаходзіўся ў Заслаўі, дзе транспарт ужо чакалі салдаты, якія павінны былі весьці яго далей. Гарачай стравы палонным і тут ня далі, ня далі і хлеба. Дзьвегадзіны іх прымалі ад Шумскага канвою і, не зважаючы на дробны золкі дождж, пагналі ўперад. Бесьперапынна ішлі ўсю ноч, мокрыя, скалелыя і да краю галодныя. Раніцой зрабілі прывал каля маленькай вёскі, адтуль сяляне прынесьлі некалькі булак хлеба, каб памяняць яго на бялізну, шынэлі і боты, прычым не абышлося бяз жорсткіх, злосных спрэчак і нават боек. Потым пайшлі праз вёску.

Перад кожнай хатай стаяў абшарпаны і абадраны селянін і пільна глядзеў, каб палонныя ў яго нічога не сьцягнулі. А палонныя бегалі ад студні да студні, набіралі вады ў свае манеркі, а каля наступнай студні вылівалі яе і рабілі новы вэрхал ды бойку каля вядра, каб зачэрпнуць сьвежай вады, і ніхто не разумеў недарэчнасьці такіх учынкаў.

На дарозе паказалася баба з вялікім бярэмам хлеба. У момант выхапілі ў яе хлеб, зьбілі яе з ног, і толькі ўдары прыкладамі выратавалі яе ад небясьпекі, што яе растопчуць і раздушаць звар'яцелыя людзі.

А палонныя сапраўды звар'яцелі з голаду. Па рынчачным пляцы ішла дзяўчына з нейкай рэччу, загорнутай у вялікую хустку. Людзі накінуліся на яе, вырвалі з рук клунак і адпалі толькі тады, калі тая ў роспачы закрычала гвалту, а з клунку пачуўся плач і піск нованароджанага дзіцяці.

У сярэдзіне гэтай узбуранай пустымі жыватамі арды павольна і важна выступаў Швэйк і гаварыў капралу:

— Хацеў-бы я ведаць, калі гэта яны пачнуць есьці адзін аднаго? Але толькі прыдзецца лёсаваць, хто павінен першы даць сябе на ахвяру, каб накарміць сваім мясам іншых. Першым, на маю думку, трэба зарэзаць каго-небудзь тоўстага, буйнага, каб з яго больш было мяса. Вось, ведаеш, чытаў я адно такое апавяданьне, як немцы забралі дзесьці недалёка ад Аўстраліі адну выспу, дзе былі адны людаеды, і ўзьнялі на ёй нямецкі штандар. Але салдаты ня здолелі справіцца з тубыльцамі, і таму сталі прасіць папу рымскага, каб ён прыслаў ім якога-небудзь місыянэра для заспакаеньня гэтых людаедаў. Ну, папа рымскі паслаў туды вельмі добрага прапаведніка, дык людаеды прынялі, апроч нямецкага штандару, яшчэ і хрышчэньне. Але ўсё-ж раз-по-раз то салдат, то місіянэр зьнікалі. А калі нямецкая ўлада пратрымалася там тры гады, дык паслалі з гэтай выспы ў Бэрлін дэпутацыю—паднесьці Вільгэльму свае верападданыя пачуцьці. І вось правадыр гэтай дэпутацыі папрасіў кайзэра, каб ён забраў з выспы салдат і паслаў туды больш місыянэраў. Вільгэльм узрадаваўся і запытаў, няўжо сапраўды ўсе яго аўстралійскія падданыя хочуць ахрысьціцца? Але правадыр яму адказаў: «Справа ня ў гэтым, цар, а ў тым, што ў тваіх людзей у чорных талярах больш сакавітае і далікатнае мяса, чым у тваіх людзей у сініх мундзірах. Чорныя—тых у адзін момант можна сасмажыць на патэльні так, што мяса ў іх робіцца як пульхны хлеб, і ў касьцёх у іх больш мазгавіны, а сініх круціш, круціш цэлы дзень на патэльні, а яны ўсёроўна як камень і майму народу яны зусім не да смаку. Дык паклапаціся аб гэтым, брат мой».

Капрал, як мага ўціскаючы рукамі жывот, каб уціхамірыць голад, нібы хацеў прыціснуць дзірку ў жываце, адказаў хмура і панура:

— Так, так, з голаду чаго толькі ня зробіш. З голаду, з гонару або з п'яну... Я, напрыклад, як яшчэ быў нежанаты і працаваў у Пісяку, жыў з трыма маладымі хлапцамі ў аднэй глухой бабулькі. Аднойчы ў нядзелю мы з раніцы працавалі, а потым усе ў аднэй місцы, у аднэй вадзе памыліся, усё як мае быць, твар і рукі, ды пайшлі на музыку. І там мы так напіліся, што прыйшлі апоўначы дадому п'яныя, як зямля, набраклыя, што пупушачкі на дрэвах увесну. Пакой наш быў на другім паверсе. Бабулька нас дачакалася, упусьціла нас, зачыніла, а по-

тым зноў пайшла да сябе ўніз і заснула. Ну, мы таксама леглі, заснулі былі, і раптам я прачынаюся—піць страшэнна хочацца. Я ўстаю, а адзін мой таварыш сядзіць ужо на вакне, зьлізвае расу з падваконьня і скаголіць: «Езус-Марыя, я паміраю ад смагі». Мы давай грукаць у дзьверы, але бабулька глухая, як пень, і ёй нібы-што. Разбудзілі мы нашым грукатам абодвых сваіх таварышоў. Тыя кажуць: «У піве мабыць быў перац, усё горла спаліла». І ім значыцца таксама трэба вады, і ім таксама да сьмерці піць хочацца. І раптам я заўважваю, што наша бабулька за намі ня прыбрала і ў місцы стаіць вада, у якой мы ўдзень мыліся... Я толькі ледзь-ледзь прыгубіў, адно, каб прамачыць горла, і таварышы таксама па разу глынулі. А да раніцы мы ўсю гэтую брудную ваду выпілі.

— А вы мыліся простым, ці пахучым мылам?—спытаў Швэйк.

— Простым,—журботным голасам адказаў капрал.

— Ну, дык значыць яшчэ можна было піць,—вырашыў Швэйк.—Але вось, каб вы памыліся пахучым мылам, тады магла-б здарыцца бяда. Адзін шынкар у Ратаі пусьціў да сябе неяк пераначаваць атрад бойскаўтаў, а яны раніцой вымыліся ў камязе, дзе ён трымаў ваду для коняй, пахучым мылам, дык яму ня было чым паіць коняй. А ваду там прывозяць здалёк, з ракі... Дык ён да таго раззлаваўся, што ледзь не ўтапіў аднаго з гэтых хлопчыкаў у камязе, а другога стукнуў капчонай кілбасой па галаве і выбіў яму вока, за што і адседзіў свой тэрмін потым у турме. А ў Касьцельцы жыў адзін лясьнік, які зарабляў вялікія грошы на вішнях; і вось, калі ён ладзіўся з жонкай ісьці на нейкую вечарыну з танцамі, яму давялося купіць трыццаць восем кавалкаў пахучага мыла, пакуль яму ўдалося знайсьці такое, якое хацела яго жонка.

— А кілбаса, якой гаспадар пакалечыў скаўта, была вэнгерская, ці праская?—спытаў нібы мімаходам капрал. А потым, не чакаючы адказу, дадаў:—Кавалак вэнгерскай мне-б лепш падабалася, але, між іншым, не пашкодзіла-б і праская.

І ён з большай сілай уціснуў кулакі сабе ў жывот.

Колёна ўсё больш расцягвалася і пашыралася. Палонныя садзіліся, або клаліся на хвілінку, станавіліся на калені, выпроствалі ногі. Апошнія шэрагі так адсталі, што канца колёны ня было відаць і спаўдня некаторыя пачалі валіцца ад зморы.

Фэльдфэбэль, начальнік транспарту, уладаў у адчай, як бачыў, што нават і біцьцё не дапамагае; нарэшце ён паказаў на лагорак, заліты сонцам, якое вызірнула з-за хмар і нездаволена загадаў:

— Гані іх туды, хай высьпяцца і перадыхнуць. Ліха ведае, што хоча з імі зрабіць начальства! Паздыхаюць яны ў мяне ўсе з голаду.

Аўстрыйцы покатам паляглі на схіле і адразу заснулі, тым часам, як расійскія салдаты, абапёршыся на вінтоўкі, стаялі навакол, нібы аўчаркі пры статку, і ўголас шкадавалі іх.

— Усё гэта вайна нарабіла. Бачыш, небаракі, вайна зморыць іх голадам да сьмерці. Бяда нашаму брату ў гэтай вайне, ой, бяда! Ці нашы расійцы, ці аўстрыякі, ці немцы,—усёроўна, усе здохнуць, як сабакі.

Але потым салдаты ўсё-ж схадзілі ў вёску, прынесьлі адтуль крыху хлеба і колькі белых булак, якія яны пачалі прадаваць, усяго толькі на які-небудзь пярсьцёнак або гадзіньнік.

Капрал, што ішоў са Швэйкам, у душы вёў сам з сабой цяжкае змаганьне, калі расійскі салдат запрапанаваў яму палавіну булкі хлеба і паказаў у гэты час на яго руку; потым ён раптам адважыўся, зьдзеў з пальца залаты шлюбны пярсьцёнак і, аддаючы яго салдату за хлеб, прабурчэў сабе ў апраўданьне:

— Даруй мне, Ліза, я не вінаваты. Нельга дзеля сьвятасьці шлюбу памерці з голаду!

Выспаўшыся, Швэйк пачаў біць вошай. Гэта было ня цяжка, бо сонца прымусіла іх усіх павылазіць наверх.

Яны поўзалі ў яго па плячох, па рукавох, вылазілі з кішэняў, валіліся з шапкі на калены... У адну хвіліну яго рукі пачырванелі ад пралітай крыві. Гэта была ўдзячная праца, і яна знайшла безьліч пасьлядоўцаў. Хто праспаўся, зьдзяваў кашулю, выварочваў куртку і трушчыў шэрую нечысьць паміж нагцей. Карціна была такая, нібы на схіле, паміж скал, сядзела чарада павіянаў.

Пад вечар па дарозе праяжджаў аўтомобіль з афіцэрамі. Калі яны ўбачылі гэтую компанію на схіле, яны загадалі спыніць машыну і выклікаць начальніка транспорту. Прыбег фэльдфэбэль. З аўтомобілю выйшаў генэрал.

— Куды іх вядзеш?

— Загадалі даставіць іх этапам у Палоннае, ваша правасхадзіцельства. Але толькі яны туды не дапнуць, бо двое сутак нічога ня елі,—адказаў фэльдфэбэль, калоцячыся ад страху.

— Ты з Заслаўя?—спытаў генэрал.—Чаму ім у вас ня выдалі хлеба?

— Нічога ня ведаю, ваша правасхадзіцельства. Да нас іх прывялі з Шумску. Там іх таксама не кармілі.

— А далёка яшчэ да Палоннага?—зьвярнуўся генэрал да свайго ад'ютанта.

— Дваццаць шэсьць вёрст,—прыклаўшы руку да казырка, адказаў ад'ютант.

Генэрал спахмурнеў, з хвіліну падумаў, а потым загадаў фэльдфэбэлю:

— Завядзі іх у бліжэйшую вёску, хай яны там высьпяцца і набудуць у мясцовага насельніцтва чаго-небудзь з ежы. А вось гэта перадасі заўтра этапнаму комэнданту ў Палонным.

Ад'ютант напісаў пісульку, генэрал падпісаў яе, аддаў фэльдфэбэлю, і аўтомобіль памчаўся далей. А Швэйк, зразумеўшы, што генэралу не ўпадабалася чарада, падышоў да фэльдфэбэля і, выструніўшыся, сказаў:

— Так, што, дазвольце далажыць,—гэта адважны генэрал. Гэта, мабыць, такі, які ў нас быў Радэецкі. Ён быў фэльдмаршал, але, паміж іншым, вельмі шляхетны чалавек.

І акурат у тэтую хвіліну, калі Швэйк выказаў сваё ўражаньне, генэрал гаварыў свайму ад'ютанту:

— Чорт ведае, што ў нас за парадкі! Кожны этапны комэндант падае інтэнданту страшэнна вялікія рахункі за харчаваньне палонных, а палонныя з голаду ня могуць ісьці да наступнага этапнага пункту. Мы выдалі для іх манifэст, яны добраахвотна здаюцца ў палон, а ў нас іх абкрадаюць. Увогуле, гэта нешта немажлівае!

— Так точна, ваша правасхадзіцельства,—абазваўся ад'ютант.

Палонныя, якіх падганялі салдаты, увайшлі ў вёску. Але тут выявілася, што ўсе запасы ў ёй былі да апошняй скарынкі зьедзены расійскімі салдатамі, якія праходзілі на фронт. Таксама і цярплівасьць насельніцтва была даўно вычарпана праходзіўшымі тут кожны дзень транспартамі палонных. Мужчыны і ка-

беты злосна і варожа глядзелі на шэра-блакітныя плямы, якія падыходзілі ў змроку да іхніх клецяй.

Усе пахаваліся. Кабета, у якой Швэйк хацеў выпрасіць некалькі бульбін, злосна сказала:

— Няма нічога, нічога ў мяне няма.

Бразнуўшы дзьвярыма, яна схавалася ў цёмнай хаце. Швэйк застаўся адзін каля клеці. Ён сеў на калодку, прабуючы раза-брацца ў пачуцьці голаду, які сьціскаў яго нібы абцугамі, але ня здолеў адшукаць належнага слоўнага выказьніка. У яго ў жываце нешта сьвідравала, бурчэла, булькала, рычэла, смор-гала і сіпела, і Швэйк знайшоў для ўсяго гэтага толькі такія словы:

— Ні к чорту варта, калі адчуваеш сябе гэткім галодным. Такіх лёгкіх сноў, якія я ўбачу сёньня, я даўно ўжо ня сьніў.

У вечаровай цішы рыпнулі дзьверы хаты. Швэйк прыслухаўся і ад цікавасьці міжвольна напяў вушы.

З хаты выйшла тая самая баба з вялікім чыгуном у руках. Яна адлівала з яго нечага ў карыта перад сьвінушнікам, што знаходзіўся насупроць клеці, адчыніла дзьверцы, з-за якіх вылезла вялічэзная сьвіньня, і зноў пайшла ў хату.

З карыта на Швэйка папіхнула пахам паранай бульбы. Ён устаў, з хвіліну вагаўся, але потым стаў ракам і асьцярожна папоўз да сьвіньні, якая, з асалодай цьмякаючы, глыбока засунула лыч у карыта.

Швэйк прыцягнуў руку і зачэрпнуў з карыта. Сьвіньня рухнула, хацела ўкусіць яго за руку, але ён ураз адхапіў яе. Яму папалася некалькі фасолін і адна бульбіна. Ён прагна хапіў іх у рот, зноў палез рукой у карыта і сулакойліва зашаптаў сьвіньні, калі тая зноў паспрабавала яго ўкусіць:

— Ну, ну, ня трэба, ня трэба. Ты-ж сьвіньня, і не павінна быць такая зайздросная ды прагавітая, як чалавек. Не захочаш-жа ты, каб палонны аўстрыйскі салдат памёр з голаду? Цябе, вядома, заколюць, як выкармяць, але да таго часу табе будзе жыць вельмі добра. А нас вось забіваюць і галодных, і нас ня кормяць, дык ад нашай сьмерці мусіць быць нейкая іншая карысьць.

Сьвіньня супакоілася і ела далей, не зважаючы на Швэйка. Швэйк стаў перад карытам на калені і, абняўшы сьвіньню за

шыю ды казытаючы яе пад барадой, пачаў хапаць сваю здабычу ў рот і ў шапку, прыгаворваючы:

— Вось, паглядзі: фасоль, бульба і нават крышачку малака. Эх, як добра табе жывецца, любая. Ты зразумееш, што азначае дрэннае жыцьцё толькі тады, калі ў вас, у сьвіней, пачнуцца весьці войны і ваш кароль, які небудзь тоўсты парсюк, пашле вас у бойку. Ну, але гэта яшчэ ня так хутка будзе, каб сьвіньні аднэй вёскі былі такія дурныя і пайшлі вайной на сьвіней другой вёскі. Бо ў сьвіньні няма сваёй айчыны, а таму ёй і ня трэба абараняць яе, калі над ёй зьвісаюць грозныя хмары.

Сьвіньня рохнула, нібы ў знак згоды і адышлася ад карыта. Швэйк выбраў рэштку ў манерку, рэдкае выпіў, пераклаў усё ў шапку, у хлебную торбу, і зноў пачаўшы казытаць сьвіньню, ласкава прашаптаў:

— Ты з вялікім разуменьнем і ведаеш, што як трэба. Я быў-бы вельмі рад, каб ты запрасіла мяне на сьнеданьне. Ну, вялікі табе дзякуй, сястрыца-сьвіньня.

Сьвіньня яшчэ раз рохнула і пайшла ў свой сьвінушнік. Швэйк сама што ладзіўся зноў сесьці на калодку, аж баба вышла з хаты і, пагледзеўшы ў карыта, радасна паклікала:

— Сьцяпан Іванавіч, зірні ты, сьвіньня наша ўжо здаровая! Усё карыта вычысьціла. Зірні, як вымытае.

З дзьвярэй павольна выйшаў стары селянін і ўважліва аглядзеў карыта. Потым ён палез да сьвіньні ў хлеў і чуваць было, як ён гаварыў:

— Дзякуй богу, ужо есьць! Жара ў яе мінулася! Нават вушы ў яе не такія гарачыя, як учора!

Баба перахрысьцілася, адбіла паклон нечаму небачанаму і ўздыхнула:

— Дзякуй табе, божачка, дзякуй табе!

Яны зачынілі сьвіньню ў хлеве і пайшлі спаць. У клеці на рэштках саломы, у якой кішэлі вошы, паслаў сабе пасьцель удалы ваяка Швэйк; ён паслаў пад ніз куртку і падсунуў пад галаву ранец, кажучы сабе пад нос:

— Ну, вось, якое здавальненьне я ім даў і якую радасьць богу! Людзі хваляць яго нават тады, калі ў іх сьвіньня зноў бярэ есьці. А тым часам гэта я зьеў яе ежу, я, баявы таварыш сьвіньні. Ці мо' сьвіньня—мой баявы таварыш?..

Ён доўга імкнуўся вырашыць гэтае пытаньне, але дарэмна. Не знайшоўшы належнага вырашэньня гэтай проблемы, ён штурхнуў капрала, які хроп і соп побач з ім:

— Слухай, што раней было: яйцо, ці курыца?

— Хррр,—плыло з барады соннага, і Швэйк, ня ўбачыўшы ў гэтым належнага адказу, павярнуўся на бок і заснуў. Яму прысьнілася, што ён на нейкім банкеце, на якім былі прысутныя адны толькі чыста вымытыя сьвіньні, у фраках, крухмальных кашулях і ордэнах, і што самая вялікая сьвіньня агаласіла тост у гонар ўсіх монархаў, якія ваююць, і сказала, што весьці вайну—вялікая заслуга, а потым закончыла:—раней людзі елі нас, а цяпер яны ядуць з намі. Вайна, сябры мае, устанаўляе паміж намі і людзьмі роўнасьць, добрую згоду і братэрства!

Будзіць нікога не давялося, бо голад рана вывеў усіх на сьвежае паветра.

Палонныя павылазілі, як клапы са сваіх шчылін, і разьбягаліся з надзеяй знайсьці хоць што зъесьці па ўсёй вёсцы, нібы тараканы па чыста вымытай падлозе ў кухні.

Да вёскі падыходзіла сажалка. Там яны налавілі жаб; садраўшы з іх скуру і, кідаючы іх у кацялкі з гарачай вадой, пад якімі курыліся агні з сухога трысьця, яны суха заяўлялі:

— Есьці жаб вельмі нават можна. Увесну гэта лічыцца ў нас далікатэсам, які дазваляюць сабе толькі важныя паны, калі ім вельмі ўжо апрыкраюць куры ды гусі.

Іншыя, у якіх жываты і нэрвы больш слабыя і якія не хацелі прымушаць расійскіх буслаў пакутаваць ад недаяданьня з прычыны недахопу жаб, гатавалі ў сваіх кацялкох лісьцё маліны і зялёныя яблыкі. А адзін мадзьяр паспрабаваў нават зварыць патронную сумку, запэўняючы, што яна са сьвіной скуры і што з яе, такім чынам, можна прыгатаваць халадзец.

Іншыя, якія ўжо ня надта гналіся за гарачым сьнеданьнем, зрабіліся вэгетарыянцамі. Яны елі гнілыя сьлівы, жавалі зялёную цыбулю і часнок, які даставалі з-за паркану, зьбіралі шчаўе, расьціралі паміж кален лебяду. Адзін настаўнік заявіў, што крапіва мае асаблівую сытнасьць, а нейкі вольнапісаны дадаў:

— Так, крапіва вельмі добрая рэч, асабліва да цяляціны. Але толькі яе трэба дробна, дробна пасячы. Мая маці заўсёды так рабіла. Эх, сябры, адно ўспомніць, як яна падавала ў нядзелю гэтую страву, ды з маладой бульбай...

Ён разгарнуў цэлы поэтычны і лірычны малюнак гэтай ідыліі цялячай смажанкі са сьвежай крапівай, і пасьля кожнага яго слова ў палонных, якія жвалі лебяду, сьліна цякла па барадзе, пакуль у іх ад вялічэзнага апэтыту не паказаліся бурбалкі на вуснах. Тады адзін палонны ўстаў, падышоў да ўсхваляванага вольнапісанага, і са словамі; «Не, гэтага ня можна вытрываць», кінуў яго ў сажалку. Іншыя зрабілі тое самае з настаўнікам.

Калі на рынычным пляцу зьявіліся кабеты, каб знайсьці ў палонных рэчы, вартыя абмену, палонныя пачалі аддаваць шатры і запасныя зьмены бялізны. Некаторыя зусім змучаныя голадам, прадавалі з сябе кашулі, тут-жа на месцы зьдзяваючы іх і аддаючы кабетам за кавалак хлеба.

А калі і гэтыя кавалкі паелі, а голад усё яшчэ не прагналі, запанаваў прынцып: «згінуў паркан, гінь і ўвесь сад!» І скінуўшы порткі, яны ў адных сподніках сталі перад кабетамі.

— Споднікі, карашо! Купляеш, старая? Даёш хлеба за іх?

І як толькі кабета аддавала за іх лусту хлеба, яны скідалі перад ёй сподніки, а калі баба нездаволена заўважвала, што яны падраныя ў кроку, палонныя падштурхоўвалі адзін аднаго і хітра пасьмейваліся:

— Гэта ты можаш залапіць, а вошы ў іх абвары варам. І так ужо мяне абабрала.

Ахвота таргавацца і прадаваць расла.

Адзін аддаў за булку хлеба шынэль, другі таргаваўся за боты, якія ён толькі вось зьняў, запэўняючы, што ў Расіі, дзе ўсё толькі роўныя мясцовасьці ды пяскі, значна лепш хадзіць босаму. Але перш, чым_управіўся ён старгавацца, зьявіліся расійскія салдаты, якія з крыкам: «Нельга, нельга!» пачалі лупцаваць папружкамі і палонных, і кабет.

З клеці вылез і Швэйк. Ён разагрэў рэшткі сваёй вячэры, сумленна падзяліўся з капралам, які ў сваю чаргу даў яму частку грошай, здабытыя за шлюбны пярсьцёнак, і акурат узыходзіў на пагорак, калі салдаты пачалі зганяць палонных у адну кучу.

— Ну, уперад, уперад, хлопцы! У Палонным будзе вам абед.

І палонныя накіраваліся ў той рай, дзе зацірка азначала вышэйшую асалоду, як гурыя на отоманцы ў магамэтавым раі. А калі вартавыя сказалі, што там, бадай што, дадуць ім мяса,

хлеба, чаю і цукру, найгаладнейшыя пабеглі ўперад, як вярблюды ў Сахары, адчуўшы пасьля доўгага пераходу па бязводнай пустыні, блізкасьць оазісу.

Вартавыя вельмі хутка зразумелі, якая таемная сіла была захована ў гэтых словах, і лячылі імі ўсё. Калі пачалі выяўляцца вынікі ад зьедзеных гнілых сьліў і зялёных яблык, і палонныя, крэкчучы і стогнучы ад шалёнага болю, адставалі абапал дарогі, вартавыя ня білі іх больш папружкамі, а, спыняючыся каля хворага, рабілі ласкавы, спакусны твар і ўрачыста гаварылі:

— Ну, пайшоў, пайшоў! Да Палоннага ўжо недалёка, а там дадуць па тры фунты хлеба і па фунце мяса. Там начальства добрае, нават кашы вам дадуць і нават доктар там ёсьць.

Пад поўдзень яны прыйшлі ў Палоннае, дзе іх чакаў другі канвой. Транспорт падзялілі на некалькі партый і разьвялі па розных садох, дзе стаялі ўжо паходныя кухні.

Нейкі штаб-афіцэр хадзіў ад аднае да другой, назіраючы за раздачай палонным абедаў і хлеба. Пісулька, паданая фэльдфэбелем, зрабіла вялічэзны цуд, і калі Швэйк убачыў, як пад адкрытым брэзэнтам паказаліся цэлыя горы хлеба, а потым пачалі лічыць гэтыя вялічэзныя булкі, ён задаволеным тонам сказаў:

— Добры чалавек, і добрага задаў ім пэнту!..

Потым прыйшоў узводны і разьбіў палонных на групы па дзесяць чалавек. За ім салдат даў аднаму з кожнага дзесятку іржавую брудную манерку і напісаў на сьпінах палонных, якім яна прыпала, крэйдай лічбы 1, 2, 3, 4 і г. д. Ён загадаў ім выступіць уперад, выстраіў іх у рад і запрапанаваў рэшце палонных запомніць, да якога нумару належыць іхны дзесятак, пасьля чаго ён павёў нумараваных да бараку, дзе кашавары мяшалі страву вялічэзнымі чарпакамі ў вялічэзных катлох.

Такім чынам Швэйк, у якога на сьпіне красаваўся нумар тры, прынёс свайму дзесятку поліўку, тым часам, як капрал дзяліў на дзесяць чалавек хлеб і мяса.

Дзесяць чалавек селі вакол манеркі, і ў бліжэйшыя пяць хвілін ня чутна былі нічога іншага, апроч чвяканьня ды стукату лыжак і зубоў. Зацірка была вельмі гарачая, але ніхто не запрапанаваў даць ёй крышку прастыць. Сківіцы працавалі так, быццам людзі ўзяліся за зьдзельную работу.

Зацірка зьнікла бяз сьледу; за ёй пайшло мяса; ад хлеба не засталося ні драбочка. Палонныя млява сядзелі на зямлі, зусім шчасьлівыя, іхныя вочы радасна гарэлі на брудных тварах, яны чакалі, што будзе далей. Сахара, здавалася вярблюдам, была пройдзена ўжо, і яны спадзяваліся цяпер добра адпачыць пад пальмамі. Да палонных падселі расійскія салдаты, што вярталіся пасьля абеду, які ім далі з іншае кухні. У іх у руках былі маленькія бачкі з ежай: яны завялі гутарку з палоннымі і шырока, дурнавата і добрадушна ўхмыляліся, вытрасаючы ежу з сваіх бачкоў у выстаўленыя далоні.

— Еж, еж, на здароўе!

Швэйк таксама пусьціўся ў гутарку з ворагам свайго імпэратара і гаварыў пра тое, ці сьвеціць у Аўстрыі тое самае сонца і якая там зямля.

Яны не разумелі адзін аднаго і былі абодва рады, калі салдат знакамі запрапанаваў Швэйку выставіць руку, перавярнуў бачок угару дном, паляпаў рукой па дне, каб усё адтуль вывалілася, і зьнік.

— Ф'юююю!—сьвіснуў Швэйк, якому гарачы падарунак абпальваў рукі. Ён падзьмуў на іх і пачаў разглядаць тое, што яму далі і што таксама было для яго загадкай.

Маленькія, кругленькія зерняткі сьветлажоўтага колеру ліплі адна да аднаго, а між імі прыгожа выглядала ялавічая скварка.

— Зноў нешта таемнае,—сказаў Швэйк капралу,—чым мы можам атруціцца. Шмат яны не даюць, а тое што яны даюць усё нейкае глупства. Што гэта такое? Кураць яго, ці ядуць, ці спачатку яго трэба зварыць, ці наогул што з ім робяць?

— Езус-Марыя!—узрушана крыкнуў настаўнік, якога раніцой выкупалі ў саджалцы.—Гэтым-жа ў нас кормяць курэй! Слухайце, панове, гэта проса! Гэта, мабыць, ім давалі прасяную кашу на абед.

У суседнім дзесятку, дзе расійцы таксама пачаставалі палонных кашай, нехта раптам стаў крычаць: «Ціп-ціп-ціп-ціп-ціп-ціп», як склікаюць куранят, а Швэйк адказаў гучным «кукарэку».

Вольнапісаны пачаў бегаць вакол з апушчанымі рукамі, удаючы з сябе пеўня, які робіць бессаромныя прапановы маладой курачцы і хоча быць харобрым ды прывабным, як малады паручык пад час балю. І раптам адсюль, дзе на плошчы або ў

руках была прасяная каша, пачуліся крыкі: «Ціп-ціп-ціп» і звонкія сьпевы пеўня.

Вартавыя зьбягаліся і ўжо былі наддалі сабе грознага выгляду, лічачы гэта за зьдзекі з іх: але хутка зразумелі, што палонныя толькі забаўляліся, калі, набраўшы ў рот кашы, звалі: «Ціп-ціп-ціп».

Потым прышоў афіцэр, пагаварыў з унтэр-афіцэрам панямецку, і вартавыя пачалі заганяць палонных у баракі, абвясьціўшы, што можна спакойна адпачываць да раніцы.

Падвечар зноў павялі іх да кухні, і пасьля заціркі кожны атрымаў па тры кавалкі цукру. Швэйк заснуў у гэты дзень з пераканаНьнем, што бог ня будзе яго бязупынна караць за здраду свайму імпэратару, а конаўка рэдкага чаю так яго сагрэла, што ён гледзячы праз напаўзаплюшчаныя павекі ў цемру барака, які гудзеў ад рознагалоснага хропу, быццам лесапільны завод, цішком засьпяваў песьню з прыпевам: «чура, чумчура я», мэлёдыя якой потым раскацілася па ўсёй Расіі.

І канчаючы куплет, ён так дасканала крыкнуў «ку-ку», што настаўнік узьняў галаву і са сну прамармытаў:

— Марыська, пацалуй мяне яшчэ разок і загадай зязюлі, праз колькі год мы пажэнімся і колькі ў нас будзе дзяцей. Я-ж цябе так кахаю, Марыська, так кахаю і не прасіў-бы ў цябе вяночка, калі-б не кахаў цябе так шчыра...

Але тут капрал, якому ўвесь дзень дакучалі газы ў жываце, перарваў яго пяшчотныя словы страшэнным трэскам, быццам ударыў пярун.

А Швэйк, усхвалёваны новымі ўражаньнямі, яшчэ раз устаў і сказаў замілавана, пяшчотна і мякка:

— Панове, заткнецеся абодва, я спаць хочу!

*

Этапны пункт у Палонным надоўга застаўся ў памяці ў Швэйка—ён любіў апавядаць пра новыя вынаходзтвы, якія ён там зрабіў, і як яму там жылося.

— Вы сабе падумайце, браточкі,—апавядаў ён,—што іду я раніцой зноў па зацірку. Ну, мы яе зьелі, а дзеля таго, што нам яшчэ хацелася есьці, я пайшоў па другую порцыю, але кашавар пазнаў мяне і гоніць прэч. А калі я не захацеў адыйсьці,

ён—хлоп!—апалонікам мяне па галаве. Тут акурат праходзіў побач адзін расійскі фэльдфэбэль, такі барадаты, у акулярах і кажа: «Дай яму, ён з нашых, з праваслаўных». Гэта я добра зразумеў, браточкі, бачыце, як я разумею ўжо расійскую мову. Кашавар мне наліў другую порцыю, ды яшчэ даў у прыдачу кавалак мяса. Тады я пайшоў да другога катла, дзе раздавалі кашу расійскім салдатам, выставіў манерку ды кажу кашавару: «Дай, браток, я з вашых, праваслаўных». Ну, ён зараз-жа зьняў салпокрыўку і даў мне поўную манерку кашы. Іду далей да салдатаў, паказваю на хлеб і кажу: «Я праваслаўны». Яны мне набілі ўсе кішэні хлебам. А потым бачу я—стаіць там такі маладзенькі салдацік і дае ўсім па цыгарцы. Я прашыўся праз натоўп да яго і кажу: «Дай мне цыгарку, я праваслаўны». Ён на мяне паглядзеў, скрывіў рот і кажа: «Ня дуры галавы і ня чмуці—на гэта ты з морды не падыходзіш. Як ты можаш быць праваслаўным, калі ты з Вршовіц?»

— Браточкі,—казаў далей Швэйк,—гэты раійскі салдат гаворыць на такой чыстай расійскай мове, што я зразумеў кожнае яго слова, а ён маё. Я яму кажу: «Я зусім ня з Вршовіц, я толькі з Прагі», а ён мне ў адказ: «Нў, а ў час мобілізацыі ты-ж быў на стралецкай высьпе, дурная твая галава?» Трэба ведаць, братцы, што расійская мова, калі на ёй гаворыць інтэлігентны чалавек, такая чыстая мова, што я адразу ўспомніў пана Клафача, які гаварыў у парляманце, што кожны чэскі інтэлігент можа лёгка размаўляць з расійскім інтэлігентам. І вось у іх аказалася такая інформацыя пра нас, што ён нават ведаў, у якой піўной ёсьць Папавіцкае піва, а ў якой Сьміхоўскае. Нарэшце ён даў мне дзьве цыгаркі і кажа: «На табе, найміт Вены, Бэрліну і Рыму!» А я протэстую: «Які такі я найміт?—Я ваяка майго старога монарха і буду ваяваць за яго, пакуль мяне не разарвуць на кавалкі!» Тады ён зноў засьмяяўся. Ды ты, кажа, здаецца, зусім ідыёт. У цябе часамі ці не казённы бот заместа галавы? Толькі ты тут, даражэнькі, ня вельмі фанабэрся, бо ўраз па мордзе сабе зловіш, не на таго натрапіў. Зараз ты, брат, у Расіі ўсе свае гэтыя жарты кінь». І зноў ён усё гэта так выразна сказаў, нібы па-чэску. Вось да чаго падобна расійская мова на чэскую, калі ён гэтай мовай добра гаворыць. Бо сказаў-жа ён мне нават, што я па мордзе сабе злаўлю. Мне самому гэта здалося ня звыклым, але мовы бываюць такія па-

добныя, і іх так лёгка зблытаць, што іншы раз яно гучыць нібы гэта іншая мова... Вось я і кажу таму салдату, што мы, мабыць, знаёмы і што мы, мабыць, спатыкаліся на сакольскім зьлёце, калі туды прыяжджала расійская дэлегацыя. Але ён зноў сьмяецца: «Ды зусім ня так, асёл ты, больш нічога. У Празе мы наогул не маглі спатыкацца, калі ты хадзіў з Вышаграду праз чыгуначны мост у Сьміхаў, а я ў гэты час хадзіў з Малога боку праз Карлаў мост у Прагу». І сьмяецца з майго зьдзіўленьня, што ён так многа ведае, хоць і расійскі салдат. І іншыя салдаты таксама глядзяць на яго, вылупіўшы вочы, а ён усё зьдзекуецца з мяне. Зрэшты ўзяў ён два пачкі махоркі ў рукі і кажа: «Наймiт Вены, Бэрліну, прызнайся, што Франц і Вільгэльм—падлюгі і нягоднікі. Прызнайся, што за Гуса, за Белую Гару, за Каменскага, Крамаржа, Махара і іншых пакутнікаў яны заслужылі пятлю на шыю. Прысягай, што ты адпомсьціш за іхную кроў!» Што мне выпадала рабіць, калі ў мяне ня было табакі. Ну, я і сказаў, што так,—яны падлюгі і нягоднікі і прысягнуў, што буду помсьціць ім да дзесятага калена. І ён даў мне табакі. Потым я ў Кіеве даведаўся, што гэта зусім ня быў расійскі салдат. Гэта быў нейкі Антон Навак з Бжэўнава, які застрэліў на фронце свайго ротнага камандзіра, калі той хацеў зьбіць яго за тое, што ён сьцягнуў бляшанку консэрваў, і перабег да непрыяцеля, забыўшыся на сьвятую прысягу, на вернасьць свайму старому імпэратару...

У Швэйка было шмат падстаў успомніць добрым словам Палоннае, таму што тутэйшы комэндант, які, як відаць, ня краў і лічыў палонных за людзей, даў ім хоць адзін дзень пражыць жыцьцём багатых. Пасьля Палоннага зноў пачаліся пакуты.

Паводле вышэйшага загаду транспорт павінен быў ісьці да Кіеву пехатой. Расійская армія ўсюды адкочвалася назад, таму што ёй не хапала сілы дзе-небудзь затрымацца і не хапала цягнікоў вывезьці ўсіх параненых і агнястрэльныя запасы, каб яны ня трапілі ў варожыя рукі.

За трохдзенны пераход, які цягнуўся ад раньня да позьняй ночы, палонныя атрымалі толькі па кавалку хлеба. На чацьвертыя суткі на этапны пункт прыбылі паходныя кухні, якія былі тут-жа на месцы зруйнаваны мадзьярамі, румынамі і басьнякамі.

Удары прыкладамі не маглі іх устрымаць. У адну хвіліну кухні былі перакінуты дагары нагамі. Пад імі стагналі апара-

ныя і раздушаныя, а на кухнях і каля іх біліся іншыя палонныя і рвалі адзін аднаму валасы і бароды, драпалі твары, білі кацялкамі па галовах...

З чвэртку гадзіны жменька вартавых дарэмна спрабавала устанавіць парадак і спыніць бойку. Усе спробы разьвесьці байцоў былі марныя. Тады паклікалі казакоў. Яны на конях урэзаліся ў натоўп і разагналі яго бізунамі. Ім, відаць, было прыемна гнацца за асобнымі людзьмі і зьбіваць іх...

Пад вечар гэтага дня прыйшлі ў пакінутую ўбогую вёску. Вартавыя распусьцілі палонных па хатах і пунях, не клапоцячыся аб тым, каб іх вартаваць.

Швэйк з капралам, настаўнікам і вольнапісаным увайшоў у пуню, якая тулілася каля маленькай нізенькай хаткі. З іншых палонных ніхто не пайшоў за імі, бо думалі, што ў вялікіх хатах хутчэй можна знайсьці бульбы.

Яны скінулі ў кут пуні ранцы і выйшлі крыху агледзецца. Хата была замкнута—хлеў пусты. У хлеве настаўнік знайшоў дзьве бручкі. Вольнапісаны ўнёс на агульную справу два кубкі сухога бульёну «Маггі», а Швэйк даў свае запалкі і набраў дроў. Разрэзаўшы бручку на кавалкі, яны зварылі на вячэру ў двох кацялкох бульён, які Швэйк заправіў яшчэ жменькай аўса і пятрушкай.

Яны зьелі бульён і пайшлі ў пуню спаць, сабраўшы ў адзін куток раскіданыя там гарохавіны, у якіх вольнапісаны знашоў некалькі стручкоў.

— Слухайце,—сказаў ён таварышом,—гэтыя гарохавіны, як відаць, не абмалочаны. Каб было ў нас сьвятло, можна было-б знайсьці ў іх яшчэ стручкоў і зварыць іх. Так есьці іх нельга, яны занадта сухія.

На зубох у яго хрушчэла, нібы мыш грызла пад падлогай.

— Чаму-ж не!—уздыхнуў настаўнік.—Добры можа быць крупнік. Але яшчэ лепш гарох са скваркамі, або з вэнджанай грудзінкай.

Гарохавіны шамацелі пад рукамі ў настаўніка, які шукаў у іх стручкоў. Швэйк заўважыў:

— Так, было-б ня дрэнна. Хоць мне ад гароху пучыць мой жывот, ён яго не п獲ратраўляе, як...

Але тут Швэйк раптам змоўк і напружана пацягнуў носам паветра, а потым дадаў...

— Мне так хочацца зьесьці вэнджанай грудзінкі з гарохам, што ў мяне, таварышы, нават галюцынацыя робіцца—адчуваю, што тут пахне вэнджаным.

Вольнапісаны ўздыхнуў, а настаўнік пачаў гаварыць аб маненачуцьцяў, з прычыны саманамовы і аб самаўзьнікненьні мінпачуцьцяў, з прычыны саманамовы і аб самаўзьнікненьні міражоў ды няпраўдзівых уражаньняў пад уплывам моцнага жаданьня. Швэйк лёг на зямлю, і чутна было, як ён соп і са сьвістам уцягваў носам паветра. Абнюхаўшы сьцяну за сабой, ён раптам рашуча заявіў:

— Браточкі, ніякіх у мяне няма галюцынацый, ніякага падману пачуцьцяў у выніку саманамовы. Анутку, панюхайце самі. За гэтай сьцяной ёсьць нешта вэнджанае.

Абодвы яго таварышы падыйшлі і ўткнуліся насамі ў шчыліну, нюхаючы, як добрыя паляўнічыя сабакі. Нарэшце вольнапісаны ўпэўнена крыкнуў:

— Дальбог, там вэнджанае! Мабыць, грудзінка або вянгліна.

Настаўнік так глыбока ўсунуў нос у шчыліну, што нават застраміў яго. Калоцячыся ўсім целам ад хваляваньня, ён з тугой уздыхнуў:

— Вось, каб цяпер мышкай ды дабрацца да яе! Або лепш праменем месяца, які лунае ў вакне...

— Нават ня трэба быць лунатыкам,—папраавіў яго Швэйк,—а добры чалавек дабярэцца туды і ня мышаю.

— Але калі-б не існавала фізычных законаў!—пакрыўджана абазваўся настаўнік.—Хіба вы ня ведаеце аб непраразнасьці цьвёрдых цел?

— Ня ведаю,—самаздаволена адказаў Швэйк.—Такія глупствы мяне ніколі ня цікавілі. Але я ведаю, што тут побач вісіць нешта вэнджанае і што трэба прымудравацць або прыдумаць такі фізычны закон, каб яно трапіла да нас або мы да яго.

— Дык нават, каб ня было непралазнасьці сьцяны, якая адгароджвае нас ад гэтай прынады, усё-ж яе вартуюць ад нашых замахаў закон і права ўласнасьці,—зазначыў вольнапісаны.—Я студэнт—юрыст 3-га курсу і добра ведаю, што трэба паважаць чужую маемасьць: аб яе недатыкальнасьці гаворыць нават рымскае права. Вам вядомы артыкул 171 крымінальнага

кодэксу аб крадзежы? А артыкул 173 таго-ж самага кодэксу аб крадзежы з узломам? За іх даецца ад 6 месяцаў да 20 гадоў пазбаўленьня волі.

— Не, я і гэтага глупства ня ведаю,—таксама бязьвінна адказаў Швэйк.—Я адно ведаю, што мне страшэнна хочацца есьці і што там за сьцяной ёсьць смачная яда.

Настаўнік выцягнуў трэцюю стрэмку з носу і з глыбокім уздыхам, які вырваўся з глыбіні душы, кінуўся на сваю саламяную пасьцелю. Вольнапісаны растлумачыў Швэйку яшчэ ці мала праўных паняцьцяў ды законаў сярэднявечча і найшоўшага часу, а затым па прыкладзе настаўніка скончыў сваю лекцыю словамі:

— На праве ўласнасьці трымаецца ўсё чалавечае грамадзтва: яно ёсьць аснова чалавечай культуры і добрабыту.

Швэйк маўчаў, адданы сваім уласным развашаньням, а вольнапісаны быў рад, што знайшоў чалавека, якога мог ашчасьлівіць сваімі ведамі, і хутка заснуў, сплятаючы свой хропат з сапеньнем настаўніка ў сымфонію больш няпрыемных, чым пяшчотных гукаў.

Тады Швэйк заварушыўся. Адсунуўшы ў бок салому, ціханька вылез і падыйшоў да хаты. Яна была замкнута: замок, які вісеў на ёй, паказваў, што яе гаспадары не варочаліся. Швэйк так-жа ціха вярнуўся ў пуню, стаў каля сьцяны і на карачкі, выняў з кішэні нож і некалькі разоў капануў ім гліняную падлогу, адкідаючы гліну рукамі, каб залезьці пад сьцяну. Ён зрабіў гэта некалькі разоў, а пасьля прасунуў правую руку ў дзірку—рука вольна выйшла на другі бок. У хаце, таксама як і ў пуні, была не дашчаная падлога, а гліняная.

Пасьля такой вынаходкі Швэйк шчыра ўзяўся капаць: пот ручаямі плыў з яго. Праз гадзіну ён ужо здолеў прасунуць у дзірку галаву, а яшчэ праз гадзіну ён і ўвесь пралез туды і апынуўся ў хаце.

Разам з ім праскочыў туды і промень месяца, апоэтызаваны настаўнікам, і асьвятліў цёмнае памяшканьне з усімі скарбамі, якія знаходзіліся там.

Іх было ня лішне ўжо многа: тры булкі хлеба, мяшок мукі, кавалак сала, дзьве вараныя кілбасы і вясла вэнджаных кілбас.

Швэйк, доўга ня думаючы, узяўся ўкладваць усё гэта ў ранец. У кутку ён знайшоў яшчэ два кавалкі масла і гаршчок кашы.

Але ён узяў толькі адзін кавалак, а потым дастаў са свайго мяшка і паклаў на старое месца дзьве булкі хлеба і дзьве кілбасы, мармычучы сабе пад нос:

— Трэба-ж ім што-небудзь зьесьці, як яны вернуцца.

Ён прашыўся назад праз дзірку ў пуню, перацягнуў туды сваю здабычу і стаў замазваць дзірку глінай і затоптваць яе.

Скончыўшы гэту работу, ён адрэзаў сабе вялікі кавалак хлеба, намазаў яго маслам і ўзяўся за яду, успамінаючы словы са зборніку «Народная мудрасьць» Яблонскага, што смачней ўсяго тое зерне, якое ачысьціў сам.

Раніцой, пакуль таварышы яшчэ спалі, ён пакроіў хлеб, кілбасу і сала на кавалкі, захінуў іх у разутыя з ног анучкі і паклаў ўсё, апроч дзеннай порцыі, у ранец. Кавалак хлеба з маслам ён паклаў у хлебную торбачку.

І толькі ўзыўшло сонца, палонных пагналі далей, абяцаючы ім полудзень на наступным этапным пункце, куды яны павінны былі прыйсьці пад вечар. Голад ня меншаў, а наадварот, як людзі былі ўжо воддаль ад фронту і выклікаваны боямі прыгнечаны стан духу мінуў, рабіўся ўсё вастрэйшы і вастрэйшы. Усе глядзелі адзін на аднаго, як зьверы.

Удзень зрабілі прыпынак на лузе і вольнапісаны разявіў рот ад зьдзіўленьня, калі Швэйк разьвязаў торбу, дастаў адтуль кавалак хлеба з маслам, паклаў яго сабе на калені, пакроіў больш дробна і, прыкусваючы сала, лёгка ўздыхнуўшы, сказаў:

— На хлебе з салам трымаецца ўсё чалавецкае грамадзтва; ён ёсьць аснова ўсёй чалавецкай культуры і дабрабыту.

У вольнапісанага сьлёзы набеглі на вочы, а настаўнік пачаў гучна смэркацца. Тады ў Швэйка загаварыла яго добрае сэрца: ён даў кожнаму па кавалку і зазначыў:

— Вось бачыце, на ліха вам уся ваша адукаванасьць, калі вы баіцеся ўкрасьці і стаць такім чынам на незаконны і цярністы шлях грэху! Так, так, дык калі-б я быў адукаваны, яшчэ з мяне ня гэта-б выйшла!

На этапны пункт яны прыйшлі позна ўвечары, і абед прышлося адкласьці да заўтрага. Швэйк і яго спадарожнікі апынуліся адны ў напоўразбуранай пуні. Раніцой Швэйк прачнуўся першым і схапіўся за торбу, якая ўсю ноч пралежыла ў яго на жываце.

Торба была парожняя, хоць рамяні былі нечапаныя: але ў дне торбы зіяла вялічэзная дзірка, прарэзаная войстрым нажом, якая дазваляла здагадацца, якім чынам зьнікла сала і хлеб. Швэйк паглядзеў на сваіх суседзяў: у вольнапісанага барада блішчэла, як наглянцаваная, а ў настаўніка кавалачак сала застаўся на барадзе. Але яны спалі шчасьлівыя, бязрупатныя, пад сваім пластом бруду, спалі бязьвінным сном дзяцей, і нічога не паказвала на тое, што іх дакарала сумленьне.

Тады Швэйк выйшаў з пуні, склаў рукі, узьняў іх да блакітнага неба і зашаптаў:

— Госпадзі, даруй ім, бо яны ня ведаюць, што робяць і не здагадваюцца, што ў ранцы ёсьць яшчэ. Прасьвятлі іхныя душы, каб настаўнік на чым-небудзь іншым, а не на маёй торбе, забываўся на закон аб непралазнасьці цьвёрдых цел, а вольнапісанаму дай разумець, што людзі крадуць нават тады, калі прайшлі поўны ўнівэрсытэцкі курс рымскага і аўстрыйскага права. Бо ўсе людзі—злодзеі і ня крадуць толькі тады, калі гэта ім здаецца малаважным. А адукацыя—гэта знадворны бляск, ляк, якім пакрыты ўсе гэтыя паны, і пад ім бываюць такія-ж нявартыя людзі, як я, твой горшы раб!

Швэйк і сам быў зьдзіўлены тэй пакорлівасьці і набожнасьці гэтай малітвы, перад якой самае неба не магло ўстояць: і калі ў пуні пачулася шурханьне, ён пасьпяшаўся вярнуцца туды. Ад дзьвярэй адскочыў настаўнік, які стаяў на варце, а ад ранца вольнапісаны, які абмацваў яго з усіх бакоў і спрабаваў, як відаць, адшпіліць рамяні. Швэйк падышоў да прававеда, даў яму поўху і навучальна сказаў:

— Фізычныя законы і ўсе артыкулы закону—для добрага салдата на вайне ня існуюць. Гэта вайна вядзецца ў абарону культуры, а таму рабуй дзе толькі можна. Рабаўніцтва ніколі ня спыніцца і заўсёды будзе існаваць побач са злачынствам! Але толькі мой ранец пакіньце!

Пры гэтых словах настаўнік перахрысьціўся, паклаў у рот крошку сала, якая засталася ў барадзе, і ўзрушаным голасам праказаў:

— Амінь!

Праз нейкі час яны сядзелі на куртачках перад кіслай калустай і рвалі зубамі кавалкі чэрствага цьвілага хлеба, а яшчэ

праз тадзіну яны ішлі далей, ішлі ў глыбіню Расіі, якая слалася перад імі сваімі бясконцымі палямі жыта і пшаніцы ды зялёнымі лугамі, бярозавымі гаямі, статкамі і вёскамі, блізка ад якіх кружылася вялічэзнае крыльле ветракоў.

Канвойныя сказалі палонным, што ўдзень яны прыдуць у вялікую вёску, дзе іх накормяць і дадуць ім адпачыць да раніцы. Зморaныя людзі падбадзёрыліся і засігалі шпарчэй.

А ў хвасьце палонных плёўся наш удалы ваяка Швэйк насустрэч невядомаму лёсу, і шчырая даверлівасьць сьвіцілася з яго вачэй. Ён ішоў папіраючыся жардзінкай, якую выцягнуў з гароду, і калі аддаль паказаліся дзьве залочаныя макоўкі над зялёнай страхой і канвойныя знакамі пачалі тлумачыць, што гэта і ёсьць этапны пункт, Швэйк апынуўся зусім адзін, таму што ён быў падсілкаваўшыся і не сьпяшаўся да кухні. Ледзь перасоўваючы ногі ў гарачым ад сонца пяску, ён з асалодай удыхаў водар сьвежага сена, які ўзьнімаўся над стэпам. Потым ён скінуў вошы, якія шпацыравалі па рукаве яго курткі і зацягнуў песьню:

Цар паклікаў нас да бою—
Сваю ўзброеную раць.
Верныя сыны, ідзеце
Трон жыцьцём абараняць!

Пойдзе з ворагам у бойку
Слаўны наш аўстрыйскі шлем.
Мы за Аўстрыі адзінства
Хоць ня хочам—кроў пральлем.

У старэнькай калі маці
На вайсковай службе сын,
Хай яна глядзіць, як сонца
Гляне раніцой праз тын.

Раніцой пунсова сонца,
Значыць сын паранен твой.
Ён ляжыць на полі бойкі,—
З сэрца льлецца кроў ракой.

Тата, мама, дарагія,
Калі-б бачыць вы маглі
Як ваш сын крывёю сьцякае—
Вы-б памерлі ад тугі.

Словы гэтай песьні цягнуліся бясконца і былі такія бязглуздыя і патрыётычныя, быццам іх напісаў вядомы аўстрафіл, па-

тэр Люцінаў-Дасталь. Таму ня дзіўна, што яны падабаліся Швэйку, тым больш, што ягоны густ падзяляла і Чэская акадэмія, якая выдала прэмію за гэткае глупства.

*

Палонныя зрабілі ўжо чатыры поўных дзённых пераходы і праходзілі зараз па вёсках, дзе больш ня было расійскіх салдатаў і этапных комэндантаў.

Ад гэтага ім было ня горш, а яшчэ нават лепш. Вёскі былі заможныя, яшчэ амаль нічога ня ведалі пра вайну, войска і палонных яшчэ ня бачылі і таму спатыкалі транспарт з вельмі вялікай цікавасьцю. Сяляне шкадавалі палонных і частавалі іх табакай і махоркай; жанчыны плакалі, гледзячы на іхныя пакуты, раздавалі ім хлеб, варылі на вячэру бульбу і прыносілі яе палонным у пуні.

Праз жорсткасьць вайны зноў прасачылася людзкасьць. Вартавыя больш нікога ня гналі ўперад і калі які-небудзь палонны хворы або з параненымі нагамі адставаў ад партыі і які-небудзь селянін, праяжджаючы на калёсах, зварочваў увагу варты, што ззаду нехта сабраўся ўцячы,—начальнік вартавой каманды толькі махаў рукой:

— Хай сабе ідзе. Да Аўстрыі цяпер далёка.

Калі транспарт прыходзіў у вёску яшчэ да зьмярканьня, яго зараз-жа абступалі мужчыны, маладзіцы, падлеткі і дзеці і пачыналі гутарку. Яны пыталіся, ці ёсьць у нас такое самае сонца, зямля, дрэвы і вада, і што сеюць у Аўстрыі. Пачуўшы, што ў нас растуць таполі, вішні, вербы ды ігрушы, што ўлетку грэе гэтае-ж самае сонца і палівае дождж, а ўзімку ідзе сьнег, што ўдзень у нас відна, а ўначы цёмна, улетку цёпла, узімку халодна, яны ветла ўсьміхаліся і здаволеным тонам гаварылі:

— Усё як у нас, усё адзін белы сьвет.

Дзяўчаты прыносілі ў конаўках малако і прасілі палонных што-небудзь прасьпяваць. Стараватыя бабы пыталіся: як у нас абыходзяцца з палоннымі і чаму ў нас адразаюць ім вушы і насы, і выкалваюць вочы; і ня было вёскі, адкуль адзін або некалькі чалавек ня трапіла ў нямецкі ці аўстрыйскі палон.

Фантазіі Швэйка адкрылася шырокае поле. Ён па-дзівацку расказваў аб жыцьці ў нас, мяшаючы праўду з выдумкамі, і як

яму ўздумаецца. Слухачы расьпіналі вушы, ківалі галовамі і згаджаліся, а Швэйк узрастаў у сваім уласным уяўленьні.

Яму здавалася, што нібы ён ідзе на край сьвету і нібы ў гэтага сьвету няма канца. Аднойчы ў дождж боты яго зусім разьмяклі, а потым залубянелі і зрабіліся цьвярдымі, як кара, да крыві разьдзіраючы яму ногі; таму ён ішоў зараз босы, перакінуўшы боты на вяровачцы цераз плячо і абуваючы іх толькі нанач, каб іх у яго ня ўкралі. Перад палоннымі слаўся бясконцы роўны стэп, у якім пасьвіліся каровы і быкі. І нішто ўжо не здавалася Швэйку такім чужым у гэтай непрыяцельскай краіне, як раней.

Ён завучыў некалькі расійскіх сказаў, і абываталі, калі ён што-небудзь расказваў ім, маглі ўжо разумець кожнае пятнаццатае ці дваццатае слова; яго абшарпаны старэцкі знадворны выгляд і добрадушны твар выклікалі давер'е мужчын і таму, што яны былі падобныя да яго, яны зварачаліся найахвятней да яго.

— Ну, а ваш цар?—спытаў яго стараста вёскі, дзе яны пераначавалі.—Добры ён чалавек? Ня трэ' было такому старому браць на душу такі грэх, гэту вайну! І навошта ён мучыць нашых палонных?

Швэйк ледзь зразумеўшы дзесятую частку пытаньня, не саромячыся, адказаў:

— Наш цар—старая калода, але ня злосны чалавек. Людзі ў кожнага знойдуць што-небудзь дрэннае. Пра вашага цара кажуць, што ён таксама добрая цаца. А наш мые вашым палонным кожны дзень ногі, як яго сьвяцейшаства ў Рыме ў чысты чацьвер—дванаццацём старцам.

— Ну, а нашага Івана, Івана Іванава сына ты ў Галіцыі не спатыкаў?—спытала старасьціха, дадаўшы:—Ён служыць у 216 палку і прысылаў ліст, што ён зараз у Галіцыі.

— Я шмат вашых спатыкаў, бабулька,—з усьмешкаю адказаў Швэйк.—Ваш Іван Іванавіч—добры чалавек? Ён бялявы, ці чорны? Да каго ён больш падобен: да бацькі ці да маткі? Я з ім гаварыў, ён прасіў перадаць вам прывітаньне...

У вачох старой сьвяціўся шчасьлівы агеньчык. Яна ўзяла Швэйка за руку, быццам каханка, і засыпала яго пытаньнямі, з якіх Швэйк роўна нічога не зразумеў, таму сказаў, наўздагад:

— Я, бабулька, з ім гаварыў, дальбог гаварыў, каля самай галіцкай мяжы; ён расказваў мне, што яму жывецца добра, што

хлеба і сахарыны ў яго аж залішне і казаў мне пераначаваць у вас. Ён гаварыў:—Бацька добры, маці—добрая, кланяйся ім ад мяне, і няхай яны цябе накормяць абедам і вячэрай».

Стараста схапіў Швэйка за руку, пагладзіў яго па шчацэ, палэпаў па плячы і сказаў:

— Добры ўдалы ваяка, ну ідзі да нас, накормім мы цябе.

Такім чынам Швэйк прыняў удзел у сямейнай вячэры, за якой ён зьеў амаль цэлую курыцу, таму што ні стараста, ні хто-небудзь з дзяцей ня елі, а толькі глядзелі на «ўдалага» ваяку Швэйка; і стараста сам завёў яго, як ён пачаў драмаць ад сыці і асалоды, у пуню, дзе старасьціха на сьвежае сена паклала нават падушку.

Калі стараста палез на ляжанку, дык кладучы пад голаў боты, сказаў:

— Вось бачыце, аўстрыец—вораг, а прыемны, адукаваны чалавек. Здаецца, ён умее нават і чытаць і пісаць.

А жонка спрасоньня адказала:

— Такі далікатны чалавек, і з нашым Іванам на фронце гаварыў. Тры разы я за абодвух сёньня памалілася ўжо, дай ім бог здароўя.

Тым часам Швэйк распрануўся на сене, як маці нарадзіла, заўважыўшы, што апрача кароў каля ясьляў стаялі і коні, ён аднёс туды ўсю сваю вопратку і паклаў яе на конскіх сьпінах, каб вошы, якія не церпяць конскага паху і цеплі, павылазілі з яго адзеньня.

Ён заснуў зусім шчасьлівы, бо яго нічога ня кусала, а раніцой успомніў, што яму сьнілася, нібы з кожнага боку ў яго стаяла па крылатым анёлу, якія ганялі ад яго мух сваімі крыльлямі.

Ён апрануў «абязвошанае» адзеньне і выйшаў на двор памыцца каля калодзежу. Каля адных калёсаў ён заўважыў скрынку коламазі. Вымыўшы брудныя, зьбітыя ногі, ён успомніў пра свае залубянелыя, пакарабачаныя боты і падумаў, што яны будуць мякчэйшыя, калі іх памазаць коламазьзю. Ён узяў скрынку і пайшоў з ёю ў хлеў. Але калі ён пачаў шукаць шчотку для выкананьня свайго пляну, яму давялося расчаравацца: нідзе ня было ані шчоткі, ані чаго-небудзь падобнага, каб замяніць яе,

І вось паглядзеўшы навокал, чым-бы яму змазаць свой абутак, Швэйк раптам нагнуўся, ухапіў у каровы хвост, якая ціха

ляжала на сваёй пасьцілцы і мудра жвала жвачку, і пачаў мазаць ім коламазь на боты.

Карова азірнулася на яго разумнымі прыгожымі вачыма, каб даведацца, што за нязвыклая мэханіка робіцца з яе хвастом, і Швэйк палічыў за патрэбнае папрасіць прабачэньня ў яе.

— Ня злуйся, рабая,— сказаў ён.—Адна з тваіх сясьцёр віната ў тым, што я згубіў усе свае пажыткі; дык дазволь мне крышку пакарыстаць з твае далікатнасьці, бо мне прыходзіцца быць вынаходцам, як Робінзону Крузо. Таму што, любая ты мая каровачка, за час вайны тэхніка вельмі ўдасканалілася, і як я вярнуся дадому, дык падам заяву ў Міністэрства Народнай Асьветы, што за карысьць бывае ад каровы, каб паправілі падручнікі, а сваю вынаходку я надрукую ў часопісі «Вынаходзтва і прогрэс» або ў «Новай эпосе».

Калі транспорт палонных рушыўся далей, Швэйка праводзіла ўся старастава сям'я; усе з глыбокай павагай глядзелі на яго люльку, набітую даронай табакай, якая выкідала з сябе такія клубы едкага дыму, ажно старасьціха зазначыла: вось дыміць, што той самавар.

Потым яны разьвіталіся. Стараста па звычаю пацалаваў Швэйка, патрос яго за руку, шчыра пажадаў яму шчасьлівай дарогі і прасіў, каб ён наведаў іх, як будзе варочацца ў Аўстрыю.

Калі Швэйк убачыў чулыя адносіны да яго з боку старасты і заўважыў, як яго жонка выцірала сьлёзы, ён таксама шчыра адказаў пацалункам і таксама выцер вочы.

— Вось-жа ёсьць добрыя людзі,—сказаў сам сабе Швэйк,— А ты, браце, ледзь не зрабіўся нягоднікам, такім нягоднікам, як адзін Кладзіўка з Вінаград, які заўсёды даваў у «Політыцы» шлюбныя абвесткі, а потым трапіў пад суд за многажонства.

Стараста выцер сабе вочы рукавом і сказаў:

— Так, так. Добрых спраў нарабіла вайна.

— А да Кіева яшчэ далёка?—Спытаў пад канец Швэйк.

Стараста з хвіліну падумаў.

— Не, цяпер ужо недалёка будзе—вёрст трыста, ня больш.

Швэйк глядзеў на бясконцую даль, а з вуснаў яго вырваліся словы:

— Будзем спадзявацца, што там ужо мора і што я знайду там антыподаў.

3

У КІЕВЕ

У дні нашай маладосьці ў нас былі хрэстаматыі з цудоўнымі апавяданьнямі пра нейкага караля, які разьбіў і разагнаў армію дванаццацёх іншых каралёў, захапіў гэтых каралёў у палон і запрог іх у сваю трыумфальную калясьніцу замест коняй.

І трапілася так, што адзін з гэтых палонных і запрэжаных у калясьніцу каралёў, выцягваючы пастронкі, упарта глядзеў на колы і бесьперастанку паўтараў: «Кола круціцца наўкола, кола круціцца наўкола». Гэта гаварыў ён так упарта, што кароль-пераможца заўважыў яго і загадаў спыніцца ды даведацца, што гэтыя словы азначаюць.

Тады запрэжаны кароль адказаў:

— Кола круціцца наўкола, і сьпіца, якая толькі вось была наверсе, апускаецца, а тая, якая была ўнізе, узьнімаецца ўгару. І таксама зьмяняецца чалавечы лёс. Раней нас вазілі на сабе нашыя слугі, а зараз, о, вялікі кароль, мы вязем цябе!

Каралю-назіральніку гэтая філёзофія так спадабалася, што ён пасадзіў свайго палоннага пры сабе на калясьніцу, каб яму ня трэ' было ісьці пехатой. Але пасьля гэтага той перастаў быць філёзофам, бо цяпер калясьніцу везьлі толькі адзінаццаць каралёў, для якіх цяжар павялічыўся, таму што дванаццаты выявіў «жыцьцёвую мудрасьць».

Да гонару Швэйка мусім адзначыць, што ён ні ў якім становішчы не выяўляў такой подласьці, нават тады, калі за трохдзенных пераход ад Брод у Кіеў ім амаль не давалі есьці, калі яны прыставалі ад смагі на пыльных шляхох, або змокшы пад дажджом да ніткі, ляскалі зубамі ад холаду. Швэйк нязьменна заставаўся «ўдалым» ваякам, падбадзёрваючы сабе ды іншых:

— Хутка ўсё гэта скончыцца, за Кіевам зараз-жа будзе мора, і калі мы захочам, дык можам там паляваць на кітоў. А расійцы водзяць нас па ўсёй Расіі для нашага-ж задавальненьня.

Здарылася ім праходзіць і чэскія вёскі, заснаваныя колёністамі-перасяленцамі яшчэ ў мінулым стагодзьдзі. У некаторых такіх вёсках палонных спатыкалі вельмі радасна і кармілі колькі тыя хацелі, а ў іншых—усё перад імі замыкалі і жыхары глядзелі на гасьцей з радзімы толькі з-пад спушчаных фіранак.

— Што гэта за людзі,— сказаў у аднэй вёсцы настаўнік,— што ў іх не гаворыць голас крыві.

— Нягоднікі!—падхапіў вольнапісаны, які пераканаўся, што пры пошуках ежы карысьней за ўсё трымацца бліжэй да Швэйка і ён не адыходзіў ад яго.—Проста дзіўна. Мы—чэхі і яны—чэхі, а не даюць нам нават бульбы. Учора я аднэй бабульцы расказаў, што гадзіньнік на старой ратушы ў Празе больш ня ідзе з таго часу, як пачалася вайна, дык яна пачаставала за гэта мяне тварагом, а гэтыя ідыёты паганыя нават і ня спытаюць, што робіцца ў нас. А то я нагаварыў-бы шмат дзівосаў на тарасах.

— Тутэйшыя жыхары,— зазначыў Швэйк,—нагадваюць мне сваякоў аднаго Чамары з Мяцеша пад Ічанам, які давучыўся ў Празе на профэсара, а потым ажаніўся з дачкой гандляркі гароднінай, нейкай Шміраль з Жыжкова, у якой ён кватараваў. Ён пражыў з ёй дваццаць год, дык яна яму досыць надакучыла. Апрача таго, на яго наогул напаў смутак і туга. Тады ён успомніў, што ён-жа можа зьезьдзіць да сябе на радзіму і паглядзець, што там робіцца праз гэтулькі год. Сеў ён на хуткі цягнік і паехаў у Ічан, і чым бліжэй пад'яжджаў, тым лепшы ў яго быў настрой. Ён уяўляў сабе хатку, дзе ён радзіўся, як яна стаіць на адхоне і як яе страха зарасла мохам, і як стары сабака, з якім ён хадзіў на паляваньне на палявых мышэй, будзе сапсьці ля яго ног—нібыта ў казцы, калі блудны сын вяртаецца ў бацькаву хату.—І як людзі будуць гаварыць: «Гэта наш Франц Чамара, які зрабіўся важным баронам у Празе. Шкада, што старому Чамары—царства яму нябеснае, добры быў чалавек!—не давялося прычакаць гэткае радасьці. Ну, пайшоў ён у вёску, а каля дарогі стары Ірава косіць ячмень. Пане профэсар зьнімае капялюш і кажа: «Бог на помач!» А той яму далікатна ад-

казвае: «З якой гэта прычыны бог будзе мне дапамагаць? Пакінь свайго бога, ды памажы мне сам, гультай! Цэлы год лынды б'іцё, сьцервы, ды ў столь плюеце». «Стары ён стаў і зьвяглівы»,—падумаў Чамара і каб улагодзіць яго, падыйшоў ды кажа: «Дзядуля, няўжо мяне не пазнаеш?» Тут Ірава замахнуўся на яго касой і крыкнуў: «Ідзі, ідзі, брыдота! Што-ж ты думаеш, я ведаю ўсіх вас, бандытаў? Шмат вас тут шлындае! Вось у старога Маравека гэтымі днямі сьцягнулі на полі гадзіньнік—ці не твая гэта работа? Ідзі, ідзі, а не дык я людзей паклічу!» Профэсар падумаў, што будзе пацешна пакінуць старога з поглядам, што ён Франца Чамара, валацуга і падаўся ў шынок. Там было пуста; ён заказаў піва, а гаспадар яго і пытае: «Вы што—страхавым агентам будзеце, або малюнкамі гандлюеце?» Гэтаму шынкару, нейкаму Башце, Чамара прызнаўся, што ён мясцовы даўні жыхар, што зараз ён за профэсара ў Празе і прыехаў паглядзець на родную мясьціну, а шынкар яму і кажа: «Бацьку вашага я памятую, добра памятую. Быў мой заўсёдашні наведвальнік. Піў ён толькі алаш з ромам і так заліваў, што нажыў сабе язвы страўніка. Пра нябожчыкаў звычайна гавораць адно добрае, але гэта быў такі прапойца, што каб ня было старой, ён у момант спусьціў-бы і дом і ўсё да апошняй капейкі. Ды ён і так больш цягаўся па судох, чым быў дома». Профэсару пасьля такіх слоў піва адразу стала горкае, і ён пайшоў паглядзець на бацькаву хату.

Швэйк перадыхнуў і казаў далей:

І вось замест ранейшай хаты стаіць вялічэзны дом, а на парозе сядзіць профэсарава сястра. Тая яго зараз-жа пазнала, прывіталася з ім і павяла да сябе, пасадзіла яго на крэсла і кажа: «Шкада, што я цябе нічым не магу пачаставаць. Хлеб у нас чэрствы, карова малака не дае, а ячменнай кавы, я ведаю, ты ня п'еш, дык я табе яго і суліць ня буду. Ты сюды надоўга, ці мо' сягоньня паедзеш? У нас табе спаць будзе нядобра. Дом толькі пабудаваны, і ў ім яшчэ вільготна... А дзяцей у цябе няма? Гэта добра, прынамсі, ты больш можаш зьберагаць. Шкада, што мужа няма дома; ён якраз ладзіўся табе напісаць, ці ня здолеў-бы ты пазычыць нам 600 крон. Ён меўся купіць карову, каламажку і каня. Фотографіі нашых дзяцей ты бачыў? Вось гэта Эрнст, які вучыцца ў вайсковай акадэміі ў Вене, а гэта Альфрэд, студэнт Лясного Інстытуту. Наша Лола ў Швэй-

царыі, у францускім пансіёне... Вячэраць я параіла-б табе ў готэлі, Франц, бо ў нас ежа вельмі простая; а калі ты маеш перабыць тут колькі дзён, дык пакінь там за сабой нумар і запрасі да сябе майго мужа, бо яму прыемна будзе пахваліцца, што ў яго ёсьць швагра, які плоціць за яго ў рэсторане». Такім чынам профэсар апынуўся у той самы вечар у Празе і цэлы месяц хадзіў у больніцу лячыць вочы, бо як ён ехаў на цягніку, вецер дзьмуў яму ў твар, а ён плакаў і ў яго зрабілася запаленьне рагавой абалонкі.

Швэйк падыйшоў да хаты, дзе за акном паказаўся ружовы твар рослай маладзіцы; яна з жахам глядзела на людзкую патоку, што ўлівалася на рынкавы пляц. Швэйк кіўнуў маладзіцы, нібы старой знаёмай, і, зварачаючыся да сваіх таварышоў, апавядаў далей:

— А бондара Копршыву, у якога было ў Празе пяць замужных дачок, вы зналі? Дык вось, ён ніколі, едучы ў Прагу, не начаваў там, бо ў яго ня было там месца, дзе ён мог-бы спыніцца. Жонка яму, іншы раз, пачне напамінаць, дзе якая дачка жыве і які ў якой мужык, і на колькі пакояў мае кватэру, а ён заўсёды кажа: едзь, маці, сама, бо калі я туды прыяжджаю, усё ідзе дагары нагамі. Я, напрыклад, пакіну мяшок за дзьвярыма, пазваню, дачка выйдзе, але не падумае запрасіць мяне да сябе, а кажа: «Тата, лепш было-б вам ісьці начаваць у Франзі, пакуль уваходныя дзьверы не зачынены; у нас зусім нельга, бо я ўсе фіранкі і шторы зьняла». Ну, я разьвітаюся з ёй, вазьмуся за мяшок, а яна пачне разважаць: «Пачакайце, тата, можа як-небудзь зробім». І тут яна хапае ўжо мяшок ды мацае колькі там масла, колькі яек, або які кавалак сала, або колькі кілбас, і толькі тады цалуе мяне і кажа: «Уваходзьце, уваходзьце, тата! Як я рада, што вы прыехалі да мяне. Як жыве мама? Чаму яна насылае так мала яек? Хіба куры дрэнна нясуцца? А мама здарова?..».

Пры гэтым Швэйк паказаў на вакно другой хаты, праз якое відаць было, як сядзіць за абедам калёніцкая сям'я; дзьверы і брама гэтай хаты былі шчыльны зачынены.

У Кіеў палонныя прыйшлі ў нядзелю раніцой. Ужо тут яны адпачывалі цэлыя суткі ў вялікім сяле пад горадам, дзе спусьцілі сваю апошнюю маемасьць, усё, што толькі можна было зьняць і без чаго можна было абыйсьціся.

На другія суткі іх узбудзілі сярод начы і пагналі ў Кіеў, «колыбель владычицы Украины».

Ніколі ў жыцьці ня бачыў Швэйк такога вялікага гораду: ад сямі гадзін раніцы да трох гадзін дню ішлі яны пад пільным наглядам варты па вуліцах, і ўсё-ж ня відаць было канца гэтым вуліцам. Дамы і домікі расцягнуліся бясконца доўгай чарадою, і перакрыжаваньняў вуліц нельга было зьлічыць.

З пацэляў глядзелі на палонных, якія ішлі пасярод вуліцы, вялічэзныя натоўпы людзей і ўсюды чуліся радасныя крыкі: «Вось, колькі іх нашы зноў забралі!» На гэта паліцэйскія, што ішлі поруч з вартай для лепшага падтрыманьня парадку, адказвалі: «Гэта яшчэ мала! Хутка і ўся вайна скончыцца».

Калі палонныя ўжо дзівавалі з палёў, лугоў, ды садоў у гэтай краіне, дык яны зусім зьбянтэжыліся, як убачылі грандыёзную веліч Кіева. Праўда, той-сёй лічыў, што мае хоць невялікія веды па географіі Расіі, а таму каля 11-й гадзіны настаўнік крыкнуў:

— Тут нешта ня тое! Мы-ж зараз у Кіеве, у якім насельніцтва менш, чым паўмільёну, а за той час, як мы тут ходзім, можна было-б абыйсьці ўвесь Лёндан з яго шасьцімільённым насельніцтвам. Ці мо' тут толькі адна вуліца?

— Не, па гэтай вуліцы мы як-ні-як адзін раз ужо праходзілі,—абазваўся хтосьці за ім.—Я пазнаў яе па дому, дзе побач з расійскім магазынам, ёсьць і француская шыльда.

— А можа гэта толькі філіяльнае аддзяленьне ў другім квартале?—сказаў вольнапісаны, паглядзеўшы назад.

Але ў адказ пачулася рашучае і ўпэўненае:

— Не, не, гэта той-жа самы дом і той самы магазын.

— Браточкі,—утыкнуўся ў гутарку Швэйк,—мы ўжо пяць разоў перасякалі плошчу, пасярод якой стаіць вось той помнік і кожны раз мы ўзыходзілі на яе з другога боку і з другой вуліцы: там іншыя магазыны, іншыя шыльды, але помнік усё той самы. Так нас яшчэ доўга будуць вадзіць на паказ. Браточкі, намі проста выхваляюцца!

У Швэйкавых словах была захавана глыбокая праўда, бо справа была пастаўлена сапраўды так, як ён казаў. Дзеля таго, што расійская армія была разьбіта на фронце, галоўны генэральны штаб імкнуўся супакоіць усхваляванае расійскае гра-

мадзтва і давесьці свае посьпехі вялікай колькасьцю палонных, якіх для гэтага цягалі з месца на месца, як кацянят.

Манэўр гэты быў вельмі просты і нескладаны: галоўны генэральны штаб вёў падлік палонных з самага пачатку вайны і друкаваў у газэтах паведамленьні, што ў пэўным баі лік палонных дасягаў такой вялічэзнай лічбы; гэта лічба вядома павялічвалася, да яе дадавалі нуль, а часам два ці тры нулі, таму яна заўсёды рабіла сэнсацыю і выклікала энтузыязм. Грамадзкасьць выхваляла чалавекалюбства расійскіх генэралаў, якія зьнішчалі магутнасьць Аўстрыі і Нямеччыны тым, што забіралі ў палон усю іхную жывую сілу.

І вось вялічэзныя транспорты палонных, якіх пераганялі з гораду ў горад, і бясконцыя шэрагі шэра-сініх шынэляў, якія абуджалі фантазію абываталяў, ілюстравалі газэтныя весткі і рабілі належнае ўражаньне на насельніцтва, дзе вайна ўправілася стварыць такі настрой, пра які Швэйк зусім слушна заўважыў:

— Даволі з іх! Тысяча глупстваў і быку сьпіну зломіць.

Паміж іншым, штабы ды інформацыйныя аддзелы ўсіх дзяржаў, якія ваявалі, працавалі па такім-жа шаблёне. Так, у Аўстрыі каротка ў двух словах, паведамлялася, што «наша войска пад націскам грозных сіл няпрыяцеля адыйшло на раней падрыхтаваныя позыцыі, якія зьяўляюцца, паводле думкі спэцыялістаў, няпрыступнымі». А трыма днямі пазьней: «наша войска» няўстрымна ўцякала з няпрыступных позыцый, тым часам, як доўгае, літаратурнай мовай напісанае паведамленьне, крычала на ўвесь сьвет, што «ўзводны унтэр-афіцэр Вэнцаслаў Крупічка адзін узяў у палон шэсьць расійскіх салдат, якія шалёна змагаліся з ім, гэта зьяўляецца довадам геройскага духу і адважнасьці аўстрыйскай арміі і нязломнай волі дамагчыся канчатковай перамогі».

У Расіі, пасьля расійска-японскай вайны, ад сыстэмы «геройства» асобных ніжэйшых чыноў адмовіліся; апісаньнем бясстрашных геройстваў казакаў карысталіся толькі для ілюстрацыі паведамленьняў з тэатру вайны і цалкам узялі курс на захоп у палон непрыяцельскіх сіл. І калі-б зараз хто-небудзь патурбаваўся па дадзеных францускіх, аўстрыйскіх, расійскіх і нямецкіх газэт ды часопісаў, а таксама паводле паведамленьняў рэшты малых дзяржаў, якія ваявалі, падрахаваць, колькі ўсяго лю-

дзей было ўведзена ў палон рознымі арміямі, дык у яго набраліся-б лічбы, прачытаць якія здолелі-б адны астрономы, ды і то пасьля гэтага іх завезьлі-б у вар'яцкі дом. Бо самая малая лічба была-б больш ад мільярду!

Такім чынам насельніцтва Кіева ў тую выдатную нядзелю мела магчымасьць на свае вочы ўбачыць палонных ворагаў, якія дазволілі галоўнаму генэральнаму штабу дэкляраваць, як і заўсёды, хуткую перамогу, і гарадзкія жыхары маглі набрацца новых высокіх уражаньняў, каб разьдзьмуць агеньчык ваеннага ўздыму, які гатовы быў згаснуць пад уплывам няўдачы на фронце.

Загадка, што палонных вадзілі па кіеўскіх вуліцах, нібыта заморскіх зьвярэй, была зроблена амаль адначасова ў розных групах, дзе асобныя салдаты мелі асаблівую назіральнасьць і здольнасьць орыентавацца. Таму, калі палонныя пад поўдня ледзьве валаклі ногі па Крашчаціку, а назіральнікі, якія вялічэзным натоўпам стаялі па абодвух бакох вуліцы і якія глядзелі з вакон, спатыкалі іх крыкамі «ўра» і зрушаным гулам:—глядзеце, глядзеце, новая партыя палонных!—з сярэдзіны вуліцы пачуўся гучны адказ:

— Так, так, новая. Толькі мы ўжо даўно ў Кіеве, так даўно, што ўжо пратухлі.

— Мы зноў праходзім па тэй самай плошчы. Дакуль-жа нас будуць ганяць па горадзе,—злосна запытаўся ў настаўніка вольнапісаны.

За яго лятуценна і пакорліва адказаў Швэйк:

— Будуць ганяць датуль, пакуль ім не абрыдзе. Калі яны забралі нас у палон, дык маюць поўнае права нас паказваць. Вось ведаў я аднаго разьніка, Гурка—яго прозьвішча, дык у яго ніколі ня было ні капейкі за душой, але ў бакавой кішэні ён насіў з сабой соценную паперку, якую ніколі не мяняў. Напрыклад, вып'е ён у піўніцы пару піва і зьесьць порцыю сасісак, а потым кліча: «Чалавек, маеце з мяне!» Ну той, калі Гурка выцягне сваю соценную паперку і папросіць рэшты, пачынае шукаць у сябе па ўсіх кішэнях, а Гурка возьме яе зноў і скажа: «Пачакайце, я зусім забыўся, што ў мяне ёсьць дробязь». І кладзе яму тры пяцёххэллеравыя манэткі на стол. Пяць гадоў я яго ведаў, і абы толькі меў ён з кім справу, кожнаму быў вінаваты, але сваю соценную паперку так і не памяняў. Што-ж людзі любяць выхваляцца, а нам не пашкодзіць, калі мы трохі лепш пазнаё-

мімся з тутэйшымі асаблівасьцямі. Хто ведае, ці будзе на нашым вяку яшчэ раз вайна і ці трапім мы зноў сюды!

А другой гадзіне, калі яны праходзілі па Падвальнай вуліцы, у публіцы пачаўся скандал. Нехта заўважыў, што тая самая партыя палонных праходзіла тут сёмы раз. Пачуліся крыкі, вэрхал, што гэта мана і зьдзекі, што гэта замер схаваць той факт, што непрыяцель неўзабаве будзе ў Кіеве. У натоўп урэзаліся гарадавыя. Яны хацелі затрымаць таго-сяго з крыкуноў. Пачалася бойка; не зважаючы на палонных, натоўп абступіў гарадавых. У паветры пагрозна забялелі сьціснутыя кулакі.

Бязладзьдзе і крыкі пайшлі ад таго месца, дзе заняліся, і на іншыя вуліцы і вартавыя пачалі падганяць палонных. Усюды відаць былі гарадавыя, якія спрабавалі, не зважаючы на тое, што на іхныя галовы сыпаліся са ўсіх бакоў удары, выцягнуць з натоўпу якога-небудзь чалавека. Гэтага-ж чалавека разьюшаны натоўп імкнуўся ў іх адбіць. І калі палонныя апынуліся праз поўгадзіны на ўскраіне гораду і вартавыя паказалі на нейкі вялічэзны дом, дзе іх чакаў адпачынак і полудзень, Швэйк, зьзяючы ад здавальненьня, крыкнуў:

— Тут паліцэйскіх таксама б'юць! Расійскі народ мне вельмі спадабаўся.

Палонныя клаліся і садзіліся на зямлю і тут ураз засыпалі, а варта, ня ведаючы, што рабіць, бязуважна стаяла вакол іх. Нарэшце, брама будынку расчынілася і адтуль вышаў афіцэр з некалькімі салдатамі, якія выстраіліся перад брамай; афіцэр скамандаваў:

— Па чатыры, станоўцеся!

Вартавыя пачалі шыхаваць палонных па чатыры чалавекі ў рад і прапускаць іх у браму; там іх затрымлівалі і абшуквалі салдаты, якія выйшлі са старых кашар.

Ператруска была строгая і ад спрактыкаванага вока таго, хто рабіў яе, нічога нельга было схаваць. Яны абмацвалі ўсё цела, вывaрочвалі кішэні, выкідалі ўсе рэчы з ранцаў, і ўсё, што лічылі за казённую маемасьць ці за небясьпечнае для Расіі, складалі ў груды, перад якімі была пастаўлена варта. Адным словам, гэта было адно з лепшых зьвеньняў у ланцугу расійскае апекі над палоннымі.

Адбіралі ўсё, што трапляла пад рукі і што падабалася салдатам. У груд складалі ламаныя бляшанкі, біклажкі, рамяні, шы-

шэлі, нагавіцы, грабяні, кавалкі мыла, абмоткі, сьцізорыкі, мазь ад вошай, брытвы, гадзіньнікі і парожнія або поўныя портманэты; туды-ж трапілі і боты, якія адзін босы салдат, намуляўшы сабе ногі, нёс перакінутыя цераз плячо, а аб боты бразнула алюміневая лыжка, якая была, як відаць, небясьпечнай для Расійскай дзяржавы зброяй у руках палоннага.

Пры гэтай мэханіцы быў прысутны афіцэр, які стаяў у кутку ля варот, сьцёбаючы стэкам па сваіх высокіх лякіраваных ботах і добрадушна пазіраючы, як палонныя чухаліся і з тугою глядзелі ўсьлед сваім рэчам, адбіраным у іх. А калі той ці іншы адмаўляўся аддаваць кашулю, грабянец, ці гадзіньнік і няме́цкай мовою спасылаўся на Жэнеўскую конвэнцыю міжнароднага права, у справу ўтыкаўся афіцэр.

Ён біў непаслухмянага стэкам некалькі разоў па галаве, ці па сьпіне, або кулаком пад рэбры, так што палонны адлятаў да брамы, тым часам, як афіцэр з нязьменна-прыемнай усьмешкай супакойліва дадаваў:

— Дармо, Дармо! У Сібіры ўсё новенькае выдадуць. У вас нашых у плугі, мабыць, запрагаюць? А мы з вамі тут цацкаемся, сьцервы!

За партыяй, з якой прыбыў Швэйк, падыйшла другая, якую акурат праганялі ў браму; перад кашарамі стаяў вялічэзны натоўп палонных, і таму прайшло ня мала часу, пакуль іх усіх прапусьцілі.

Каб лепш выкарыстаць час, настаўнік зьдзеў з сябе куртку і пачаў у ёй шукаць вошы. Пасьля паклаў яе ў ранец і толькі-толькі ладзіўся зьдзець з сябе і кашулю, як вольнапісаны, выпрастаўшыся на шыналю, сказаў яму:

— Слухайце, гэта зусім лішняе, глядзеце, які там на двары дым ідзе. Мабыць нас там пакупаюць і зробяць дэзынфэкцыю нашай бялізны і вопраткі. Мабыць, нас павядуць адгэтуль далей і баяцца разьнесьці вошы і ўсякую заразу.

— Добра, я пакіну вошы ў кашулі—няхай згараць,—вырашыў настаўнік.—Але папружку трэба выцягнуць, каб яна не загінула.

У гэты момант да вольнапісанага падыйшоў салдат бяз зброі. Ён абмацаў яго шынэль і паказаў нейкую срэбную манэту.

— Прадай шынэль, усёроўна яго ў цябе адбяруць, а я табе за яго даю дзьве грыўні.

Вольнапісаны адмовіўся; салдат набавіў яшчэ манэту, дастаў з кішэні пачак махоркі і стаў угаворваць аўстрыйца, выцягваючы ўжо з-пад яго шынэль.

— Вось табе за яго трыццаць пяць капеек і пачак махоркі ў прыдачу, табе ён усёроўна не патрэбен, бо ў Сібіры цёпла.

— Што ты тут робіш?—грымнуў на купца другі салдат.— Нельга, нельга! Што-ж ім голым хадзіць, ці што? Ідзі, ідзі адгэтуль!

Тым часам настаўнік выцягнуў з портак папружку, а вартавыя пачалі падводзіць палонных да брамы. Таго, што рабілася наперадзе, ня было відаць, і Швэйк з яго падарожнікамі трапілі ў рукі сваіх катаў зусім нечакана, нібы авечкі ў воўчае стада.

Шынэль вольнапісанага кінулі туды, у кучу, а калі гаспадар паскардзіўся афіцэру, што гэта супярэчыць міжнароднаму праву, афіцэр паднёс стэк да самага носу вольнапісанага і прасіпеў:

— Я табе пакажу міжнароднае права, я табе пакажу Жэнеўскую конвэнцыю.

За шынэлем туды-ж трапіла і настаўнікава куртка, а на яе кінулі і швэйкавы боты, зьвязаныя настаўнікавай папружкай, быццам вужакай. А Швэйк, апынуўшыся на двары, дзе гразі было блізка па калены, з тугой сказаў:

— Вось нас і дэзынфіцыравалі. Прынамсі, табе, настаўнік, не давядзецца больш пацець у сваёй целагрэйцы, і так працаваць, палюючы за вошамі, бо твой вучастак скараціўся, а што да мяне, дык, напэўна, баяліся, каб часам я па дарозе ў Сібір не нацёр мазалёў гэтымі ботамі.

— Я асёл,—урачыста сказаў вольнапісаны,—я сапраўды асёл! Чаму я не прадаў шынэль за трыццаць пяць капеек? На гэтыя грошы я мог-бы купіць сабе хоць пару булак.

Настаўнік, трымаючы абедзьвюма рукамі порткі, якія зьяжджалі ў яго, утупіўся позіркам у гразь, якая даходзіла яму да лытак ды залівала і чаравікі і са скаргаю праказаў:

— Хто-б мог уявіць сабе гэткае прыйме ў брацкай Расіі? Далібог калі-б я быў зараз дома і пачуў, што доктар Крамарж кажа, нібыта ўсе славяне ўваходзяць у адну сям'ю, і расійцы— нашы браты, я падыйшоў-бы да яго і даў-бы яму добрую поўху за гэта.

Гэтыя дэбаты аб панславізьме скончыў Швэйк, дастаючы з нагі кавалак шкла, наступным афарызмам:

— Магчыма, што мы ня былі славяны, але зараз мы будзем імі. Нам гэтае славянства добра ўвальлюць у горла.

Капітан Павал Апанасавіч Кукушкін, загадчык гаспадарчай часткай Кіеўскага гарнізону, ня быў прынцыповы вораг палонных. Ён адыходзіў ад тэй ісьціны, што вайна ёсьць вайна, а ня жарты, і праз цялесныя агляды, пры якіх палонным прыходзілася распранацца на-гола, стараўся ўбіць ім, што зараз—менавіта вайна.

Калі ўся «шэра-сіняя брыдасьць, якая прырынула на Русь, каб яе дачыста аб'есьці»,—такія словы пусьціла ва ўжытак адна расійская газэта і капітан Кукушкін лічыў іх за найбольш трапныя для палонных,—была на двары, а вартавыя і салдаты разьбіралі адабранае, каб прадаць яго тым самым палонным, капітан зьявіўся, загадаў адчыніць харчовы магазын, вынесьці мех цукру і загадаў палонным аднаму за адным падыходзіць, асабіста назіраючы, як дзяжурны кожнаму выдаваў на рукі два белыя кавалкі. Пры гэтым капітан кожнаму тавапрыў:—«У чай, разумееш?—і па-сяброўску лэпаў кожнага стэкам па нагах, ажно палонны высока падскокваў ад болю. І тыя, у каго ня было ані конаўкі, ані бляшанкі, з тугой глядзелі на цукар і будку, з якой курыўся дым, а Швэйк, паклаўшы адзін кавалак у рот, пацяшаў сябе:

— Дармо, зьем і так. Роту сабе я ім не апяку.

Тым часам капітан Кукушкін даведаўся, што на кухні ўжо зварылі абед, і зьбіў кашавара, які запэўняў, што ён ня мог зрабіць порцый з выдадзенага яму мяса, таму што мяса было занадта мала і, апроч таго, яно ўварылася. Зьбіў яго капітан Кукушкін не за невыкананьне загаду, а за сьмеласьць, з якой той сказаў, што мяса было занадта мала. Хоць, між іншым, добры і сумленны Паўла Апанасавіч сапраўды выдаў толькі чвэртку таго, што ён паставіў у рахунак інтэнданству і што належала палонным паводле раскладкі.

Потым, прыйшоўшы да палонных, ён выклікаў уперад аўстрыйскіх унтэр-афіцэраў; аднаго ўзводнага, русіна, які гаварыў па-нямецку, ён прызначыў за перакладчыка і загадаў праз яго папыхаваць салдат і прарабіць тут-жа розныя практыкаваньні.

На пляцы з поўгадзіны чулася каманда: «Рады падвой! Паварот на права. У шарэнгі—стройся... нале-ва, кру-гом... на-

права, кру-гом»... А яшчэ чулася «На наскі прысядай... паварот галавы на-права... на-лева». Тут-жа адбывалася муштра, «як аддаваць чэсьць».

Палонныя клаліся ў гразь, быццам жабы ў балота, і капітан Кукушкін хмялеў ад свае ўлады, уяўляючы сабе, як гэтыя людзі, каб ён трапіў у іхныя рукі на фронце, выпусьцілі-б яму кішкі, як зайцу, а вось зараз самі мусілі ламацца перад ім, як малпы.

Ён глядзеў на іх, гладзячы свае доўгія вусы, і душа яго нібы купалася ў ружовым масьле. І ўспамінаючы колькі чалавек прайшло ўжо праз ягоныя рукі і колькі яшчэ пройдзе, ён падлічваў, колькі з таго, што ён павінен быў даваць палонным, засталося ў гэтых самых руках. Таму ён радасна падумаў:

— Дзякуй богу, пасьля вайны можна будзе купіць сабе маёнтак на Каўказе, або ў Крыме—там яшчэ лепш.

Салдаты тым часам вынесьлі са складу хлеб, расклалі яго на роўныя кучкі і паставілі каля кожнай па колькі бачкоў. Капітан загадаў перакладчыку запрапанаваць палонным разьмеркавацца па нацыянальнасьцях: немцы, аўстрыйскія немцы, чэхі, сэрбы, італьянцы, русіны, мадзьяры—усе паасобку. Як толькі яны такім чынам сформуюцца, яны атрымаюць хлеб і зацірку і іх разьвядуць на начлег.

Лэпаючы сябе стэкам па халявах, ён падаўся на кухню.

У шэрагах палонных пачуліся крыкі унтэр-афіцэраў: Немцы—станоўцеся направа! Чэхі—налева! Вось там, каля студні! Палякі—каля прыбіральні!

Сыны Аўстрыі пачалі зьбірацца да сваіх нацыянальных купак. У чэхаў, палякаў і басьнякоў гэта выклікала радаснае хваляваньне і надзею на паварот да лепшага. Між палонных хадзілі чуткі, нібыта з чэхамі і славянамі абыходзяцца ў Расіі асабліва добра і што на іх глядзяць там не як на ворагаў; і вось, калі іх група адлучылася ад масы і стала ў баку, у іх з новай сілай загарэўся оптымізм.

— Нас, напэўна, будуць лепш карміць,—заўважыў настаўнік.

— Нас пакінуць у Расіі і не адправяць у Сібір,—дадаў вольнапісаны.

— Я заўсёды казаў, што добра быць чэхам,—ухмыльнуўся Швэйк.—Нават адзін наш поэт казаў: «Славяне ўсюды ёсьць браты».

Але тут зьявіўся дзяжурны фэльдфэбель па кухні і павёў адзін разьдзел за адным на абед.

Ён хадзіў ад купы да купы і лічыў палонных па пальцах. Потым вярнуўся і пачаў зноў лічыць, паківаў галавой і тупа паглядзеў у нейкую паперку. Адступіўшы крыху назад, ён няпэўным голасам крыкнуў:

— Дзе тут немцы?

— Тут!—грымнулі яны.

Ён зрабіў знак, каб яны ішлі за ім і далей:

— А чэхі?

— Тут!—грымнулі яшчэ гучней.

Ён паказаў ім рукой на месца за немцамі і, як чэхі занялі яго, спытаў:

— А мадзьяры дзе будуць?

— Эльен!—крыкнула купка гонвэдаў.

Ён паставіў іх за чэхамі, а потым прачытаў у паперцы:

— Палякі?

— Тут!—адказалі палякі і самі сталі за мадзьярамі.

Потым пайшлі сэрбы, круаты, італьянцы і русіны, а калі пляц перад ім апусьцеў, ён з роспаччу ў голасе прашаптаў: «А дзе-ж аўстрыйцы?» і не чакаючы адказу, пабег па капітана Кукушкіна на кухню далажыць яму, што сярод палонных няма ніводнага аўстрыйца.

— Быдла!—сказаў яму капітан.—Як гэта няма? Я-ж бачыў іх на свае вочы! У Аўстрыі жывуць аўстрыйцы і шмат іншых народаў,—пахваліўся ён сваімі ведамі, здабытымі ў юнкерскай школе.—Праўда, раней ніхто пра гэта і ня думаў; усё гэта была адна нямецкая ды аўстрыйская зграя. Але зараз загадана разьмеркаваць палонных па нацыянальнасьцях.

Ён пасьпяшаўся ўсьлед за здэтанаваным фэльдфэбелям, які баяўся, што ў яго бяз сьледу зьніклі аўстрыйцы, і што капітан пашле яго за гэта на фронт.

Капітан Кукушкін спыніўся перад складзеным у кучу хлебам і крыкнуў фэльдфэбелю:

— Ну, лічы, дурань. Вось тут аўстрыйцам, вось чэхам, гэта мадзьярам, тое палякам, а вось там—іншым. Навошта-ж, глупень, я-б загадаў выдаць аўстрыйцам хлеб, каб тут ня было аўстрыйцаў. А калі ўжо я загадваю выдаць хлеб, гэта значыць, што аўстрыйцы ёсьць.

Фэльдфэбель, напужаны незразумелым яму зьнікненьнем аўстрыйцаў, бо двор-жа вось толькі быў поўны людзьмі, якіх ён лічыў за аўстрыйцаў, канцом спалохаўся і, заікаючыся, прамармытаў:

— Так точна, ваша благародзьдзе! А як-жа? Сапраўды так!

— Вось я табе, курынаму сыну, зараз пакажу, колькі тут аўстрыйцаў,—ужо троху мякчэй сказаў капітан.—А ну, згані іх на тым баку зноў у адну кучу...

Ён узяў у фэльдфэбеля паперку і адлучыў немцаў, чэхаў і іншыя народы ды народзікі лапікавай монархіі адзін ад аднаго, як казлоў ад авец. І калі пасьля італьянцаў, якія засталіся на месцы, ён выклікаў: «аўстрыйцы»—пачуўся нейкі адзін хоць і гучны голас:

— Тут!

Гэта быў удалы ваяка Швэйк, які вызнаў, што ён аўстрыйскай нацыянальнасьці. Пасьля ён апраўдваўся:

— Не хацелася мне крыўдзіць нашага дзядульку, каб непрыяцель мог падумаць, нібыта ў яго апостальскай вялікасьці няма ніводнага вернападданага. Мне прышлося замазаць слабыя бакі нашай айчыны, як гэта рабіла мадам Пакорні з Лубачэва са сваей дачкой, калі ішла з ёй на танцы, каб мужчыны ня бачылі таго, што ім бачыць ня трэба.

Капітан Кукушкін сказаў Швэйку па-расійску, што найшлася, як відаць, між гэтага інтэрнацыянальнага быдла, прынамсі, хоць адна аўстрыйская сьвіньня, а потым узяў свайго фэльдфэбеля за каўнер, Швэйка за вуха, і стукнуў іх ілбамі, каб яны лепш пазнаёміліся і іншым разам пазнавалі адзін аднаго. Пры гэтым Швэйк сказаў:

— Так, так! Правільна! Хай ведаюць, як пазнаваць ворага і з чаго ён складаецца!

Пасьля Швэйк сказаў, што кучка хлеба, аддзеленая аўстрыйцам, павінна дастацца яму, адзінаму прадстаўніку гэтага насельніцтва Аўстрыі. Гэтая заява, перакладзеная капітану унтэрофіцэрам русінам, выклікала самую зацятую лаянку з боку капітана, які аддаўся сваім разрахункам, колькі аўстрыйцаў пакадзаць яму ў харчовай ведамасьці, і колькі можна на гэтай справе выгадаць, бо ў натуры іх было так мала. А калі Швэйк ня суніміўся і ўсё намагаўся свайго, спасылаючыся на тое, што ўсе

групы, незалежна ад іх ліку, атрымалі па роўнай кучцы, капітан кінуў фэльдфэбелю толькі два словы:

— У арыштоўню!

Потым, з хвіліну памаўчаўшы, у паўголасе дадаў:

— Дай яму па мордзе!

Фэльдфэбель даў Швэйку аплявуху—«такую, што ў мяне іскры з вачэй пасыпаліся», расказваў потым Швэйк,—а два салдаты падхапілі яго пад пашкі і павялі праз двор па доўгім калідоры ў сутарэньне з акутымі жалезам дзьвярыма, за якімі чуўся гучны рогат. Другі фэльдфэбель адчыніў дзьверы, схапіў Швэйка за каўнэр і штуршком нагі ў задніцу піхнуў яго ў сутарэньне.

У сутарэньні панаваў змрок. Швэйка абступіў натоўп расійскіх салдат. Яны з цікавасьцю разглядалі аўстрыйца, які трапіў да іх.

Гэта былі дэзэртыры, затрыманыя ў Кіеве, яны чакалі тут чарговай адпраўкі на фронт. Тым часам яны круцілі цыгаркі ды курылі іх, прапанавалі цыгарку, нібыта індэйцы—люльку згоды, Швэйку і пачалі запытвацца ў яго:

— Завошта цябе пасадзілі? Таксама «лётнік»? З фронту ўцёк, ці што?

— Я пакутую за тое, што не адрокся ад таго, за каго змагаўся,—казаў, уздыхнуўшы, Швэйк.

А расійскія зьняволеныя, не зразумеўшы яго, паблажліва заківалі галовамі.

— Пр-р-р-равільна! Ня трэба змагацца! Прэч вайну! Бі афіцэраў!

Яны пазычылі Швэйку конаўку, налілі яму чаю і пачаставалі яго сітным з кілбасой, просячы яго не сароміцца, а пасьля ачысьцілі яму месца на нарах, каб ён мог паляжаць і адпачнуць.

У той час, як Швэйк прыпамінаў падзеі гэтага дня, калі яго веды ўзбагаціліся словамі «арыштоўня» і «даць па мордзе», і прыходзіў да вынікаў, што быць у гэтай самай арыштоўні зусім ня горш таго, што з ім можа здарыцца,—рэшта палонных узьнялі на двары бойку за хлеб, не чакаючы пакуль унтэр-афіцэры яго разьмяркуюць. Зноў пайшлі ў ход кулакі; людзі азьвярэлі, білі адзін аднаго, намагаючыся ўдарыць як найбалючай, пакуль вартавыя бізунамі не разагналі іх па мясцох.

Быў вечар; у вокны арыштоўні глядзелі зоры, а на званіцы аднэй царквы, акурат за кашарамі, зазванілі на вячэрню. На сьценах над нарамі капцелі газавыя лямпачкі з разьбітымі шкламі. Арыштанты зьбіраліся ўсе ў купу, п'ючы чай, і, пачаваўшы і Швэйка, узяліся гуляць у карты і сьпяваць песьні.

Ніхто не зварачаў больш увагі на Швэйка. Ён схаваў у торбу кавалак сітнага з кілбасой, які яму паклалі на конаўку і які ён ня мог ужо даесьці. Калі арыштаваных пачалі выпускаць «да ветру»—у прыбіральню выйшаў і Швэйк; там яму далі з сабой сьмярдзючы дрыўляны цабэрак, «парашу», якая ставілася на ноч у арыштоўню. Потым ён прысунуў да высокага вакна нейкую скрынку і ўзьлез на яе.

Дэзэртыры сьпявалі то працяжныя сумныя песьні, то дрындушкі з прыпеўкамі: «афіцэрам усім паёк, а салдатам кіпяток», і Швэйк, ахінаючы іх братэрскім, ласкавым позіркам, сказаў сабе:

— Так, у славян усюды ёсьць браты.

На двары панавала цішыня, такая-ж неабсяжная, як неба, якое распасьцерлася над змрокамі зямлі. У Швэйкаву душу пратачылася журба і смутак, і перад ім, як жывыя, паўсталі яго таварышы па палку: вольнапісаны Марэк, і Балун, і паручнік Лукаш... Ён глыбока ўздыхнуў:

— Залаты мой паручнік,—прашаптаў ён—ці не заелі цябе без мяне вошы. Адкуль ведаць, які зараз у яго ідыёт дзяншчык!..

Ягоныя думкі пайшлі, дзякуючы гэтаму, у іншым кірунку, і Швэйку прыпомнілася песьня, якую ў іх сьпявалі ў акопах і якая адначасова выяўляла сум і малявала становішча. І вось яго моцны голас уліўся ў хор расійскіх салдатаў:

Я, дзяўчаткі, вам ня пара,
Бо я вырас на папары.
А як будзеш тут прыгожы,
Калі цела точаць вошы.
На іх палюю кожны дзень,—
Мне пра іх і думаць лень.
Як ня чышчу я штаны—
Усё вашывыя яны.
Калі пачуецца „зважай"—
Мне ад сьвербу хоць канай.
Хто ціка выстаіць, калі
Усе лыткі вошы абгрызьлі.

Швэйк скончыў, выпрастаўся на нарах і накрыўся шынэлем; а яго таварышы па арыштоўні, якія змоўклі падчас яго песьні, зноў пачалі гуляць у карты і гарланіць, пазіраючы на палоннага і спагадліва кажучы:

— Вось гэта добра! Хоць у вас народ і не праваслаўны, а малітзы прыгожыя. А скажы, брат аўстрыяк, ці праўда, што ў вас усе людзі пісьменныя?

Засынаючы, Швэйк яшчэ раз прыпомніў, што ён у арыштоўні, і, задаволены сваім лёсам, пазяхнуў.

— Тут,—наважыў ён,—салдат лупуюць па мордзе, паліцыя зьбівае народ, і ў арыштоўню трапіць зусім нават проста. Адным словам, усё тут акурат так, як і ў Аўстрыі; Расія, як відаць, таксама добра ўпарадкаваная краіна.

4

У ДАРНІЦЫ

Неразгаданае і падазронае зьявішча: ва ўсіх падручніках на чужаземных мовах можна знайсьці ці толькі «салёныя» словы, шляхетныя сказы і самыя тонкія вялікапанскія выразы. Міжнародныя формы зносін дэпутацый і дэлегацый на ўсякіх выстаўках ды конгрэсах зьяўляюцца ўдасканелай крышталізацыяй высокіх зваротаў, сплеценых, нібы шлюбны букет, з шляхетных, далікатных «панскіх» слоў і гавораць яны скрозь пра адны тыя самыя высокія, ідэальныя, поэтычныя матэрыі.

Слоў, якімі гаворыць і якімі карыстаецца просты народ, не знайсьці ні ў водным падручніку, хоць першае, чаму вучыцца чужаземец, прыехаўшы ў незнаёмую краіну,—гэта лаянка і цынічныя словы ў чужой мове. Гэта старадаўняя практыка і паўтараецца яна на кожным кроку. Хто перабыў адзін месяц у Італіі, не памятае праз паўгода, як завецца па-італьянску «віно», але памінаць імя мадоны ў лаянцы ён не адвучыцца за ўсё жыцьцё. Або які-небудзь маленькі чужаземец, завучаючы ў школе нямецкую мову, цікавіцца менш тым, як сказаць па-нямецку: «трэба паважаць бацькоў», чымся тым, як сказаць свайму дакучнаму таварышу: «ідзі, чорт паганы, дурань».

Таму ня трэба дзівіцца, што лексыкон Швэйка быў у некаторай меры аднабокі і пашыраўся побач з рэчамі штодзеннага ўжытку адно за кошт лаянкі; ён хутка навучыўся выгаворваць яе як мае быць, каб не пазбавіць яе сакавітасьці.

У арыштоўні ён прасядзеў двое сутак; пад канец другіх сутак зьявіўся аглядаць арыштоўню нейкі генэрал і, заўважыўшы між расійцаў Швэйка, спытаў, завошта ён сядзіць. Калі капітан Кукушкін далажыў, што Швэйк пакараны за грубіянства і за-

мах на небясьпеку Расійскай імпэрыі, генэрал усьміхнуўся Швэйку і сказаў яму па-нямецку:

— Аўстрыйскі салдат заўсёды быў верны салдат,—а потым зьвярнуўся да капітана і па-расійску дадаў:—не пакідайце яго пад арыштам, а ганеце яго на работу. Хіба вы думаеце, што гэтыя нягоднікі будуць дарма есьці расійскі хлеб?

Назаўтра ўраньні да Швэйка прыставілі двух салдатаў са штыхамі і яго павялі з кашараў па горадзе.

Вартавыя былі добрыя і вясёлыя хлопцы; яны ішлі ўскраінамі, мінаючы вялікія вуліцы і людныя пляцы, спыняючыся, сьмяяліся і гутарылі з кухаркамі і паказвалі ім палоннага паставарыску і вольна.

Яны навучылі яго гаварыць дзяўчатам і жанчынам нейкі выраз, пасьля якога тыя кожны раз беглі ўбок, або пачыналі лаяцца. А, угледзеўшы няўцямна-добрадушнае аблічча Швэйка, які пяўся зразумець сэнс гэтага выразу, яны ілюстравалі яго адпаведнымі гэстамі.

Такім чынам Швэйк навучыўся парушаць сёмую і дзесятую запаведзі. Гэта азначае: зажадаў жонкі блізкага свайго.

Нейкая тлустая бабулька, якую Швэйк таксама зачапіў завучаным зваротам, «руская баба» спынілася і завяла з канвойнымі гутарку, каб даведацца, чаго нарабіў палонны і куды яго вядуць. Атрымаўшы адпаведны адказ, яна павярнула да Швэйка свой спагадлівы твар:

— Ах ты, небарака! А жонка ў цябе ёсьць? А дзеці?

— Так, так, добра,—не разумеючы кінуў ёй Швэйк.

Старая не сунімалася гаварыць, кідаючы нешта ў рот і зноў выплёўваючы. Пасьля яна перасыпала салдатам з торбачкі, якую трымала ў руках, нечага ў кішэні, і салдаты таксама пачалі нешта грызьці і выплёўваць. Бабулька паглядзела на іх і на Швэйка, і калі салдаты, ня зьнімаючы вачэй, моўчкі кіўнулі галавой, насыпала нечага з мяшка і яму ў кішэню. Швэйк, дастаў пальцамі жменьку таго, што яму далі (гэта было неачышчанае ад шалупы насеньне сонечніку, буйнае, падпражанае).

Бачачы, як ядуць іншыя, Швэйк паклаў адно зярнятка ў рот, адкусіў кончык, ачысьціў шалупайку пазногцем, а потым раскусіў ачышчанае зерня. Салдаты зарагаталі і сказалі:

— Эх, ня ўмееш ты!

— Так няможна. Вось, глядзі, як трэба,—замятушылася бабулька, са спрытам старой малпы, кідаючы сонечнік у рот. Шалупайкі выляталі адтуль, як мякіна з малатарні.—Вось у нас як ядуць, па-расійску, значыцца!

У Швэйка абудзіўся гонар. Ён схапіў цэлыя прыгоршчы сонешніку, усыпаў яго ў рот, пажваў і сказаў з выразам агіды:

— Думаеш я збльшу перад табой, га?

Бабулька вельмі ўзрадвалася і зьдзівілася з яго шчырасьці, стараючыся яму штосьці растлумачыць, прычым яе твар так наблізіўся да яго твару, што шалупайкі ляцелі каля самых яго вушэй. Але раптам Швэйк закашляўся і ўсё, што ў яго было ў роце, выляцела, як з гарматы.

Добрая бабулька, якая хацела навучыць Швэйка есьці сонешнік «па-расійску», была ўся заплёвана. Яна перапалохалася і лупсянула такую лаянку, што палонны нават пашкадаваў, чаму ён не разумее, што гэта азначае; потым бабулька пабегла, а Швэйк далікатна пусьціў ёй усьлед:

— Вось гэта па-нашаму, па-аўстрыйску!

За Кіевам яны выйшлі ў поле, абмінулі чыгуначную лінію і хутка дайшлі да лягеру ў Дарніцы.

Лягер займаў рэдзенькі хваёвы гаёк, які быў абгароджаны калючым дротам. У адным кутку відаць была нейкая павець, пад якою былі ўкапаны ў зямлю вялічэзныя катлы, а ў баку стаяў невялічкі драўляны дом, дзе разьмясьціліся канцылярыя ўправы концэнтрацыйнага лягеру.

У Швэйка было ўражаньне, нібы ён трапіў у тлусты, сінявы бруд, якому нейкая невядомая сіла надавала самыя разнастайныя формы, то зьбіраючы ў клубкі, то перамешваючы ўсё адно з адным, нібы рукі кухаркі цеста да сьвяточнага пірага, перарабляючы яго за колькі хвілін у абаранкі ці коржыкі.

Як дасягала вока, былі відаць навокал палонныя. Адны ляжалі пад дрэвамі з атупелым выразам змардаванай жывёлы, іншыя сядзелі на ранцах, напалавіну пустых, або зьбіваліся ў шчыльныя купкі і таўпіліся вакол катлоў, ад якіх расійскія салдаты адганялі іх кіямі. Урэшце, былі і такія, якія, поўзаючы ракам, шчыпалі рэдзенькую траву і клалі яе са сьмешным выразам прагнасьці, дзікага голаду і агіды сабе ў рот.

Каму давялося хоць адзін дзень перабыць у Дарніцы, той рабіўся на ўсё жыцьцё самым заўзятым антымілітарыстам.

Вайна адсоўвала ад салдат рай з кожным днём усё далей і далей, у той самы час ствараючы ў сваіх нетрах найцяжэйшыя пакуты, за якімі ішло пекла ў Дарніцы.

Ад 80 да 100 чалавек памірала там штодня з голаду і зморы, а бязглуздае, зусім ашалелае вышэйшае начальства накіроўвала туды палонных партыю за партыяй. У тым лясочку было ад 20 да 30 тысяч палонных, і ў названых некалькіх катлох павінна была ўжо гатавацца яда для ўсіх іх.

Калі Швэйк, шукаючы месца, прашываўся праз гэты натоўп, ступаў цераз ляжачых і абыходзіў тых, якія спалі, седзячы (гэта былі людзі, якіх булка хлеба, зваліўшыся з дрэва, больш усхвалявала-б, чым разарваная паміж іх граната), акурат у гэты час падбіралі нябожчыкаў. Іх проста цягнулі за ногі, як нейкую падлу; галовы іх біліся аб карэньні хвой, і Швэйк, зьдзіўлены гэтай карцінай, сказаў расійскаму салдату, што прачышчаў сабе дарогу прыкладам:

— Вось сюды каб пасладь тых графінь, што складаюць таварыства аховы жывёлы ў Празе.

Ён знайшоў, нарэшце, вольнае месца і сеў. Заўважыўшы, што яго ранец з гатовымі лопнуць швамі і вялічэзнай дзіркай выклікаў агульную ўвагу і прыцягваў прагныя і зайздросныя позіркі, ён выцягнуў кавалак хлеба і падаў яго бліжэйшаму суседу. Але ў адну хвіліну за яго ўхапіліся два дзесяткі рук, ушчэнт пакрыўшы яго, і Швэйк пераканаўся, што калі быць міласэрным, дык гэта значыць—галадаваць самому.

Таму за полуднем ён асьцярожна даставаў хлеб з ранцу маленькімі кавалачкамі і клаў іх адзін за адным у рот. Раптам ён інстынктыўна адчуў, што нехта ўпарта глядзіць на яго.

Швэйк павярнуў галаву ў той бок; на пні сядзеў нейкі салдат і, ня зводзячы вачэй, глядзеў на працу Швэйкавых зубоў.

Калі Швэйк павярнуўся да яго тварам, той закрыўся рукой ад сонца і разгублена стаў азірацца, а потым павольна ўстаў, падыйшоўшы да Швэйка і, нахіліўшыся да яго, сказаў:

— У вас ёсьць хлеб і вось якая шчасьлівая прыгода—вы-ж Швэйк, ці праўда?

Той дапытліва паглядзеў на незнаёмага. А потым ускочыў і падаў яму абедзьве рукі.

— Марэк! Вольнапёр! Ты таксама тут, дружа?

— Я ўжо трэці дзень тут, Швэйк,—адказаў вольнапісаны Марэк.—Мяне прывезьлі сюды з Паддубна на цягніку, я пяцёра сутак нічога ня еў, апрача некалькіх нясьпелых ігруш.

Швэйк паставіў ранец паміж кален, прыкрыў яго сваім целам, выцягнуў кавалак хлеба і прашаптаў Марэку:

— Еж, толькі памалу, каб ніхто ня бачыў.

Той зьдзеў шапку, накрыў ёй хлеб, лёг на жывот і прытуліўся шчакамі да шапкі. Швэйк зразумеў практычнасьць такога мэтоду і ўхвальна сказаў:

— Хвацка ў цябе гэта выходзіць, дружа! Яно нават лепш, чым калі конь есьць авёс з торбы. Толькі скажы мне, калі ласка, дзе ты дзеў сваё пуза? Быў такі тоўсты, а цяпер зад у цябе, як шыла востры.

І ён падсунуў Марэку яшчэ кавалак хлеба з кілбасой. Праз некалькі хвілін Марэк устаў і прысеў на куртачках. Шапка была так вычышчана, што нават ня прышлося вытрасаць з яе крошкі, і Марэк, з удзячнасьцю гледзячы на Швэйка, разьвязаў свой ранец і сказаў:

— Дружа, ты накарміў галоднага і зрабіў чалавечалюбны ўчынак. Вось паглядзі, у мяне ёсьць яшчэ адна запасная пара апоркаў, а ты босы. Бяры іх, калі ласка! Я даўно мог-бы прадаць іх за дзесяць капеек, але я прадбачыў, што воляй лёсу ў мяне зьявіцца больш добры купец і не памыліўся. Лёс паслаў мне цябе, Швэйк!

— Ды мне вельмі прыемна хадзіць босанож, у мяне ногі не такія ўжо далікатныя,—паспрабаваў адмовіцца Швэйк.—Я ад самой мяжы дайшоў сюды босы.

Але Марэк не супімаўся, угаворваў яго і выказаў небясьпеку, што яго чаравікі могуць і ўкрасьці, а таму Швэйк, ацаніўшы становішча з пункту погляду нядаўнае «ператрускі» ў Кіеве, зрэшты здаўся і зараз-жа набуў іх на свае ногі.

Скруціўшы сабе і Марэку з газэтнае паперы па цыгарцы, ён закурыў і пачаў распытваць:

— Ты-ж раней быў пад Бродамі? Юрайда, памятую, пайшоў з табой на перавязачны пункт. Якім-жа чынам здарылася, што ты чакаў мяне тут у Расіі?

— Пад Бродамі я сам сябе параніў,—паправіў яго вольнапісаны,—але параніў я сябе няўдала,—куля толькі лёгка зачапіла руку. Чорт яго ведае, што гэта такое: ідзеш у бойку, як

цялё ў разьніцу, ведаючы, што знарад гатоў адарваць табе галаву ці абедзьве нагі, а вось не хапае духу адстрэліць сабе два пальцы. Я перш хацеў выпаліць сабе ў далонь, а потым усё адводзіў і адводзіў сваю руку ад рулі, дык у мяне адарвала толькі кавалачак мякішу. Прасядзеў усяго тыдзень у шпіталі ў Будапэшце, і калі ласка—усё загаілася.

— Што-ж, цябе адразу-ж выправілі з маршавай ротай на фронт?—з цікавасьцю спытаў Швэйк.—Няўжо табе не ўдалося як-небудзь злаўчыцца і застацца ў лазарэце? Кажуць, што маршавыя роты гоняць зараз на фронт так, як зьбіраюць на пагарэлае: «хто хутка дае, дае ўдвая». Або калі футболісты заклікаюць на свае спаборніцтва: «Толькі дзеці ды тыя, хто памірае, ня лічачы нябожчыкаў, могуць заставацца дома!»

Марэк апусьціў долу галаву і апёрся локцямі аб калены.

— Дый так яно і ёсьць, але ніхто, напэўна, ня ведае, што ў нас робіцца,—азваўся ён.—Гэта-ж такая загадкавая гісторыя, як адзіны бог у трох абліччах. Дзяржава б'ецца з няпрыяцелем, а насельніцтва б'ецца з дзяржавай. Мусіць канец быў-бы дзяржаве, каб не дактары. Усе салдаты, што ня хочуць біцца з няпрыяцелем, б'юцца з дзяржавай. Кожны з іх бяз рукі, або язык адняло, як бомбай ашалушыла, або слых страціў праз выбух, або ўвесь чыста трасецца пасьля контузіі, або кульгае праз раматус, або хворы на ішыяс; сухоты, камені ў нырках, на парок сэрца, або траха што не звар'яцеў праз запаленьне мазгавой абалонкі. А дактары б'юцца з імі на сьмерць, а навука перамагае. Навука, нібы тая простытутка, служыць ня шчасьцю чалавецтва, а ягонаму няшчасьцю. І ўсё гэта—за грошы! Мобілізуюць якога-небудзь доктара—і вось ён зьнішчае пры аглядзе пасьведчаньне аб цяжкай хваробе, што выдаў сам-жа пацыенту да прызыву, і кідае паперку на падлогу са словамі: «Пытаньне, ці хворыя вы, вырашаю цяпер я!»

— Значыцца, дактары і табе падсабілі?—перапыніў Швэйк таварыша, што ўдаўся ў філёзофію.—Напэўна, здарава такі яны табе ўпялі, калі ты на іх так гаворыш?

Марэк у задуменьні паматаў галавою.

— З Будапэшту, дзе я сьцьвярджаў, што не магу кратаць рукой, мяне накіравалі ў Пардубіцэ, каб дактары ў другое агледзелі. А доктар мне кажа: «Вы будзеце там як дома: шпіталь вялікі, есьці даюць добра, дактары—амаль усе чэхі, і вы, на-

пэўна, затрымаецеся там на колькі тыдняў». Ну, прыехалі мы ў Пардубіцэ. Дапраўды, шпіталь вялізарны: пяць карпусоў, у кожным з іх—па сорак палат. Усё разьмеркавана па аддзяленьнях: у першым корпусе—вэнэрыкі і ўсё, што з гэтай опэры; у другім—хворыя на тыфус, дызэнтэрыю, халеру; у трэцім корпусе знайшлося месца для нас, хірургічных з фронту. Быў час, калі досыць было толькі прайсьці амбуляторыю, і калі палкавы доктар прызнаваў цябе за хворага, дык шпітальны доктар нават не турбаваўся, каб агледзець цябе. Ён лічыў, што, каб чалавек быў здаровы, дык калега не накіраваў-бы яго ў шпіталь, і ахвотна даваў такому чалавеку крыху адпачнуць. У іх нават было ўстаноўлена, што параненыя мелі адпачынку паўтары месяцы, рэўматыкі і хворыя на парок сэрца—месяц. Так, раней чалавека з больніцы не выганялі.

— А вось я ведаў аднаго Рысса з Млады-Болеславі, які служыў за вартавога на аўтомобільным заводзе, а за мобілізацыю трапіў у 10-ы ландвэрны полк,—падхапіў Швэйк.—Дык той прыходзіць у кашары і заяўляе, што ў яго нешта нядобрае з сэрцам. Палкавы доктар агледзеў яго і кажа: «Я вас, сымулянта, у карцары згнаю! Сэрца здаровае, як у каня!» Той пайшоў дадому, узяў на заводзе бюлетэнь, ды зварочваецца да доктара страхкасы: «Так, і так, баліць сэрца, не магу працаваць». Страхавы доктар выслухаў яго; напісаў рэцэпт. «У вас,—кажа,—праца не цяжкая, дык вы дома не сядзіце. Вось ужывайце гэтыя лекі, па тры лыжкі на дзень, а калі не дапаможа, дык прыходзьце зноў. Але вы павінны берагчы сябе, Рысс». Той у бліжэйшую нядзелю апрануўся па-сьвяточнаму і паехаў у Прагу да профэсара. Профэсар уважліва агледзеў яго і запытаў: «У вас ёсьць жонка і дзеці? Вы застрахаваліся на іхную карысьць на выпадак сьмерці? Справа ваша дрэнная, дружа! Вам трэба ляжаць, вам няможна хваляваўца, няможна піць піва і чорную каву... Вось вам мікстура, а праз тыдзень заходзьце зноў». Пра гэта апавядаў нам сам Рысс у рэстаране, дзе ён заказваў пасьля кожнага куфля піва па кубку чорнай кавы з вялікай чаркай каньяку, кажучы, што ўва ўсіх дактароў адна навука, гэта азначае, што ўсе яны ў ёй мала разумеюць і ўсе аднолькавыя сьвіньні. І спрачаўся, што каб гэты профэсар быў за палкавога доктара, дык-бы прагнаў яго, а каб палкавы доктар быў на пасадзе профэсара, дык сам-бы паклаў яго ў ложак.

— Так, чалавек ёсьць продукт навакольнага асяродзішча,— у задуме сказаў Марэк.—Але ў Пардубіцэ ва ўсіх дактароў быў прынцып кожнага вылечваць, ды так вылечваць, каб ён усё жыцьцё не забыўся на гэта. Салдат, прыехаўшы туды, хоць і крэнхаў, нібы той Лазар, але выходзіў з адзнакай: «Здатны служыць». Разам са мной быў адзін кравец з Кралове-Градца, які заўжды гаварыў: «Пане вольнапісаны, я магу сказаць толькі адно: тут ня шпіталь, а бандыцкае гняздо, катавальня». Гэта было зусім слушна: там лячылі толькі электрычнасьцю і голадам, выганяючы хваробы з цела, як за часамі гішпанскай інквізыцыі— д'ябла з ведзьмаў. Галоўны інквізытар там быў адзін доктар Краус з Прагі, а доктар Папенгэйм быў у яго за памочніка. Гэтыя два суб'екты маглі падымаць хворых на ногі! У 13-м бараку знаходзіліся машыны для электрызацыі; з вечару фэльдфэбель чытаў нам сьпіс тых, хто павінен быў раніцой туды прысьці, і людзі, якія там пабылі, ня спалі ўсю ноч—яны так баяліся гэтай мэханікі! Ну, зьявіўся і я туды, і доктар Краус агледзеў маю руку. Гэта быў тоўсты чалавек, з лысай, як більярдная куля, галавой, бліскучым чэрапам і маленькімі вочкамі. Вочкі тыя заплылі, як у сьвіньні, і былі хітрыя, як у сарокі. Пацмокваючы тоўстую цыгару, ён з усьмешкай паглядзеў на мае паперы. «Значыцца, вольнапісаны,—кажа ён,—у вас руку адняло? Ад агнястрэльнай раны ці ад раматусу? Ну, дармо, ня бойцеся, мы хутка вылячым! Аўстрыі патрэбны інтэлігэнты з здаровымі рукамі! Пачакайце хвілінку, спачатку мы пусьцім больш лёгкіх хворых». І вось,—вёў далей сваё апавяданьне Марэк,—ён выклікае нейкага Чэрмака, такога старога ландштурміста з 7-й брыгады. Той адказвае: «Тут!» і кульгае да доктара, апіраючыся на два кіі і схіліўшыся ў тры пагібелі,—проста жах глядзець. «Небарака,—думаю я,—што з табой яшчэ можна зрабіць? Твая справа пэўная». А доктар Краус зірнуў у паперы і пытае: «З чаго гэта ў вас сталася? Цяжкавата з вамі будзе!»— «Гэта мяне так у Літармэржыцы абрабілі, пане галоўны ўрач,— хрыпіць Чэрмак.—Мяне спачатку саджалі ў паравую ванну, а потым аблівалі халоднай вадой, і вось цяпер я паварушыцца не магу. Усё ў мяне баліць, а ногі ў мяне—як цеҗяшы». Доктар толькі далікатна ўсьміхнуўся: «Дармо, дармо! Калі ласка на гэты столік, распранецеся, ляжце на жывот, заплюшчыце вочы, а калі я вас пакалю голкай, скажэце: «Цяпер!» І ён сапраўды

коліць яго цела голкаю, з пятак да галавы, і Чэрмак уздыхае: «Не яшчэ. Не яшчэ. Усё яшчэ не... А вось цяпер, так!» Калі-ж доктару абрыдзелі досьледы з голкай, ён пасадзіў Чэрмака на крэсла і пачаў стукаць малатком па каленях. Чэрмак адбіваўся, крычаў, што яму баліць, што калені ў яго дужа ломіць... Тады доктар паклаў яму на рукі мядзяную шчотку, а на ногі другую і пусьціў ток, а Чэрмак як завые: «Ой, ня вытрымаю, пане доктар, ня вытрываю! Ой, сьвятыя ўгоднікі, сьмерць мая прышла!» Нарэшце, доктар Краус выключыў ток і строга загадвае: «А цяпер, даражэнькі, кіньце прыкідацца і йдзеце проста, чорт вас забяры!» І што-ж: Чэрмак пайшоў сабе, нібы ён ніколі і ня кульгаў. Доктар яму яшчэ: «Цяпер—бегма, шпаркім крокам! Дзесяць хвілін—бегма! Чэрмак і гэта выканаў, пакуль не атрымаў адзнакі: «Здатны!» А Краус гэты самы блісну́ў на мяне сваімі сьвінымі вачыма і кажа: «Вы, вольнапісаны, у тэхнікуме вучыцеся? Значыцца, вы пра дзівы тэхнікі ведаеце?»

— У Празе, у адным шпіталі неяк электрызавалі турка,— успомніў Швэйк,—дык той зароў, як леў, вырваўся і ўцёк, і толькі ўвечары яго затрымалі недзе за горадам. Мне давялося недзе чытаць, што ў Амэрыцы, у Нью-Ёрку, адзін нэгр, які забіў фэрмэра і згвалціў ягоную прабабку, пасьля таго, як быў абвінавачаны ў блудзе з аднэй распуснай дзяўчынай, сарваўся з электрычнага крэсла і ўцёк, а потым утапіўся ў Панамскім канале. Відаць, гэта электрычнасьць будзе мацнейшая, чым тая, якую за пяць хэльлераў пушчае стары ў піўной «Флек», але ўсё-ж я ведаў чалавека, на прозьвішча Хазапэрк, які вытрымліваў і ня гэткія рэчы.

— Потым доктар Краус,—казаў далей Марэк,—загадаў легчы на стол аднаму салдату, які быў аглушаны выбухам міны і больш чым паўгода ня мог гаварыць. Доктар паклаў на яго шчоткі і пачаў памалу падбаўляць току. Спачатку хлопец толькі падсьвістваў, потым запішчэў, потым завыў і нарэшце, так зароў, што ў нас валасы ўзьняліся тарчма ад жудасьці. А доктар адно і ведае, што прыціскае шчоткі ды ласкава прыгаварвае: «Толькі адно слова скажэце «Пардубіцэ!»—«Пардубіцэ!»— грымнуў салдат, як кандуктар, аж увесь барак задрыжэў. Доктар намаляваў у яго паперах: «Здатны» і ласкава навучае яго: «Вось гэтага слова «Пардубіцэ» і доктара Крауса, які вас навучыў яго вымаўляць, вы ніколі, аж да сьмерці, не забывайце!»—

— Я таксама ведаў нейкага Мэстэка з Падскаля,—зазначыў Швэйк,—які заўсёды хадзіў у Бранік гуляць у кэглі. А аднойчы, п'яны, ён зваліўся з Вышэградзкіх бастыёнаў і, калі ён ляжаў пры сьмерці ў гарадзкой больніцы і поп пытаўся ў яго, якое ў яго апошняе жаданьне, ён успомніў чатыры словы: «Пеце толькі Бранікскае піва!»

— Пасьля яго прывезьлі нейкага Тушічку з Яромэржу,—апавядаў Марэк,—прыгожага хлопца, гандлёвага служачага, з 89-га палка. І яго Краус электрызаваў і так добра вылячыў, што той сам павёз сваю цялежку. Потым ён узяўся за ўзводнага Бартака з Хлумэка. Гэты быў глуханямы і адно спаўзаў з катавальні; ён з маленьнем працягваў да доктара рукі, каб той не катаваў яго сваёй навукай, як морскую сьвінку. А нейкага Шлінгэра з Броумова, якому каваклкам знараду разьбіла костку і парвала жыльле пад каленем, так наэлектрызавалі, што пасьля гэтага ён ўзяў ды задавіўся. А доктар перабірае аднаго за адным і, не пакідаючы бязьвінна ўсьміхаецца, кажа: «Паслухайце, вольнапісаны, вы памятаеце з біблейскай гісторыі Хрыстовы дзівы? Дык вось, мы робім тое-самае. Але з прычыны таго, што вы з Прагі, дык я пашлю вас туды, каб вы маглі наведаць сваю маці; а потым вам ужо самахоць прыдзецца прасіцца на фронт. Аўстрыі патрэбны салдаты. Інтэлігэнцыя павінна даваць добры прыклад народу, гэтаму быдлу. Хаця, калі вы думаеце, што ў вас пакалечана рука, дык я яе магу вылячыць цудам. Вы-ж бачылі: глухія пачалі чуць, сьлепакі—бачыць, кульгавы ўзяў пасьцелі свае і пайшоў, і нябожчыкі аджываюць. Зрабіць яшчэ адно цуда для мяне дужа лёгка!» Такім чынам, я пакінуў «Прытулак жудасьці», як мы назвалі 13-ты барак у Пардубіцы, і перавёўся ў гарнізонны шпіталь на Карлавым пляцы ў Празе. За начальніка шпіталю быў сусьветна-вядомы лекар, доктар Губэр, які ніколі ня меў пацыентаў, але за тое лавіў салдат у калідорах і адтуль проста пасылаў на фронт. Мы звалі яго «Белая дама». Ён часта любіў гаварыць, што нам нехапае толькі крыху аўстрыйскай крыві.

— У Младэ-Болеславе,—зноў перапыніў яго Швэйк, якому здалося што ўвесь час гаворыць адзін Марэк,—за палкавога доктара быў нейкі доктар Роубічак, хоць да часу прызыву ён быў акушорам, як доктар Мундзі. Дык ён сказаў майму знаёмаму Сланаржу з Лібаню, калі той пачаў скардзіцца на раматус і

пухліну ў калене: «Гэта глупства! Крыху баявога запалу вас зусім вылячыць!» А Сланарж яму ў адказ: «Ці не дасьцё вы мне кілё гэтага сродку, пане доктар?» Тады Роубічак вылаяў яго аслом, быдлам, вярблюдам, сабакам і пачаў крычаць: «Я вас вылечу, нягодніка, падлюгу, чэскую сьвіньню!» Сланарж яму зноў: «Шчыра дзякую, пане вэтэрынарны ўрач!» Ну, яго адразу-ж арыштавалі, а потым з першай маршавай ротай выправілі на фронт.

— Там, на Карлавым пляцы,—скончыў Марэк,—адна з сёстраў схавала мяне ад Губэра. Я быў ужо там тыдзень, пакуль, нарэшце, ён не злавіў мяне ў прыбіральні. Тут-жа ў прыбіральні ён прыклаў вуха да мае курткі, паслухаў, як б'ецца ў мяне пад кішэнямі сэрца, а потым пацягнуў мяне ў канцылярыю. «Гэтага чалавека зараз-жа накіраваць у кадр, каб ён паслужыў нашай справядлівай справе!»

— А як вас кармілі ў тэтым шпіталі?—запытаўся Швэйк.

— Нішто сабе,—адказаў Марэк,—але толькі пасьля вячэры нас прымушалі сьпяваць аўстрыйскі гімн, пакуль дактары яшчэ ня выйшлі, а потым, перад сном, яшчэ раз. Першыя радкі мы сьпявалі як мае быць, але толькі з прымусу. А другія нам былі больш да спадобы, бо іх мы самі прыдумалі, і з' даволі няпрыстойным зьместам, але мы сьпявалі яго з такім пачуцьцём, што нават Губэр, праходзячы часам міма і пачуўшы нашы сьпевы, прыкладаў руку да шапкі і казаў свайму асыстэнту: «А чэхі-ж зусім не такія ўжо здраднікі сваёй бацькаўшчыне!» Ах, добры быў час! Але потым неяк раптам пасыпаліся ўдар за ўдарам: Кіраліхіда, маршавая рота, фронт, невялічкая справа пад Роўна, дзе нам ізноў наклалі, а потым расійцы,—скончыў вольнапісаны, пазяхаючы.—Ах, як мне спаць хочацца!

— Чакай, цяпер я раскажу табе пра мае прыгоды,—засупярэчыў Швэйк.—Я трапіў у палон выключна праз нейкае непаразуменьне, і мяне пасьля вайны не пакараюць, як тых, што самахоць узьнімалі рукі. Справа ў тым, што мяне аддала ў рукі ворагаў дурная, шалёная карова. Марэк, каб ня было гэтага непаразуменьня, наш імпэратар ужо можа-б перамог!

І Швэйк расказаў усё, што з ім было ад таго дню, як яны разыйшліся з Марэкам, да таго, калі яны зноў спаткаліся. Але потым, заўважыўшы, што ў Марэка вочы заплюшчваюцца ад

стомы, у чым часткова вінаваты быў поўны страўнік, ён зьлітаваўся, дазволіў яму легчы і прашаптаў, кладучы ранец паміж сабой і Марэкам.

— Калі ты ўначы захочаш есьці, дык вазьмі адсюль. Мабыць, нам пашчасьціць тут што-небудзь знайсьці; я зноў эраблю так, каб мяне пасадзілі ў арыштоўню. Ты, браце, яшчэ ня ведаеш тутэйшых парадкаў. А таму, у разе якой патрэбы, зьвярдайся да мяне. Я ўжо ўмею гаварыць па-расійску і ведаю, як тут трэба дзейнічаць. Добра, Марэк, добра?

— Добра, пан, так!—прамармытаў Марэк у паўсьне.— Швэйк лёг каля яго, падклаўшы сабе некалькі сасновых шышак пад галаву.

— Ня спаць дужа моцна, каб нас не абакралі!—былі яго апошнія словы.—Так, так, гара з гарой ня зыходзяцца, а людзі...

У небе ясна зьзялі зоры, а паміж дарніцкіх сасёнак блукалі змучаныя людзі, шукаючы што-небудзь зьесьці, як бяспрытульныя сабакі.

*

Малюнак дарніцкага лягэру не зьмяніўся за ноч. Раніцой зноў зьнесьлі колькі мерцьвякоў і закапалі іх нездалёк пад соснамі. А тыя, што з голаду самі гатовы былі памерці, глядзелі тупа, бяз цікавасьці і хваляваньня на капаньне магіл, як на акт, які павінен няўхільна закончыць тое, што яны да гэтага часу перажылі.

У групах палонных, што ляжалі пад дрэвамі, салдаты яшчэ і яшчэ знаходзілі такіх, якія ўжо адпакутвалі сваё і больш не варушыліся. Яны цягнулі іх за драцяную загароду, не зважаючы на іскаркі жыцьця, якія можа яшчэ цьмелі ў гэтым попеле. Яны таксама думалі, што ў палоне і на вайне зусім ня можа быць іначай, і калі заўважалі, што той, каго яны несьлі, яшчэ спрабаваў быў расплюшчыць вочы, каб у апошні раз зірнуць на белы сьвет, абернуты людзьмі ў катавальню, яны яго коратка супакойвалі:

— Усё роўна, браце, падохнеш, як сабака!

А шостай гадзіне ланцуг расійскіх салдат адлучыў частку палонных ад усяе грамады. Яны прыкладамі і бізунамі ўзьнімалі тых, што спалі, і сагналі іх у адно месца, пакрыкваючы:

— Ну, ну, уставай! На працу!

Кіеў умацоўвалі і на капаньне акопаў ды пабудову драцяных загарод пастанавілі выкарыстаць палонных аўстрыйцаў. Славянская Расія, таксама як і Аўстрыя і Германія, зусім не хацела дарма карміць гэты чалавечы матэрыял, які ратаваўся ў палоне ад вайны, ці дазволіць яму паміраць са старасьці на саломцы, пакуль была яшчэ магчымасьць геройскай сьмерці ад кінутай з аэраплягну бомбы ці адважнае і патрыётычнае пагібелі з голаду і зьнямогі. Палонных пералічылі, адкінулі тых, якія ад слабасьці не маглі больш стаяць на нагах, і падмянілі іх дужэйшымі. Потым ім праклалі дарогу да катлоў, гаворачы:

— Ну, наперад, хлопцы! Ежу і хлеб вы атрымаеце, а потым гайда на працу!

Палонных разьбілі на групы па дзесяць чалавек і раздалі ім бачкі. З другога канцу лягеру пад'ехала некалькі фурманак, і з іх пачалі складаць вялізныя булкі чорнага хлеба.

Лягер аджыў. Брудна-сіняе цеста заварушылася і хлынула да кухняў. Палонныя стаялі шчыльна адзін пры адным, зьліўшыся ў адно, нібы застыглая лява.

Каля катлоў фэльдфэбель даў першай дзесятцы булку хлеба; кашавар зьняў покрыўку з катла, памяшаў заціркі і наліў палонікам у бачок. Па лесе разышоўся пах падсмажанай цыбулі і так шчыльна згуртаваў людзей, што яблыку недзе было ўпасьці. Уся ўвага была сконцэнтравана на катлох і на фурманках з хлебам; вочы гарэлі, ноздры расьпіналіся, уцягваючы пах гарэлага ялавічага сала.

Атрад, які адлучыў прызначаных на працу ад іншых, быў узмоцнены яшчэ адным узводам, але ён ледзь стрымліваў націск узбуджанага натоўпу. Расійскія салдаты ў першым шэрагу, узяўшыся за рукі, стварылі суцэльны ланцуг; другі шэраг за імі адганяў палонных прыкладамі.

Першая дзесятка ўжо пад'ела, а ў другой разьмяркоўвалі хлеб. У гэты момант маса ўскаланулася; з элемэнтарнай сілай, з сілай, якая пад час вулькановага выбуху ўзьнімае выспу з дна мора, яна націснула ў бок кухні і рынулася, нібы сьнегавы абвал, да катлоў.

Ланцуг перарваўся, вартавых пазьбівалі з ног, і пад ботамі шалёнага натоўпу, які прарваўся нястрыманай патокай, дзе ўжо

ня было паасобных людзей, апынуліся і тыя палонныя, якія павінны былі атрымаць ежу і ісьці на працу.

Ня было ні стогнаў, ні крыкаў; усё зьлілося ў глухі, злавесны гул, нібы аднекуль здалёк насоўвалася навальніца. І раптам натоўп ірвануўся да катлоў і хлеба, і пачалася бойка.

Булкі хлеба лёталі над галовамі, крышыліся скрыўленымі пальцамі на тысячы кавалкаў. Лыжка заціркі гатова была ўжо зьнікнуць у галодным роце, але чыя-небудзь рука адкідала яе прэч, апарваючы гарачым варывам твар таго, хто першы заваладаў ёю.

Шпаркім крокам падыйшла рота расійцаў са штыхамі напагатове. Але ніхто не спалохаўся, ніхто не адскочыў перад гострымі штыхамі. Салдаты прымушаны былі спыніцца і адступіць. Прапаршчык, які камандваў імі, загадаў набіць стрэльбы і даць залп угару.

Залп прымусіў уздрыгнуць вяршаліны хвояў, але ніхто яго ня чуў, ніхто не зьвярнуў на яго ўвагі. Галодныя людзі працягвалі бойку.

Прапаршчык, бледы і здэтанаваны, зусім зьбянтэжыўся і хацеў быў ужо сур'ёзна страляць. Але ў гэтую хвіліну паветра страсянулася ад нялюдзкага, роспачлівага крыку, крыку нязноснага болю і жудасьці; шэра-сіняя маса застыгла, а потым пачала падавацца назад і разыходзіцца.

Расійскія салдаты, не чакаючы каманды, узяліся разганяць яе па лесе, (не шкадуючы ўдараў. Каля кухні засталіся толькі раздушаныя і скомчаныя, а ў катле з кашай тырчэў палонны мадзьяр дагары нагамі, які, занадта ўжо перахіліўшыся праз край, быў скінуты туды заднімі і літаральна зварaны жыўцом.

Яго выцягнулі за ногі, выкапалі кацёл з зямлі і паставілі яго ў бок. Прапаршчык паслаў пра гэта рапарт у Кіеў. Але калі адтуль прыехаў цэлы батальён разам са сьледчай камісіяй, каб скласьці адпаведны акт, кацёл быў ужо пусты і на дне ў ім знайшлі толькі шапку. Паміж ініцыяламі «Ф. І. І.», аб якія нейкі палонны, аблізываючы шапку, парэзаў сабе язык, засталося крыху кашы. Усю рэшту палонныя зьелі, не зважаючы на тое, што каша была прыпраўлена тлушчай няшчаснага таварыша.

Пад абед з Кіеву падвезьлі яшчэ хлеба і некалькі новых катлоў; зварaны мадзьяр абудзіў сумленьне расійскага інтэн-

данцтва. Увечары раздавалі хлеб, а пасьля палонных разьмеркавалі па купках і тлумачылі, якія бачкі якой купцы належаць.

Каля кухань стаялі казакі з бізунамі і трымалі парадак, лупцуючы палонных па плячох і сьпінах. Прыклад падаваў адзін прапаршчык, які біў аўстрыякаў гумавай кішкой, прыгавараючы:

— Начальства павінна заўжды паказваць добры прыклад!

І раптам пачулася каманда:

— Чэхі—наперад! Чэхі, сьвядомыя чэхі, да мяне!

— Марэк,—параіў Швэйк, які са сваім хлебам у ранцы, разам з вольнапісаным ня прымаў удзелу ў агульнай бойцы,— ня ідзі туды! Ты яшчэ ня ведаеш Расіі і ня маеш уяўленьня, якія тут вырабляюцца штукі. Мяркуй сам—шукаюць добрых чэхаў, а потым душаць іх голадам, таксама як і іншых. Але тут усё робіцца на палітычным грунце. Як я яшчэ служыў да вайны ў Будэёвіцах, у нас быў адзін капрал, нейкі Чымчара; дык той таксама, прыдзе да нас у кашары ды і кажа: «Мне патрэбен інтэлігентны чалавек для канцылярыі, які ведае нямецкую і чэскую мову, з прыгожым почыркам». А калі хто-небудзь адгукаўся, дык ён выводзіў яго ў калідор, даваў яму ў рукі вядро і венік ды загадваў: «Гайда чысьціць прыбіральні, ды каб у мяне ўсё там блішчэла. А не—дык падам на вас рапарт!» Можа і тут рыхтуюць нешта падобнае, але нас, тым часам, не ашукаюць!

Але ўбачыўшы, што маладзенькі расійскі афіцэр, які стаяў на пні, гаварыў па-чэску, яны ўсё-ж падаліся туды, працісну-ліся праз натоўп бліжэй, каб усё чуць.

Гэта была прамова, якую яны не аднойчы чулі ў сябе на радзіме на розных мітынгах і сходах. Афіцэр сказаў, што ён—чэх, былы аўстрыйскі афіцэр. Ён паведаміў, што ў Расіі ёсьць чэская арганізацыя, якая змагаецца разам з расійцамі, і ў іхных шэрагах, супроць Аўстрыі. Афіцэр гаварыў, што цар вельмі любіць чэхаў і ён вызваліць іх, а таму неабходна ўзяцца за зброю і разьбіць Вену і Бэрлін; потым ён перайшоў да глыбокай старажытнасьці, заклікаючы Гуса і Жыжку ды бразгаючы спарахнелымі касьцямі табарытаў, якія загінулі пад Ліпанамі і маравах, што прыдбалі сабе вечны супакой пад Белай гарой.

— Салдаты! Браты!—заклікаў ён.—Вы зараз у «чыстцы»! Мы ведаем, што вам гэты «чысьцец» неабходны! Кожны з нас павінен быць адліты са сталі! Цяпер размаўляюць жоралы гармат,

цяпер кулямёты выкідваюць валавяныя словы! Наша радзіма стаіць з пятлёй на шыі!

— Ах ты, божа мой!—голасна пашкадаваў Швэйк.—Я-ж заўсёды казаў, Марэк, што Аўстрыі пагражае небясьпека, і што ёй надыходзіць канец.

Афіцэр зірнуў на Швэйка халодным позіркам і горача гаварыў далей:

— Можа пра нас скажуць што мы звар'яцелі, але нянавісьць павінна блукаць у нашых мазгох, як тыгра ў джунглях, і павінна ляжаць на нашым сэрцы, як скручаны пітон. Нянавісьць павінна быць нашай раньшняй і вячэрняй малітвай, нянавісьць павінна быць гімнам нашае працы! Цнатлівыя грудзі нашых скал, люстраная паверхня нашых вазёр, берагі нашых рэк, пахмурыя глыбіні нашых капальняў, душа ненароджаных яшчэ дзяцей—усё павінна дыхаць гэтай нянавісьцю! Часткі клопатаў, што вылятаюць з каміноў нашых хат, павінны сеяць і выклікаць нянавісьць! З іскраў кавадлаў павінна ў радасных патугах нараджацца яна-ж—нянавісьць!

— У яго фантазія і вобразы, як у сучаснага поэта,—прашаптаў Швэйку Марэк.

— Што-ж у «Поўную чашу» таксама прыходзіў поэт, які складаў вершы, а калі ён напіваўся, дык вёрз такую самую лухту,—адгукнуўся Швэйк.

Голас прамоўцы зазьвінеў гучней і рэха паўтарала яго ўрачыстыя словы.

— Руда ў нетрах зямлі павінна тужыць па тым шчасьлівым момансе, калі мыператопім яе ў жалеза і сталь супроць забойцаў! І тады ня прыдзецца шукаць зброі; у жылаватую шыю забойцаў мы ўцупімся зубамі!

— Ой, ён некага хоча загрызьці да сьмерці,—зазначыў Швэйк, на што афіцэр, зьлязаючы з пню, з пагардай адказаў:

— Ты быў аўстрыйскім нявольнікам. Пакуты вайсковага палону змыюць з цябе тэты бруд.

Потым на пень узьлез нейкі цывільны ў кашулі з расшпіленым каўняром, таксама сказаў прамову, але больш зразумелую. Ён сказаў, што палонных накіруюць у Сібір, дзе расійскі ўрад прымушае іх паміраць ад тыфусу. Але, калі ідзе вайна, дык трэба біцца, а хто хоча біцца, хай запісваецца. Ён атрымае новую форму, будзе мець досыць хлеба, яды і...

У гэту хвіліну офіцэр смаргануў прамоўцу за крысо; той падавіўся, праглынуў некалькі слоў, і скончыў так:

— Усе мы—адна сям'я. Калі вы будзеце біцца, вы не памрыцё ні за сябе, ні за расійцаў. Расійцы паміраюць за нас, мы за іх. Хіба вы не чуеце ў сабе славянскі дух? Хіба не цячэ ў вашых жылах славянская кроў?

Пасьля гэтага рытарычнага пытаньня, Швэйк выступіў наперад, спыніўся перад прамоўцам і сказаў:

— Так точна, ваша благародзьдзе, адчуваем!

І адгарнуўшы рукаў, пад якім гумовая кішка «кухоннага» прапаршчыка пакінула шырокі пунсовы пас, ён падыхаў на яе і пераконана дадаў:

— Як-жа не адчуваць! А славяны мы будзем таксама дужа добрыя. Нам-жа ўбіваюць тут славянства ў самае нутро.

Але запісацца ніхто не запісаўся. Тады цывільны кінуў на палонных доўгі позірк і сказаў:

— Вось вы цяпер у Расіі. Вывучыце хаця расійскі народны гімн. Ён можа вам спатрэбіцца. Сьпяваюць яго так,—дадаў ён і моцным голасам пачаў выводзіць словы гімну.

Расійскія салдаты ўзялі пад казырок, а палонныя, тупа азіраючыся, не разумелі, у чым справа. Нарэшце, офіцэр стомленым і расчараваным голасам сказаў:

— Значыцца, ніхто з вас ня хоча запісацца ў армію? Значыцца, вы ня добрыя, сапраўдныя чэхі?

Ніякага адказу. Офіцэр і цывільны адыйшлі разам з расійскім прапаршчыкам, які пад час іхных прамоў усё падтакваў ім.

— Слухай, Вашэк,—сказаў цывільны,—табе трэба было даць мне весьці агітацыю паводле майго разуменьня. Я паабяцаў-бы ім варэнікаў, смажанай сьвініны з капустай, гуляша, піва і ўвесь батальён запісаўся-б у мяне як адзін чалавек.

— Ня хочу,—задуменна адказаў той.—Чэскія ваякі павінны быць цьвёрдыя, як сталь.

Некалькі крокаў яны прайшлі моўчкі, потым задуменны афіцэр спыніўся і сказаў у пустату, выціраючы пэнснэ:

— Дзіўна! Незразумела! Калі гэтае быдла галоднае, у іх няма ніякага імкненьня да ідэалу. Толькі-б пажэрці чаго-небудзь! Другім разам я раскажу ім пра разбураны Градшын і чырвоную ад крыві Ўлтаву.

Цывільны палэпаў яго па плячы.

— Ня сумуй, браце, нашы патугі дадуць свой плён. Ты— ідэаліст, а я—практык. Жыцьцё патрабуе практычных захадаў, і час на мае мэтоды яшчэ прыдзе. Другім разам ты ім скажаш: «Вы будзеце мець гонар быць чэскімі ваякамі, рыцарамі Бланіка!», а я скажу ім: «Вы будзеце атрымліваць хлеб і грошы, будзеце жэрці клёцкі і капусту, а ў дзень св. Вэнцэслава вам дадуць смажаную гусіну!». Вось убачыш, мы свайго дойдзем! Ну што, у рэстаран сёньня прыдзеш, Вашэк? У «Празе» атрымалі сьвежае піва. Півавар з Здолбунова варыць яго пад рукой.

Замест адказу, афіцэр паказаў рукой на блізкі ўжо трамвайны вагон, і абудвы пайшлі хутчэй; прапаршчык пачаў адставаць.

Нязначны лік чэхаў, якія складалі аўдыторыю, памалу разыйшоўся. Калі той ці іншы хацеў сказаць што-небудзь пра пачутае, палонныя недаверліва і моўчкі пацiскалі плячыма.

А з-заду ля плоту ляжаў наш Швэйк і стараўся навучыць Марэка расійскаму гімну, сыпяваючы на яго мотыў розныя шансонэткі ды прыпеўкі...

Ноччу палонных раптам пагналі з лягеру на вакзал і набілі імі цяплушкі. На досьвітку падалі паравік, і цягнік рушыўся...

5

ЭКСПЭДЫЦЫЯ Ў ГЛЫБІНЮ РАСІІ

Калі праскі абываталь езьдзіў у Турноў, уся сям'я і ўсе знаёмыя праводзілі яго, а ён, мацаючы свой сакваяж, пытаў жонку:

— Колькі-ж шныцалёў ты мне дала з сабою, старая? А на кілбасу ты не забылася? А бутэльку з наліўкай? Ты-ж ведаеш, што я гатоў самлець дарогаю, бо ў мяне такі кволы страўнік, а мне прыдзецца як-ні-як, а ехаць тры гадзіны ў цягніку.

Вайна і яе патрабаваньні скасавалі такую кволасьць страўніка акурат таксама, як яны скасавалі нэрвовасьць, дрэннае страўленьне, замароку і адсутнасьць апэтыту. Швэйк і Марэк сядзелі разам з трыццацю васьмю палоннымі ў цяплушцы, якая няспынна калацілася з імі чацьвертыя суткі на ўсход, і ўсё-ж у іх ня здарылася морскай хваробы.

І чаго-б яна мела ў іх быць? Раз-по-раз, не даяжджаючы да якой-небудзь станцыі, спыняліся на запасных пуцёх; вартавыя, якія ішлі з эшалёнамі, выганялі палонных з цяплушак да кухняў, дзе яны атрымлівалі па кавалку хлеба, па кацялку заціркі і па лыжцы кашы. Адтуль іх гналі ў прыбіральні, а потым зноў у цяплушкі; паравоз даваў гудок, і цягнік ішоў далей.

Такі цягнік быў падобны да вандроўнага зьвярынцу, які спыняецца толькі там, дзе можна пакарміць жывёлу. Людзі, што ехалі ў ім, ня мыліся, не часаліся, не галіліся; бруд на іх нарастаў карою, якая з кожным днём таўсьцела і таўсьцела. Вошы пладзіліся ў цяплыні перапоўненых цяплушак з падвоенай хуткасьцю, і ўжо заядалі зусім аўстрыйцаў, бо ніхто іх ня біў. А калі палонныя, вяртаючыся з прыбіральні, іншы раз не знаходзілі свайго цягніка на тэй самай пуці, яны шлындалі па вялізных станцыях і пыталі адзін аднаго:

— Ці ня бачыў ты, дзе дзелася наша перасоўная карчма?

Ад Кіева з імі ехалі два расійскія афіцэры, і ў цягніку панавала дысцыпліна. Дзьверы павінны былі замыкацца, і без праваднічага нікому не дазвалялі выходзіць. Калі цягнік, чакаючы застрэчнага, спыняўся на разьездах і палонныя праўлялі свае натуральныя патрэбы пад адкрытым небам, вартавыя стаялі каля іх, як анёлы, а штыхі тырчэлі ўгару, як пяруньнікі.

На другі дзень афіцэры вылезьлі, і ўвесь гэты парадак адразу спыніўся. Вартавыя зашыліся ў асобны вагон, прызначыўшы «цяплушачных старост» з аўстрыйскіх унтэр-афіцэраў і заявіўшы ім, што яны адказваюць за ўсё, і палонныя такім чынам самавызначыліся.

У цяплушках былі зроблены з кожнага боку па два рады лаў, на якіх можна было ляжаць. Хто іх пасьпеў заняць, той карыстаўся прывілеем, што спаў ноччу лежачы, а тыя, хто знаходзіўся пасярод цяплушкі, маглі ў сваю чаргу сядзець пад час язды пры адчыненых дзьвярох, боўтаць пад грукат колаў нагамі і любавацца краявідам.

Неабсяжная роўнядзь бегла за цягнікам назад. Праносіліся вялізныя палі пшаніцы, жыта, аўса, цукровых буракоў, шырокія поплавы, раскіданыя дзе-ні-дзе вёскі пад таполямі і вербамі, ветракі, сады і гнілыя сьцірды саломы, якія схіляліся над палямі, нібы вялізарныя чарвівыя грыбы.

Палонныя глядзелі на верставыя слупы, якія паказвалі, колькі праехалі вёрст, і спрачаліся аб мэце іхнага падарожжа. Адны запэўнялі, што іх вязуць у Сібір, іншыя—да Чорнага мора, на Каўказ.

Узьнялася спрэчка аб прызначэньні засеянай сонешнікам паласы. Настаўнік, з якім Швэйк зрабіў увесь шлях ад мяжы і спаткаўся цяпер тут у цяплушцы, сьцьвярджаў, што сонешнік разводзяць адно дзеля яго хараства, бо, як вядома з літаратуры, расійцы—народ поэтычны. Марэк даводзіў, што яго разводзяць за кармавую расьліну, замест бульбы, якой яшчэ нідзе ня было відаць, а Швэйк вырашыў пытаньне, сказаўшы:

— Расійцы—поэтычны народ, і з прычыны гэтай поэтычнасьці яны лузгаюць семячкі, як у нас ваўёркі—арэхі. Увогуле, добры зьвярынец пабудаваны на зямлі.

На бліжэйшай станцыі Швэйкава меркаваньне аб прызначэньні сонешніку цалкам спраўдзілася. Побач з цягнікам з палоннымі стаяў пасажырны, і там, пад вокнамі трэцяе клясы, ля-

жалі цэлыя груды сонешнікавага лушпавіньня. Ля адчыненага вакна сядзеў селянін і кабета; яны гаварылі паміж сабой, і пры гэтым лушпавіньне ляцела з іхных вуснаў, як аблупленая эмаль з перагрэтай каструлі.

На вагзале, поўна набітым людзьмі, а таксама і ў пасажырным цягніку хутка даведаліся, што ў такім вось цягніку едуць палонныя. Гэту вестку прынялі з радасьцю, як спосаб разагнаць страшэнную нудоту. І калі аўстрыйцы палезьлі з цяплушкі, іх абступіў натоўп мужчын і жанчын і паўз увесь цягнік чуліся гутаркі, якія ўсе пачыналіся з пытаньняў: «Колькі табе год?» і «А зямля ў цябе ёсьць?».

Гэткія-ж брудныя, як і палонныя, бедна апранутыя сяляне ў сваіх кашулях на выпуск, хто ў высокіх ботах, а хто і босы ці ў лапцёх, гутарылі голасна і пыталі, чым скончыцца вайна і хто пераможа. Адзін з іх зьдзеў з Марэка куртку, напнуў яму на галаву сваю шапку, выпусьціў у яго з парток кашулю і радасна крыкнуў:

— Глядзі, сапраўдны русак! Ніхто ня дасьць веры, што гэта аўстрыец.

З вагона зірнула сялянская кабета і прыветна ўсьміхнулася Марэку. Потым яна выцягнула з-пад лавы грубы мяшок, дастала адтуль кавалак сітнага і два яйкі і сказала:

— Вось, маеш! Наш Аўхім таксама ў палоне, у немца.

— У гэтых сялян галовы як у жабракоў ці ў Льва Талстога,—прашаптаў Марэку настаўнік.

— Па-мойму, яны падобны да апосталаў,—таксама ціха абазваўся той.

— Яны ня надта клапоцяцца аб прыгожай вопратцы,—сказаў Швэйк.—Цырульнікі і мылавары тут не разбагацелі-б. Але затое грабеншчыкам хапіла-б працы. Тут кожны валасаты, як Ісаў. А хітрыя-ж яны, што чэрці. Вось гэткі дзядзя палезе босы на хвою, а назад лезе ўжо ў ботах. Адно цікава, як тут выглядае мора.

Гэтым часам паравік пасажырскага цягніка даў гудок, на вагзале празьвінеў трэці званок, і цягнік крануўся. Кабета ля вакна яшчэ раз кіўнула Марэку і падала яму жменьку слонечніку.

— На, трымай! Усяго добрага!

— На месцы, на месцы!—закрычэлі вартавыя, і іх паравік таксама даў гудок.

Палонныя зноў паўлазілі ў цяплушку. Швэйк сеў разам з усімі і, убіраючы крутое яйка і кавалак хлеба, сказаў Марэку, які сядзеў на лаве:

— Шанцуе табе, хлопец, на жанчын, хоць ты і ня ўмееш па-расійску. Калі ты хочаш зрабіць ёй няпрыстойную прапанову, дык павінен сказаць так.

Ён выгаварыў сказ, з дапамогаю якога «жадаюць» жонку блізкага свайго, і параіў Марэку скарыстаць яго ў адпаведны момант і ў адпаведным месцы; а потым ён растлумачыў яму яшчэ, што азначае сказ, у якім памінаецца маці, і што за яго можна злавіць па мордзе.

Швэйк ня быў эгоіст нават у навучаньні іншых, і калі-б ён жыў пэўны час у Палястыне, ён абавязкова пашоў-бы прапаведваць слова ўсім народам.

Яны паехалі; дзесяць хвілін цягнік вёз іх паўз бясконцую чараду хатак, да якіх са стэпу сыпяшаліся вялізныя статкі кароў, быкоў, цялят, авец і сьвіней, і палонныя не маглі вырашыць, ці горад гэта, ці вёска. Відаць было, што перад кожнай хаткай ляжалі роўныя кучкі і нават цэлыя горы нейкай чорнай цэглы, аб прызначэньні якой нават распалілася спрэчка.

— Гэта проста будаўнічая цэгла,—сказаў Швэйк.—Тут ладзяцца будаваць, і ўвесну тут, хлопцы, муляром будзе добра.

— Зусім не, будынак станцыі са звычайнай чырвонай цэглы,—сказаў настаўнік.

— І апрача таго, гэты матэрыял складзены нават каля будкі чыгуначнага вартавога, ля рэек,—зазначыў Швэйк.

На бліжэйшай станцыі палонныя зноў вышлі з вагону. Яны адважваліся ўжо выходзіць на пэрон, дзе ім часам давалі капейку, булку ці кавалак цукру і адкуль іх гналі расійскія жандары, лэпаючы іх далонямі па сьпіне, як трусоў.

Зрабілі вынаходку, што на кожнай станцыі ёсьць гатавальнік з гатовым варам, дык можна было саграваць сабе чымсьці гарачым страўнік, хоць зацірку давалі толькі прыблізна праз кожныя паўтары сутак. Палонныя ўжо ведалі, што гатаваная вада завецца па-расійску «кіпяток» і перш за ўсё шукалі будку

з гатаванай вадой, пыталі ўсіх чыгуначных служачых і жандараў:

— Пан, вар ёсьць? Пан, дзе вар? Цягні вар, пан!

Трэба было падмяніць чым-небудзь адабраныя ў Кіеве манеркі і фляжкі. Таму на станцыях зьбіралі іржавыя, кінутыя расійскімі салдатамі конаўкі дзеля чаю і залаплялі ў іх дзіркі хлебам. Марэк знайшоў яшчэ цэлую манерку, настаўніку прыпала бутэлька з-пад гарэлкі, а Швэйк зрабіў сабе з бляшанкі ад консэрваў вядзерца з драцяной ручкай. Палонным выдалі нязграбныя драўляныя лыжкі, якімі ніхто ня ўмеў есьці, а тыя, у каго нейкім дзівам зацалеў сьцізорык, узяліся самі выразаць лыжкі з бярозавых целяшкоў, якія яны цягалі з тэндэру.

— Вайна,—казаў пры гэтым цесьля Рэзьнічак з Клобаўк,— вайна будзе мець сваім вынікам тое, што ніхто нічога ня будзе баяцца і ўсе будуць разумныя, як малпы. Вось я, напрыклад, гэтым паленам буду нават галіцца, калі яго толькі добра нагастру аб цэглу і навяду лязо аб падэшву; а дома я ня ўмеў як сьлед галіцца і ангельскай брытвай. Адно каб не баяцца згубіць нейкую там цывілізацыю ды культуру! Як мы стаялі ў Букавіне пад Гарадзенкай, нам не давалі пайку, і вось я ў гэтай бядоце раптам так разахвоціўся на малако, што здаецца аддаў-бы за яго жыцьцё.

— А мне-б хацелася піва,—зазначыў Швэйк.—Мялі языком што хочаш, адно не кажы мне пра піва, а то я здохну ад смагі.

— Афіцэры ў нас,—успамінаў далей Рэзьнічак,—былі ня горшыя і ня лепшыя, чым ва ўсёй арміі. Эканомілі на нашых мясных порцыях, давалі нам менш, чым трэба, і з'эканомілі такім чынам цэлых дзьве каровы, якіх, вядома, ня рэзалі, а пакінулі сабе. Даглядаў кароў і даіў іх ефрэйтар, і ў афіцэраў было заўсёды і малако, і сьмятанка, і масла, і творагу колькі хочаш. Я служыў у рабочай камандзе, і нас прымусілі пабудаваць для афіцэрскіх харчоў асобны склеп і стаяць перад ім ноччу на варце. Вось стаю я там аднойчы на варце і чую, як каровы жвуць нездалёк сваю жвачку, і раптам мяне такая ахвота ўзяла выпіць малака, што хоць ты што хочаш рабі. А карову падаіць— гэта, я ўжо ведаў, дарэмна, бо раз я быў паспрабаваў. Дык ефрэйтар усё з яе выцадзіў, усё да апошняй кроплі.

Апавядальнік уздыхнуў і казаў далей:

— Я агледзеў дзьверы склепу; на іх быў замок, але вісеў ён на зусім слабым прабоі. Я дастаю штых, усаджваю яго ў прабой і паварочваю—прабой толькі рыпнуў. І дальбог, хлопцы, не маню: у гэтых праклятых афіцэраў былі схаваны там вось гэткі кавалак масла, гладыш сьмятаны, конаўка вяршкоў, якія хоць нажом рэж, і два вядры добрага торагу. Я ўсё гэта вынес, вяршкі выпіў, а масла і сьмятану схаваў у ранец. Ну, а што рабіць з торагам? Пакінуць—шкада! Пабудзіць таварышоў і раздаць ім—таксама няможна: яшчэ хто-небудзь дакажа. Тады я зьняў нагавіцы—яны былі яшчэ досыць чыстыя, я насіў іх толькі пяты тыдзень—завязаў іх зьнізу і паклаў туды тораг. У кожную калошу ўвайшло акурат па вядры. Я занёс іх у поле, схаваў у жыце і прыкрыў саломаю, а потым вярнуўся на месца, нібы нічога і ня было. Але што за гвалт быў раніцою!.. Капітан, паручнік і кадэт—смаркаты такі хлапчанё!—кідаліся туды і сюды, як шалёныя. Загадалі абабіць дзьверы склепу жалезам і зрабіць завал з кавалка рэйкі. Ну, а потым, як пачаў я шукаць сваю здабычу ў жыце, выявілася, што сабакі сьцягнулі яе ноччу на другое поле. Нагавіцы, вядома, былі падраныя, але торагу ў іх крыху засталося, і я з яго зрабіў сабе сыру. Бо на вайне, браточкі, трэба ўсё абмеркаваць і нічым ня грэбаваць.

— Патрэба—маці вынаходлівасьці,—сказаў настаўнік.—Чалавечы розум робіцца дамысны, калі цела адчувае ў чым-небудзь патрэбу, ды ня можа здабыць неабходнага. Калі сам знаходзішся ў дрэнным становішчы...

— ... дык ідзеш і рэжаш у таварыша яго мяшок з рэчамі,—нібы паміж іншым сказаў Швэйк.

Настаўнік пачырванеў і гаварыў далей:

— Калі дзяржава ў небясьпецы, калі людзкая грамада вісіць над процьмаю, дык лепшыя розумы пачынаюць думаць пра самаабарону і паратунак. У часе вайны дзяржавы гатовы кожную хвіліну збанкруціцца і вось тэхніка рухаецца наперад вялікімі крокамі. Узяць, напрыклад, аэропляны. У 1909 годзе француз Гобэр меўся ўпяршыню паляцець на іподроме ў Кухэльбадзе пад Прагай. Меўся, кажу я, ды не паляцеў, бо веяў слабы ветрык, якога ў той час трэба было яшчэ баяцца. А цяпер праз шэсьць гадоў, аэропляны лётаюць на фронце нават у буру, што груганы. Значыцца, вайна спрыяе разьвіцьцю тэхнікі.

— Памятаю, памятаю,—адгукнуўся Швэйк.—Яшчэ тады прывезьлі ў Прагу марожанае мяса з Аргентыны, а потым прышлося выкінуць яго ў Ултаву, бо цана на яго спала. А каб паглядзець гэтага Гобэра, з Прагі і ваколіц у Кухэльбадназьяжджалася тысяч трыццаць народу. І што патрэба—маці вынаходлівасьці, як ты сказаў, гэта таксама слушна. Але і п'янства грае часам яры гэтым ролю павітухі. Вось я, напрыклад, знаў аднаго Собку з Суваля і яго жонку. Гэта была, як той кажа, няроўная пара. Яна была ў саюзе цьвярозьнікаў, а ён штодзень быў п'яны, як сьвіньня. Прыдзе дахаты ўвесь брудны, а яна толькі ведае, што абмывае яго, заліваючыся гаручымі сьлязьмі і лаючыся апошнімі словамі. Аднойчы ён вось так прышоў п'яны і брудны да хаты, а яна...

Але тут апавяданьне перапыніла бойка, якую завялі два занадта гарачыя палонныя. Наогул, у цяплушцы найбольш панавала згода, але варта было каму-небудзь з вышэйшых лаваў абліць каго-небудзь з ніжэйшых чаем ці штурхнуць, як той ужо лез на кулакі... Дзіўна! Гэтыя-ж людзі, усе ў аднолькавым сумным і нядобрым становішчы, толькі выйшлі з паласы агню, дзе яны без ніякага протэсту, нібы авечкі, ішлі на забойства і моўчкі жыўцом гнілі ў гразі, крыві ды гнаі, нібы гэта было нешта зусім зразумелае і натуральнае, а тут за тысячы кілёмэтраў ад фронту, паміж сабою, яны зайздросьцілі адзін аднаму, і былі злосныя, як сабакі на ланцугу. Яны злосна лаяліся паміж сабой, ніхто не хацеў даць таварышу нажа, не дзяліўся вадой, упікаючы яго кожным кавалкам выпрашанага хлеба. Нарэшце дайшло да таго, што часам, як стаялі на станцыі, дзе трэба было атрымліваць паёк, з сарака чалавек палонных не знаходзілася нікога, хто-б згадзіўся прынесьці для іншых з раздавальнага пункту хлеба і стравы.

— Ніяк не магу ўцяміць,—казаў Марэк, якога выбралі за цяплушачнага старосту,—як гэта можа быць. У яго самога жывот уцягнула з голаду, а ён, такі-сякі, ня хоча прайсьці пяцьдзесят крокаў па ежу. Няўжо людзі так згультаіліся? Ці гэта ў іх рэакцыя пасьля нэрвовай напружанасьці на фронце?

Швэйк заўсёды хадзіў для сваёй дзесяткі па хлеб, а аднойчы калі засталося дзьве лішніх булкі, на якіх ніхто не заявіў прэтэнзіі, і тыя, хто застаўся бяз хлеба ў суседняй цяплушцы злосна лаяліся і гатовы былі зьбіць свайго дзяжурнага, ён сха-

дзіў на хлеб і для іх, сам разьмеркаваў ім хлеб, а потым сказаў Марэку:

— Гэта ня людзі, а нейкая жывёла, якая ня можа жыць без пастуха і пугі. Мне прышлося там для парадку даць некаторым па карку.

Дзякуючы экскурсіям на станцыі, веды расійскай мовы ў аўстрыйцаў значна пашыраліся. Швэйк мог ужо запытаць, дзе вар і якая гадзіна і гаварыць, што ён галодны і не страляў у расійцаў, бо расійцы—нашы браты, а сьвятыя Кірыла і Мэфодзі, якія прышлі на Русь, каб пашырыць там хрысьціянства, былі яго продкі: адзін па матцы, другі—па бацьку.

Марэк неўзабаве перагнаў Швэйка ў веданьні расійскае мовы; ён склаў сабе маленькі слоўнічак з пачутых выразаў, але гэты слоўнічак меў чыста акадэмічнае значэньне. Наадварот, Швэйк быў практык і заўсёды ў выніку ягоных размоў на станцыі з сялянамі, дзе ён даваў поўную волю сваёй фантазіі, зьяўляліся лусты хлеба, яйкі, булкі, чай і цукер.

Ён страшэнна любіў бегаць па станцыях, і ніхто ня ўмеў так проста адказаць жандару, які праганяў нячыстых аўстрыякаў з заляў для пасажыраў I і II клясаў, як Швэйк; пры гэтым ён пазіраў на жандара з так спрытна ўдаванай пачцівасьцю, што таму рабілася нават горача.

Марэк ужо ўмеў чытаць надпісы на станцыях, а настаўнік запісваў іх на ўспамін аб пройдзеным шляху ў запісную кніжку. Швэйк сказаў, што гэта—глупства, і вывеў з таго, што яны скрозь ехалі на ўсход, што яны, калі нідзе ня спыняцца раней, трапяць праз Пільзен у Прагу.

— Я зьлезу ў Вышэградзе,—сказаў ён Марэку,—бо мне адтуль бліжэй да хаты. І калі мы прыедзем да абеду, дык я пайду ў рэсторан «Тры сябры» і закажу сабе суп з вантробамі... Але толькі мне здаецца, што гэта лухта, калі кажуць, нібы зямля—круглая. Вунь мы які кавалак праехалі, а яна ўсё роўная, як талерка.

Яны зноў спыніліся на нейкай станцыі; Швэйка вышаў на пэрон і завёў сяброўскую гутарку з вартаўніком. Той усыпаў яму жменьку махоркі і знакам паказаў, каб ён адыходзіў, бо вакол іх ужо сышоўся гурток цікавых, якія трымаліся, аднак, на пэўнай адлегласьці.

— Са мною ўсюды так далікатна абыходзяцца,—падумаў Швэйк,—ці не баяцца яны, каб я чаго не сьцягнуў?

Ён спрытна скінуў з сябе вошыну, якая паўзла ў яго па рукаве; вошына, зрабіўшы ў паветры дугу, звалілася на порткі вартаўніка, які акурат у гэту хвіліну ўзяўся за вяроўку званка, зараз-жа ўчапілася за новае месца і папаўзла ўгару пад кашулю. Вартаўнік даў званок і сказаў Швэйку:

— Другі званок твайму цягніку.

— Дармо,—гэтак-жа далікатна адказаў той,—сьпяшацца няма куды.

— Сядай, зараз будзе трэці званок,—настойліва паўтарыў вартаўнік і тры разы пазваніў.

Недзе за кляснымі вагонамі, якія стаялі сьпераду, крануўся цягнік. Паравоз са сьвістам, пускаючы густыя клубы дыму, усё паддаваў ходу.

Вартавы адыйшоў ад званка. Убачыўшы Швэйка, захопленага гутаркай з нейкай старою кабетаю, якая дапытвалася ў яго, ці ёсьць у яго жонка, ён штурхнуў яго ў бок і сказаў:

— Вунь пайшоў твой цягнік.

— Езус—Марыя!—крыкнуў Швэйк.—Яны едуць без мяне. Стойце! Спыніцеся! Марэк, загадай спыніць, я застаўся тут!

Ён пераскочыў праз бар'ер і пабег за цягніком, з адчайным крыкам:

— Стой, стой! Я ня хочу заставацца тут адзін!

Але на трэцяй пуці яго схапілі чыгуначнікі і пацягнулі назад, прыгаварваючы:

— Дурань ты, дурань, куды ты лезеш? Хочаш пад хуткі трапіць?

У тую-ж хвіліну міма станцыі праімчаўся хуткі, і задні вагон швэйкавага цягніку зьнік за паваротам.

Швэйка завялі на станцыю і перадалі яго жандару. Той пачухаў у сябе за вухам, злосна і няпрыязна зірнуў на Швэйка і запытаў:

— Паперы!

— Вось, калі ласка,—паслухмяна адазваўся Швэйк, выцягнуў з кішэні кавалачак папяроснай паперы і падаў яе жандару.—І махорка. Закурыце.

— Ды ня курыльнай!—крыкнуў жандар, хапаючы яго за каршэнь.—Няма чаго табе дурнем прыкідацца, я табе пакажу!

Швэйк, значыцца, зноў зрабіўся ахвярай непаразуменьня. У яго пыталі паперы, якія дазвалялі яму застацца на станцыі, а ён зразумеў, што жандар папрасіў у яго паперы на цыгарку, і таму, пакуль «чын» трос яго за каршэнь, ён спакойна сказаў:

— Што, гэтага табе не хапае? Добра, я яшчэ дам. У нас такую паперу даюць у прыбіральні. Каб я ведаў, што вы тут такія дзівакі, я-б узяў для цябе цэлы ранец.

— Пойдзеш ты ці не?—крыкнуў на яго жандар.

Гэта сцэна прывабіла чыгуначных служачых і цэлы натоўп пасажыраў; нарэшце, з канцылярыі вышаў начальнік станцыі. Ён загадаў Швэйку растлумачыць па-нямецку, у чым справа, і сказаў потым жандару:

— Пусьці яго. Наглядай толькі, каб ён ня ўцёк. Праз гадзіну пойдзе пасажырны, а ўсе эшалёны з палоннымі ідуць у Пэнзу, дык калі яго выправіць на пасажырным, ён дагоніць свой эшалён у Рцішчаве, дзе ў іх прыпынак на абед.

І вось, калі сумны Марэк падаў у Рцішчаве, атрымоўваючы хлебны паёк, рапарт, што ў яго зьнік адзін палонны, і вяртаўся з хлебам для свае партыі ў цяплушку, разважаючы, якое нявшчасьце магло напаткаць Швэйка, з пасажырнага цягніка вышаў яму насустрач знаёмы, падобны да Швэйка, але толькі куды таўсьцейшы, чым ён, чалавек.

Падышоўшы да вольнапісанага, гэты чалавек абняў яго, неўважаючы на ўсё, што было ў яго руках.

— Добры дзень, Марэк! Мы ўжо, хай сабе, паедзем разам, але часамі мне прыдзецца пакідаць вас! Расію адразу ня вывучыш.

Ён пацягнуў зьдзіўленага Марэка за цяплушку, злазіў сам туды па ранец, а потым узяўся выцягваць з-за пазухі хлеб, яйкі, кілбасы, булкі і пампушкі з мясам. Потым ён расшпіліў порткі і далей разгружаўся.

— А цяпер, Марэк,—сказаў ён, значна патанеўшы ў фігуры,—прынясі мяшок для рэчаў. Я стану над ім, а ты разьвяжаш мне споднікі. Яны ў мяне набіты сонешнікамі.

Гэта быў бэнэфісны дзень для палонных; Швэйк доўга расказваў, што з ім было ў пасажырным цягніку, што там гаварылі,

і колькі вагонаў ён перайшоў. А потым ён прашаптаў Марэку на вуха:

— Нават грошы я дастаў. Чатыры рублі пяцьдзесят. У купэ першае клясы сядзела адна такая красуня, дык калі кондуктар пачаў праганяць мяне адтуль, я сказаў яму: «Вы-б лепш пасядзелі з гэтаю паненкаю. Дальбог, яна такая прыгожая, што каб яна мяне папрасіла, я-б ахвотна саграшыў з ёю». Тады яна вышла, дала мне два рублі і сказала: «Я разумею па-чэску, аўстрыйскі салдат. Я бывала ў Карлсбадзе і ў Празе. Не кажы пра мяне дрэннага». Але яна была так-жа здаволена, як прынцэса Тун, што працавала за міласэрдную сястру на Франц-Іосіфаўскім вагзале ў Празе. Туды акурат прывезьлі параненых салдат 35 палку з расійскага фронту, і яна хадзіла па ўсім цягніку з падносам, на якім былі растаноўлены шклянкі кавы і чаю, і пытала: «Чаго ты хочаш, чэскі ваяка, ці кавы, ці чаю?» Адзін салдацік ёй і сказаў: «Ні тога, ні іншага, а вось я-б хацеў саграшыць з вамі, паненка. Глядзеце, хлопцы, які ў яе задок прыемны!» Ну, а тут яна сама яму адказала: «Дык як-жа, братцы, чаю ці кавы? А задком служыць не магу».

Што Швэйк ня хлусіў, відаць з наступнага:

Раньняй вясной 1918 году мне давялося ехаць па справах палонных на Каўказ. У адным вагоне са мной ехала старая, хворая і надзвычайна няпрыгожая жанчына, якой я рабіў едучы сякія-такія дробныя паслугі, прыносячы ёй з буфэту чаю ці чаго-небудзь зьесьці. Яна была мне дужа ўдзячна і, паміж іншым, сказала:

— Вось тры гады таму каля Варонежу са мной ехаў адзін палонны аўстрыйскі салдат, таксама дужа, дужа прыемны. Ён казаў, што яго эшалён нейкім чынам пайшоў без яго, і ён даганяў яго на пасажырным цягніку. Ён расказваў, што чэхі дужа любяць Расію і дапамогуць ёй перамагчы ў вайне Нямеччыну. Як прасіў ён, каб яму памаглі, хто сколькі можа, дык казаў, што ён з Прагі, што сьвятыя Кірыл і Мэфодзі даводзяцца яму нейкімі прапрапрадзедамі і што таму ён сам праваслаўны. І вось, калі ён стаяў у калідоры і думаў, што я яго ня чую, ён гаварыў сам з сабой па-чэску, што такой красуні, як я, ён яшчэ ня бачыў і ахвотна даў-бы сябе зачараваць... У яго былі сымпатычныя блакітныя вочы і далікатныя эўропэйскія манэры. Я дала яму

два рублі на праезд. Што-ж, палонных аўстрыйцаў мы заўсёды шкадавалі. Таксама-ж людзі!..

Разам з тым з гэтага вынікае, што Швэйк удасканаліў свае мэтоды...

*

Нарэшце, палонныя даехалі да Пэнзы, і іхны цягнік спыніўся на запасной пуці на краі вялікай станцыі. Нічога асаблівага ня здарылася. Яны атрымалі зацірку і кашу, на гэты раз грэцкую, і больш аб іх ніхто не клапаціўся. Яны вылезьлі з цяплушак, знайшлі ваду, памыліся, пагаліліся, так, што ў іх ад болю сьлёзы цяклі з вачэй, а потым выйшлі ў стэп каля станцыі, паскідалі адзежу і ўзяліся трускаць вошы, што густымі напластамі былі ў ёй.

Яны памалу абуджаліся ад застойнага гультайства, і ва ўсіх зноў зьявілася імкненьне жыць па-людзку. Знайшліся нават такія адважныя, што нацягалі ў чарапку вады і ўзяліся мыць бялізну.

Калі яны апранулі чыстыя кашулі, самаадчуваньне ў іх яшчэ больш палепшылася. Яны разышліся па станцыі, а некалькі асабліва сьмелых падаліся ў горад.

Сярод іх былі і тыя, ў каго яшчэ захаваліся аўстрыйскія грошы; яны надумалі памяняць грошы ў Пэнзе і гэта прыцягнула да іх цэлы натоўп спэкулянтаў, якія абступілі іх шчыльнай сьцяной і пхалі ім бадай што сілком рублі. Спэкулянты нажывалі на гэтай справе нямала, але з прычыны таго, што лік іхніх кліентаў быў абмежаваны, ніхто з іх асабліва не разбагацеў.

Швэйк, запэўняючы ўсіх чыста, што ён—добры славянін, сабраў на ранейшых станцыях поўную кішэню медзякоў, ня лічачы некалькіх паўрублёвікаў і рублёў; цяпер, у горадзе, ён таксама адстаў ад іншых, і яго прывёў на станцыю патруль. Швэйк зьявіўся да сваіх, увесь зьяючы ад задавальненьня і трымаючы смажаную гусіну ў адной руцэ, а вараную курыцу ў другой, і ветліва ўсьміхнуўся Марэку, які лічыў, што гэтым разам Швэйк канчаткова згінуў.

— Тут ня надта ўжо і дрэнна,—сказаў Швэйк.—Я быў на гарадзкім пляцы; там акурат кірмаш, які тут завуць «базар», і вось што я накупіў. Гусь каштуе паўрубля, курыца—пятнаццаць

капеек, а пад шапкай у мяне яшчэ кавалак смажанага мяса. У торбе ў мяне: чай, цукар і цыгаркі, а за трыццаць пяць капеяк я купіў яшчэ і новы чаиніх. Расія—добра!

І пакланіўшыся салдатам, якія праводзілі яго, ён кожнаму з іх падаў руку і чула сказаў:

— Дзякуй, добра! Здароў! Вось вам на чай, братцы!

Ён даў кожнаму па дзьве папяросы, перадаў купленае на ахову Марэку і пайшоў на вагзал, дзе паўз рэйкі стаяў даўгі рад недабудаваных драўляных баракаў.

Яны былі забіты дошкамі, а дошкі былі ўкрыты прозьвішчамі і подпісамі ўсіх палонных, якія тут праяжджалі, і палонныя са швэйкавай партыі дапоўнілі колекцыю аўтографаў весткамі і пра сябе саміх. Папляваўшы на дошку, яны ўвечнілі сябе з дапамогаю хэмічнага алоўка, накшталт таго: «Ян Голан з Льготы, Коўбалава вуліца № 6. Апошні паштовы адрас—Мілешоў пад Сельчанамі. Радавы 11-га пяхотнага палка, 4-га маршавага батальёну, 12-й роты. Пасылаю таварышом прывітаньне з дарогі на Сібір».

Швэйк пачаў чытаць надпісы, гаворачы:

— Гэтага Тржэцяка з Высоке Мыта я ня знаю, але Эрнст Кац з Кшэмянецкай вуліцы здаецца мне знаёмы. Гэта пэўна сын тога Каца, які гандляваў зайчынымі скуркамі, а потым судзіўся за падробленьне вэксалю. З адным Зомэрам я вучыўся ў аднэй клясе ў школе, але наўдачу, каб гэта той самы, бо гэты—11-га ляндвэрнага палка, а той служыў у 36-м пяхотным палку ў Болеславіі, дзе яго бацька трымаў буфэт пры афіцэрскім сабраньні. А аднаму Шубэрту з Костомлята пад Німбрукам я калісьці прадаў сабаку.

Знаёмага ён усё-ж такі не знайшоў, хоць сумленна перачытаў спачатку да канца. Але затое ён знайшоў вольнае месца і напісаў на ім: «Тут уласнаручна расьпісаўся Язэп Швэйк, ордынарац 11-й маршавай роты, 91-га пяхотнага палка, калі ён, знаходзячыся ў ганебным палоне, трапіў сюды на сваім шляху праз усю Расію. Няхай жыве Франц-Іосіф!».

Зірнуўшы на свой подпіс здалёку, ён падумаў, што ў ім нечага не хапае; таму ён вярнуўся і дадаў: «Марэк таксама едзе са мною. Пухам яму зямля!».

Надвечар вартавыя загналі палонных у цяплушкі і замкнулі іх там. Уначы падалі паравік, а калі палонныя раніцой прачнуліся, цягнік ужо грымеў па рэйках.

Зноў пачаліся спрэчкі пра мэту іхнага вандраваньня. Некаторыя сьцьвярджалі, бяручы пад увагу надпісы на бараках, што іх вязуць у Сібір, а іншыя казалі, што яны едуць не на поўнач, а на поўдзень, і здагадкі дасягнулі найвялікшай напружанасьці, калі было выяўлена, што цягнік ішоў назад па тым самым шляху, па якім яны вось толькі ехалі.

Доказаў было колькі хочаш. Тыя, хто за час падарожжа сядзеў ля дзьвярэй цяплушкі, пазнавалі мясцовасьць, вёскі і станцыі. Настаўнік правяраў у сваёй кніжцы назвы станцый— яны супадалі. А, як спыніліся, відавочна выявілася, што на гэтай самай станцыі палонных тры дні таму назад кармілі абедам.

Карты Расіі ў іх ня было. А напамяць яны не маглі арыентавацца ў разьмяшчэньні расійскіх гарадоў, не гаворачы ўжо пра разьмяшчэньне чыгуначнае сеткі. Ясна было адно: яны ехалі туды, адкуль прыехалі, і гэты факт спрычыніўся таму, што ў адну сэкунду абляцела ўвесь цягнік жывая тэлеграма:

Падпісана згода і мы едзем дамоў!

З усіх зробленых да гэтага часу вынаходак, гэта была самая радасная, і яе ўплыў выявіўся ўжо на наступнай станцыі. Палонныя ўзяліся як мага прыбіраць сябе: мыліся, чысьціліся, узброіліся голкамі ды ніткамі і пачалі абшывацца. З глыбіні кішэняў зьявіліся сьветлыя зорачкі; іх пачалі прыладжваць да каўняроў. Калі-б стары ўладар лапікавае імпэрыі ўбачыў у гэту хвіліну сваіх слаўных абаронцаў, сэрца-б у яго так і ёкнула; бо адзін ефрэйтар аддаў узводнаму кашулю за дзьве зорачкі, якія былі ў тога ў запасе, а фэльдфэбель адмовіўся ад свайго абеду на карысьць аднаго радавога, які аддаў сваю новую шапку за яго потную і зашмальцаваную.

— Ці ведаеш, хто я,—казаў фэльдфэбель радавому.—Калі мы вернемся ў Аўстрыю, я на гэта не забудуся. Ну, хлопцы, падбадрыся, каб прыехаць дамоў сапраўднымі салдатамі...

Палонных ахапіла гарачка любасьці да чысціні і парадку, як гэта бывае з гаспадынямі перад вялікімі сьвятамі. Спаткаўшы на нейкай станцыі эшалён палонных, якіх везьлі ў Пэнзу, і якія, значыцца, яшчэ нічога ня ведалі пра згоду, яны пачалі вымень-

ваць у іх боты, шапкі, порткі і курткі, аддаючы ў прыдачу да больш дрэнных і брудных рэчаў свае хлебныя пайкі.

Тлумачэньню Марэка, што калі-б нават было замірэньне, усё-ж немагчыма, каб іх зараз-жа накіравалі на радзіму, бо перад замірэньнем павінна было быць перамір'е, пра якое яны даведаліся-б хоць што небудзь ад расійскіх салдат,—ніхто не даваў веры. Нават настаўніка захапіў агульны ўздым, калі ўсе стараліся ўпрыгожыцца; ён мяняў, як мог, апраўдваючыся:

— Салдаты, сяляне, парабкі, рабочыя, рамізьнікі—усе вернуцца ў такім выглядзе, што ніхто не заўважыць, што яны былі ў палоне. Што-ж сказалі-б у нас у палку пра мяне?

Такім чынам адзін толькі Марэк прадбачыў, што на якой-небудзь вузлавой станцыі іхны цягнік проста перавядуць на іншыя рэйкі, і Швэйк ды некалькі басьнякоў, якія лаяліся на ўсе застаўкі, заклікаючы ўсе няшчасьці на Расію, на сонца, на месяц і на ўсіх жыхароў,—толькі яны адны не прыбіраліся.

Швэйк зьнік на станцыі і доўга не зьяўляўся. Калі ён вярнуўся, ён сумна праказаў:

— Я хацеў тэлеграфаваць са станцыі цару, каб ён загадаў вярнуць мне мае тры мэдалі, але мяне прагналі з паштовай канторы. Дык я на гэтыя грошы купіў квашаніны.—Праз хвіліну дадаў ён, даючы Марэку кавалак густое, падобнай да клею з дрэнным пахам квашаніны, з якой тырчэлі сьвіная шчэць і кавалкі каровінае поўсьці.

— Я ніводнага хэльлера не давязу да Прагі!—рашуча сказаў Швэйк, мацаючы сваю туга набітую капейкамі кішэню.— Чаго мы не праямо ў Расіі, дык тое мы прап'ем у Галіцыі! Езус-Марыя, што за дзівакі гэтыя расійцы! Вядуць вайну і недазваляюць сабе пры гэтым нават разу глынуць гарэлкі!

Такімі словамі Швэйк выказаў сваю тугу па алькоголі і свае антыцьвярозьніцкія пераконаньні ў Расіі, якая любіла выпіць, але якая пасьля мобілізацыі забараніла ў сябе, з прычын досыць зразумелых, выраб і продаж гарэлкі і піва.

Едучы далей, яны не пераставалі правяраць дарогу. Ня было ніякага сумненьня: яны ехалі назад у Кіеў.

На кожнай станцыі Швэйк выскакваў з цяплушкі і купляў усё, што толькі было на ятках. Ён прыносіў булкі, садавіну, кілбасы, гуркі, квашаніну, таматы, шпік і цыбулю, і ён і Марэк елі ўдостач, не саромячыся зайздросных поглядаў іншых.

Вынікі былі ў вольнапісанага яшчэ ў той самы дзень. На кожнай астаноўцы ён вылазіў з цяплушкі і аблягчаўся ў высокай стэповай траве. Але потым прыступы зрабіліся больш частыя, і яму трэба было прыладжвацца ў адчыненых дзьвярох, прычым верны таварыш яго, Швэйк, трымаў яго за рукі, каб ён не зваліўся.

На другі дзень іхны цягнік спыніўся на таварнай станцыі вялікага гораду; паравоз з тэндэрам пайшоў наперад, каб набраць вады, Марэк зараз-жа накіраваўся ў прыбіральню на станцыі, вярнуўся і зноў пабег туды.

Тым часам прычапілі паравоз; раптам пачуўся званок, вартавыя крыкнулі:—сядай, сядай!—і цягнік крануўся.

— Марэк, хутчэй! Ах ты, божа! Марэк, мы паехалі!—затрывожыўся Швэйк.

З-за пабеленых дошак, якімі была адгароджана прыбіральня, выскачыў Марэк і, трымаючы рукамі порткі, пабег за цягнікам. Ён дагнаў сваю цяплушку і ўчапіўся за дзьверы, а Швэйк і натаўнік схапілі яго за рукі, каб ён ня трапіў пад цягнік. Марэк падскочыў і ступіў на драцяную пятлю, якая была замест падножкі, але ў гэты момант порткі і споднікі выкаўзнулі ў яго з рук і забоўталіся пад нагамі.

Цягнік якраз падыходзіў да пасажырскай станцыі, і публіка, якая стоўпілася на пэроне, магла назіраць надзвычайнае відовішча: у дзьвярох цяплушкі вісеў, як павук, напоўголы чалавек, нібы вітаючы прысутных сваёй асьветленай сонейкам тыльнай часткаю, а з цяплушкі чуўся добрадушны голас:

— Трымайся мацней, Марэк; ён хутка спыніцца, і тады мы цябе ўцягнем... А ну, хлопцы, памажэце!..

Некалькі палонных кінуліся на дапамогу, і разам узьнялі шыбельніка ў цяплушку. Па пэроне разьлёгся выбух рогату і разам з тым абурэньня, і Швэйк, паказваючы на даму, якая абурана махала парасонам, сказаў Марэку:

— Яна нездаволена табою. Яна, відаць, думала, што аўстрыйцы ў задзе... пульхнейшыя. А ты не адпавядаеш уяўленьню, якое яна сабе склала аб харастве чалавечага цела.

Праз паўгадзіны палонныя даведаліся, што едуць па іншым шляху. На заўтра яны прыехалі ў Варонеж, дзе іх перавялі ў лягер.

Здарэньне з Марэкам і выпадак на вакзале ня меў іншых вынікаў, апрача зьяўленьня ў «Русском Слове», у якім вялося сталае цкаваньне палонных, агнёвага артыкулу пісьменьніка Брэшко-Брэшкоўскага пад назваю «Россия на краю гибели».

У ім пісалася пра дзікую нянавісьць палонных, з якіх адзін адважыўся на люднай паўднёва-расійскай станцыі паказаць з цяплушкі свой голы азадак у публіцы, сярод якой знаходзіліся генэралы, вышэйшыя цывільныя чыны і профэсары; у артыкуле раілася ўжываць бязьлітасную строгасьць да гэтай нечысьці, якая наляцела як саранча, каб аб'есьці Расію, і буйным шрыфтам паўтаралася байка, нібы ў Гэрманіі і Аўстрыі запрагаюць палонных у плугі, прыпякаюць ім пяткі распаленым жалезам і выразаюць пасы са сьпіны, прысыпаючы сьвежыя раны сольлю. Канчаўся артыкул заклікам да расійскіх ваяк адпомсьціць за сваіх закатаваных братоў.

Калі Марэк прасьлібізаваў гэты артыкул у Варонежы і пераклаў з яго тое, што зразумеў, Швэйку, той глыбокадумна зазначыў:

— Дык, значыцца, і тут у газэтах пішуць такія-ж гіцлі, як і ў нас? Ну, ды такая дрэнь нас не запалохае!

6

НА ПРАЦУ

Калі пад час вайны ў якога-небудзь афіцэра выяўляўся такі талент рабаўніка, што ён пагражаў нават той частцы фронту, дзе ён камандваў, ці калі яго дуракаватасьць дасягала такой ступені, што не заўважыць яе не магло нават дзіцё, дык такі афіцэр прызначаўся за начальніка лягеру ці каманды палонных.

Салдат, які трапіў у палон, жыўцом хаваў сябе. Для дзяржавы, вернападданым якой ён быў, ён ня меў больш ніякай вартасьці, бо яна не магла загадаць яму забіваць салдат іншай дзяржавы, а для дзяржавы, на бок якой ён перайшоў, ягонае жыцьцё таксама ня мела значэньня. Ён проста зьнікаў з фронту, дзе ён быў пэўнай пагрозай, а потым ужо гэта была яго асабістая справа, ці вытрымае ён да канца, ці не.

За начальніка рабочай каманды з палонных, у якой я знаходзіўся ў Расіі, быў палкоўнік, што камандваў пад Перамышлем брыгадай ратнікаў. Гэта быў такі дурны чалавек, што каля яго сьмяяліся яго-ж салдаты, якія ўбачылі ўпяршыню чыгунку, калі іх мобілізавалі. Але адстаўкі яму не давалі, а прызначылі яго за начальніка над двума—трыма стамі палонных. Сотні тысяч мерцьвякоў у лягерах для палонных у Расіі, Нямеччыне, Аўстрыі і іншых краінах, што прымалі ўдзел у вайне,—вось вынік дзейнасьці такіх людзей. І цукровыя буракі, якія растуць пад Мілаўцам і Іёзэфавым, і пшаніца, якая каласіцца на палёх Расіі, яшчэ і цяпер сьведчаць пра іхныя справы. Бо яны рабілі з палонных гной на ўгнаеньне свае ўлюбёнай радзімы.

Лягер у Варонежы, куды прывезьлі Швэйка і Марэка, быў перасыльны. Адтуль палонных пасылалі на працу.

За каменданта быў старэнькі капітан Папоў. Абедзьве якасьці, якія атэставалі яго на гэтую пасаду, былі разьвіты ў

яго пасярэдняму і выгуляліся роўна. Ён выдаваў палонным менш хлеба, чым трэба, абкрадаў іх на мясе, не даваў ім цукру і загадаў варыць чай у катлох. Кухнямі загадвалі мадзяры, якія чай пакідалі сабе, а вар афарбоўвалі попелам.

Можа яго дзейнасьць была-б больш інтэнсыўнай, каб яму не перашкаджалі казацкі генэрал Сахараў, што камандаваў вайсковай акругай і прыкамандыраваныя да лягеру данскія казакі-інваліды. Але Сахараў, чалавек сумленны і далікатны, адданы сваёй справе салдат, часта прыяжджаў на рэвізію, выслухваў палонных і пытаўся ў іх пра жыцьцё ў Расіі. Данцы, таксама вымуштраваныя салдаты, абыходзіліся з палоннымі добра, як гэта і належыць з пераможанымі ваякамі, і іхнае разуменьне вайсковага гонару не дазваляла ім абкрадаць палонных.

У капітана Папова была, да таго-ж, яшчэ адна ўласьцівасьць, якая зрабілася яго канькам. Ён быў упэўнены, што цэнтральныя дзяржавы знарок пасылаюць такія масы палонных у Расію, каб зрабіць там з іхнай дапамогай паўстаньне і пагражаць расійскай арміі з сяродку. А з прычыны таго, што ён з практыкі рэволюцыі 1905 году ведаў, што паўстаньне выбухае перш за ўсё там, дзе людзі, доўга пажыўшы разам, бліжэй сыходзяцца адзін з адным, ён стараўся як мага разрозьніць палонных.

Таму ён паставіў партыю, у якой быў Швэйк, на двары, рассартаваў палонных паводле нацыянальнасьцяй і пачаў складаць з пісарамі сьпіс, падрабязна апытваючы палонных.

Допыт пачаўся з крайняга канца, і ўжо трэцяму палоннаму таварышы, якія стаялі за ім і якія трапілі ў лягер раней, параілі не казаць свайго сапраўднага прозьвішча.

— Пагоняць цябе ў капальні, а там, браце, дрэнна. Тут ты таксама галадуеш, але хоць няма чаго рабіць. Скажы ім якуюнебудзь лухту, але прозьвішча не кажы. А калі будуць выклікаць у партыю, дык ты не адгукайся, бо цябе ня так завуць, а пакажы пісару сваю асабовую бляху. Ён умее чытаць лацінку.

Выгада такой штукі была відавочная і даводзіла да роспачы як пісара, так і самага капітана. Некалькі гадзін узапар пісар адзначаў і разьмяркоўваў, куды і з якой партыяй каму ісьці, а на заўтра перад ім былі зусім іншыя людзі, якія нахабна хлусілі яму, што яны яшчэ не запісаны.

Заразу гэтай дэмаралізацыі пашырылі больш старыя палонныя, якія былі там з 1914 году і выхваляліся, што цалкам зразумелі Расію і яе тэхніку. Яны ўмелі абмінаць усе загады, якімі вайсковае ведамства старалася прыцягнуць іх да працы, і, лежачы ў бараках на лавах, з хітрай усьмешкай казалі:

— Хай мяне падсмажаць на ціхім агні, хай мяне вошы заядуць, хай я замерзну—але толькі каб не працаваць.

Яны лічылі за свой сьвяты абавязак навучаць новых палонных у такім-жа кірунку, і таму Швэйк, даведаўшыся пра гэтыя парадкі, ані ня зьдзівіўся, калі ззаду праціснуўся міма яго нейкі зусім абадраны суб'ект і на пісарава запытаньне: «Як тваё прозьвішча?»—адказаў:—«Палонны Валацуга Беспамятны».— А калі пісар зьбянтэжана запытаў, як гэта запісаць, той адказаў, што: «Палонны»—гэта яго імя, а «Валацуга-Беспамятны» прозьвішча. Азірнуўшыся навокал ён дадаў:

— Нагаварэце яму што-небудзь накшталт гэтага, з чаго ў яго вочы на лоб павылазяць. А для вас я карчмар Долечак з Жычан.

Таму Швэйк, калі пісар падышоў да яго, не чакаючы запытаньня сказаў:

— Сапёр Вадзічка.

— Ах, Вадзічка!—задаволена праказаў пісар і зьвярнуўся да Марэка:—А тваё прозьвішча?

— Чамубне Кратына,—сур'ёзна адказаў той.

— Дзіўныя ў іх на Захадзе імёны і прозьвішчы,—сказаў капітан пісару, убачыўшы, як ён пакутуе над гэтым нязвычайным імем.—Перапытай яго яшчэ раз, каб не перablытаць.

— Ча-му-б-не Кра-ты-на,—па складох казаў Марэк, а Швэйк павярнуўся да яго і сказаў:

— Ты ці не радня пану Кратыне з Кралуп? Ён крые дахі і любіць лазіць па кручах. Ён яшчэ зьняўся на даху палацу ў Нелагошы, а ў Вельгрушы на вежы пад ім зламалася драбіна.

Як усе былі перапісаны, капітан Папоў пайшоў у сваю канцылярыю, а потым вярнуўся з нейкімі паперамі і пачаў чытаць:

— На сельскую працу ў Каменцы—дваццаць чалавек!

Пісары і казакі падышлі да палонных, дзе кожная нацыянальнасьць стаяла ў асобнай групе, і ўзялі з кожнай па аднаму чалавеку. Вышла чатыры чалавекі.

— А ну, з кожнай яшчэ па аднаму!—загадаў Папоў, паказваючы на другі канец кожнай групы.

Узялі яшчэ чатырох; цяпер было ўжо восем чалавек, з якіх ніхто ня ведаў адзін аднаго. Капітан зноў крыкнуў:

— А цяпер вазьмеце вось сяродку!

Набралася дванаццаць чалавек. Папоў пералічыў іх і пайшоў ад групы да групы, паказваючы казакам пальцам:

— Во гэтага! Во гэтага!

— На заводы і капальні ў Чарткова—шэсьцьдзесят чалавек!

І пакуль пісар, абліваючыся потам, пачаў складаць сьпіс прызначаных у Камянец, Папоў, паводле свайго асьцярожнага мэтоду, выбраў яшчэ шэсьцьдзесят чалавек для працы ў капальнях так, каб з іх ніхто ня знаў адзін аднаго. Так вялося да таго часу, пакуль не распарадкавалі ўсю партыю.

Маючы на мэце дабрабыт Расіі, ён праводзіў свае мерапрыемствы з вялікім сумленьнем і лічыў сябе за збаўцу радзімы. Яго злавала толькі тое, што лік палонных у лягеры ўсё ўзрастаў—зьявішча, якое не маглі растлумачыць ні ён, ні пісары.

Тым часам сьпісы перапісалі нанова, і капітан зьвярнуўся да палонных з прамовай, у якой асабліва падкрэсьліваў, што яны едуць на працу і ім будзе жыць добра; але хай яны не забываюцца на тое, каго куды пасылаюць—гэтыя вось у Чарткова, гэтыя—у Мільлерава, тыя—у Новачаркаскую, а тыя—у Крукаўку. Потым ён пайшоў абедаць, і казакі пайшлі за ім.

У натоўпе палонных пачуліся выгукі і крыкі, нібы перагукваліся між сабою паляўнічыя пасьля паляваньня, разышоўшыся па ўсім лесе. Кожны клікаў і шукаў таварыша, з якім ён быў разам на фронце ці пасьля яго, і групы паразыходзіліся.

Пасьля таго, як палонных пачаставалі абедам, пісары зноў прышлі, цяпер ужо адны, без капітана, далі казакам дасылальныя паперы і пачалі рыхтаваць партыі да адпраўкі.

Гэта была безнадзейная справа. Пісары глядзелі ў сьпісы і выклікалі прозьвішчы, аж пахрыплі, але ніхто не адклікаўся. Яны хапалі палонных, патрабавалі іхнага пасьведчаньня, але ніводнае прозьвішча ня было падобнае да тых, што былі ў сьпісу. Усё, што з такімі цяжкасьцямі зрабілі раніцою, разбурылася, засталіся адны руіны. Казакам загадалі выгнаць усіх на двор і выстраіць па аддзяленьнях. Але і з гэтага нічога ня выйшла.

Нарэшце за справу ўзяўся начальнік варты, казацкі ўраднік з прастрэленым вокам. Ён узяў у пісара сьпісы і крыкнуў казакам:

— Дваццаць чалавек у Камянец! Адлічвай! Гатова? Вядзі іх на вакзал! Далей: шэсьцьдзесят чалавек у капальні ў Чарткова. Станавіся па чатыры! Адлічвай пятнаццаць шэрагаў! Ну, шпарчэй! Гані іх прэч!

А на пісаравы просьбы і супярэчаньні, што гэта, бач, ня тыя, каго прызначыў капітан і якія адзначаны ў сьпісах, ураднік адказваў:

— Глупства, гэта ўсё аўстрыйцы, сукіны дзеці!

Такім чынам Швэйк і Марэк разам трапілі на вакзал. Разам з іншымі восемнаццацьцю палоннымі іх загналі ў цяплушку, і раніцою на трэці дзень яны дабраліся да Камянца; там іх аддалі пад загад земскай управы, якая павінна была разьмеркаваць іх па сялянскіх гаспадарках на дапамогу ў зборы ўраджаю, які сама што тады разгарнуўся.

Іх адвялі на двор і дазволілі ім адпачываць на дрывах, што нарыхтаваны былі на пілаваньне. Потым паліцыянт адышоў і пачаў хадзіць узад і ўперад каля брамы, а палонныя зноў узяліся за сваю звычайную справу—біць вошы.

Пад дзесятую гадзіну прышоў нейкі чыноўнік з сялянамі. Яны падышлі да палонных і пачалі выбіраць лепшых на выгляд ды мацнейшых.

— Вось гэты, відаць, будзе добры працаўнік,—паказаў чыноўнік на Швэйка, у якога чырвоны твар зьзяў ад задавальненьня, што ім так цікавяцца.

Барадаты дзядзя ў высокіх ботах, з якіх пазіралі пальцы, падышоў да Швэйка і, узяўшы за рукі, абмацаў яго аж да плеч, а потым сказаў:

— Што-ж, гэтага можна. Трэба-б яшчэ двох.

— А ў зубы ты мне ня зірнеш, ідал?—далікатна зазначыў Швэйк, разявіўшы рот.—Вось якія ў мяне іклы.

— Ага, есьці папрасіў!—здагадаўся мужык, ківаючы галавой.—Пачакай, браце, яшчэ ня можна. Перш ты павінен зарабіць хлеб той.

Ён зірнуў на Марэка, памацаў яго мускулы, пацягнуў яго ўгару, каб той устаў, узяў яго рукі ў свае і незадаволена прамармытаў:

— Здаровы, але не працаўнік.

— Не кажы нічога дрэннага пра майго таварыша,—параіў яму Швэйк.—Ты ўжо будзеш задаволены, калі мы разам патрапім да цябе. Будзеш радавацца з нас, што мы на ўсё здатныя.

— Глупства, ён навучыцца працаваць,—сказаў чыноўнік селяніну, які, ня зводзячы вачэй з Марэка, ніяк ня мог прыйсьці да пэўнай думкі.

Селянін прысунуў Марэка да Швэйка і пачаў выглядаць сабе трэцяга. Але ўсіх палонных ужо разабралі; каля кожнага стаяў селянін, паклаўшы яму руку на плячо, і на дрывах сядзеў толькі адзін мізэрны, з жоўтым тварам, відаць, хворы салдат у форме гонведа.

— Вазьмі гэтага,—сказаў чыноўнік селяніну, які быў засупярэчыў.—Вазьмі. У цябе ёсьць ужо два добрых, а гэты таксама будзе працаваць.

І ён сам паставіў няшчаснага поруч з Марэкам.

— Ты мадзьяр ці хто?—спытаў у яго Швэйк.

— Славак, таварыш, славак,—нясьмела адказаў той.—Я з Штавеніц пад Трэнчыным.

— Ты ці ня той драцянік, якога неяк выгналі ўзімку з карчмы «Маглай»?—запытаў, зацікавіўшыся, Швэйк.—Ён, ведаеш, там напіўся, а плаціць не хацеў, дык хлопцы з Кашыршу ўкралі ў яго, як ён ляжаў у гразі, усе пасткі.

Чыноўнік сабраў вакол сябе сялян, узяў у пісара паперу, якую той прынёс з канцылярыі, і прачытаў з яе загад вайсковага ведамства, як абыходзіцца з палоннымі. Сяляне павінны былі сачыць за тым, каб палонныя ня ўцяклі, трымаць іх далей ад жанчын, не прымушаць іх працаваць больш, чым самі працуюць, і павінны былі карміць іх так, як самі кормяцца. Потым ён адаслаў пісара, павярнуўся да сялян і сказаў:

— Аўстрыйцы—добрыя людзі і адменныя працаўнікі. Вы будзеце задаволены імі. Я пісаў у лягер, каб нам прыслалі найстаранных і наймацнейшых. Ну, а цяпер, хлопцы, ня шкодзіць з вас... па рублёўцы... таго...

І ён весела, зухавата пстрыкнуў сябе пальцамі па шыі.

Мужыкі, хаця і без асаблівай ахвоты, выцягнулі з кішэняў ці з-за халяў грошы і далі яму па рублёўцы «на чай».

Барадаты селянін, якога звалі Трахім Іванавіч, павёў сваіх працаўнікоў, Швэйка, Марэка і славака Цьвяршыну на рынкавы

пляц, запрог там у нізкія калёсы двох невялічкіх коняй, прапанаваў палонным сесьці і, узьлязаючы на калёсы, крыкнуў:

— Н-но, любыя, выцягвай!

Яны выехалі за горад. Перад імі разьлеглася неабсяжная роўнядзь палёў, на якіх пшаніцу дзе-ні-дзе касілі і вязалі ў снапы, як у Аўстрыі сена. Селянін паказаў на тых, што працавалі ў полі, і сказаў:

— У нас хлеб ужо прыбраны. Цяпер застаецца толькі касавіца, бо на гэта ў нас часу не хапіла. Потым будзем вазіць сена. Хлеба, дзякаваць богу, зарадзіла сёлета досыць. Хутка прыедзем двору.

За палямі пшаніцы пайшлі палі сонешнікаў, а потым—вялізны поплаў са сьпелай травой, якая дзе-ні-дзе пачынала ўжо сохнуць. Швэйк, зразумеўшы, што ім прыдзецца касіць, зьвярнуўся да славака:

— Вось бачыш, якія тут людзі разумныя. Яны сушаць траву, пакуль яна стаіць яшчэ на корані.

Праз чатыры гадзіны яны дабраліся да вёскі, дзе іх спаткаў натоўп жанчын і дзяцей, якія са спалохам глядзелі на іх. Потым яны завярнулі на двор хаты. Там чакала іх гаспадыня з дзьвюма дарослымі дачкамі.

— Вось я вам прывёз аўстрыякаў,—сказаў Трахім Іванавіч, саскакваючы з калёс.—Цэлы рубель прышлося аддаць чыноўніку за тое, што ён нам тлумачыў, як з імі абыходзіцца. Карміць, як сьлед, пэнсіі па пяці рублёў у месяц, і з бабамі каб ня блыталіся!..

Абедзьве дзяўчыны голасна зарагаталі. Гаспадар, распрогшы коні, пацягнуў гасьцей за рукаў:

— Вячэраць ідзеце.

— Яны ўвайшлі ў бруднае цёмнае памяшканьне, дзе на сьценах, зьбітых з неабчэсаных бярвеньняў, у куце пад павуціньнем вісела колькі малюнкаў, якія бліскалі фольгай і пазалотай... З аднае пазіраў строгі твар Хрыста, з другое сумна ўсьміхалася матка божая.

— Ну, сядайце з намі!—паказаў селянін на лаву.

Гаспадыня з дочкамі засталіся стаяць ля дзьвярэй. Але потым, перамогшы палахлівасьць, якую выклікала нязвычайная форма, яны памалу падышлі да палонных і запыталі:

— А як-жа гэта ў вас? У цябе жонка ёсьць? І дзеці? А зямля? А капуста на ёй расьце?

— Гэта вось мая гаспадыня, а гэта—дочкі,—растлумачыў Трахім Іванавіч. Гэта—Наталка, і гэта—Дуня.

Дуня, здаровая дзеўчына, у якой крамяныя грудзі так і расьпіралі кофту, зьняла з галавы ў Швэйка шапку і пагладзіла яго па лобе. Потым яна зірнула пад шапку і Марэку, на якога яна глядзела з недавер'ем і сказала бацьку:

— Ніякіх рагоў у іх няма, і вачэй у іх двое. А бацюшка ў царкве казаў, што гэта антыхрысты, што ў іх адно толькі вока сярод лобу і рогі, як у быка... Можа гэта зусім не аўстрыякі?

— Ваш бацюшка—дурань!—проста заўважыў бацька.—Дзівак ён. Гэта—людзі, як і мы. Усе пісьменныя, і чыноўнік казаў, што ў іх нават кавуны відэльцамі ядуць. Ну, а цяпер давайце вячэраць!

З вялізнай расійскай печы, якая займала ўвесь кут насупроць, гаспадыня выцягнула рагатым струмантам вялікі, закураны саган, тым часам як яе дочкі паставілі на сярэдзіну стала драўляную міску і расклалі вакол яе стракатыя ляксаваныя і таксама драўляныя лыжкі. Тады Трахім Іванавіч устаў і прачытаў перад абразамі малітву. За ім стаялі жанчыны, кланяючыся і жагнаючыся.

— Гэта яны перад ядой моляцца,—паціху прашаптаў Марэк. Славак Цьвяршына няўпэўнена ўстаў, падышоў да іх і, стукаючы сабе ў грудзі, пачаў хрысьціцца паводле каталіцкага абраду. А калі паклоны ўсё яшчэ не канчаліся. Швэйк наважыўся:

— Эх, пайду і я рабіць вольныя рухі; хоць хутчэй іх усе пераробім. Відаць, бог пасылае ім пядрэнны абед, што яны яго так шчыра дзякуюць загадзя. Калі я быў на вайне, у палку быў фэльдфэбель Блашэк, які заўсёды казаў салдатам: «Дурні вы гэткія, практыкаваньні са стрэльбай і вольныя рухі вы будзеце рабіць, пакуль не счарнееце і пакуль магазын ня будзе поўны!» Можа і гэтыя тут моляцца на запас?

І Швэйк стаў поруч з гаспадаром ды пачаў адбіваць паклоны, аж трышчэла сьпіна, і хрысьціцца, нібы ён выконваў зьдзельную працу. Калі гаспадары скончылі і разьвіталіся са сваімі сьвятымі, яны з замілаваньнем глядзелі на яго.

— Вось, адразу відаць—набожны і добры чалавек,—сказаў гаспадар.—Нават нашаму богу моліцца.

— Гэты ня ўмее маліцца,—пачаў ламанай расійскай мовай апраўдваць Марэка Швэйк, калі пасядалі за стол. Ён наогул ня ўмее па-вашаму гаварыць. Ён дурны, як бот.

Гаспадыня пераліла варыва з жалезнага гаршка ў драўляную міску, і ўсе ўзяліся за лыжкі. У гарачай вадзе плавалі кавалачкі капусты, бульбы і нейкай незнаёмай гародніны; гаспадыня, чакаючы чужаземцаў, раіла ім вылаўліваць з міскі мух, якія валіліся туды раямі. І, ставячы на стол парэзаны скібкамі белы хлеб, сказала:

— Ежце, ежце! У нас варыва хопіць. У печцы яшчэ саган стаіць.

Палонныя цягалі лыжкамі кавалкі з міскі, і іхныя веды ў расійскай мове ўсё пашыраліся. Гаспадар завёў з жанчынамі размову, і Швэйк зьвярнуў увагу на тое, што часта паўтаралася слова «лазьня».

Варыва яны заелі хлебам, і Марэк паціху заўважыў, што гэтая бедная вячэра ня варта таго, каб за яе авансам так маліліся ды дзяквалі. Швэйк, адзначаючы правільнасьць яго́ных слоў, сказаў:

— Можа іхны бог—скупы. Бывае так, што ў каго сэрца добрае, дык той адразу дае, а іншы любіць і паўпірацца. Вось у Лібене была ў мяне адна знаёмая, Ганна Бэнда, дык тую ніяк ня ўпросіш, пакуль не дасі на блюзку ў дадатак да прызнаньня у каханьні. Хто яго ведае, якія тут парадкі? Можа іхны бог глухі. Яго-ж заўсёды малююць дужа старога.

— Ну, брацьцы, цяпер пойдзем памыцца,—сказаў гаспадар, узьнімаючыся і даючы ім знак ісьці за ім.

Ён павёў іх праз двор да маленькай хаткі, падобнай да пуні. Калі яны ўжо зусім блізка падышлі да яе і Марэк упэўніўся, што гэта ня тая ўстанова, пра якую ён думаў, ён запытаў у гаспадара:

— А дзе ў вас тут сарцір?

— Ідзі проста ў стэп,—адказаў той.—Нам сарцір непатрэбен.

Марэк адышоўся. Трахім Іванавіч адамкнуў хатку, упіхнуў туды Швэйка і яго таварыша, прапанаваў распрануцца і сам памог ім скінуць порткі і кашулі.

Падабраўшы іхную бялізну і адзеньне, ён адчыніў другія дзьверы і пайшоў за імі ў другое памяшканьне. Ня гледзячы на

цемру, відаць было, як ён паразьвесіў порткі і курткі на калкох пад стольлю, а бялізну разгарнуў на жэрдцы.

— Езус-Марыя,—прашаптаў Цьвяршына.—Што з намі тут зробяць? Мы-ж у нейкай закуце!

— Зусім ня тое ты кажаш, таварыш,—паправіў яго Швэйк.— Мы—у кутузцы. У расійцаў ёсьць для гэтага тое самае слова, што і ў нас. Мы называем гэта карцарам, турмой, як гэта вядзецца ў добрых людзей. Салдаты і валацугі завуць гэта кутузкай. Шляхетныя расійцы і паны афіцэры называюць такое месца катаргай, а сяляне—кутузкай. Здаецца, наш гаспадар казаў нават, што пасодзіць нас зараз у кутузку. Я-б толькі хацеў ведаць—з кім ён нас пасодзіць.

— Ну, ідзеце-ж,—кіўнуў ім Трахім Іванавіч, паказваючы на другое памяшканьне і, калі ўсе ўвайшлі, зачыніў за сабою дзьверы.

Вакол іх панавала поўная цемра, і толькі праз маленькую дзюрку ў падлозе праходзіла крыху сьвятла. Гаспадар сеў на лаву, а потым узяў ражку з вадой і падышоў з ёй да печы, дзе паміж каменьня, пускаючы дымны і чадны жар, цьмелі буйныя вугалі.

Трахім Іванавіч узяў дзьвюма трэскамі адзін камень і кінуў яго ў сваю ражку. Вада зашыпела. Ён задаволена нешта прамармытаў, зрабіў тое самае з другой ражкай і паставіў яе ля сябе.

— Божа літасьцівы,—прашаптаў Цьвяршына, палахліва тулячыся да Швэйка.—Што гэта ён там робіць? Гэта ўсё роўна, як кат нарыхтоўвае свае прылады да катаваньня. У нас вось так катавалі Яношака, каб ён прызнаўся, з кім рабаваў сваіх паноў.

— Здаецца мне, таварышы, што і з намі будзе тое,—з пакораю сказаў Швэйк, абняўшы рукою худое, кашчавае цела свайго таварыша.—Напэўна, ён выпрабоўвае ці досыць распаліліся каменьні. Напэўна, ён прымусіць нас прайсьці па іх босымі, каб упэўніцца ў нашай бязьвіннасьці, што мы не забівалі расійцаў. Тут, напэўне, бракуе жалеза і таму абыходзяцца больш танным матэрыялам. Ты-ж ведаеш, як узьніклі капальні «Польдзіхютты» каля Кладно? Адтуль езуіты бралі жалеза, калі дапытваліся, ці ня ведзьма тая ці іншая жанчына.

Трахім Іванавіч узьняў поўную ражку вады, адступіў на крок ад агня і адным махам выліў ваду на каменьне. Грымнуў выбух; пачулася лопаньне, нібы ірвалася некалькі шрапнэляў, і ад печы

ўзьнялася да нізкай столі страшэнна распаленая хмара пары аж палонныя адразу зьліліся потам. Гаспадар шпарка адчыніў дзьверы, выскачыў вон, крыкнуў ім нешта, чаго яны не зразумелі, і зачыніў дзьверы.

— Ён крыкнуў: «Цяпер вам сьмерць!»—ляскаючы зубамі і чапляючыся за Швэйка, зарумзаў Цьвяршына.—Ён засмажыць нас тут жыўцом, а потым нас зьядуць.

Жар сухой пары напоўніў ўсё памяшканьне. Са Швэйка ручаямі цёк пот; ён абціраў яго рукамі з вачэй, якія ад поту да болю сьвярбелі, сплёўваў яго з губ, дзе да кропляў поту дадаваўся агідны салёны смак, і супакойваў Цьвяршыну:

— Мы як дзяцюкі ў «пещи огненной». Добра яшчэ, што нас смажаць сухіх. А ты падумай сабе, што-б было, каб нас палівалі гарачым маслам! Так нас толькі адпарваюць. Казаў-жа чэскі афіцэр у Дарніцы, што палон, гэта—чысьцец, і што кожны павінен прайсьці праз яго, каб трапіць да дзьвярэй раю.

— Значыць, вось чаму ён крыкнуў: «Цяпер вам сьмерць!»—загаласіў Цьвяршына.—Ніколі-б я не паверыў, што будзе мне такі канец. Толькі-б трапіў я цяпер на фронт, я-б у іх так страляў, я-б ім так паказаў, як выдаваць маніфэст, што яны, нібы, вызваляць нас ад мадзьяраў. Езус-Марыя, гэта-ж сапраўдныя людаеды!

Цьвяршына зваліўся з лавы і лёг на падлозе. Швэйк не адказваў, а пачаў качаць галкі з гразі на сваіх сьцёгнах і кідаць іх на вугалі. Настала поўная цішыня. І толькі раз-па-раз чуўся пад стольлю сухі трэск, нібы ламалася тоненькая галінка. Гэта былі вошы, якія трэскалі, ня вытрымліваючы гэтай распаленай атмосфэры.

— Тут можна яшчэ дыхаць, таварыш,—сказаў Цьвяршына, смаргануўшы за нагу Швэйка.—Тут стаіць ражка з халоднай вадой. На, выпі і ты,—дадаў ён прагавіта глытаючы ваду і апусьціўшы туды твар. Потым ён падпоўз на каленках да дзьвярэй і пачаў біць у яе кулакамі:

— Памажэце! Ратуйце! Гвалт! Нас смажаць жывых! Паміраем! Памажэце! Адчынеце!

Ніхто ня прыходзіў. Ад печы ішоў такі жар, што нават каля дзьвярэй нельга было дыхаць, і калі Цьвяршына пачуў, што Швэйк п'е ваду з ражкі, ён пайшоў па вопратку. Ён выцягнуў з кішэні курткі маленькі малітоўнічак у чорнай вокладцы, лёг

прытульваючы яго да грудзей, зноў на падлогу, потым прысунуў яго да дзюркі, праз якую праходзіла сьвятло, і пачаў голасна маліцца, блытаючы ўсе малітвы.

— Ну, а я хоць памыюся гарачай вадой,—сказаў Швэйк.— Я-ж увесь у гразі, і ўсяго мяне вошы пагрызьлі, проста гідка глядзець.

Ён пачаў пеляскацца ў ражцы, катаючы ўсё яшчэ галкі з гразі.

— Памолімся за нашага прасьвятога епіскапа,—мармытаў Цьвяршына, ловячы паветра, як выкінуты з вады карась.—Божа, пачуй мае малітвы і зьлітуйся! Хай запаляцца нашы пячонкі і сэрцы агнём сьвятога духа, каб неапаганеныя служылі мы табе чыстым сэрцам і чыстымі намерамі...

— А табе тут яшчэ мала жару?—запытаў Швэйк, прыпікаючы да ражкі.

— Усемагутны божа, аснова ўсіх дзяржаў, асабліва-ж найхрысьціянскай з усіх аўстра-вэнгэрскай монархіі,—мармытаў, лежачы на падлозе, Цьвяршына,—асьвяці раба свайго, нашага дзяржаўнага імпэратара Франца-Іосіфа І, каб уразумеў ён моц тваю, якая дае перамогу на ворагамі, і...

— Ну, бязумоўна,—перапыніў яго Швэйк,—Наш фэльдкурат так і казаў, што апошняя думка сумленнага ваякі павінна належыць вышэйшаму правадыру.

— ...І каб ён,—запыняючыся, чытаў Цьвяршына,—праз літасьць тваю стаўшы монархам, мудра кіраваў пад тваёй дзясьніцай народам.

— Амэн,—ціхліва сказаў Швэйк, устаючы.

Цьвяршына з хвіліну прыслухоўваўся, ці ня ідзе хто. Потым ён зноў разгарнуў кнігу і, укладаючы ў голас усю пакору і ўсю тугу свае душы, зноў зацягнуў:

— Навучаньне і малітва добрапрыстойнай дзевы: фанабэрыя ці жаданьне падабацца бывае звычайна першым крокам да грэху. Імкніся перш за ўсё спадабацца богу, і тады ты спадабаешся ўсім сумленным і прыстойным людзям...

— Калі я ляжаў у больніцы ў Бродзе,—зазначыў Швэйк,—дык там была адна санітарка, сястра Анастасься. Гэта была мілая дзяўчынка, і ўсім яна падабалася. Яе можна было-б залічыць у сьвятыя, каб яна ня зьнюхалася з адным маладым доктарам. Потым у яе было ад яго дзіцянё, і ўрэшце ён з ёй ажаніўся.

— Няпрыстойнае адзеньне і лёгкадумнае баламуцтва,—гучэла зьнізу,—зьяўляюцца пасткай, якая ловіць душы. Беззачаннасьць—лепшая прыгожасьць твайго роду, няпрыстойнасьць і нядбайнасьць вопраткі—яго найвялікшая ганьба. Шмат хто з дзяўчат занадта рана і шмат клапацяцца, каб выйсьці замуж, і толькі таму, што яны карыстаюцца пры гэтым ня тымі сродкамі, іх ніхто не бярэ.

Лепшы сродак для разьвіцьця бюсту ведае адна мадам Пальчык з Пшыбрама,—азваўся Швэйк,—наогул яна дае жанчынам розныя сродкі для ачараваньня, а яе муж—мужчынам. Ён зусёды зьмяшчаў абвесткі ў «Політыцы: «Дзе няма валасоў, там яны зноў вырастаюць. Дзеці—шчасьце сям'і.

— Той, хто табе падлыгвае і патурае, той амаль заўсёды хоча табе схлусіць. Сьцеражыся зьмія-спакушальніка, пагарджай ім. Калі табе абяцае што-небудзь свавольны, здатны да авантур, чалавек, дык ён ня выканае свайго слова, бо не аднойчы абяцаў тое-самае шмат каму іншаму. І хто ва ўсім сьвеце ўзнагародзіць цябе за згублены гонар і добрапрыстойнасьць, якія ўкраў у цябе праз свае абяцаньні які-небудзь сласнотнік?—у захапленьні пытаў Цьвяршына словамі свае кніжачкі.

І Швэйк на гэта даваў адказ:

— Ніхто. І будзеш ты цягацца з ім па судох, пакуль ён табе не заплоціць за зьнявагу і алімэнты.

Цьвяршына прачытаў так усе дзесяць навучаньняў для дзевы, а потым перайшоў да малітвы, гучна галосячы праз дзюрку і заклікаючы бога навучыць яго, каб ён, Цьвяршына, усякага бессаромнага спакушальніка ад сябе адкінуў і прыняў да сэрца ўсе парады руплівых бацькоў. Ледзь жывы Швэйк лёг ля яго, дыхаючы халаднейшым паветрам, якое ішло з-пад падлогі, і пачаў глядзець разам з ім у кніжку.

— А што, прадсьмяротных маленьняў мужа і жонкі ў цябе няма?—запытаў ён.—Такіх, калі яны абудвы паміраюць разам?

Калі праз нейкі час Трахім Іванавіч адчыніў дзьверы, штурхаючы перад сабою голага Марэка з яго бялізнай, ён убачыў, што абудвы палонныя ляжалі на падлозе ў чадзе, амаль засмажаныя і лавілі паветра, як сабака на паляваньні. Ён папэпаў іх па сьпіне і, узяўшы пустую ражку, каб прынесьці вады, ласкава сказаў:

— Ну што, папарыліся, хлопцы?

— Ух, як піць хочацца,—крыкнуў Швэйк, бяручы з яго рук поўную ражку, і пачаў прагна піць. Тым часам гаспадар дастаў кавалачак мыла, паказаў на ражку з цёплай вадой і знакамі паказаў, што трэба памыцца.

Марэк зразумеў, што ён у першабытнай расійскай лазьні і падаў добры прыклад. Палонныя пачалі мыць адзін аднаго; у лазьню прышоў голы гаспадар з новай ражкай вады, кінуў туды камень, каб пагрэць яе, і лінуў яе на распаленае каменьне, каб падпусьціць пары. Нарэшце, з палку ён узяў бярозавы венік і пачаў ім парыцца, пакуль усё яго цела не пачырванела, як у рака. Ён качаўся па палку, пырскаючы і вохаючы ад задавальненьня. Тады Швэйк таксама схапіў венік, пацёпкаў ім Марэка, Цьвяршыну і сябе і раптам абвясьціў:

— Ага, разумею: гэта прылада для зьнішчэньня вошай, вошабойка. Лускаць адну вош за аднэй занадта марудна і нудна. А мы вось думалі, што нас тут хочуць катаваць, а тым часам зьнішчылі ўсіх нашых саюзьнікаў... Няхай жывуць расійскія спосабы катаваньня!

*

Назаўтра Трахім Іванавіч усклаў тры кошыкі сярпоў, біклажку вады, мяшок хлеба і казанок на калёсы і пабег да пуні, дзе начавалі палонныя.

Было яшчэ бадай зусім цёмна. На ўсходзе нябачнае яшчэ сонца кідала першыя агністыя стрэлы ў крывавае неба, і Трахім Іванавіч радасна зазначыў:

— Добры будзе дзень!

Ён адчыніў дзьверы ў пуню і прарэзьліва крыкнуў:

— Э-гэ-гэ! Уставай, хлопцы!

Марэк з пярэпалаху ўскочыў з сена, на якім яны спалі. Цьвяршына ўзьняўся, нарыхтаваўшыся бегчы, куды вочы глядзяць, хоць чорту ў лапы, а Швэйк спакойна павярнуўся на другі бок, сказаўшы:

— Не перашкаджайце спаць, эй, вы там! Бо вас аштрафуюць за парушэньне грамадзкае цішыні і спакою.

— Эгэ-гэ-гэ!—закрычаў гаспадар у адказ над самым вухам у Швэйка.—Ну, уставай, паніч! Хадзем на поплаў, на працу!

— Што-ж, на працу, дык на працу,—пазяхнуў Швэйк,—што-ж мы будзем рабіць?

— Хутчэй, хутчэй апранайся,—сьпяшаў гаспадар,—няма чаго марудзіць.

Трахім Іванавіч выйшаў запрагаць коняй у калёсы; абедзьве дачкі таксама ўсталі і кэрпаліся з валовымі запражкамі.

— Я толькі-толькі пасьпеў заснуць,—скардзіўся Швэйк,— з вечару мяне дужа кусалі блохі. І вось гэты тып прыходзіць і іржэ мне ў вушы, як конь. Так з пярэпалаху і радзімчык здарыцца можа. Узьнімае нас на працу, а яшчэ ноч... Калі-б тут былі блізка паліцыянты, я-б падаў на яго скаргу. Што ён не дае людзям спаць, калі ім спаць хочацца?

— Дальбог, Швэйк, яшчэ няма другое гадзіны,—бурчэў Марэк, зірнуўшы на гадзіньнік.—У нас такой парой усе яшчэ сьпяць.

— Ну вось бачыш,—урачыста сказаў Швэйк,—што я мог-бы яго пасадзіць нават за краты. Эх, няма тут паліцыянта пад рукой; дай яму толькі крыху ў руку, дык ён табе ўсё сьцьвердзіць! Язэпа Поспішыля з Высачан ведаеш? Не? Ну дык вось, з ім быў якраз такі выпадак, калі яго затрымалі ў часе дэманстрацый за выбарчае права. Ён таксама ішоў разам з іншымі, а на шыі ў яго шалік, а пад шалікам—апухлыя залозы. Справа ў тым, што ён прастудзіўся ад скразьнікаў на заводзе, і каб яму нават заплацілі мільён, дык ён ня здолеў-бы выцісьнуць ані гуку. Але, як няма чаго рабіць, дык ён пайшоў на дэманстрацыю нават з распухлым горлам. Стаіць ён, значыцца, на Венцэслававым пляцы, слухае, як доктар Соукуп крычыць праскім фараонам: «Узброены народ у форме паліцыянтаў, схіліся перад яго вялікасьцю пралетарыятам!» і думае: «Ён сабе крычыць, а паліцыянты стаяць, як балваны. А калі паласканьне перакісам вадароду мне не дапаможа, дык абавязкова прыдзецца даць выразаць залозы». І раптам яму на плячо кладзе руку паліцыянт: «Імем закону, вы арыштаваны. Вы крычалі: «Прэч манархію, прэч імпэратара!» Наш Поспішыль паказвае рукой на горла, а паліцыянт зрабіў знак другому, каб узяць яго, і яны ўдвох узялі няшчаснага з натоўпу і пацягнулі ў вучастак. Там склалі на яго пратакол, а ён сіпіць: «Я ня крычаў, у мяне горла распухла». А паліцыянт, які яго прывёў, кажа: «Вось бачыце, пан комісар, ён нават асіп ад крыку!» Але комісар бачыць, што горла ў Поспішыля зусім распухла, і пытае: «Ды ці добра вы ведаеце, што гэта ён крычаў?», на што паліцыянт адказвае: «Так, ён мог гэта крыкнуць!»—«Але-ж вы бачыце, што ён ня можа нават

гаварыць», гаворыць ужо злосна комісар, адчуваючы, што праз гэтую справу можа быць для паліцыі няпрыемнасьць, але той кажа сваё: «Сьцьвярджаю паводле абавязкаў службы, што ён хацеў гэта крыкнуць!»

— А у нас у Вэнгрыі—дадаў Цьвяршына,—і ня гэта даводзілі. Вось, напрыклад, нейкі Белік з Слаўніка абвінавачваўся ў тым, што ён...

У гэты момант у дзьвярох зноў зьявіўся Трахім Іванавіч.

— Варушэцеся, хлопцы, весялей!

— Ды я яшчэ ня мыўся,—пачаў апраўдвацца Цьвяршына, а Трахім Іванавіч бязуважна адказаў:

— Гэта і ня трэба. Толькі паны могуць дазволіць сабе мыцца штодня. Ну дык—хутчэй! Хутчэй!

Трахім Іванавіч прамармытаў яшчэ нешта няўцямнае, моцна вылаяўся, і выпхаў іх за дзьверы. Потым ён пасадзіў Швэйка да сябе на калёсы, Марэка і Цьвяршыну пасадзіў разам з дочкамі, і—гайда наперад!

Коні жвава паймчаліся і хутка схаваліся ў далі. Валы ступалі марудна, паважна; Наталка і Дуня паганялі іх даўжэзнымі кіямі, пакрыкваючы: «Цоб цобе, цоб! Чаго паўзеш? Цобе цоб!»

Марэк больш уважліва зірнуў на Дуню. Яна была прыгожая, тоўстая—усюдых кругла, нідзе ніякіх кутоў. Крамяныя лыткі былі засмылеўшы на сонцы, а кашуля ледзь ня трэскала на грудзёх ад напружаньня, калі Дуня глыбей уздыхала ці сьмяялася, пазіраючы на Марэка.

— Вось колькі народу працуе ўжо,—сказала яна яму з дакорам.—Мы занадта позна выехалі. Да нашага-ж поля яшчэ далёка!

— Дармо,—супакоіў яе Марэк, махнуўшы рукой.—У двары я-б яшчэ спаў. А не, дык яшчэ-б толькі клаўся спаць.

Дуня села да яго бліжэй і пачала распытваць у яго пра жыцьцё ў Аўстрыі; паміж іншым запытала, ці сьвеціць там таксама сонца і месяц, ці такія самыя там рэкі, стэпы і дрэвы, а потым, крыху пачырванеўшы, спытала:

— А якія ў вас жанчыны? Старыя, дзяўчаты, паненкі? Усё роўна, што і ў нас?

— Як сказаць?—засьмяяўся Марэк, не зразумеўшы сапраўднага сэнсу гэтага запытаньня.—Ёсьць у нас і старыя, і маладыя,

і прыгожыя, і няпрыгожыя, і худыя, і тоўстыя. Жанчыны ўза ўсім сьвеце аднолькавыя.

І ўсё ў іх такое самае, як і ў нас?—дапытвалася Дуня — І валасы? І зубы? І рукі і ногі?

— Ну так, так,—сьцьвердзіў Марэк.

— І гэта таксама?—запытала Дуня, паклаўшы рукі на свае поўныя грудзі.

На Марэка раптам нешта найшло. Ён абярнуўся ў бок другіх калёс, але, угледзіўшы, што Наталка, мабыць, разьвязвала тую-ж праблему ў Цьвяршыны, якому яна захоплена нешта расказвала, ён абедзьвюма рукамі сьцісьнуў Дуню за грудзі.

— Зразумела, і гэта таксама. Але не заўсёды яно гэткае сакавітае.

Дуня прытулілася да яго ўсім сваім гарачым целам, як кошка, потым яна пасунула адну руку Марэка ніжэй, так што яна апынулася ў яе на каленах, і прашаптала:

— Значыцца, у вашых дзяўчат усё-усё так, як у нас? Усё, усё?

— Так, так, так,—кінуў Марэк, якога аж у пот кінула, і ягоныя пальцы непакойна бегалі па каленах цікавае дзяўчыны.— Усё: валасы, зубы, рукі, ногі—усё, як у вас. Але такія прыгожыя ножкі, як у цябе, ня ў кожнай бываюць.

І яго правая рука нібы незнарок ахапіла дуніну нагу вышэй лыткі, паказытала каленку і каўзанулася яшчэ вышэй... Але Дуня рашуча адштурхнула яе.

— Куды лезеш, чорт лазаты? Нельга ў калёсах! Мала табе, калі я кажу, што ў расійскіх дзяўчат ўсё такое самае, як у вашых? Не, трэба табе самому памацаць, ды яшчэ на людзях!.. Ідзі, ідзе, пахабнік!

Яна зноў пачала паганяць валоў, але праз хвіліну перадала Марэку пугу і засьмяялася:

— Пайду я пагутарыць з Наталкай. І калі ў вашых жанчын сапраўды ўсё такое самае, як у нашых, дык гэта азначае, што і вашы мужчыны нічым не адрозьніваюцца ад нашых? Значыцца, у іх таксама ўсё, як і ў нашых?

А праз хвіліну яна нешта горача тлумачыла сястры, якая з захапленьнем зірнула на Марэка і сказала:

— Ах, які ён адукаваны чалавек! Ён табе ўсё адразу растлумачыць! А гэты стары дурань,—уздыхаючы, паказала яна на-

зад, на Цьвяршыну,—усё толькі пытае, ці можа ён хадзіць па нядзелях у царкву, і нічагуткі цікавага ня кажа і не паказвае! Дурань, сапраўды дурань! Рохля!

Каля дзевятай гадзіны яны дабраліся да поля, дзе Трахім Іванавіч жвава тлумачыў Швэйку, што і як трэба рабіць, а Швэйк, нічога не разумеючы, з усім згаджаўся і ўсё сьцьвярджаў:

— Так, так, так! Пшаніцу касіць, авёс малаціць, сонечнікі перакапаць, коні пасьвіць, валоў напаіць... Так, так, так... Добра, так, так, так!..

Задаволены Трахім Іванавіч палэпаў Швэйка па плячы. Паклікаўшы Марэка і Цьвяршыну, ён даў кожнаму па касе, адвёў іх праз поле назад, дзе трава, ужо падсохнуўшы, стаяла сьцяной, і сказаў:

— Ну, з богам. За два дні вы ўтрох гэта жартам скосіце. А калі косы затупяцца, дык у нас іх гастраць так.

Ён палабаўтаў рукою ў цэбры, каб разьмяшаць там гліну і пясок, выцягнуў з цэбра достачку і пачаў ёй мянташыць.

— Вось, хлопцы, косы цяпер—як галякі, і да вечара вы сваю паласу скончыце.

Яны пачалі касіць; Марэка паставілі апошняга, Цьвяршыну—наперадзе, і Швэйк пачаў угаварваць Марэка:

— Галоўнае, глядзі мне на ногі, каб іх не адцяць. Калі трава не паваліцца, дык ты не бядуй. Яна дастала, што ёй належыла і павінна была паваліцца. А калі не павалілася, дык ты тут ня вінаваты, а вось без нагі мне было-б дрэнна. Вось таксама жыў у Касьцельцы адзін сьлёсар, на прозьвішча Беранэк, які любіў пакпіць з людзей. Ідзе ён неяк па рынку, а насустрэч яму кульгае на аднэй назе стары Прохаска, якому другую нагу адстрэлілі пад Кралове-Градцам. Беранэк падаў яму пяцёрку і кажа: «Вось бачыце, дарагі Прохаска, цяпер узімку вам добра, што ў вас няма другой нагі. Добра, што ў вас мерзьне адна, а ў мяне—дзьве!» Год дваццаць пасьля таго ў Беранэка зьявілася кастаеда, і дактары адрэзалі яму нагу. Калі яго прывезьлі з больніцы дамоў, стары Прохаска, хоць ужо зусім ледзь дыхаў, прыцягнуўся да яго і кажа так жаласна: «Ну, вось, дарагі мой, я магу вас узрадваць. Не бядуйце, што гэтыя лупені адрэзалі ў вас ножку. Цяпер неўзабаве надыйдуць халады, дык яна ў вас мерзнуць ня будзе!».

Швэйк спыніўся і пачаў мянташыць; тады ён заўважыў, як моцна і з якой упартасьцю Марэк біў па траве. Цьвяршына таксама спыніўся, зірнуў на Марэка і пахваліў яго:

— Вельмі добра. Праўда, відаць, што гэта ня я касіў, але-ж і там, дзе Швэйк, дык падобна на тое, што тут сабака папасьвіўся.

І ён таксама пачаў вадзіць мокрай достачкай па касе, паблажліва пазіраючы на Швэйка.

Сонца стаяла ўжо высока і пякло бязьлітасна. Касцы кінулі працу і падыйшлі паглядзець, як працуюць аўстрыйцы. Мужчыны падыйшлі блізка, а жанчыны разглядалі іх здалеку, зьвяртаючыся час-ад-часу да Дуні, якая тлумачыла ім усё дзіўнае ў гэтых чужаземцах.

Касцы, бачучы, як Марэк марна біў па траве, думалі сваю думачку. Прыбег і Трахім Іванавіч і расказаў, адкуль ён узяў гэтых палонных.

— Першы робіць нядрэнна,—зазначыў стараста, дужы, высокі селянін,—але іншыя нічога ня ўмеюць. А што азначаюць нашыўкі на рукаве вунь у таго?—спытаў ён, паказваючы на снуркі вольнапісанага.

— Гэта студэнт, чалавек адукаваны,—сказаў гаспадар.—Сам загадчык мне сказаў, што гэты—з адукаваных. Ды яно і так відаць—рукі ў яго белыя.

Стараста ўзяў у Марэка з рук касу і запытаў у яго з іранічнай усьмешкай:

— А ты, браток, касіць умееш?

— Не,—шчыра адказаў Марэк,—у нас сена косяць машынамі.

— Бач, якая важная птушка,—засьмяяўся стараста.—Глядзітка, у іх усё робяць машынамі. Вось у Каргіне ў фольварку таксама ёсьць палонныя. Ім загадваюць дровы біць, а яны ў адказ: «Ня ўмеем, у нас гэта машына робіць». Я там у аднаго запытаўся: «А што, дзеці ў цябе ёсьць?» і паказваю рост ад падлогі. «Ёсьць,—кажа—тры штукі». Пытаю пра жонку, ажно—няма. Адкуль-жа ты дзяцей узяў, сьвіньня нямецкая?» крычу я яму. А ён толькі плячмі паціскае ды ўсё сваё кажа: «У нас на гэта ёсьць машыны. У нас шмат машын». Гэты вось такі самы круцель.

Падтрыманьне слухачоў яго распаліла, і ён зноў зьвярнуўся да Марэка:

— А ты на конях езьдзіць умееш? Коняй у тройку запрагаць умееш?

Не, ня ўмею,—гэтак-жа спакойна адказаў той.—У нас ёсьць аўтомобілі.

— Бач, ты, аўтомобілі! Брэша, як сабака!—урачыста абвясьціў стараста.—Яму, пацану, год дваццаць ня больш, і ён ужо наезьдзіўся на аўтомобілях, а мне ўжо шэсьцьдзесят, а я іх яшчэ і ня бачыў. Гэтыя аўстрыякі брэшуць ну проста, як сабакі!

Яго словы спаткаў гул ухвалы. Палонныя пазіралі адзін на аднаго, не разумеючы ў чым справа, а стараста нарэшце запытаў:

— Ну, а на гармоні граць умееш?

— Не,—спакойна адказаў Марэк.

Стараста ўзлаваў, выцягнуў з кішэні нож і пачаў адразаць з рукава Марэка нашыўкі, моцна трымаючы яго за локаць і гаворачы:

— Вось табе і адукаваны! У нас, у Маскве, у нас на сьвятой Русі, кожны парабак разумнейшы. А яшчэ пайшлі ваяваць з намі, дурні! Нібы ніколі ня чулі, што Расія нават Напалеона разьбіла, хоць той быў хітры, як чорт, і паехаў верхам ад Масквы аж да Парыжу! Вось, братка, вучэцеся ў нас, погань!

Стараста шырока раставіў ногі, размахнуўся касой, нібы хацеў разрэзаць напал земную кулю, і хапіў па траве так, што каса толькі дзынкала. Хвілін з пяць ён касіў як асілак, аж пот ішоў з лобу, а Швэйк нават запляскаў у далоні і крыкнуў: «брава, брава!».

— Ты што, звар'яцеў?—накінуўся на Швэйка Цьвяршына.—Што ўмее гэты мужык, тое і я магу.—А ну, братка,—падштурхнуў ён старасту,—а ну паглядзі, як у Аўстрыі косяць!

Шырокімі, лёгкімі ўзмахамі ён запрацаваў касой і трава шырокімі радамі клалася за ім.

— Гой, людзі добрыя, глядзеце на палоннага,—пакрыўджана крыкнуў стараста.—А ты, Сярожка, вазьмі-тка вось у гэтых лодыраў косы, дый пакажам ім, як па-нашаму.

Сярожка, хлопец год у дваццаць, узяў касу ў Швэйка, а сам стараста вырваў касу з рук у Марэка і стаў перад Цьвяршынай, сказаўшы:

— Ну, братка, цяпер сьпяшайся! Цяпер толькі трымайся!

І пачаў касіць, нібы ад гэтага залежыла яго жыцьцё. Сяляне ў захапленьні падбадзёрвалі сваіх землякоў. Марэк упрашаў Цьвяршыну ня зблышыць, а Швэйк крычаў абедзьвюм бакам: «Наддай яшчэ, наддай!», каб энтузіязм трымаўся і не слабеў.

— Справа, відаць, ідзе на заклад,—сказаў ён Марэку,—як тады з адным рандаром, калі ў яго касіў мой знаёмы Вомачка з Ваднян. Гэты Вомачка быў адзін на лузе і працаваў, а абед яму прывёз сам рандатар. Той глядзіць, што Вомачка ўжо шмат накасіў, хваліць яго і кажа: «Добра, Вомачка, вельмі добра. Але іду ў заклад на дзесяць літраў піва, што да вечара вы ўсяго ня скосіце». А Вомачка на гэта: «А я іду ў заклад на дваццаць літраў піва, што да шостае гадзіны ў мяне будзе ўсё гатова». Ну, той, ідучы, кажа Вомачцы: «Я прышлю вам дзьве бутэлькі наперад для падмацаваньня». А ў двары ён знарок падмяшаў да піва лякарства на вольнасьць і паслаў Вомачцы з дзяўчынкай. Вомачка абед зьеў, піва выпіў і зноў узяўся касіць. Толькі раптам яго за жывот як хапіла!.. Тут ён здагадаўся, што рандар надумаўся яго падашукаць, каб ён ня выйграў, і знарок падмяшаў чаго-небудзь у піва. Тут ён прыдумаў вось што: зусім распрануўся, пакінуў толькі кашулю, завязаў яе ззаду ў вузел і пайшоў касіць, аж смыліць, не зважаючы на тое, што дзеецца ззаду... А шостай рандар прыехаў на поплаў і бачыць: уся трава пакошана, а сам Вомачка ля ручая. «Ну,—кажа рандар,—вы выгралі заклад, Вомачка. Але што вы там робіце?—«Мыюся, пане. Заўтра вы загадайце сабраць тое сена, якое я накасіў да абеду, а рэшту прыдзецца пусьціць у гной. Яно ўсё запаскуджана. «Эх,—уздыхаючы скончыў Швэйк,——дай бог, каб яны так да вечару касілі!

Але яго скромнае жаданьне ня спраўдзілася. Праз дзьве гадзіны стараста паклаў касу, уздыхнуў і прахрыпеў:

— Стой. Так і здохнуць можна, а з рускага чалавека якраз досыць.

Цьвяршына, выхваляючыся сваёй перамогай, толькі ўсьміхаўся; Швэйк, зірнуўшы на зробленае, упэўніўся, што палавіна лугу скошана, і пахваліў славака:

— Вось бачыш, які ты маладзец. Пасьля абеду выклiч зноў каго-небудзь на спаборніцтва.

У гэту хвіліну падыйшла Наталка і паклікала іх абедаць. Абед быў зусім убогі—звараная на вадзе прасяная каша. Наталка зьліла з яе ваду, падліла з бутэлькі нейкага алею, выцягнула з мяшка хлеб, нарэзала яго лустамі, паклала лыжкі і пачала частаваць:

— Ежце на здароўе!

Швэйк памачыў палец у алей і аблізаў яго. Дуня, убачыўшы яго зьдзіўлены твар, пачала тлумачыць, паказваючы на бутэльку:

— Гэта поснае масла—алей.

Швэйк з запытаньнем у вачох зірнуў на Марэка, узяў у рот лыжку кашы і сказаў:

— Дык гэта-ж наша аліва. Вось чаму ў расійцаў такі здаровы колер твару,—ад алівы, якую яны льюць сабе ў кашу.

Па абедзе Трахім Іванавіч зірнуў на сонца і літасьціва дазволіў запаўзаючы ў цень пад калёсы:

— Цяпер мы гадзінку адпачнем. Кладзецеся, хлопцы, адпачывайце!

Дуня і Наталка пайшлі да баб на суседняе поле. Хутка адтуль пачуліся песьні. Швэйк слухаў з вялікай цікавасьцю. Але адчуўшы, што ня дрэнна-б было-б знайсьці ціхае месца, ён адыйшоўся ў бок у стэп і сеў паміж высокімі сьцяблам і бур'яну і іншых расьлін.

Сьпевы змоўклі і дзяўчаты пачалі шаптацца. І калі Швэйк, зрабіўшы што трэба, бордза ўстаў, ён убачыў такі малюнак: усе жанчыны сядзелі на такой адлегласьці, на якой яны маглі заставацца незаўважанымі на карачках на зямлі і ня зводзілі вачэй з таго месца, дзе ён быў. Калі ён узьняўся, усе крыкнулі і разьбегліся, але зноў сабраліся на суседнім полі, і, сакочучы, пачалі паказваць рукою на палонных.

Выспаўшыся, Трахім Іванавіч наважыў, што пойдзе з Цьвяршынай касіць, а Швэйк і Марэк будуць з дочкамі малаціць.

Дуня ўзяла Марэка, дала яму ў рукі вілкі і, паганяючы валоў, загадала яму кідаць на калёсы снапы пшаніцы, паўз якіх яны праяжджалі. Калі снапы былі зьвезены на чыста падмяцены ток, Дуня раскідала іх там, а Наталка запрэгла коняй у каменнае кола, дала лейцы Швэйку, загадаўшы яму стаць пасярод і моцна трымаць іх, і пачала ганяць іх пугаю кругом па таку. Коні беглі трушком. Зерне пырскамі разьмяталася з-пад кола і конскіх капытоў угару і ў бакі. Наталка пакрыквала на коняй, бегаючы за імі і раскідваючы нагамі салому, а Швэйк задаволена ўсьміхаўся.

«Гэта-ж тэхніка часоў цара Саламона,—думаў ён.—А я тут усё адно як дырэктар Клудзкі, калі ён выступае ў цырку са сваімі муштраванымі коньмі.

Яны змалацілі ўсё, насыпалі зерне разам з мякінаю ў мяхі, прыбралі салому, але перад імі зараз-жа зьявіўся новы воз пшаніцы. Так ішло да цёмнага, калі яны вярнуліся да касцоў.

Дуня зноў зварыла кашы, а Швэйк папрасіў ня ліць туды шмат алею. Пасьля кашы кожны атрымаў па кавалку хлеба і па палавіне кавуна. Потым Трахім Іванавіч паслаў на зямлі коўдру, лёг пасярод, зьдзеў боты, падклаў іх сабе пад галаву і загадаў:

— А цяпер—кладзіся! Дзяўчаты—па-права, аўстрыякі—па-лева!

Сам ён застаўся ляжаць паміж імі, загародка паміж ягнятамі і ваўкамі. Загародка, якая так сапла, нібы некага перасьцерагала ці некаму пагражала.

Змарыўшыся ад працы ўсе ўраз паснулі. Апоўначы Марэк прачнуўся ад расы, якая асела яму на ногі. Ён падцягнуў ногі, прыкрываючы іх канцом коўдры, адчуваючы, што ўсё яго цела нібы разьбіта і ные. Пальцы балелі ад вілак, плечы распухлі... І ў той-жа момант ён зноў заснуў, адчуваючы толькі, як Швэйк прыціскаўся да яго, аддаючы сваю прыемную цяплыню.

На досьвітку ён зноў прачнуўся ад холаду. Усе яшчэ спалі; толькі Дуня клапацілася ля казанка, распальваючы пад ім пук саломы, каб згатаваць сьняданак. Убачыўшы, што Марэк трэ сабе вочы і ніяк ня можа зразумець, дзе ён, яна сказала яму ціха, але злосна:

— Стараста праўду казаў, што ты, за прабачэньнем, дурань! Усе навокал сьпяць, як забітыя, а ён такі целеш! Дзьве гадзіны

я з ім прапакутвала, ляжала ля яго, а ён толькі і таго, што сьпіць!..

Марэк усё зразумеў. Цьвяршына ляжаў побач з коўдрай на голай зямлі, абняўшы Швэйка, а ля яго было пустое месца, яшчэ цёплае тае, якая яго грэла, каб ён, Марэк, не прастудзіўся.

З першымі праменьнямі сонца прачнуліся і іншыя. Калі Швэйк зірнуў быў на біклажку з вадой, каб памыцца, Трахім Іванавіч шчыра засьмяяўся:

— Як? Зноў мыцца? Пакінь—у нядзелю памыемся ў лазьні як мае быць.

А дзяўчаты выцягнулі з кішэні скрынячкі з таннай пудрай і пасыпалі ёй свае нямытыя твары; і толькі пасьпелі зьесьці варыва, як Трахім Іванавіч узьняўся.

— Ну, за працу! Глядзеце, хлопцы, каб да суботы усё было скончана!

Так вялося ў іх дзень у дзень, аж пакуль не надыйшла субота; а калі за імі прыехала гаспадыня, Трахім Іванавіч выправіў яшчэ да абеду Дуню з Марэкам паперадзе з возам пшаніцы. Рэшту ён хацеў абмалаціць з тымі, хто застаўся, а ў нядзелю раніцой усім вярнуцца да хаты і пайсьці ў царкву на абедню.

*

Усю дарогу Дуня не гаварыла з Марэкам; толькі пад'яжджаючы да вёскі, яна ўпяршыню з тае раніцы, калі яна вылаяла яго дурнем, зьвярнулася да яго і, засьмяяўшыся, сказала:

— А ты ведаеш, што мяне замуж аддаюць? У тую нядзелю прыедзе малады са сватамі з Каргіна; яго маці наказала пра гэта маёй маці. Пагуляеш на маім вясельлі?

— А як-жа!—адказаў Марэк, дарэмна стараючыся разгадаць загадку гэтай маладой, першабытнай, здаровай і жыцьцярадаснай самкі.—А калі будзе вясельле?

— Калі нашы пагоняцца, дык праз тры тыдні,—уздыхнула Дуня і яе брудны твар пачырванеў праз пудру.—Малады багаты, зямлі ў яго шмат. І кажуць, што ён сваю жонку біць ня будзе. Бацька ягоны таксама ніколі жонкі ня біў.

Дуня села бліжэй да Марэка, узяла яго за руку і маява пра-казала:

— Мне ўжо семнаццаць год, а маладому дваццаць. Як раз час выходзіць замуж. А то ўжо ўсе кабеты сьмяюцца, а маці

вельмі крыўдзіцца. Калі яна пасварылася з бабай Арынай, дык тая ёй сказала: «Цьфу, што ў цябе за дочкі! Такія пудзілы, што ніводны парабак з імі гуляць ня хоча! «А я-ж не такое ўжо пудзіла, га?

— Не, вядома, што не!—сьцьвердзіў Марэк, абнімаючы яе стан. І Дуня прытулілася да яго і жартаўліва прашаптала:

— Ну, ну, добра! Але чаму ты такі дурны! Добра, ня руш мяне цяпер. У хаце будзе досыць часу.

Яны прыехалі і ссыпалі збожжа ў клець. Дуня распрэгла валоў, пусьціла іх пасьвіцца, а сама нацягала з Марэкам вады ў лазьню і сказала яму:

— Лазьню выпалім заўтра раніцою. Сёньня будзем мыцца толькі халоднай вадой. Але сьпіну ты мне патрэш, га?

Аднак, яна замкнула за сабой дзьверы, а як вымылася, падштурхнула яго.

— Ну, цяпер ідзі мыцца ты. А потым прыходзь у хату. Я прыгатую на вячэру яечню.

Калі Марэк прыйшоў у хату, яна паставіла на стол яечню з скваркамі, а потым прынесла аднекуль грубую падушку і паклала яе на прыпек.

— Сёньня я буду спаць тут, пад абразамі,—сказала яна.— Я павінна маліцца, каб бог дараваў мне мае грахі.

Яна пачала класьці перад абразамі земныя паклоны, стукаючы лбом аб падлогу і ўвесь час хрысьцячыся. А калі Марэку абрыдла глядзець на гэта, ён падыйшоў і падняў яе.

Ён сеў на прыпек і пасадзіў Дуню на калені. Яна абняла яго за шыю і прашаптала:

— А ты мне гасьцінца купіш, як будзе кірмаш?

— Усё, усё я табе куплю, усё падарую. Дзесяць фунтаў цукерак табе прывязу, як толькі мне прышлюць грошы з хаты,— абяцаў ёй Марэк, спускаючы з яе плеч кашулю.

Але Дуня спалохалася і падбегла да дзьвярэй.

— Нельга, нельга. Яшчэ відна. І мне сорам перад сьвятымі. Нельга, матка боская нас убачыць.

— Ах, Дунечка, ды ўжо-ж амаль зусім цёмна,—пачаў упрашаць яе Марэк.—Дальбог, я цябе ледзь бачу адсюль. Ну добра, я выйду і зачыню акяніцы.

Ён так і зрабіў. Калі ён вярнуўся, на стале чадзіла маленькая, закураная лямпачка, а Дуня зноў хрысьцілася перад абразамі.

Госпадзі памілуй, госпадзі памілуй, госпадзі памілуй!..

— Ах, Дуня, навошта паліць агонь,—запытаў ён, прыціскаючы яе да сябе.—Я патушу.

— Не, не, ня тушы!—Дуня кінулася да лямпачкі.—Я ня хочу. Бог бачыць і ў цемры, а я ня хочу, каб матка боская пра такое ведала.

Марэк пляснуў рукамі.

Ты-ж сама ня ведаеш, чаго ты хочаш...

Дуня падыйшла да яго зусім блізка і прасіпела яму ў твар:

— Ну, праўда-ж ты дурань, набіты дурань! Кожны пацан у нас ведае, што яму трэба рабіць, а ты ня ведаеш... А яшчэ салдат!.. Ну, глядзі, дурань, глядзі!

І, плачучы з прыкрасьці, яна ўскочыла на лаву, са злосьцю перавярнула хрыста і матку боскую тварам да сьцяны, ударыла кулаком па абразох так, што аж пыл закурыўся ад іх і пасыпалася павуціньне, кінулася з лавы Марэку на шыю і ўрачыста сказала:

— Вось бачыў, дурань! Цяпер яны глядзяць праз сьцяну на вуліцу, а мы можам рабіць пад імі ўсё, што хочам!

І, валячыся на падушку, яна пацягнула Марэка за сабой і прашаптала, сьціскаючы яго і захліпаючыся:

— Мой любы, дарагі, залаты аўстрыёначак!.. Мой няшчасьненькі палонны!..

*

Ужо быў досьвітак, але ў вачох Марэка стаяла прыемная цемра, калі ён прабіраўся па двары, каб выспацца на сваім сене. Хутка прыехалі Швэйк і Цьвяршына і леглі ля яго.

Яны праспалі ўсю раніцу, пакуль ня прышла Дуня і не паклікала іх абедаць. Яна са спагадаю пагладзіла Марэка па шчацэ і на зьдзіўлены Швэйкаў позірак сказала:

— Няшчасны вучоны! Ён так змардаваўся. У яго белыя рукі і ён ня звык да чорнай рускай працы. Але сягоньня ты можаш адпачыць. На абед будуць пампушкі, і ты добра падмацуешся.

Па абедзе, памыўшы свае кашулі, палонныя пашлі ў вёску на пагулянку. Мужыкі ўтварылі адну групу, кабеты—другую. Дзяў-

чаты сядзелі кружком, паклаўшы адна аднэй галовы на калені, сыпявалі і гутарылі, распускалі сабе косы і шукалі адна ў аднае вошай.

Яны якраз канчалі «Ночаньку, калі зьявіліся нашы тры палонныя. Усе пачалі глядзець на іх. Дзяўчаты змоўклі, толькі Дуня тлумачыла нешта ім ціха і старанна. Потым яна зьвярнула іхную ўвагу на Марэка і дадала:

— Яны якраз такія, як нашы мужыкі. Працуюць, кураць, граюць на гармоні, п'юць і б'юць сваіх жанок. А гэты добры і разумны хлопец. І ўсё ў іх такое самае, як і ў нашых мужчын.

І ўсе дзяўчаты нястрымана і звонка зарагаталі...

7

НАРОДНАЯ МЭДЫЦЫНА

З панядзелка зададжылася і Трахім Іванавіч павёў сваіх работнікаў у аўторак раніцою ў абору, дзе ўзімку стаяла яго жывёла. Ён прынёс ім рыдлёўкі, адкалупаў ад плеценай з лазы сьцяны крыху гліны і адламіў ад спрэсаванага гною кавалак падобны да цэглы.

— Ну, хлопцы, бярэцеся за працу. Накладайце гэта Наталцы ў калёсы, а яна будзе вазіць іх за хату. Там вы складзеце іх у кучы.

— Што-ж, ты хочаш будаваць новую хату?—запытаў яго Марэк.—Ці яшчэ на што?

Трахім Іванавіч растлумачыў, што з гэтага матэрыялу нельга будаваць хаты. Заўважыўшы, што яго ніхто не разумее, ён павёў Марэка ў пакой і паказаў на печ.

— Вось яно куды ідзе. Гэта—наш антрацыт.

Такім чынам вырашалася загадка тае цэглы, якую палонныя бачылі ўсюды, як праяжджалі па Расіі. Яе ўжывалі замест дроў, вугалю ці торпу, як апал.

Гэта вынаходка так узрадавала Швэйка, што ён адламваючы вялізныя кавалкі і накладаючы іх на воз, абвясьціў:

Вось гэтымі рукамі я раблю каменны вугал. Раней на гэта патрэбны былі землятрасеньні і іншыя катастрофы, а цяпер досыць некалькіх аўстрыйцаў, Трахіма Іванавіча і сухога кароўяга гною.

За два дні яны прыбралі ўсю пуню, і гаспадар быў вельмі задаволены іхнай працай. Дождж, нарэшце, суняўся, але надвор'е было халоднае, дзьмуў сьвежы вецер і Трахім Іванавіч надумаў малоць пшаніцу.

З пуні выцягнулі ручныя жорны, паставілі іх на двары і па чарзе круцілі. Цьвяршына, выхваляючыся сваёй сілай, цягаў мяшкі, а іншыя іх насыпалі, прычым на Швэйку яшчэ ляжаў абавязак адганяць заўсёды галодных сьвіньней, якія кожную хвіліну мелі намер залезьці на кучу зерня і сажраць яго.

Паводзіны гэтых сьвіньней былі для Швэйка поўнай загадкаю. Раніцою, як аўстрыйцы вылазілі з свае пуні, сьвіньні стаялі ўжо перад дзьвярыма, чакаючы, калі палонныя пойдуць на задворак.

З прычыны таго, што ў гэтых месцах пра клёзэты ня ведалі, а тыя сяляне, якім даводзілася бачыць іх у іншых месцах, лічылі іх за непатрэбную раскошу і бадай за спакусу д'ябальскую, дык абавязкі асэнізацыйнага абозу выконвалі сьвіньні, якія акуратна зьяўляліся, каб выконваць свае абавязкі.

А дагнаць іх было зусім немагчыма. Калі Швэйк паспрабаваў штурхнуць нагой старую, вялізную сьвіньню, якая занадта ўжо нахабна лезла да яго, казычучы яго сваім вільготным, халодным лычам, яна прасунула галаву паміж яго ног і, узьняўшы ўгару, ёмка перакуліла яго носам у гразь.

Гэтага Швэйк ня мог ёй дараваць. Убачыўшы, як на ёй, калі яна пасьвілася ў стэпу, шпацыравалі галкі, вароны і шпакі, і нешта вылузвалі з яе шчэці, ён пачаў запэўняць, што ў сьвіньню ўвайшла нячыстая сіла і прапанаваў таварышам бойкатаваць яе ў часе ранічнага сэансу.

— Мы павінны зрабіць вакол гэтай сьвіньні блёкаду, як Англія вакол Нямеччыны,—угаварваў ён.—Хай гэта агіднае стварэньне здохне з голаду, хоць-бы мне і самому давялося нічога ня есьці.

І вось гэтая самая сьвіньня разадрала аднойчы мех, які Швэйк забыўся каля млыну, а калі ён пабег за ёй з кіем, дык яна кінулася ўбок проста пад ногі Цьвяршыне, які нёс на сьпіне цяжкі мех з збожжам.

Цьвяршына вохнуўся разам з мехам проста на сьвіньню. Тая з усёй сілы завішчэла і кумільгам пакацілася прэч, а небараку Цьвяршыну мусілі падымаць. Валячыся, ён пачуў, як у ім нешта хруснула, і вось цяпер ён ня здолеў сам устаць на ногі.

Яго перанесьлі ў пуню і паклалі на сене. Трахім Іванавіч прынёс абраз маткі боскай і тройчы абыйшоў з ёй вакол няшчаснага, чытаючы малітву, а потым усе зноў узяліся за працу, нібы

нічога і ня было, бо Трахім Іванавіч паставіў абраз каля галавы хворага і ўпэўнена сказаў:

— Цяпер маліся ёй і да раніцы ўсё будзе добра. Да раніцы яна цябе вылячыць.

Але ў вечары Цьвяршыні зрабілася горш. Ён адно стагнаў, ня маючы сілы паварушыцца, і з такім запалам маліўся, што Швэйк, узрушаны, сказаў:

— Гэтая сьвятая ня ведае, дзе табе баліць. Давай, Марэк, падымем яго, і ты яе падсунь яму пад сярэдзіну, каб ёй ня трэба было так доўга шукаць і каб яна хутчэй здолела яго вылячыць.

Узяўшыся разам, яны падсунулі яму абраз пад сярэдзіну. Цьвяршына заснуў, але ноччу прачнуўся і разбудзіў Швэйка:

— Слухай,—сказаў ён,—прыбяры ты яе, калі ласка. Яна мне можа і дапамагла, ды рама праклятая замінае і муляе. Ад яе ў мяне ўжо двойчы трашчэла сярэдзіна, хоць і ня надта балюча.

Раніцой Трахім Іванавіч памацаў у Цьвяршыны сярэдзіну, якая дужа апухла, і злосна прамармытаў:

— Ну, вось, і гэты хворы, і сьвіньня! Гэта-ж трэба такая шкода!

І невядома было, ці шкадаваў ён палоннага, ці толькі сьвіньню.

Швэйк адчуў гэтую двухсэнсавасьць ягоных слоў і, пераказаўшы свае ўраджаньні Марэку, сказаў:

— Гэта таму, што ў вясковых наогул ува ўсіх добрыя сэрцы. Гэта я ведаю ўжо даўно. Вось у нас на радзіме быў адзін заможны селянін, якога звалі Півонкай, дык той пайшоў неяк у піўніцу і засеў там з адным гандляром цыбуляй гуляць у шэсьцьдзесят шэсьць. Раптам па яго прыбягае батрачка: «Гаспадар, калі ласка, ідзеце хутчэй дадому, гаспадыні чамусьці нядобра!» А ён павярнуўся і кажа: «Скажы, што я зараз прыду. Бабку ўжо паклікалі? Ну, дык скажы ёй, каб яна сьпяшалася». І гуляе далей. Праз нейкі час бяжыць другая, батрачка: «Гаспадар, хутчэй да хаты! Сынок ваш, Яшэк, зваліўся з даху на дровы, і вось доктар яго ніяк ня можа адчуліць». Півонка нават і не абярнуўся. «Скажы,—кажа,—што я прыду як скончым партыю...» Праз гадзіну першая батрачка ўжо зноў тут: «Гаспадар, бяда! Што нам рабіць? З каровы, з Лысой, цялё выходзіць заднімі нагамі наперад, і вэтэрынар тут, а карова ня можа ацяліцца!»

А сама ўся дрыжыць і зубамі ляскае, як сабака, калі той ловіць скочак. «Гаспадар, даруйце, наконт Яшэка—гэта хлусьня, і наконт гаспадыні—таксама хлусьня. Я толькі не хацела вас так адразу напалохаць з каровай».

— Брацця,—прастагнаў Цьвяршына, як Швэйк скончыў,—калі я памру, дык падзяліце паміж сабою па шчырасьці маю маемасьць. Ты, Марэк, вазьмі мой ранец, а табе, Швэйк, я пакідаю свой чайнік. І памалецеся за спакой мае беднае душы, якая будзе ляжаць на чужой зямлі, на чужыне.

— Пра гэта не клапаціся, таварыш,—пасьпяшыў супакоіць яго Швэйк.—Так і ведай, пахаваньне мы табе наладзім адменнае, як ваяку, які памёр на полі бою, хоць цябе і ўгробіла нейкая паскудная сьвіньня. Давай мы цябе перанясём на двор, каб ты бачыў нас і табе было ня так сумна паміраць у адзіноце.

Яны вынесьлі Цьвяршыну з пуні, паклалі яго на бярэма саломы, і Швэйк, круцячы ручку млына, зацягнуў пахавальны марш.

Было цяжка мяне, маці,
На сьвет белы нараджаці.
Як пачаў-жа падрастаці,
Дык пагналі ваяваці.

Далі мне ў рукі зброю,
Далі стрэльбу, гостры штых.
Як паг няць у пек а бою,—
Ня сумуй па сыне ты!

Твае ласкі не атуляць
Сына ў жорсткай барацьбе.
Без цябе цяпер, матуля,
Знойдзе месца ён сабе!

Будзе ў Польшчы адпачынак.
Пад расійскаю рукой.
Я звалюся на лагчыне,
І знайду там супакой...

Чым далей Швэйк сьпяваў, тым больш марудны і жалобны рабіўся ў яго голас і тым павольней круціў ён ручку млына, так што Трахім Іванавіч зусім зганіў ягоную песьню і сам пачаў круціць, ушчуваючы Швэйка.

— За рускай працай сьпявай і рускую песьню. Во як!..

І ён завёў удалую дрындушку, круцячы ў такт ручку млына, аж асьцё з імпэтам разьляталася ўва ўсе бакі.

Убачыўшы, што Швэйк пачаў працаваць больш жвава, гаспадар трахануў валасамі і сказаў:

— Вашы песьні таксама ня дрэнныя, але нашы, рускія, лепшыя. А калі ты ясі расійскі хлеб, дык сьпявай і расійскія песьні. А, вось і Марта, якая ўзялася вылячыць нашу сьвіньню. Давай, хлопцы выганім сьвіньню на двор.

Яны выцягнулі сьвіньню, якая ляжала з разьдзьмутым пузам у сваіх хляве, на двор. Да яе падыйшла старая няпрыгожая шаптуніха, зьдзела кажух і накрыла ім сьвіньню, у якой быў, відаць, запор. Потым старая, седзячы на кукішках, памалілася над хворай жывёлай, перахрысьціла яе і, набраўшы ў рот сьвянцонай вады з нейкае бутэлечкі, прыснула ёй паміж вачэй. Сьвіньня рохнула ад асалоды ад гэтага душу, і старая зноў перахрысьціла яе, цяпер ужо лоб. Нарэшце, яна скачала з хлеба з нейкімі сушанымі лістамі галку, абліла яе алеем, абпырскала сьвянцонай вадой і, калі Трахім Іванавіч разявіў сьвіньне зяпу паленам, засунуў ёй гэту галку як мага глыбей у глотку, каб прымусіць яе праглынуць зельле.

Пасьля гэтага старая пайшла ў хату, прынесла адтуль другі абраз і, нешта мармычучы ды бесьперастанку хрысьцячы сябе і сьвіньню, пачала хадзіць усё больш і больш шчыльнымі кругамі вакол сьвіньні, пакуль абраз не крануў яе хваста.

Тады яна некуды пайшла і вярнулася толькі па абедзе. Сьвіньня, відаць, дужа мардавалася, бо пры самым маленькім руху прарэзьліва вішчэла.

Старая зноў села ля яе, дасьледуючы, памацала яе ногі, абпырскала іх сьвянцонай вадой і раптам адным махам доўгага вострага нажа адрэзала ў яе хвосьцік, пырснуўшы з роту ў сьвежую рану апошні запас сьвянцонай вады.

Сьвіньня падскочыла, нібы яе падкінула моцнай сталёвай спружынай, і пачала кумільгам бегаць па двары, з віскам, ад якога зьвінела ў вушшу. А старая, узьняўшы перад сабой абраз, бегала за сьвіньнёй і крычала як звар'яцелая, аж нельга было зразумець, ці яна ашалела ад сьвіньні, ці сьвіньня ад яе.

Нарэшце, сьвіньня спынілася, прысела... і з-пад акрываўленага абрубка хваста пачалася жудасная страляніна. Старая хуценька вымазала сабе палец мылам з маслам, таркнула яго ў дзюрку, адкуль з імпэтам ірваліся газы, і паклала абраз на напружаную сьпіну жывёлы. І вось намаляваны на абразе сьвяты

зрабіў цуда, якога ў яго прасілі. Сьвіньня яшчэ раз прарэзьліва завішчэла, потым задаволена рохнула і ззаду ў яе пачалі вывальвацца зьбітыя камякі напалавіну пераваранай пшаніцы. Пасьля гэтага сьвіньня пабегла на поплаў і пачала пасьвіцца, нібы з ёй зусім і ня здарылася трагэдыя, за якую яна ахвяравала хвост.

З зусім зразумелай цікавасьцю пазіралі Швэйк і Марэк на гэтае цуда шаптунскага лячэньня. Трахім Іванавіч мармытаў нешта амаль такім задаволеным тонам, як сама пацыентка, калі з яе вываліўся першы камяк; падыйшоўшы да Марты, ён сказаў ёй нешта, і паказаў разам з гэтым на Цьвяршыну.

Старая падыйшла да хворага і запытала, што ў яго баліць, а потым зьвярнулася да Трахіма Іванавіча.

— Дасі мне за ўсё тры фунты сала? Два за сьвіньню і фунт за аўстрыйца? Дальбог менш ніяк нельга. Сам, здаецца, бачыў, што бог не адразу выконвае малітву сваёй недастойнай рабы. Давялося доўга прасіць яго, пакуль ён, бог літасьцівы, вылячыў сьвіньню. Што-ж ты думаеш, ён так проста зьлітуецца над аўстрыякам, нашым душагубам?

— Больш чым два фунты ня дам!—рашуча сказаў Трахім Іванавіч.—Паўтара за сьвіньню і паўфунта—за аўстрыйца. Ну, сьвіньня—мая, гэта я разумею. Але палонны? Ваеннапалонны гэта—дзяржаўны чалавек, і мне да яго клопату няма. Зьлітуйся, Марта, зрабі добрую, боскую справу! Бога ад лішняга цуда не паменее. А мне работнік патрэбны. Скажы сама, няўжо-ж мне яго дарма карміць, ці весьці цяпер, у самы прыпар, за сто вёрст у бальніцу? Так і ведай: ён—чалавек дзяржаўны, і яго належыць лячыць зусім дарма!

— Не, менш, чым за тры фунты я ня згодна!—таксама рашуча заспрачалася старая.—У тваёй сьвіньні пудоў дзесяць будзе, а ты з боскай угодніцай сыпраешся за цану? І ня сорам табе? Бога ўгнявіць не баішся? Вось у старасты сьвіньня захварэла, дык ён мне пяць фунтаў сала даў!

— А ты, старая ведзьма,—сур'ёзна зазначыў ёй селянін,—ня можаш, ці што, дарма памаліцца за чалавека, каб бог вярнуў яму здароўе? Захоча бог—чалавек палепшае, не захоча—памрэ... Ну, увогуле, я дам табе два з палавінай фунты сала.

Марта зразумела, што такога гонарару, якога яна вымагала, усё роўна не атрымаеш, і таму згадзілася.

— Але толькі глядзі, каб сьвежага, не сапсаванага.

Яна зноў зьдзела кажух, якім яна накрывала раніцой сьвіньню, прымусіла Цьвяршыну апрануць яго, загадала перанесьці хворага на сена і строга загадала Трахіму Іванавічу:

— Пастаў увечары самавар, натры аўстрыйцу сярэдзіну гарачым алеем ды дай яму піць чай, колькі яму захочацца. А раніцой я прыду вымаліць для яго боскае блаславеньне. Ды глядзі, каб тры фунты сала самага лепшага былі гатовы!

Перад тым, як легчы спаць, Швэйк нацёр Цьвяршыне сярэдзіну і зрабіў яму масаж. Цьвяршына жаласна стагнаў і вохкаў. Дуня прынесла гарачы самавар. Хворы праглынуў няма ведама колькі гатаванай вады і ноччу сказаў Швэйку:

— Я зьмяк, што мыш! Цяпер я ўжо не памру, я ўвесь спацеў!

Раніцой, як яго вынесьлі на двор, зьявілася Марта, не гаворачы ані слова, нахілілася над ім і пырснула яму ў твар сьвянцонай вадой, якую яна ўсю дарогу з хаты трымала ў роце. Цьвяршына ўздрыгнуў ад некачанасьці і зноў пачуў, як у яго ў сярэдзіне нешта хруснула, пасьля чаго яго нібы заліло цёплай хваляй. Усьлед за гэтым яна прымусіла яго выпіць цэлую конаўку сьвянцонай вады. Калі ў ім нешта забуркацела, старая пачала хадзіць вакол яго з абразом. Нарэшце, яна стала ля яго на калені і выцягнула з кішэні кавалак хлеба. Швэйк, які стаяў ля Цьвяршыны ў галовах, параіў яму:

— Глытай, глытай, не разважаючы, каб нам ня прыйшлося расшчапляць табе зубы калом. Старая—разумная баба і нічога ня робіць так сабе. Гэй, старая, з нажом ты ня дужа сьпяшайся! Ён—чалавек жанаты.

Замест адказу Марта выцягнула з кішэні ножык. Цьвяршына ўскочыў як ашпараны, скінуў з сябе кажух, за які старая старалася яго затрымаць, і пабег праз двор, а старая імчалася за ім, галосячы ўсьлед:

— Вазьмі хлеба, зьеш сьвятога хлеба. Я яго проста ад бацюшкі прынесла!

Але Цьвяршына, як толькі абярнуўся і ўбачыў старую з нажом у руцэ, што сілы закрычаў:

— Не падыходзь, старая, не падыходзь! Заб'ю, а рэзаць сябе ня дам! У мяне ў дварэ жонка маладая! Я ўжо зусім здаровы! Ня дам сабе нічога рэзаць!

Швэйк зірнуў на Марэка, які качаўся со сьмеху і сур'ёзна сказаў:

— Ён добра робіць, што ўцякае ад яе як далей. Старожа лепш, як варожа. Гэтай старой ня цяжка разануць яшчэ раз. Ён зусім як Іосіф прыгожы, які ўцякаў ад жонкі Пэнтэфрыя, калі яна спакушала яго, і пакінуў ёй толькі сваю накідку. Але ўжо, калі тут здарыцца каму-небудзь захварэць, дык яму трэба набыць парасон, каб бабы не запляваlі яго сьвянцонай вадой да сьмерці. Гэта таксама нейкая недарэчнасьць, але з цягам часу ўсё будзе зразумела. Вось у адным мястэчку пад Кладно быў бургомістр, нейкі пан Саска, і да яго пад час мобілізацыі прыбег поліцыянт ды кажа: «Пан бургомістр, хадзеце, калі ласка, прашу вас, да суда і зірнеце, што там здарылася!» Ну, ён зараз-жа падаўся туды, бо поліцыянт быў як няпрытомны ад хваляваньня, і бачыць, што ля будынку суда стаіць ужо жандар са стрэльбай на плячы, а ля ног у яго нешта накрыта ківерам. Убачыўшы бургомістра, жандар узьняў крыху ківер і пытае: «Калі ласка, пан бургомістр, ці ня ведаеце вы, прашу вас, хто мог гэта зрабіць?» Бургомістр, гэты пан Саска, глядзіць і бачыць—перад самымі дзьвярыма ляжыць вось гэткая кучка, а ў яе ўладжана паштоўка з намаляваным на ёй яго вялікасьцю імпэратарам. Бургомістр ледзь стрымаўся ад сьмеху, бо ён зусім ня быў вялікі монархіст, а поліцыянт кажа: «Я, пан бургомістр, прывяду вам вашага Рэкса. Гэта добры сабака, амаль што поліцэйскі. Ён адразу пазнае па паху». Зьбегаў ён па Рэкса, а той абнюхаў кучку, зірнуў сваімі разумнымі вачыма на бургомістра і на жандара, а потым падняў заднюю лапку і абліў сьвятую асобу імпэратара. Жандар, як гэта ўбачыў, дык і паваліўся няпрытомны. А калі яго ачулілі, дык ён тут-жа арыштаваў пана Саску разам з яго Рэксам і адправіў іх проста ў прокуратуру ў Кладно; адтуль яго ўжо аднаго павезьлі ў Прагу, а Рэкса павесілі на рынкавым пляцы ў Кладно, на страх усім бунтаром. Бургомістрава жонка, пані Саска, дужа хацела ведаць, за што арыштавалі яе мужа; вось яна і напісала яму, бо наслухалася ад яго што-колечы пра артыкулы закону: «Напішы мне, на які артыкул ты спатыкнуўся!» Праз некалькі дзён прыходзіць да яе адказ з Панкраткі: «На 58-ы артыкул крымінальнага кодэксу». Ён, значыцца, напісаў ёй, як па самавучыцелю Вымазаля, а яна ўзяла ў дварэ грамадзянскі кодэкс, знайшла ў ім 58 артыкул і чытае:

«Муж, абвінавачаны ў распусьце...» Больш яна і чытаць не захацела, а зараз-жа напісала мужу: «Гэтага я ад цябе не чакала, што ты здольны так зьняважыць маё вернае каханьне». І хоць усе ёй казалі, што ён арыштаваны за здраду дзяржаве і зьнявагу яго вялікасьці, яна нікому ня верыла, пакуль яго, пана Саску, ня выпусьцілі з Панкраткі, і ён не давёў ёй, што яна павінна была даведацца адносна 58-га артыкулу ў крымінальным, а не ў грамадзянскім кодэксе, бо гэта вялікая розьніца. Такім чынам гэтая недарэчнасьць была выяўлена і яна яго яшчэ больш пакахала. Дык вось, на сьвеце бываюць усякія непаразуменьні.

Тым часам Трахім Іванавіч спрачаўся з Мартай за сала, узрушана гаворачы, што яна нікога ня вылячыла, бо аўстрыец сам пабег, і што больш чым два фунты ён нізавошта ня дасьць, бо бог у гэтай справе зусім ня прымаў удзелу.

8

СУГЛЯДЫ І ВЯСЕЛЬЛЕ

Увесь хлеб памалацілі і ссыпалі ў засекі, сонца зьзяла ўжо два дні, і ў суботу Трахім Іванавіч абвясьціў:

— Сёньня мы будзем вазіць сена. Гэй, хлопцы, схадзеце ў стэп ды прыганеце з пашы коняй і кароў.

Палонныя пайшлі ранелька-рана. У стэпох ад буйнае расы ўзьнімаўся лёгкі белы туман, які слаўся па самай зямлі. Яны ішлі ўжо больш за гадзіну ў кірунку, паказаным ім гаспадаром, па палёх, на якіх ім сустракаліся людзі, коні і валы, але ўсё яшчэ не знаходзілі жывёлы Трахіма Іванавіча.

— Ах ты божухна!—крыкнуў раптам Марэк.—Мы-ж ня ведаем, хто і дзе яе пасьвіць. Я зьбегаю назад ды запытаю ў гаспадара.

— Дальбог,—пацьвердзіў Швэйк,—мы ўжо цэлы тыдзень яе ня бачылі. Мабыць яе пасьвіць агульны пастух.

— Не, тут ніхто яе ня пасьвіць,—разважыў Цьвяршына.— Я, напрыклад, ніколі яшчэ ня бачыў нікога каля статку.

Марэк пайшоў, а Цьвяршына прапанаваў Швэйку:

— Ідзі ты направа, а я налева. Калі знойдзеш, дык крыкні, ці я крыкну.

— Калі знойдзеш коняй, дык дагані мяне верхам, і мы разам паедзем на іх, падганяючы перад сабой валоў,—крыкнуў Цьвяршыне ўсьлед Швэйк.

З гэтымі словамі яны разыйшліся, і Швэйк засігаў адзін па стэпу, пільна паглядаючы навокал, каб знайсьці быдла свайго гаспадара.

На іржэўніку пасьвіліся вялікія статкі кароў і коняй, але Швэйк нідзе ня бачыў жывёлу, якая-б была падобна да жывёлы

Трахіма Іванавіча. Калі ён стыкаўся дзе-ні-дзе з параю валоў, якія пасьвіліся асобна, дык яны ўцякалі, задраўшы хвасты з працяжным мычэньнем, і пачыналі пасьвіцца на недасяжнай адлегласьці. Швэйк падумаў:

— Бач ты—ведаюць, што трэба цягаць цяжкое, і ня хочацца. Шчасьлівыя гэтыя валы—знаходзяць сабе ежу нават тады, калі нічога ня робяць, а таму ім і ня трэба нічога рабіць. Плюваць ім на Трахіма Іванавіча.

Гэтак-жа сама, як і валы, паводзілі сябе і коні, калі Швэйк спрабаваў падыйсьці да іх. Расьпінаючы ноздры, яны злосна порскалі, брыкалі, а праз хвіліну ўжо імчаліся з грываю па ветры прэч цераз стэп.

Было горача. Ад гэтай пагоні Швэйк на сьмерць змарыўся. Ён зьдзеў куртку, разаслаў яе і крыху задрамаў, а потым зноў пачаў бегаць за валамі і коньмі.

Ён быў ужо недалёка ад суседняе вёскі, калі, нарэшце, шчасьце павярнулася да яго тварам. Разам са статкам кароў пасьвілася некалькі коняй, сярод якіх ён спазнаў рабочага каня свайго гаспадара.

Ён зараз-жа падыйшоў, гукаючы яго:—Гнедка, Гнедка!—Іншыя ў спалоху кінуліся ў розныя бакі, а Гнедка выцягнуў шыю і ўзяў прапанаваны яму кавалачак хлеба.

Гульня была выйграна. Швэйк схапіўся за конскую грыву, ўскочыў яму на сьпіну, адабраў шэсьць валоў, якіх ён чыра лічыў за ўласнасьць Трахіма Іванавіча, і пагнаў іх, гойсаючы вакол іх, у тым напрамку, адкуль прышоў.

Гэта была надзвычайная праца, бо валы ня выяўлялі аніякага жаданьня слухацца. Яны разьбягаліся ўва ўсе бакі, жаласна мычэлі і імкнуліся назад у статак. Ледзь Швэйк пасьпяваў вярнуць аднаго, як уцякала трое іншых.

— Т-так, быць каўбоем ня надта ўжо лёгка,—прамармытаў Швэйк.—Чорт ведае, што такое! Я на вайсковай службе колькі год слухаўся рознага быдла, а вы ня хочаце слухацца мяне? Цікавая рэч—няўжо адзін чалавек ня можа справіцца з шасьцю жывёлінамі, калі некалькі жывёлін кіруюць цэлымі дзяржавамі!

Гэтыя словы нібыццам зрабілі ўплыў на валоў. Мабыць гэта вышла таму, што статак зьнік з іхных вачэй, застаўшыся па той бок пагорку, але так ці іначай яны зьбіліся ў адну кучу і пабеглі трушком наперад.

— Вось каб капітан Загнэр убачыў мяне такога,—вёў Швэйк далей гутарку з самім сабой.—Ён навучыўся-б у мяне, як весьці роту ў бой. Дальбог, гэта-ж зусім, як у нас у арміі—шэрае быдла наперадзе, а афіцэры ззаду.

Швэйк выпрастаў грудзі, горды высокім становішчам, якое здабыў у палоне, і на ўсё горла пачаў камандваць:

— Рота—стой! Паўзварот улева! Першая шарэнга кладзіся! Другая шарэнга—з калена! Проста па цэлі—плі!

Яго каманда далёка разносілася па стэпу. Нейкі стары селянін, які варочаў сена, азірнуўся, углядзеўся, прыкрываючы вочы далоньню, і раптам як мага закрычаў:

— Гэй, праваслаўныя, ратуйце! Трымай яго, аўстрыйца, канакрада! Гэй, праваслаўныя, трымайце яго, чортавага сына! Чакай, паскуда, пакажуць табе!

Ён пабег на суседняе поле, адвязаў ад калёс каня, ускочыў на яго, і наўскачка паляцеў за Швэйкам з прарэзьлівым крыкам:

— Канакрад! Канакрад! Бі канакрада, бі яго! Пятро Гаўрылаў, глядзі, канакрад! Ён у цябе каня ўкраў!

Гвалт, узьняты гэтым старым, гучэў як трубны голас у дзень страшнага суду. З усіх бакоў зьявіліся на конях сяляне, кабеты, дзяўчаты і дзеці і па стэпу пракаціўся шматгалосы рык:

— Бі яго! Ён у Пётры Гаўрылавага каня ўкраў!

Як мага паганяючы коняй, коньнікі стараліся абкружыць Швэйка. Той, адчуваючы, што з гэтага вялікага дабра ня будзе, кінуў валоў і пусьціў свайго каня наўскач, што сілы б'ючы яго пяткамі па бакох.

Крыкі пагоні зрабіліся яшчэ больш грознымі. Самы адважны, выючы ад злосьці, паймчаўся проста на Швэйка, у якога конь упудзіўся і панёс. Ён спачатку ўзьняўся на дыбкі, а потым рынуўся наперад з такім імпэтам, што Швэйку прышлося ўчапіцца аберуч у грыву, каб не зваліцца; ледзь кранаючыся капытамі зямлі, выцягнуўшыся, як птушка, ён стралою імчаўся па палёх і завярнуў проста ў адвор да Трахіма Іванавіча, які выйшаў якраз з Марэкам зірнуць, калі-ж, нарэшце, палонныя прыгоняць жывёлу.

Швэйк кумільгам скаціўся з каня.

— Ну, дзе ты іх знайшоў? Чаму ты так ляцеў, як шалёны, чаму ён у цябе ўвесь у мыле?—запытаў Трахім Іванавіч, а потым, уважліва зірнуўшы на каня, крыкнуў:—Ах ты божухна, ды

гэта-ж ня мой конь! Гэта конь, якога я летась прадаў Пётры Гаўрылаву!

У гэты момант пяцьдзесят чалавек з крыкам: «Дзе канакрад? Бі яго, жыўцом яго ў зямлю!» пад'ехалі да двара і спыніліся, убачыўшы Швэйка з гаспадаром. Трахім Іванавіч выйшаў да іх і, разводзячы рукамі, сказаў:

— Дурні-ж яны, сапраўдныя дурні! Ну што з імі зробіш? Паслаў я яго па коні, а ён прыяжджае на чужым! Коні яго не пазнаюць, валоў ня можа знайсьці, а яшчэ кажа, што пісьменны і ўдварэ штодзень газэту чытае! Бярэце вы, хлопцы, гнядога з сабою ў Каралёўку! А Пётры Гаўрылавічу ад мяне шчырае прывітаньне!

Сяляне, пачухаўшы патыліцы, павярнулі коняй і паехалі назад, а Трахім Іванавіч злосна плюючы і клянучы Аўстрыю і аўстрыйцаў і той дзень, калі яму ў галаву прышла няшчасная думка ўзяць у парабкі палонных аўстрыйцаў, раптам узьняў галаву і зьдзіўлена прыслухаўся. За двором чуўся голас Цьвяршыны:

— Нно, цобе цоб!

— Ну хоць валоў ён прыгнаў дадому,—весела ўсьміхнуўся селянін.—Гэй, хлопцы, запрагай. Два разы па сена сёньня зьезьдзім.

Першая пара валоў ступіла на двор, і з вуснаў Трахіма Іванавіча вырвалася грубая лаянка. А потым двор напоўніўся валамі, каровамі, цёлкамі, авечкамі і козамі, і Трахім Іванавіч пачаў ірваць на сабе валасы і разьюшаны кінуўся на Цьвяршыну, які горда стаяў сярод шумлівага статка.

— Я-ж... твою маць, казаў табе прыгнаць толькі валоў. А што ты, сукін сын, зрабіў? Падлюга, паскуда аўстрыяцкая! Гэта-ж ня нашае быдла! Гані яго зараз-жа туды, адкуль узяў! У, пракляты! Так-бы і забіў цябе, нягодніка!..

*

Калі яго злосьць крыху адышла, ён паклікаў дачок; тыя прыбеглі, і ён загадаў ім:

— Папрасеце ў суседзяў трох коняй! Хутчэй! Мы самі паедзем па валоў!

Дзяўчаты вярнуліся праз некалькі хвілін з трыма коньмі. Трахім Іванавіч сеў на аднаго, паказаў рукой на палонных і сказаў:

— Прыдзецца нам самім іх шукаць. У гэтых палонных розуму няма ні на грош!

— У іх ёсьць усё, што павінна быць, але толькі ў невялікай меры,—уздыхнула Дуня, па-мужчынску ўскочыўшы верхам на каня. Наталка ўжо выяжджала за вароты.

Позна ўвечары Трахім Іванавіч вярнуўся з коньмі, а ўсьлед за ім зьявіліся і дочкі з валамі. Упарадчыўшы жывёлу, гаспадар падыйшоў да палонных і ціха папрасіў:

— Даруйце мне, хлопцы, што я вас так аблаяў, і нават матак вашых пакрыўдзіў. Вы не маглі знайсьці жывёлы, бо яна была далёка ў стэпе, а валы зайшлі аж пад самыя Кахановічы. Даруйце, хлопцы, грахі мае цяжкія!

— Ну, што ўжо там!—ласкава ўсьміхнуўся Швэйк.—Толькі я так адбіў зад сабе, што прыдзецца рабіць прымочкі, каб ня так пякло і садніла. Чаму-ж ты ня ставіш таўро на сваіх валох, калі выпускаеш іх разам з іншымі, яловая твая галава? Вось у нас нават на гуталіне ставяць знак фабрыкі, якая ўся зьмяшчаецца ў старым жалезным гаршку, а ты...

*

Тое, пра што казала Марэку Дуня, спраўдзілася: у нядзелю прыехалі госьці—малады з бацькамі. Трахім Іванавіч спаткаў іх і зараз-жа запрасіў іх абедаць.

Яны ўвайшлі ў хату, памаліліся на абразы і, павітаўшыся з аўстрыйцамі, селі за стол і пачалі распытваць іх, чаму загарэлася вайна, калі цар і Франц-Іосіф заўсёды сябравалі адзін з адным.

Наталка паставіла на стол, што нагатавала і насмажыла маці. Абед быў адменны. Малочная лапша, варэньнікі, смажаныя куры, аладкі. Стравы давалася дужа многа, аж у Швэйка і Цьвяршыны вочы блішчэлі ад радасьці, і Швэйк, расшпіліўшы гузік ад парток, пачаў упрашаць Марэка:

— Еж-жа... Гэта яны прыехалі глядзець маладую. Эх, шкада, што нельга наесьціся на тыдзень наперад, як вярблюд!

За абедам Дуні ня было. Калі ён скончыўся, Наталка прынесла самавар. Матка маладога кінула самазадаволены погляд на

сына, дваццацёхгадовага хлапца ў высокіх ляксаваных ботах і ў чырвонай кашулі, падперазанай стракатым баваўняным шалікам, якія носяць у нас рамізьнікі ўзімку на шыі; потым яна запытальна зірнула на палонных і, нарэшце, на Трахіма Іванавіча.

Той зразумеў, таксама як і Марэк, што яна хоча пачаць гутарку пра справу, але саромеецца чужых. Таму гаспадар сказаў:

— Кажы, кажы, яны ані слова не разумеюць.

Марэк са Швэйкам адыйшліся да прыпеку, каб не перашкаджаць, пакуль пададуць самавар, а Цьвяршына выйшаў на двор. Матка маладога кашлянула, зірнула на абразы, на падушкі на прыпеку, на ясна вычышчаны самавар, і пачала:

— Дык вось, каб вы ведалі, чаму мы да вас прыехалі. У вас тавар, ды не абы-які, а ў нас—купец, таксама не абы-які. Наш Ільля добры чалавек, добры гаспадар і прыгожы хлапец, другога такога не знайсьці. І надыйшоў час узяць Ільлю жонку ў хату,—цягнула старая, нібы рэзала масла на кавалкі.—Дзяўчаты за ім так і віюцца, ды ён і слухаць ня хоча. Я выбрала для яго красуню, смуглявую, палкую, падыйшла да яго і кажу: «Ну, як, Ільля, пажэнім цябе з гэтай?» А ён адмаўляецца: «Што вы, што вы, мамачка? У нас і курыцы на двары чорнай няма, а вы хочаце, каб я ўзяў сабе жонку чорненькую». Ну, а потым ён ужо мне прызнаўся, што яму ваша Дуня спадабалася і што пакахаў ён яе моцна і за жонку ўзяць хоча. А я дык яе і ня ведаю і ня бачыла. Дзе-ж яна ў вас?

Наталка пабегла паклікаць сястру. Маці перачакала паўзу, а потым соладка казала далей:

— Ільля-б мог знайсьці маладую і багацейшую і прыгажэйшую, чым ваша Дуня, але мы і самі ня бедныя і можам дазволіць сыну ўзяць тую, якая яму падабаецца. А колькі вы за Дуняй даеце?

Цяпер адказала гаспадыня, Дуніна маці:

— А колькі і што вы просіце?

— Ды колькі-ж вы даеце?

— А на што вы спадзяецеся?

— Што-ж, тавар-жа ваш. Чый тавар, таго і цана.

— Гэта правільна, тавар наш. Але скажэце-ж тады, колькі вам на яго паходу даць!

— Самі вызначце!

— Не, вы да нас прышлі, а ня мы да вас. Скажэце, што хочаце?

— Гэта-ж як на рынку на кірмашы,—зазначыў Швэйк, які з цікавасьцю прыслухоўваўся да слоў, як туды і сюды перакідваліся.—Ах, каб цябе! Добра было-б тут быць за фактара.

— Мы хацелі-б для нашага Ільлі маладую,—уставіў бацька маладога,—каб з самаварам, падушкамі...

— ... ды з акутай медзьдзю скрыняй,—пасьпешна дадала старая.

— Добра, самавар мы дамо, падушкі таксама, але скрыні з медзьдзю няма,—рашуча сказаў Трахім Іванавіч.—Расьпісной скрыні для такой маладой, як наша Дуня, досыць. А медзь цяпер дарагая, усю яе забралі на гарматы для вайны... Ну, дык як-жа? Бярыцё дзяўчыну?

— Бярэм, але скрыня каб была акутая медзьдзю,—засупярэчыла старая,—а так нашаму Ільлі крыўдна...

Дуня, апранутая ў сьвяточнае ўбраньне, увайшла ў пакой. Усе, апрача маладога, зрабілі выгляд, нібы не заўважаюць яе, і Трахім Іванавіч сказаў:

— Хай будзе па-вашаму—дамо ёй і скрыню з мядзянымі цьвікамі, хоць Дуня-б магла знайсьці такога суджанага, як Ільля, і бяз скрыні. Але за гэта хай Ільля купіць ёй галёшы ды заплоціць за палавіну віна на вясельле.

— Што, маладой галёшы? І палавіну віна?—узлавалася будучая сьвякруха, схапіўшы адной рукой мужа за плячо, а другой штурхаючы Ільлю.—Хадзем, хадзем, сугляды былі дарма! Глядзеце, якія скнары, бессаромныя! Скрыні мядзянай даць ня хочуць, падушкі, пэўна, будуць набіты толькі напалавіну, а ім яшчэ давай галёшы ды плаці за віно!

Яна вышторхнула абудвых прадстаўнікоў моцнай палавіны ў сям'і з пакою, сама, лаячыся, паставіла каня ў аглоблі і пачала запрагаць. Але калі яна ладзілася ўжо зацягнуць лейцы, з хаты выйшла Дуніна маці.

— Ах ты божухна, ды ці не звар'яцела ты? Сама кажаш, што мы ня бедныя, а ня хочаш, каб твой сын купіў маёй дачцы галёшы. Трэба-ж мне паглядзець, як малады сваю маладую паважае. А падушак, такіх, якія я дам за сваёй дачкой, у цябе і ў самой ніколі ня было.

Старая зноў выпрагла каня, загадала сыну і мужу вярнуцца і ўвайшла сама сьледам за імі; потым яна ўзяла Дуню за плячо, адчыніла дзьверы ў суседнюю каморку і штурхнула туды спачатку Дуню, а потым і свайго сына.

— Ну, пазнаёмцеся ўжо, ці што,—сказала яна, замыкаючы за імі дзьверы.

— З гэтага можа нядобрае выйсьці,—зазначыў Швэйк.— Камора без вакон, парачка сядзіць у цемры, і калі ім ня даць сьвятла, дык усё можа здарыцца.

А пакуль старыя абмяркоўвалі, каго паклікаць на вясельле, і колькі купіць гарэлкі, Ільля сядзеў у каморы на бочцы з салам ды пытаў Дуню:

— Ці бачыш ты, якія ў мяне добрыя боты?

У каморы было цёмна, як у калодзежы, і Ільля прашаптаў гэта зусім ціха. Дуня здагадалася, што Ільля хоча выпрабаваць, ці добры ў яе зрок і слых, і голасна адказала:

— Бачу. На іх мядзяныя падкоўкі і яны з добрай ляксаванай скуры. Дзе гэта ты іх купіў? Мабыць, больш чым дваццаць рублёў за іх аддаў?

— Дваццаць два заплацілі,—прашаптаў ён яшчэ цішэй, а Дуня зноў голасна сказала:

— Дваццаць два? А я думала, што і ўсе дваццаць пяць!

— Дык як-жа, пойдзеш ты за мяне?—запытаўся ўжо голасна Ільля, а Дуня адказала шэптам:

— А біць мяне ня будзеш? Напівацца, як сьвіньня, таксама ня будзеш?

— Я цябе ніколі біць ня буду, Дунечка,—млосна праказаў Ільля,—а п'ю я і так толькі ў сьвяты. І можа прыйдзецца мне ісьці на вайну. Будзеш ты тады салдаткай.

Ён узяў маладую за руку, правёў па ёй пальцамі і памацаў яе крамяныя моцныя мускулы. Таксама памацаў ёй лыткі і сьцёгны, і ўсё, як выявілася, было такой добрай якасьці, што ён рашыў:

«Маці будзе задаволена, калі я ёй раскажу, як добра Дуня бачыць і чуе, і якія ў яе дужыя рукі.

А Дуні ён сказаў уголас, гладзячы яе па голых каленках:

— А галёшы я табе абавязкова куплю, каб ты бачыла, што я для жонкі нічога не шкадую.

Дуня прытулілася да яго, як п'яўка, і Ільлю каўнер яго чырвонай кашулі здаўся раптам цесным. У гэты момант маці яго адчыніла дзьверы, гаворачы:

— Пойдзем. Ня выйшла справа. Ім, бач, сто рублёў дай на пачастунак галоце. Галёшы я абяцала, на пяцьдзесят рублёў згодна, а гэтым ненасытным усё мала. Нічога, знойдзеш другую жонку.

А за ёй крычала Дуніна маці:

— Лепш я цябе сваімі рукамі затаплю, чым пушчу ў такую сям'ю. Прышлі па дачку, хочуць вынесьці ўсю гаспадарку. Зубы-б такому маладому павыбіваць...

Яны зноў выйшлі, запрэглі каня і паехалі. Праз дзесяць хвілін іхныя калёсы ізноў загрукацелі на двары; Ільлёў бацька саскочыў з іх і сказаў Трахіму Іванавічу:

— Слухай, сват, восемдзесят рублёў я мажа і дам на пачастунак. Ты свой тавар добра прадаеш, ніхто ніколі так выгодна не прадаваў. Значыцца, восемдзесят рублёў, і сам я тыць многа ня буду. Не вяртацца-ж нам з пустымі рукамі.

— Хай будзе на гэта воля боская,—уздыхнуў селянін і ўвайшоў у хату. Усе пайшлі за ім. Трахім Іванавіч зьняў са сьцяны абраз, Дуня і Ільля сталі на калены, і ён першы блаславіў іх, перадаўшы потым абраз іншым, якія зрабілі тое-самае. Пасьля гэтага селі вячэраць.

Такім чынам, Дуня была цяпер засватана; вясельле мелася адбыцца праз тры тыдні, і калі Марэк і Швэйк адшукалі свае саламяныя ложкі, Марэк з некаторай зайздрасьцю сказаў:

— Гэтай парачцы будзе шанцаваць у жыцьці. Яе блаславілі тым-самым абразом, якім старая ведзьма лячыла сьвіньню ад запору. Відаць, гэты сьвяты ў іх на ўсе рукі майстра!

*

Тыдзень узапар працавалі яшчэ на палёх, малацілі ячмень, вазілі сена і толькі ў нядзелю варочаліся ў хату. Цьвяршыне Трахім Іванавіч даручыў паправіць усе плугі і калёсы, тым часам, як сам ён, абедзьве дачкі, Марэк і Швэйк заставаліся ў стэпе, варылі кашу ў казанках і спалі на аднэй коўдры пад калёсамі. Малады, Ільля, прыяжджаў часам да Дуні верхам, гутарыў з ёй, памагаў ёй варочаць сена, а потым зноў ехаў назад.

З таго часу, як Дуня стоячы на каленах перад Ільлёвымі бацькамі, пакланілася ім нізка да зямлі, яна была дужа вясёлая і жартаўлівая. Часьцей, чым звычайна, яна выцягвала з кішэні кавалак люстэрка і пудрыла сабе твар. Яна ажно расьцьвітала ад думкі, што яна—маладая.

А калі па начах Трахім Іванавіч спаў, яна яшчаркай падпаўзала да Марэка, які спаў з краю, і шаптала, грэючы яго сваім гарачым целам:

— Ш-ш-ш! Не варушыся! Бач, хлапчанё наша навучылася ня спаць, калі Дуня да яго прабіраецца ноччу!

Але-такі прыбралі ўвесь хлеб. Адно поле ўжо аралі над зімовае. Вечары сталі даўжэйшыя... І тады Швэйк даўміўся, што і ўбогае меню можна зрабіць больш markdown розпастайным, бо ўсюдых зьявілася шмат грыбоў.

Удзень яны іх зьбіралі, а ўвечары Швэйк смажыў іх на масьле. Куры несьліся добра; таму яек хапала. А масла Цьвяршына памалу цягаў з каморкі, калі гаспадыні ня было ўдварэ. Такім чынам, пасьля гаспадарчай вячэры палонныя набівалі сабе вантробы смачнымі грыбамі.

Гаспадар, падыйшоўшы неяк да агню і ўбачыўшы гэтыя грыбы, плюнуў і зазначыў Швэйку:

— Чаму вы не ясі больш кашы ці хлеба? Цьфу, як гэта вы можаце есьці такую брыду?

А Швэйк, бачучы, як Марэк вылізвае кацялок з грыбамі, з радасным тварам сказаў:

— Цікава было-б ведаць, хлопцы, чым нас будуць частаваць на вясельлі. Гаспадыня казала, што заб'е сьвіньню і купіць барана, што будзе пірог з мясам і што заказалі дзесяць фунтаў селядцоў. Вось гэты селядзец ім прысмак, а пра грыбы, якія ў нашых лепшых рэсторанах падаюць толькі важным панам, гэтыя людзі кажуць: «брыда». А таго не разумеюць, што людзі павінны карміцца рознымі спосабамі і што для іх кожная дробязь—на карысьць. Вось я, напрыклад, знаў аднаго мэдыка, на прозьвішча Часнок, быў ён дужа бедны студэнт, і рэпэтаваў багатых хлапцоў, каб ня здохнуць з голаду, і ўсё-ж скрозь галадаваў. Жыў ён у Падскале ў старым доме, дзе было шмат тараканаў, і калі прыходзіў дамоў, дык заўсёды прыносіў што-небудзь ім, бо яны былі яго адзіныя таварышы, якія з ім не разлучаліся.

І вось аднойчы запрасілі яго на банкет у адным багатым рэсторане, з прычыны таго, што адзін студэнт, якога ён падвучваў, здаў экзамэн на доктара. Ну, Часнок пайшоў туды, сядзіць, есьць аж нос угібаецца. Раптам, акурат тады, як ён браў страву з талеркі, што яму падаваў кэльнер, яму нешта заказытала пад каўнерыкам; ён—раз, туды,—і ў тую-ж хвіліну яму ў талерку, проста ў соўс, зваліўся таракан і ляжыць сабе на сьпінцы, толькі ножкамі дрыгае... Мой Часнок,—апавядаў Швэйк,—так і пабялеў ад страху, што гэта могуць заўважыць, бо тады-б быў скандал. Але, на шчасьце, ніхто не заўважыў, апрача самаго гаспадара, які наглядаў за парадкам. Ён бачыў, як Часнака ўсяго скаланула над талеркай, зараз падыйшоў—зірк, у соўсе плавае, барахтаецца і вось-вось патане таракан! Цяпер ужо гаспадар рэсторану пабялеў, як палатно, схапіў талерку, прамармытаў: «Даруйце!» і як куля вылецеў з пакою. Вяртаецца ён праз хвіліну з чыстай талеркай і кажа Часнаку: «Прашу вас на хвіліну па важнай справе!» А ў канторы пакорна рукі склаў ды ледзь не на каленах пачаў прасіць: «Не пагубеце мяне, у мяне жонка і чацьвёра дзяцей. Розуму не дабяру, адкуль гэта брыда трапіла сюды, ды яшчэ жывая. У нас-жа ўсё працэджваецца і прасейваецца». І тут-жа дае Часнаку сто крон ды дадае: «Калі ў вас ня будзе грошай, дык прыходзьце зноў. Я ведаю, што азначае быць бедным студэнтам!.. А з вашага выгляду відаць, што вы бедны». Часнок гэты,—скончыў сваё апавяданьне Швэйк,—купіў, узрадаваўшыся, сваім тараканам адменную вячэру: пільзэнскага піва, чайнай кілбасы, сьвежага салату і нават гурочкаў. Ён пачаў зваць іх ня іначай, як сваімі «збаўцамі», і штодзень лавіў аднаго таракана і нёс з сабой у скрыначцы з-пад сярнічак. Ён пачаў абедаць і вячэраць у самых дарагіх рэсторанах з францускай кухняй, і заўсёды, як канчаў есьці, няпрыкметна для іншых, нібы запальваючы цыгару, пускаў у талерку свайго таракана і загадваў яе перамяніць. І так растаўсьцеў, што важыў блізка паўтараста кілё, здаў экзамэны на доктара і купіў сабе два аўтомобілі і дом ва Ўршовіцы. А цяпер, калі ў каго з яго кватарантаў заводзяцца тараканы, дык ён яго ў момант выганяе з кватэры, а сам усюдых пасыпае парашком і трымае ў сябе на кухні двух вожыкаў, за якія яму ўжо прышлося плаціць адступнога кухарцы, калі яна ў цемры наступіла на большага, і пракалола сабе палец на назе.

— Адкуль у цябе бяруцца ўсе гэтыя гісторыі?—сьмяючыся, спытаў Цьвяршына, а Марэк, пацягваючыся, сказаў:

— Дальбог, добра, што неўзабаве вясельле!

Урачысты дзень набліжаўся і стаў вялікім днём для нявесты і цікавым для Швэйка. Забілі сьвіньню і абсмалілі яе над запаленымі пукамі саломы; аблупілі купленага барана; гарэлку, якая няма ведама адкуль узялася, схавалі ў далёкі куток у каморы. Дуня з раніцы хадзіла ўся ў белым, у вянку з зялёнага лісьця і з васковымі бубачкамі на галаве.

Шлюб павінен быў пачацца а дванаццатай гадзіне, але ў гэты час маладога яшчэ ня было. На запытаньне Марэка, дзе-ж малады, Трахім Іванавіч адказаў:

— Пэўна чакае ў царкве. Ідзеце таксама наперад ў царкву, хлопцы.

Потым зьявіліся калёсы з запрашанымі маладой, тым часам, як паяжджане маладога спыніліся ля калёс, на якіх ён прыехаў з дружкамі.

Дуня пасьпешна адышлася, падбегла да вялікага крыжу перад царквой і прывязала да яго хвартух, такі-ж белы, як і яе ўбраньне. Калі Марэк запытаў Трахіма Іванавіча, што гэта азначае, дык той прамармытаў праз зубы:

— Гэта яна аддае шлюб хрысту, прыносіць яму, значыцца, у падарунак сваю дзявочую цноту.

Адправа скончылася. Сьпевакі прасьпявалі: «Ісайя, лікуй», і бацюшка пачаў шлюб. Ён узьдзеў на галовы маладым вялікія мядзяныя вянкі і даў ім выпіць з аднае чары віна; ён сьпяваў, вадзіў іх па царкве, як правадыр мядзьведзя, і вось Ільля і Дуня зрабіліся мужам і жонкай.

А вясковыя кумкі заўважалі, як Дуніна сьвякруха прыкладала хустку да вачэй, і пацiху штурхалі адна адну:

— Бач, хітрая ліса! Чакай, галубка-маладуха, ня соладка будзе табе ў яе жыць!

Калі скончыўся шлюбны абрад, усе рушыліся да Трахіма Іванавіча. Ля дзьвярэй хаты стаяла старая Марта і, асыпаючы маладых хмелем, ячменем і пясковым цукрам, прыгаварвала:

— Ой-жа і будзе вам жыцьцё саладзей за цукар, ой-жа і зьвіецеся вы разам, як буйны хмель, ой-жа і будзеце вы пладней, чым зерне ячменнае.

— Што гэта старая вядзьмачыць? — запытаў Цьвяршына, палахліва адступаючы. А Швэйк па-філёзофску азваўся:

— Чакай, даведаемся! Ды ты не ўцякай, у яе няма нажа!

Госьці засталіся на дварэ і кожная жанчына ўзяла ў рукі па глінянаму гаршку, які, відаць, яна прырыхтавала загадзя. Марта правяла маладых, падштурхоўваючы іх, у пакой, увайшла туды за імі і замкнула за сабой дзьверы на засаўкі.

Прайшло дзесяць марудна даўгіх хвілін. Некаторыя жанчыны выцягвалі рукі з гаршкамі, іншыя станавілі іх, сьмяючыся, на зямлю. Нарэшце, рыпнулі дзьверы, зьявілася Марта, высока ўзьнімаючы над галавой белае прасьціралдла з крывавай плямай пасярод. Госьці закрычалі: «Гэй! Гэй!» і ўдарылі гаршкі вобземлю так, што чарапкі разьляцеліся дажджом ува ўсе бакі.

З-за Марты выскачыў распалены малады муж і кінуўся перад Трахімам Іванавічам на калены, цалуючы яму рукі і ногі і мармычучы нейкія дзіўныя словы падзякі за тое, што той даў яму жонку-цнотку.

Жанчыны бразнулі другі залп з гаршкоў, а добры ваяка Швэйк, пад'упаўшы пад агульны настрой павагі і зьнішчэньня, схапіў у сенцах вялікую кадзь з-пад квашанай капусты і таксама ўдарыў ёй вобземлю. Гэта прагучэла як гарматны салют у гонар цнатлівасьці маладой.

Потым ён выцягнуў з каморы прызначаную на сала кадушку, і ахнуў яе аб падлогу; кадушка, вядома, рассыпалася на кавалкі. Калі-ж ён хацеў зрабіць тое-самае і з самаварам, Трахім Іванавіч затрымаў яго за руку:

— Што ты робіш, вар'ят? Ці ты з глузду зьехаў?

Швэйк, гледзячы, як жанчыны, скачучы ды падкідаючы падушкі, усё яшчэ білі гаршкі, якія няма ведама адкуль браліся, пачаў зьбянтэжана апраўдвацца:

— Я думаў, што чым больш іх перабіць, тым большая цнатлівасьць маладой.

Нарэшце, госьці ўвайшлі ў пакой. Пад вакном быў выстаўлены пасаг маладой: акутая жоўтаю бляхай скрыня, а на ёй—новыя галёшы. Шэсьць падушак у белых навулечках ляжалі на лаве, а на сярэдняй з іх цьвіла такая-ж крывавая кветка, як на прасьціралдле ў Мартавых руках.

Убачыўшы гэтую пляму жанчыны зноў радасна зашумелі, а Швэйк, які глядзеў на іх дужа зьдзіўлена, пацíху прамармытаў:

— Проста хоць лажыся ды памірай... Я-ж тады ноччу ў полі... Ці гэта была другая?..

Марэк кінуў на яго гостры дапытлівы позірк. Але Швэйкавы вочы глядзелі на яго з анёльскай бязьвіннасьцю, поўныя цíхасьці і нябёснае сіні.

Банкет цягнуўся да познае начы; гаварылі шмат усякіх п'яных, нясклaдных прамоў. Малады распальваўся ад хвальбы, якую сыпалі яго жонцы, маладая чырванела ад ліслівых слоў кабет, якія не шкадавалі фарб для апісаньня якасьцяй яе мужа.

Калі гарэлку ўсю выпілі, барана і сьвіньню зьелі амаль да каліва і высушылі пяцьдзесят, а можа і больш самавараў, а скрыню, падушкі і клумак з бялізнай ды вопраткай паклалі на калёсы, Дуня прыладзілася выяжджаць у Каргіна, у сваю новую хату, яе праводзілі матчыны сьлёзы і бацькавы блаславеньні.

Момант, калі малады адыйшоў, каб нешта ўпарадкаваць, Марэк скарыстаў для запытаньня:

— Слухай, Дуня, адкуль у цябе ўзялася кроў?

Маладая склала губы бантікам, заплюшчыла вочы і прашаптала яму на вуха адно адзінае слова:—«Дурань!». Яно прагучэла рэзка, як граната, і Марэк яшчэ і цяпер ня ведае, ці гэты эпітэт тычыўся яго ці маладога мужа.

Потым палонныя ляглі спаць; Марэк чуў, як Швэйк варочаўся з боку на бок і ўсё паўтараў:

— Розуму не зьбяру!.. Розуму не зьбяру!..

— Я таксама, таварыш!—заўважыў Цьвяршына.

— Як? І ты? Чаму-ж і ты?—ня вытрымаў Марэк.

Цьвяршына, надзвычайна сарамячыся, ува ўсім прызнаўся.

— Даруйце, братцы. Здарылася так, што калі яна прышла неяк з поля па хлеб, я быў адзін з ёй у хаце. Ну і вось: дзяўчына маладая, і на тое была боская воля...

І раптам гэтую шчырую споведзь перарваў Швэйкаў рогат, як крык чайкі. Цьвяршына скончыў словамі:

— І вось сёньня гэта кроў... Я зусім адурэў ад гэтага...

А Марэк, робячы націск на кожным слове, сказаў:

— Ды і я зусім адурэў, брацця. Я больш за ўсіх адурэў!

Швэйк усё яшчэ сьмяяўся. Нарэшце, ён сказаў:

— Проста лажыся і памірай! Калі-б толькі ведаць, як і чым яна гэта зрабіла? Хлопцы, гэта-ж быў-бы цэлы капітал. У нас гэта давала-б прыбытак...

— Што ў нас давала-б прыбытак?—захацеў даведацца Марэк. А таму, што Швэйк не адразу адказаў, ён дадаў:—Тут у Расіі ўсё немагчымае—магчыма. Можа, у іх тут за нач усё зноў вырастае, як грыбы?

— Проста, у іх ёсьць для гэтага нейкая мазь,—сказаў Швэйк,—усё роўна як для росту валос ці бюсту. Браццы, каб я ведаў рэцэпт гэтага сродку, я-б вас азалаціў. У нас яно-б пайшло ух ты як! Я зьмясьціў-бы абвестку ў «Палітыцы» і ў мяне-б было больш буйнае прадпрыемства, чым у Одколека з яго лякарнямі. Гэтае-б куплялі ў мяне ўсе дзяўчаты, пачынаючы з дванаццаці год, а для ўдоў і паненак з добрых сем'яў я-б вырабляў гатункі мацнейшыя... Марэк, дзеля ўсяго, што табе дарага на сьвеце, скажы мне рэцэпт, калі ты яго ведаеш!

Швэйкаў голас задрыжэў; у ім чулася просьба і адчай... А Марэк, нахіліўшыся да яго, нібы хацеў яму нешта прашаптаць на вуха, што сілы крыкнуў яму тры разы ў самае вуха:

— Дурань! Дурань! Дурань!

*

З таго дню, як паехала Дуня, у хаце Трахіма Іванавіча час ішоў нудна. Толькі ў панядзелак яшчэ цягнуўся сьвяточны настрой. Гаспадар сядзеў з прыяцелямі за сталом; даядалі рэшту і высушылі цэлага бусла гарэлкі, якога гаспадар з хітраватай усьмешкай прынёс з каморы.

— Глядзеце, як я аб вас паклапаціўся! У муцэ схаваў, каб ніхто не знайшоў. А то гэтая галота грошай на гарэлку шкадуе, а выпіць ахвоча.

Пасыпаліся жарты і прыказкі. Стараста ўстаў і няцьвёрдым голасам сказаў прамову:

— Памятаеце, брацццы Гаўрыка Татарына, які на рынку цягаў за бараду бацюшку за тое, што той не хацеў за два фунты сала вянчаць яго па праваслаўнаму абраду з Настулькай Нічыпаравай? Забілі яго, сукінага сына, на фроньце, паклаў ён за цара-бацюшку сваю буйную галовачку!.. Вып'ем, брацццы, за яго здароўе!

— Ты што гэта за здароўе нябожчыка піць зьбіраешся?— п'яным голасам засупярэчыў Трахім Іванавіч.—Го, ды стараста ў нас жартаўнік; сам ня ведае, што яму на язык узыйдзе!

— А вось я, стараста, загадваю табе, Трахім, выпіць за здароўе Гаўрыка Татарына, бо ён забіты за бацькаўшчыну,—злосна адгукнуўся стараста.—Як ты можаш свайму начальству пярэчыць, калі яно табе загадвае?

І ён так моцна штурхануў гаспадара сваёй шклянкай у бараду, што шклянка, ударыўшыся аб зубы, разьляцелася на кавалкі.

— Ага, ты так! На маеш, г... сабачае!—прахрыпеў Трахім Іванавіч і з маху ўдарыў старасту ў твар.

Гэта падало сыгнал да агульнай бойкі. Сяляне гэтак ужо ап'янелі ад моцнай гарэлкі, што досыць было аднаго маленькага штуршка. Яны пачалі біць і душыць адзін аднаго тымі самымі рукамі, якімі толькі што абыймаліся.

У паветры стаялі грукат, гул, стогны і лаянка. Пад націскам здаровых кулакоў трашчэлі зубы і сківіцы, узбрыгвалі пухіры, станавіліся ліхтары... Хутка пакой зрабіўся цесным для гэтых мілых гульняў і іх перанесьлі на двор.

Шум бойкі ўзварушыў усю вёску. Прыбеглі зацікаўленыя— лік удзельнікаў у бойцы ўзрос. Гледачы са сьвежымі сіламі кідаліся на ўжо акрываўленых байцоў, і старыя людзі, усе ў сіняках, таптаці ботамі цьвет моладзі, якая зыходзілася сюды з імкненьнем атрымаць тут добры прыклад на далейшае жыцьцё. Нарэшце і жанчыны пачалі цягаць адна адну за валасы, драпацца і біць па твары.

А з-за замкнутых дзьвярэй свае пуні на гэтую дзікую бойку ўсіх супроць усіх глядзела трое палонных, і калі Цьвярцына захацеў разьвесьці байцоў, Марэк затрымаў яго, прашаптаўшы:

— Божа барані! Тут-бы табе быў і капут—цябе-б забілі! Тут такі парадак.

— Гэта, казаў той,—зазначыў са свайго боку Швэйк,—такая справа, з якой відаць, што наконт культуры ў іх слабавата. Калі-б яны былі такой культурнай нацыяй, як мы, дзе ўсе чыста інтэлігенты і адукаваныя, такой культурнай, каб можна было, як казаў сапёр Вадзічка, інтэлігентамі сьвіней карміць, дык яны-б проста наладжвалі кожную нядзелю якое-небудзь спортыўнае

сьвята. І не разьбівалі-б сабе галавы за тое, што стараста ў іх дурань ці не, а наладзілі-б матч паміж «Спартай» і «Славіяй». Бо калі ў нас на стадыёне гуляюць у футбол, дык малюнак амаль такі самы. Розьніца толькі тая, што тут б'юць у тых самых ботах, у якіх ходзяць, а там абуваюць для гэтага бутцы. Асьвета,— гэта ўсё, і без асьветы ні кроку ступіць нельга, як казаў адзін Бочэк, якога застрэліў пад час ярыпшту агент паліцыі. Бочэк меў на ўвазе свайго прыяцеля Вашынскага, у якога яму спачатку прышлося вучыцца, як рабіць адмычкі: ён казаў, што праз сумленнасьць хутчэй за ўсё можна дасягнуць посьпеху, і таму вось ён і сумленна працуе сам над кожнай адмычкай.

— У нас таксама так б'юцца,—уставіў сваё слова Цьвярдыншына.

— Не, у нас так б'ецца толькі просты народ,—адгукнуўся Швэйк,—для адукаваных ёсьць футбол, бокс, бароканьне. Вось у «Банзэце» быў гаспадар, дык той, калі ў яго ўстанове пачыналі біцца, гасіў электрычнасьць і ў цёмным сам выкідаў усіх з пакою. Пайшоў ён неяк паглядзець на такое спаборніцтва ў футбол і, ідучы да хаты, зайшоў да нас, у «Поўную чару». Палівец у яго і пытаецца, як яму спадабалася гульня, а ён ў адказ: «Тут толькі і заўважаеш, наколькі мы ў Нусле адсталі ад пражцаў. У нас ня ўмеюць так біцца. Эх, крыўдна мне было толькі, што ня ўзяў я з сабой свае дубінкі. Я-б іх разьвёў, бітуноў тых!».

Бойка на двары дайшла да такога пункту, што Швэйк крыкнуў:

— Становішча крытычнае! Надыйшоў псыхолёгічны момант, калі, як казаў доктар Крамаржа, адзін бок бойкі пускае сабе ў порткі!

Аднак становішча выратавалі жонкі Трахіма Іванавіча і старасты, якія набралі ў калодзежы вады і пачалі разьліваць ёю байцоў. Пал іхны пачаў памалу спадаць і, нарэшце, зусім згас. Стараста, мокры, як мыш, стаяў перад сваім ворагам, такім-жа мокрым, як і ён, і жаласна стагнаў:

— Ну, скажы, баранава твая галава, навошта мы, дурні, пабіліся? Навошта мы пана-бога злуем?

Потым ён, хістаючыся, пайшоў і хутка прыехаў на калёсах, седзячы на мяшкох з пшаніцай.

— Трахім Іванавіч! Бацька родны! Апранай кажух і гайда ў Карпіна да маладых! Пшаніцу я памяняю на гарэлку, і мы яе ўсю жрап'ём.

Селянін палез да старасты на калёсы, не зварачаючы ўвагі на жонку, якая крычала яму, каб ён даў палонным якую працу; іншыя сяляне зрабілі тое-самае, усклалі на калёсы па мяшку пшаніцы і сьцебанулі па конях.

Поле бойкі апусьцела. Калі Марэк упэўніўся, што можна, не баючыся выйсьці на двор, Швэйк прапанаваў:

— Ну, сёньня працы, відаць, ня будзе. Давайце, памыем сабе бялізну!

Ён расклаў за пуняй агонь і нацягаў вады; яны намачылі кашулі і парткі, вымылі іх павесілі сушыцца.

Прышла Наталка і завяла гутарку пра бойку.

— Бацька вернецца ноччу ў добрым выглядзе!—паскардзілася яна.

— Раскажы, Наталка, як гэта робіцца, каб пацякла кроў!— запытаў, млеючы ад цікавасьці, Швэйк.

— Бач, ты, які крущель! Проста, раз кулаком у зубы! Няўжо нікалі ня бачыў?—засьмяялася Наталка і ўцякла.

Калі яна пайшла, аднекуль узялася старая Марта.

— Што, хлопцы, мыеце кашулькі? Шкада вам, пэўна, што Дукі няма?

— Чаму шкада,—запытаў Марэк.—Нам нікога не шкада.

— І сям'і не шкада?—прамармытала старая.—Вы далёка ад сям'і, і толькі жанчына можа прыгалубіць салдата.

— Ты толькі чорта прыгалубіш,—адказаў Швэйк.—Чаго ты прышла сюды скігаліць? Ці чорт цябе прынёс, ведзьму?

— Бабка прышла аўстрыйскіх салдацікаў прыгалубіць,—мармытала старая, паказваючы тры ўсьмешцы за пажоўклымі вусамі буйныя жоўтыя зубы.—Прыгалубіць, палашчыць... Вось, як цяпер Ільля са сваёй жонкай лашчыцца... Кожны з вас дасьць мне па дзьве грыўні. А калі хочаце ўсе тры, дык магу за паўрубля.

— Што ты такое надумала?—з жахам закрычаў Марэк.

Марта паўтарыла сваю бессаромную прапанову з рухамі, якія тлумачылі мэту яе візыту. І калі ўсе, зьбянтэжаныя, маўчалі, старая пачала іх спакушаць.

— Будзеце задаволены, далі-бог. Бабка спрытная, бабка штукарка, бабка сваю справу ведае!..

У адказ на яе заклік і аблудны бляск вачэй на пачырванелым твары Швэйк моцна ўхапіў яе за каршэнь, ледзь не задушыўшы яе; ён страсануў яе, як кошка мыш, даў ёй добрага выспятка ніжэй сьпіны і, пускаючы з богам, праз зубы прамармытаў:

— Ідзі, пакуль цэлая!

Калі мясцовая «жрыца каханьня» схавалася за пуняй, ён раптам нешта ўспомніў і, шкадуючы, праказаў:

— Эх, трэба было-б мне яе распытаць... Можа-б яна і сказала... Пэўна-б згадзілася з намі ўвайсьці ў кампанію ў такой выгоднай справе. Слухай, Марэк, як ты мяркуеш? Ці добрая-б была такая фірма: «Таварыства на паёх «Швэйк і Марта», вытворчасьць і рамонт цнатлівасьці. Узоры дарма па першым патрабаваньні».

Ноччу іх пабудзіў Трахім Іванавіч, які вярнуўся зусім п'яны і гарлаў песьні.

— Бач, набраўся!—зазначыў Цьвяршына, а Швэйк, апраўдваючы яго, сказаў:

— Гэта ён з радасьці, што ў яго такая добрая дачка. Хіба ня прыемна, калі малады цалуе чалавеку за гэта ногі?

Прышоўшы раніцою ў пакой сьнедаць, яны засьпелі гаспадыню з дачкой перад абразамі за малітвай. На стале ляжаў хлеб, а ў місцы салёныя гуркі. Цьвяршына смаргануў Наталку за рукаў:

— Наталка, давай капусту, мы паедзем араць адны.

Наталка зірнула на матку, а потым паказала на гуркі.

— Вось ежце! Цяпер пост на некалькі тыдняў.

Яна шчыра перахрысьцілася і паклала земны паклон перад абразамі.

— Салёных гуркоў добра зараз даць гаспадару,—зазначыў Швэйк,—а мы ад іх толькі аскому наб'ём.

— Добрая пэрспэктыва, няма чаго казаць,—засьмяяўся Марэк, грызучы чэрствую скарынку.

Трахім Іванавіч заварушыўся на лаве. Гаспадыня дала яму некалькі паўхіроў, а калі ён расплюшчыў вочы, буркнула:

— Ды ўставай-жа ты, бочка бяздонная! У людзей пост, богу маліцца трэба!

І Трахім Іванавіч, усё яшчэ не прачнуўшыся, стаў з ліпкім ад перапою ротам і з вачыма, залепленымі гразёю, перад тварам свайго бога.

Потым выцягнулі вялізны, цяжкі плуг, запрэглі ў яго пару старых валоў, перад імі—пару маладых, якія павінны былі яшчэ вучыцца працаваць, а перад гэтымі—зноў пару старых. Трахім Іванавіч павёў іх за ваколіцу на дзялянку, якая зарасла пустазельлем і загадаў Марэку кіраваць валамі, тым часам, як Швэйк і Цьвяршына мусілі паганяць іх, а сам узяўся за плуг.

Першую баразну правёў ён сам. Скончыўшы яе, ён пацягнуўся, пазяхнуў і паставіў на сваё месца Цьвяршыну.

Потым ён вярнуўся ў хату, а Цьвяршына пачаў араць адзін. Гэта была пякельная праца. Валы ішлі за вярсту ад плугу; маладыя валы хутка намулялі сабе шыі ярмом, пачалі ўпінацца, валіліся ад стомы на зямлю, а Швэйк, калі яны абарачаліся, гладзіў іх і прымаўляў:

— Бедныя вы мае, вы зусім, як салдаты, калі іх гоняць на фронт. Мне зусім не падабаецца быць за вашага афіцэра.

На абед Наталка прынесла халоднай бульбы і зноў гуркоў.

— Цяпер, у пост, вам нават няварта прыходзіць дамоў, бо мы ўсёроўна нічога ня варым,—сказала яна.

Тады Швэйк расклаў агонь з саломы, паставіў на яго казанок з бульбай, каб падагрэць яе, і сказаў, трымаючы над агнём зьледзянелыя рукі:

— У нядзелю старая хадзіла ў царкву сьвяньціць курэй; тут нічога не ядуць, пакуль поп не асьвеньціць, а потым гэта застаецца таму-самаму папу. Тут, відаць, шануючы бога, трымаюцца падзелу працы паводле амэрыканскай сыстэмы: адны ўшаноўваюць яго голадам, а папы—пражэрлівасьцю. І вось, калі поп зьядае асьвянцоную курыцу і яна травіцца ў яго ў жываце, ён тлумачыць сваім парахвіянам, што праваслаўнаму богу ўгодна і прыемна, каб у чалваека ў пузе бурчэла ад голаду. Мне здаецца, брацці, што мы наогул ніколі не зразумеем расійскага народу. Возьмем, напрыклад, тое, што было на вясельлі. Маці ведае, як яна ёсьць, бацька ведае, сястра ведае, а маладая нічым ня выдае сябе і ніколі нават не прагаворыцца! Гэта ня тое, што адна мая знаёмая, нейкая Марыля Шпачэк, як яна выходзіла замуж. Выходзіла яна за краўца, якога звалі Міхуле, дужа добрага хлапца, толькі ногі ў яго надта пацелі. І вось на вясельле абуў ён новыя

ляксавыя чаравікі, і ногі ў іх прэлі так, што проста ня было як трываць. Госьці на вясельлі сядзяць, п'юць, вярзуць усякую лухту, і ніхто не заўважвае, што няшчасны малады ўвесь скрывіўся ад болю, што ён з радасьцю зьдзеў-бы чаравікі, і абуў-бы старыя боты. Нарэшце, госьці разыйшліся, і маладая выйшла ў свой пакой, бо засталася жыць у старых. Ну, ён, Міхуле, пабег за ёю, распрануўся і цэліў ужо нырнуць да яе пад коўдру, ды забыўся зьдзець потныя шкарпэткі, а яна, як ён абняў яе, раптам кажа: «Што гэта, даражэнькі, тут так дзіўна пахне?» Яна, ведаеце, была з адукаваных і прымаўляла па кніжнаму. І ў гэту хвіліну ён не знайшоў, што ёй адказаць, бо да гэтага часу ён ёй ня прызнаваўся, што ў яго пацеюць ногі. Дык ён цмокнуў яе ў вусны і прашаптаў: «Гэта мая цнатлівасьць, дзетка!» А яна тады глыбока ўздыхнула, нібы ў яе камень з душы зваліўся, і кажа: «Балазе, што я ня цнотка; а то-б мы тут абудвы задушыліся-б ад смуроду!..».

— Добрыя рэчы ты нам расказваеш, Швэйк, але даць веры ім ты нас усё-ж ня прымусіш,—засьмяяўся Марэк. А Швэйк, падаграючы бульбу і гуркі, пяшчотна зірнуў на яго і сказаў:

— Ты можа яшчэ скажаш, што я хлушу? А тым часам гэта ўсё—чыстая праўда. Гэта ўсёроўна, як было з аднэй Мрклазай у Пржышыме. У гэтай жанчыны быў сын, якога звалі Богумілам, і стары хацеў перадаць яму хутар, а сам перайсьці на пэнсію. Ну вось, кліча ён сына неяк у нядзелю да сябе і кажа: «Богуміл, пастарайся знайсьці сабе жонку!». Хутка Богуміл прыходзіць зноў да бацькі. «Тата,—кажа ён,—я-б хацеў ажаніцца з Агнэсаю Чэйкаў з Доубравіцы».—«Нельга,—кажа стары,—і лепш ужо і ня пытай, чаму. Я ведаю, што яна падыходзіць, але жаніцца з ёй ты ня можаш». А таму, што Богуміл не адставаў ад яго, стары нарэшце сказаў: «Разумееш, я калісь заляцаўся да яе маткі... Ну... адным словам, яна твая сястра!». Богуміл зноў пачаў хадзіць па кірмашох ды гулянках, а потым зноў прышоў да бацькі і кажа: «Так і так, у мяне ёсьць жонка. Я вазьму Марту Голуб з Шыбршына». Стары зноўківае галавой: «Нічога ня выйдзе,—кажа ён,—як-жа, я яе матку знаў пяць год, і яна таксама твая сястра!». Але Богуміл занадта ўжо закахаўся ў Марту і дужа мардаваўся; ён так занудзіўся, што маці заўважыла і пачала распытваць, як, што і чаму. Богуміл спачатку не хацеў ёй прызнавацца, а потым усё ёй і расказаў, што перашка-

джае яму жаніцца. Маці пачухала за вухам і пытае: «А яна цябе кахае, Богуміл? І ты яе кахаеш?» Той толькі ўздыхнуў: «Больш чым цябе, маці! Жыць мы адзін без аднаго ня можам!» Тады маці яшчэ раз пачухала за вухам і сказала: «У такім разе, не зьвяртай увагі на тое, што кажа бацька. Наш стары—таксама ня твой бацька!..».

Прышоў Трахім Іванавіч зірнуць на працу. Ён паглядзеў вакол, мадлічыў нешта на пальцах і сказаў:

— Праз тыдзень у вас ворыва будзе скончана. Тады я пакіну сабе толькі Цьвяршыну, а вас назад адвязу ва ўправу.

Палонныя скончылі ворыва, і Трахім Іванавіч выплаціў ім заработак. У бліжэйшую нядзелю яны пачалі рыхтавацца да ад'езду.

Швэйк і Марэк паклалі свае рэчы на калёсы. Гаспадыня і Наталка крычалі ім усьлед: «Шчасьлівай дарогі!» Марэк буркнуў:—«Ну вас к чорту!» але Швэйк, махаючы шапкай, расчулена сказаў:

— Усяго добрага!.. Не памінайце ліхам! Пішэце і не забывайцеся пра вашага Швэйка!

9

ШВЭЙКАЎ АНАБАЗІС

Трахім Іванавіч прывёз іх у земскую ўправу і, цярэбячы ў руках шапку, здаў іх у канцылярыі пісару. Той нават, ня зірнуўшы на іх, тут-жа аддаў загад:

— Заўтра я вас пашлю на працу да другога селяніна. У нас шмат патрабаваньняў. Ідзеце пакуль што на двор, там вам старая скажа, дзе вам можна пераначаваць.

Трахім Іванавіч шчыра разьвітаўся з імі, пажадаўшы ім ўсяго добрага і надаваўшы ім процьму каштоўных парад.

— Не трацеце грошай, хлопцы,—казаў ён.—Ня губеце сваіх душ, не вядзецеся з кабетамі і купеце сабе высокія боты на зіму.

Усё гэта былі вельмі добрыя парады, а апошняя з іх—самая практычная. У Марэка боты былі без падносак, а Швэйкавы боты былі падобны да разяўленых зяп кракадылаў. І вось, апынуўшыся ўдвох у цёмнай, бруднай камеры, дзе ад вошай варушылася рэдка пасланая салома, яны пачалі сур'ёзна абмяркоўваць гэтую параду.

— Але-ж такія боты каштуюць самае малае пятнаццаць рублёў,—сказаў Марэк, задумена ківаючы галавой,—а ў нас у кожнага толькі па дзесяць.

— Ну, дык я настраляю колькі-небудзь у цягніку,—вялікадушна прапанаваў Швэйк.

— Нічога ня купляйце,—сказаў з-пад лавы ў куту нейкі чалавек, якога яны спачатку не заўважылі,—і ня ідзеце працаваць да сялян... Хіба вы перайшлі ў Расію, каб працаваць? Хіба наша справа выручаць гэтых людзей? казаў ён далей, палязаючы паміж ножак лавы на сярэдзіну камеры.—Вось вы зарабілі дзесяць рублёў за ўсё лета, а самі цяпер босыя і голыя. І будзеце апус-

жацца ўсё ніжэй ды ніжэй, як панскі вазьнік, калі яго пераводзяць у пастухі, а на старасьці год прымушаюць пасьвіць гусей.

Незнаёмы змоўк і пачаў калупаць у носе, а потым так ёмка высмаркаўся на падлогу, што ледзь-ледзь ня трапіў у Швэйка. Нарэшце, ён зірнуў абудвым у вочы і сказаў:

— Брацця-таварышы, я бачу, што вы з Прагі. Не спрачайцеся, я бачу гэта па вашых абліччах. Вы, можа, і старыя вадлы, але ў палоне—праўдзівыя навабранцы. А я, брацця, чалавек бывалы. Я, брацця, на трэці дзень па-тым, як абвясьцілі вайну, апынуўся ў палоне. У вас па дзесяць рублёў,—сказаў ён урачыста,—а ў Сібіру, брацця, можна атрымаць за дзьве капейкі фунт хлеба, за капейку—два яйкі, за пятак—зайца, а за грыўню—цэлы мэтар кракаўскае кілбасы. У самаварах там столькі вады, што і за век яе не папіць, а махоркі вам за чатыры капейкі насыпяць во-о колькі! На дзесяць рублёў вы пражывеце там зіму, як бароны! Наплюйце на ўсіх гэтых ідыётаў з іхнай працай, з іхнай капустай ды кашай. Лёзунг кожнага сумленнага палоннага на гэту зіму такі: «У лягер! У Сібір! У Сібір! У Сібір!

Незнаёмы доўга скроб у сябе ў рыжай барадзе, а потым падыйшоў да двух таварышоў і падаў ім руку:

— Маё прозьвішча—Гаршына, мэтр д'отэль, служыў у лепшых праскіх і венскіх рэсторанах.

— Язэп Швэйк з Прагі, на Боітшы, рэсторан «Поўная чара»,—першы пасьпяшаўся адрэкомэндавацца Швэйк; Марэк, разглядаючы галадранца, які стаяў перад ім у падранай вайсковай форме, з якой лахманы зьвісалі, як кавалкі старога баявога сьцягу, ня мог стрымацца ад сьмеху.

— А мяне завуць Марэк, вольнапісаны. Ведаеце, мэтр д'отэля ў такім выглядзе я сабе ніколі не ўяўляў.

— Гэта таму, што твае мазгі таксама крануў час, таварыш,—весела адказаў Гаршына.—Апрача таго, я толькі ўчора ўцёк з шахты нездалёк ад Растова. Уся бяда была ў тым, што я меў няшчасьце трапіць у лапы казаком, дык трэба было цэлых два тыдні, пакуль я мог уцячы. Слухайце, таварышы-брацця, сьцеражэцеся ў Расіі горш за ўсё цара і шахтаў. Горш за гэта, ведаеце, няма нічога на сьвеце. Працуеш там, пакутуеш; кожным каменем можа цябе забіць. А ня хочаш працаваць, дык цябе заб'юць салдаты на сьмерць бізунамі. І цэлы дзень ня чуеш там

нічога іншага, апрача грубых, самых крыўдных лаянак, па мацеры і наогул.

— Так, але цар хацеў гэта забараніць,—сур'ёзна зазначыў Швэйк,—і ўжо быў прапанаваў радзе міністраў падрыхтаваць адпаведны загад. Яны склікалі нараду, падрыхтавалі загад і аддалі яго цару на подпіс. А ён чытае: «Мы, боскай літасьцю, Мікалай другі, самаўладца ўсерасійскі, вялікі князь фінляндзкі, і іншае, і іншае, загадваем усім нашым вернападаным, каб кожнага, хто ад гэтага часу будзе зьневажаць маці другога, каралі пяцьцюдзесяцьцю ўдарамі бізуном і ссылалі ў Сібір на працу ў валавяныя капальні. Дадзена ў Санкт-Пецярбурзе, і г. д.». Цару гэта дужа спадабалася. Хацеў ён ужо загад падпісаць, шукае пяра—няма пяра. «Прынясі мне пяро, хутка!»—кажа ён галоўнаму камэр-лёкаю. А той кідаецца да малодшага камэр-лёкая: «Дзе-ж пяро... тваю маць! Нясі хутчэй!» Цар гэтыя словы пачуў і думае: «Час загад падпісваць, час. І дзе гэта мае паданыя так нядобра лаяцца навучыліся?» Памакнуў пяро ў атрамант, падпісвае: «Мікалай» і раптам робіць кляксу, ды са злосьці як вырвецца ў яго: «Ах ты... тваю маць!..» Ну, тут ён загад зараз-жа падраў, а другога пісаць не казаў, а свайго галоўнага камэрдынэра выслаў у Архангельскую губэрню, якая пад самай Камчаткай.

— Ты з такімі апавяданьнямі тут спасьцерагайся, даражэнькі,—параіў былы мэтр д'отэль,—і не скажы чаго такога на людзях, стары капялюш. Гэта можа табе тут дорага абыйсьціся. І ня крыўдуй, што я назваў цябе «старым капялюшом», а прымі гэта за бацькаўскае навучаньне.

Швэйк падзякаваў яго мяккім позіркам сваіх блакітных вачэй і пасьпяшаўся сказаць яму што-небудзь прыемнае:

— Ты, браце, як я бачу, дужа разумны чалавек. Ты мне дужа падабаешся.

У гэты момант адчыніліся дзьверы і ў камеру ўвайшоў пісар, разам з вялізным доўгавалосым селянінам у старым кажуху. Пісар паказаў рукой на палонных:

— Ну, вось табе тры штукі. Усе добрыя працаўнікі. Выбірай.

Селянін вымераў іх з ног да галавы гаспадарчым поглядам.

— Ды мне патрэбны толькі адзін, але калі яны дарма, дык вазьму і двох.

— Дарма яны хоць і дарма, але кашулю прыдзецца табе ім даць,—сказаў пісар,—і справіць ім боты. Такі парадак. Царбацюшка так загадаў.

Селянін сьцягнуў з галавы ўбогую шапку, пачухаў патыліцу і ўздыхнуў:

— Эх, дрэнна начальства кіруе... Ну, але добра, зраблю ўжо ім, што трэба. Давай вось гэтых двох,—паказаў ён пальцамі на Швэйка і Гаршыну.

— Зараз іх бярэш ці не?—запытаўся пісар.

— Заўтра раніцой, васпане.

— Так і ведай, я з табой не паеду, барада,—сказаў Гаршына,—пакуль ты мне не дасі кашулю і кажух. На тое ёсьць закон.

— Удварэ я табе ўсё дам,—паабяцаў селянін.

— Як гэта «ўдварэ»? Дзе ты іх возьмеш? У самога ў цябе боты падраныя, і кажух увесь у дзюрках,—спрачаўся Гаршына.—Апрача таго, я ня ўмею працаваць. Я мэханік, оптык, і ўмею рабіць толькі акуляры. Хіба ў цябе акулярная майстэрня?

— А я ўсё сваё жыцьцё адно лётаў на аэропляне,—паважна сказаў Швэйк.—У мяне ўсё ляціць дагары нагамі. Ты, напрыклад, запражэш валоў, накладзеш воз сена, дасі мне ў рукі шугу, а потым ідзі шукай мяне пад хмарамі. Такі ўжо я чалавек.

Селянін завагаўся і, ня ведаючы што рабіць, запытальна зірнуў на пісара. Той прашаптаў яму: «Пачастунак будзе?»—і калі селянін кіўнуў у знак згоды, выскачыў за вароты і нешта крыкнуў на вуліцу.

Потым ён вярнуўся са стражнікам, які бяз усякіх размоў аперазаў усіх трох палонных бізуном па сьпінах.

— Вось табе акуляры, вось табе аэроплян, вось табе аўтомобіль! Чакайце, аўстрыяцкія чэрці, сукіны дзеці, я вам пакажу, як не паважаць нашых праваслаўных. Бяры іх,—крыкнуў ён селяніну,—бяры іх зараз-жа! Я вас навучу, як слухацца начальства!

Ды мне яшчэ перш на рынак трэба, бацюхна,—сказаў селянін.—У мяне жонка на рынку кавуны прадае. А пасьля рынку я прыду за аўстрыякамі. Дзякую табе, бацюхна, што павучыў ты іх трошкі за гультайства.

І ўсе ўтрох выйшлі.

— Ён мне здорава засьвяціў,—прызнаўся Швэйк, пачухваючы сьпіну.—Строгія, няма чаго казаць. Вядома, і з палоннымі трэба строгасьць. Бо які-ж гэта-б быў стражнік бяз строгасьці?

— Такі дурань гатоў і забіць чалавека,—хваляваўся Гаршына. «Будзеш працаваць? Ага, ня хочаш? Дык вось-жа табе!» Ах, каб я толькі мог адплаціць гэтай быдліне.

Да яго злосага голасу далучыўся Марэк, пытаючы: што-ж цяпер рабіць?

Гаршына правёў рукой па твары, нібы зьмятаючы з яго нейкую павучыну. З кішэні ён выцягнуў кніжку, зірнуў туды, склаў яе і сказаў:

— Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго! Мы-ж усе чэхі, ці так? Хлопцы, вы абедалі? Тут ніхто вас карміць ня будзе. Я папрашу старую згатаваць нам чаю. Дайце паўрубля, я пайду на рынак і куплю кілбас. Хлеба ў вас ёсьць? А потым мы зьнікнем па-француску.

Праз нейкі час ён вярнуўся са сваім вялікім чайнікам, засыпаў туды чаю, выцягнуў з-за пазухі кавалак чайнае кілбасы і разрэзаў яе на тры часткі.

— Гэта, казаў той, наша апошняя вячэра перад карай,—заўважыў ён.—Мы перапілуем краты і ўцячэм як граф Монтэ-Крысто! Вып'ем, хлопцы, за ўсё, што здарыцца з намі сёньня і наогул калі-небудзь у Расіі! Так! А цяпер—ранцы на сьпіну і гайда!

Ён пераклаў рэчы з Марэкавага мяшка ў Швэйкаў ранец, пусты мяшок паклаў у свой і з самым бязьвінным абліччам пайшоў да пісара ў канцылярыю. Той узьняў галаву ад кнігі:

— Куды?

— На рынак, за гаспадаром. Ён купіць нам боты, бо кавуны ён ужо прадаў. Ранец мы пакладзем да яго на калёсы, і ён яшчэ заедзе сюды разам з намі,—сьпехам адказаў Гаршына па-расійску. А па-чэску дадаў:—Як раз так! Шукай нас потым!

— Ты іх правядзеш, а потым вернешся,—загадаў ён Марэку, бачучы, што ў таго нічога няма ў руках.

— Ну, куды-ж мы цяпер пойдзем?—запытаў Марэк ля варот.

Гаршына зірнуў ува ўсе бакі, як тхор, які шукае, дзе-б пралезьці ў курыны катух, і лаканічна кінуў:

— Спачатку на рынак, а потым на станцыю.

Яны спаткалі таго самага стражніка, які іх адлупцаваў. Убачыўшы, як яны сьпяшаюцца, ён засьмяяўся і крыкнуў ім ўсьлед:

— Да пабачэньня, хлопцы!

— Лепш мне спаткацца з мядзьведзем на Ўрале, чым з табой, сьцерва,—буркнуў Гаршына.

Не атрымаўшы адказу на запытаньне, што яны будуць рабіць, Швэйк радасна крыкнуў:

— Значыцца, мы цяпер упяршыню без анёла-абаронцы? Значыцца, мы цяпер самовызначыліся!

— Куды, куды?—запытаў у іх жандар, што нудзіўся на пэроне.

— Мы едзем з казаком,—спакойна адказаў Гаршына.—Нас пасылаюць на працу ў лягер. Казак крыху забавіўся на рынку, а нас паслаў наперад.

Ён павярнуў назад, пайшоў да выхаду, зірнуў на пляц і крыкнуў некуды:

— Гэй ты, там! Ідзі хутчэй! Цябе жандар кліча!

— Добра, добра,—прамармытаў жандар.—Я толькі хацеў ведаць, ці ня зьбеглі вы. Усюды гэтых аўстрыйцаў поўна, усе ўцякаюць ад працы.

Ён адыйшоўся і пачаў назіраць за лямпаўнікам, які чысьціў станцыйныя лямпы.

— Ну, дык куды-ж мы едзем?—зацікавіўся Марэк.

— Куды вочы глядзяць,—прасіпеў Гаршына.

— Вы мне нагадваеце аднаго майго знаёмага з Панкрат,— сказаў Швэйк,—які па нядзелях па абедзе заўсёды казаў жонцы: «Значыцца, я іду. Пайду я ці ў «Лішку, ці ў «Банзэт», ці ў рэсторан «Тры каралі», ці да Палівеца, ці ў «Шэнфлёк», ці ў піўніцу «Вясёлая даліна». Калі што здарыцца, дык пакліччце мяне з адной з гэтых устаноў. Але жонка ніколі па яго не пасылала, а заўсёды яго прывозілі ў «труне», у фургоне, які развозяць п'яных уштчэнт, бо ён заўсёды пакідаў на гэты выпадак шэсьцьдзесят хэльлераў у кішэні і пісульку са сваім адрасам, каб ведалі, куды яго здаць. Пакуль ён аднойчы не затапіўся ў Ботычэ, а ў пісульцы, засунутай за істужкі капялюша, ён напісаў, што прапіў і гэтыя шэсьцьдзесят хэльлераў і што ён ня хоча вяртацца ў Панкраты пеша.

Вакзал напоўніўся людзьмі. Наехалі сяляне, салдаты, казакі і кабеты, і Гаршына ўсё пазіраў на жандара, які раз-по-раз аба-

рачваўся да іх; потым ён завёў гутарку з адным казаком, які пытаў, хто пераможа ў гэтай вайне.

— Гэта цяжка сказаць. Немец, сукін сын, дужа моцны, але і Расія дужа моцная. Немец—хітры чорт, за тое ўжо казакі—малайцы-хлопцы!

Узрадаваны казак выпнуў грудзі другой і ўдарыў сябе па іх кулаком.

— Вось гэта ты правільна сказаў!—крыкнуў ён.—Ты пра Кузьму Кручкова чуў? Гэта, браце, герой! Ён адзін закалоў трыццаць сем немцаў, застрэліў іх, засек шашкай, а самаго яго нават вось столькі не чаплянула, і не адна валасіна з яго галавы не звалілася.

— А ён быў бяз шапкі?—неасьцярожна запытаў Швэйк.

Казак, не зразумеўшы яго, зноў ударыў сябе правай рукою ў грудзі, паказаў растапыраныя пальцы свае рукі, якая была падобна да лапаты, сьціснуў іх потым у кулак і тыркануў яе Швэйку пад нос са словамі:

— Вось, глядзі, калі-б немец захацеў біцца! Вось як яго-б схапілі гэтыя кулакі! Але гэтага гэты чорт, гэты сукін сын ня хоча! Ён усё пнецца ўзяць сваёй тэхнікай! Тэхніка ў яго моцная!

— Твае кулакі пахнуць магілай,—сьціпла зазначыў Швэйк, адварочваючы нос ад накіраванага ў яго кулака. Казак, зразумеўшы, што Швэйкавы словы выражаюць хвальбу, крыкнуў на ўвесь вакзал:

— Вось як мы пойдзем на немцаў, на аўстрыйцаў, на туркаў! Вось як мы ім зубы павыбіваем!

І ў сьвятым, патрыётычным запале ён выцяў Гаршыну кулаком па барадзе так, што ў таго зубы ляснулі і ён пахіснуўся.

— Даруй,—ахамянуўшыся сказаў казак, калі Марэк і Швэйк дамамаглі свайму сябру ўстояць на нагах,—даруй, што я саграшыў. Сапраўдны расіец ня можа думаць пра забойцу інакш як у злосьці. А грэх ужо і тут, не пасьпееш і вокам міргнуць.

У вачох у яго заблішчэлі сьлёзы. Ён выцягнуў з кішэні пачак папярос, пацягнуў іх Гаршыне і яшчэ раз сказаў:

— Даруй ты мне, я ня мог стрымаць свае сілы. Як? Немец, сукін сын, хоча нас перамагчы?... Што-ж, чакай, ня хопіць у яго патронаў і тэхнікі, дык мы яго кулакамі во як адлупцуем!— нечакана закрычаў ён і так моцна размахнуўся ў бок Марэкавага носу, што той ледзь пасьпеў адскочыць.

— Ён такі-самы, як нейкі Коршынэк з Нучыцэ,—заначыў Швэйк, адступаючы перад казаком, які гатоў быў давесьці і яму ўсю глыбіню свайго абурэньня і свой сур'ёзны замер біцца да канца.—Гэты Коршынэк служыў за фурмана ў аднаго селяніна і заўжды гутарыў з коньмі. Напрыклад, едзе ён на гнедым у Прагу і расказвае яму ўсё, што здарылася і што казаў яму гаспадар: «Учора я ў шэсьцьдзесят шэсьць прайграў дваццаць хэльлераў, а Пазьдзернік, гэты круцель, іх выйграў», і сьцёб! каня пугай па сьпіне. «А гаспадар, ліха на яго!»—сьцёб! зноў каня па сьпіне,—«сёньня раніцой мне кажа, што я ўчора быў п'яны, як сьвіньня,—зноў пугай,—«і гаспадыня, гадаўка, ударыла мяне па твары,»—сьцёб! сьцёб! па кані,—дык памойму» (сьцёб!) «усіх гаспадароў трэба пасадзіць у адзін мех ды ў ваду!»—(сьцёб! сьцёб! сьцёб!). А аднаго разу пасьля фэсту ён расказаў гнядому, як яго вытурылі ў Душніку з піўніцы і як паліцыя, паводле заявы аднаго профэсара, прыцягнула яго да адказнасьці за катаваньне жывёлы, а ён ў аддзяленьні казаў: «Ды даруйце, навошта-ж мне каня катаваць? Я яго нават дужа люблю, я яму ўсё расказваю, што ў мяне ў думках». Але толькі гэта яму не дапамагло, бо каня нельга было паставіць ў сьведкі.

На вакзале прагучэў сыгнал, пасьля якога да пэрону пад'ехаў цягнік. Вартаўнік, нібы робячы нешта вялікае, ударыў у звон, і Гаршына штурхнуў Швэйка.

— Кінь ты лухту верзьці! Хутчэй, за казаком у трэцюю клясу!

Званок зазваніў у други і трэці раз і Гаршына, высунуўшыся з вакна, калі цягнік крануўся, крыкнуў жандару:

— Бывай, стары! Перадай прывітаньне пісару і земскай управе.

З другога вакна выставіў галаву Марэк і, зірнуўшы на сонца і рэйкі, якія беглі ў даль простай рысачкай, крыкнуў ў вагон:

— Мы едзем проста на поўдзень!

Вагон быў напалавіну пусты. Яны занялі кожны па лаве; Швэйк падклаў сабе пад галаву ранец і нібы паміж іншым запытаў:

— Што-ж мы скажам? Што даганяем свой эшалён? Што цягнік з нашымі ідзе папераздзе?

— Не, коратка сказаў Гаршына.

— Што-ж у цябе можа ёсьць білеты?—расьцягваючы словы, запытаў Марэк.—Ці табе далі ў рукі літэр?

— Так, у мяне ёсьць літэр,—адказаў Гаршына.—Вы толькі ня турбуйцеся, усё будзе добра.

Вагон мякка ўздрыгваў, пагрукваючы на стыках. Палонныя заснулі; ападалі змрокі і надыходзіла ноч. Раптам пачуліся нечыя галасы:

— Вашы білеты? Пашпарт? А ну, пакажэце!

У вочы бліснула сьвятло ліхтару. Над аўстрыйцамі схіліліся кандуктар і жандар, а за імі стаяў контралёр. Убачыўшы, хто гэтыя пасажыры, усе тры ў адзін голас крыкнулі:

— Ага, аўстрыйцы? Ну, а дзе ваш канвой?

Марэк, праціраючы са сну вочы, зірнуў на Гаршыну. Жандар смаргануў за нагу Швэйка, і той, узмасьціўшыся на верхняй лаве, як курыца на курасеdні, са зьдзіўленьнем глядзеў на тых, хто парушыў яго спакой і, сонна пазяхаючы на ўвесь рот, мармытаў:

— А вось і яны! У добрую трапілі мы гісторыю!

— Я пытаю, дзе ваш канвой?—пераказаў ужо больш строга жандар; кандуктар, пад позіркам контралёра, стаў таксама прычэплівы.

— Я-ж кажу, брацца, што мы папаліся,—задаволена гаварыў Швэйк, зьбіраючы свае рэчы.—Цяпер яны нам маршрут дадуць і пакажуць ужо, гэтыя тры славянскія браточкі.

Жандар і контралёр, пачуўшы словы «славянскія браточкі», мімаволі азірнуліся, і Гаршына, злавіўшы іхны позірк, сказаў жандару па-расійску:

— Тут я свае дакумэнты ніяк не магу паказаць. Гэта сакрэт, палітычная тайна. Выйдзем на калідор. Хадзем, таварышы!.. Мой дакумант атрыманы непасрэдна ад цара, і на ім подпісы ўсіх міністраў,—сказаў ён жандару, падаючы яму вялікую, старанна складзеную паперу.

Жандар асьцярожна разгарнуў яе; асьвятліўшы яе сваім ліхтарыкам, ён струніўся, нібы стаяў перад самым царом, а потым, ўзяўшы пад казырок, пачаў чытаць.

Гаршына стаяў, спакойна ўсьміхаючыся, да пары з статуём, у якога абярнуўся жандар. Швэйк гутарыў з кандуктарам, стараючыся даведацца, куды іх накіруюць, а Марэк, занепакоены

паводзінамі жандара, Гаршыны, і контралёра, які зазіраў цераз жандарава плячо ў паперу поўнымі цікавасьцю і павагі вачыма, устаў на цыпкі і таксама зірнуў на таемны дакумант.

Гэта было мэню рэсторана «Чорны Конь» у Празе. На блакітным фоне разгортваў свае крыльлі вялікі літографаваны арол, а пад ім каліграфічным почыркам у трох слупкох на чэскай, францускай і нямецкай мовах было напісана, што прыгатавана ў той дзень у рэстараннай кухні на абед і чым маглі пацешыць сябе наведвальнікі рэсторану а-ля-карт.

І вось гэтыя тры слупкі, напісаныя лацінкай, са зьдзіўленьнем разглядаў цяпер расійскі жандар, якому, відаць, і ў думку ня прыходзіла, што за «дакумант» яму падсунулі, і які сумленна стараўся разгадаць яго сэнс і значэньне.

— Дальбог, нічога не разумею,—уздыхнуў ён нарэшце, абціраючы рукавом пот з лобу.—Дужа дзіўна напісана. Нельга разабраць, што гэта азначае.

Тады пашпарт ўзяў у рукі сам контралёр і агледзеў яго з усіх бакоў. Потым, водзячы пальцам па радкох, ён пачаў чытаць:

Polėvky hnědė	Consommė	Klare Suppe
„ ryzoová	„ au ruz	Reissuppe
„ s nudlemi	„ au pot d'Italie	Nudelsuppe
Polėvky bilë	Potage clair	Weiss Suppe
„ Z kvėtáku	„ de chau-fleur	Karfilosuppe
„ Z mozku	„ de arvell	Hirnsuppe [1])

— Гэта па-чэску, па-француску і па-ангельску,—спакойна растлумачыў Гаршына, заўважыўшы, што і контралёр ня мог нічога зразумець.—Гэта наш пашпарт для ўсіх саюзьнікаў. Мы едзем з сакрэтным палітычным і дыплёматычным заданьнем.

— А куды маеце ехаць?—запытаў, млеючы ад далік-

— А куды маеце ехаць?—запытаў, млеючы ад далікатнасьці, жандар.

— Адсюль,—адказаў паважна Гаршына, дакрануўшыся пальцам да мэню,—адсюль мы едзем вось сюды, сюды і сюды. Тут мы затрымаемся крыху больш, а потым вернемся ў Петраград.

---

[1]) Бульён чысты; з рысам; з лапшой. Консомэ; з цьвятной капустай; з мазгамі.

І, поркаючы пальцам у асобныя словы, ён голасна чытаў:

Retkvicky	Radis	Radieschen
Ostendske ústrice Huitres		Ostender Austern
Majonesa Z lososa Saumonsance mayonnaise Lachsmaynnaise [1])		

— Так і ёсьць, гэта па-ангельску і па-француску,—сказаў контралёр жандару, які зьдзіўлена глядзеў на пасажыраў, што ехалі з дакумэнтамі ад самой рады міністраў.—Я ведаю, што «Майонэз» францускае слова. А вы хто будзеце?—Зьвярнуўся ён да Марэка.

Марэк пачырванеў, але ня ўправіўся ён знайсьці словы на адказ, як Гашына ўжо соладка загаварыў:

— Ня будзьце, прашу вас, такія цікавыя. Разумееце,—сакрэтнае, зусім асабістае заданьне... Аховы вышэйшых дзяржаўных інтарэсаў і таямніц...

І ён паказаў на арла, які разгарнуў свае крыльлі ад чэскай «Retkvicky» да слова «Radiesvhen»

— Дазвольце вам адказаць,—улез у гутарку Швэйк і, абводзячы пальцам па аднаму абзацу ў кожным слупку, сказаў, нібы заражоны нахабнасьцю Гаршыны:

Гэта мае імя, па бацьку, і прозьвішча, гэта—яго, а гэта—яго.
І, ніколі не саромячыся, прачытаў:

Rostěnka	Felct saate	Rostbraten
Krocan	Dindon	Trutbiann
lebeni kyta	cutissot de chevreuil	Rehkeule [2])

Жандар старанна склаў паперу і, казырнуўшы, вярнуў яе Гаршыне. Кандуктар прашаптаў контралёру нешта на-вуха: той зьвярнуўся да аўстрыйцаў:

— Можа-б вам было зручней у другой клясе? Я-б, вядома, даў вам асобнае купэ, каб вас ніхто ня турбаваў.

Гаршына толькі ўкланіўся бяз слоў, паказаўшы рукою на вагон, у якім яны сядзелі, у знак таго, што яны хочуць вярнуцца туды-ж. Швэйк сказаў, што яму зусім непатрэбна заставацца аднаму, а Марэк дадаў:

— Мы хочам усё бачыць, усё чуць.

---

[1]) Радыска; остэндзкія ўстрыцы; ласосіна з майонэзам.

[2]) Ростбіф; індык смажаны; сьцягно дзікай казы.

— Вы, можа, служыце ў дзяржаўнай тайнай паліцыі?—пабялеўшы, шэптам запытаў контралёр, на што Швэйк многазначна адказаў:

— Вы здагадаліся. Мы служым у тайнай паліцыі. Мы— тое-самае, што хуткая дапамога.

Яны вярнуліся ў свой вагон, дзе тым часам пайшлі чуткі, што жандар затрымаў трох небясьпечных нямецкіх шпэгаў. Неўзабаве стала вядома нешта зусім адваротнае: што гэтыя тры— вышэйшыя чыны тайнай паліцыі, якіх паслаў асабіста цар, каб выявіць настрой народу, бо цар-бацюхна хоча чуць голас краіны. Гэтая навіна мела зусім нечаканы вынік. Калі ў той час, як жандар разглядаў паперу, у вагоне было поўна людзей нават з іншых вагонаў, дык цяпер нашы палонныя былі зусім адны. У вагоне ніхто не застаўся. Толькі па абедзе зьявілася нейкая старая, стала, абліваючыся сьлязамі, перад Швэйкам на калены і пачала прасіць, каб ён вярнуў ёй сына-студэнта, якога паліцыя выслала ў пачатку вайны ў Якуцкую вобласьць. А калі яны ёй паабяцалі, што выканаюць яе просьбу, да іх прылез п'яны тыпус і пачаў прапаноўваць зрабіць замах на губэрнатара за пяцьдзесят рублёў, пасьля чаго паліцыя магла-б павесіць на малое два дзесяткі рабочых і студэнтаў.

— Гэта-б вам каштавала ўсяго паўтраця на кожнага, айцы-дабрадзеі. А калі хочаце, дык можаце павесіць і дваццаць пяць душ; тады яны будуць каштаваць вам толькі па два рублі,— вылічваў гэты падлюга.

Скончылася на тым, што ён атрымаў ад Швэйка паўхаля, ад Гаршыны—у зубы, а Марэк даў яму высьпятка, што п'яны прыняў з відавочным задавальненьнем.

— Адразу відаць, што начальства!—крыкнуў ён.—Начальства, яно паўхалёў і высьпяткаў не шкадуе. Як тут ня ўбачыш, што вы, галубы мае, проста з Пэтраграду!

Потым іх на нейкі час пакінулі ў спакоі. На нейкай станцыі Швэйк прынёс чаю і булак. Яны крыху падмацаваліся, а потым Гаршына выцягнуў сваю паперу і весела сказаў:

— Ці не загадаеце яшчэ чаго, панове? Вось тут ёсьць смажаная гусіна, заяц у сьмятане, смажаныя кураняты, фаршыраваныя галубцы...

— Я-б узяў, мабыць, кавалачак гусяціны,—азваўся Швэйк; Марэк выказаўся за кураня. А Гаршына, хаваючы паперу ў запазуху, сур'ёзна сказаў:

— Ці дасьцё веры, хлопцы, што гэта папера ратавала мне летась жыцьцё? Ці дасьцё веры, вы, што яна, ратавала мяне ад галоднай сьмерці? Нас прывезьлі ў Сібір і ўжо цэлы тыдзень не кармілі. Людзі з голаду елі кару з дрэў, як зайцы. Ну, а я цэлы дзень чытаў гэта мэню, з самай раніцы да позьняга вечара. Спачатку мяне ад гэтага нудзіла і ў мяне рабіліся спазмы ў страўніку. А потым, калі я, бывала, прачытаю яго з пачатку да канца, дык у мяне заставалася такое ўражаньне, нібы ўсё гэта я сам зьеў. І было мне і млосна, і прыемна...

— Значыцца, у роце як у палацы, а ў жываце як у сарціры,—растлумачыў ягоную думку Швэйк.

— Бадай што так,—згадзіўся Гаршына.—У мяне была яшчэ і карта вінаў, але тую я згубіў. Каб яна была ў мяне, я-б наладзіў вам банкет. А так выпадае ліць у сябе адно гэтую агідную гатаваную ваду.

Ён зноў наліў сабе ў конаўку чаю з свайго вялікага іржавага чайніка, і хутка ў пустым вагоне загучэла прарэзьлівая песьня на мотыў арыі аркадзкага прынца з опэрэткі «Офрэй у пекле».

Як быў я „обэрам" [1]) калісьці,
Дык меў і радасьць і спакой,
і грошы й мяккую пярыну,
і прыгажуньняў цэлы рой...

Хапала пільзенскага піва
Шампанскае мне ў рот плыло...
Але зрабіўся я палонным,
І кішкі з голаду зьвяло.

— Марэк, вацікаўлены, глядзеў на сьпевака, Швэйк—захоплены і ўзьнесены. Заўважыўшы свой посьпех, бо Марэк нарэшце выцягнуў паперу і аловак, каб запісаць тэкст песьні, Гаршына, сказаў:

— Гэта сапраўды песьня палонных славян. Але чакай. Калі патрапім у лягеры, ты пачуеш яшчэ лепшыя; там ты і запішаш,

[1]) Обэркэльнэр мэтрд' отэль, галоўны афіцыянт.

якія табе спадабаюцца. У лягерах поэзія расьцьвітае. Людзі пішуць вершы проста з голаду.

І ён зацягнуў нешта іншае.

*

Чацьвёра сутак перабылі яны ў цягніку, і чатыры разы ўдавалася ім пераканаць жандараў, якія правяралі дакуманты, што яны едуць па сакрэтнай справе на Каўказ, каб прыняць удзел там у формаваньні добраахвотнай арміі для змаганьня з туркамі.

Жандары ламалі сабе галовы над «дакумантам» Гаршыны, але арол праганяў усе сумленьні. Як-жа—на паперы красаваўся дзяржаўны герб, і дазорцам дзяржаўнага парадку прыходзілася з ім лічыцца, асабліва, калі Швэйк ім сур'ёзна тлумачыў:

— Так, туркам цяпер будзе канец! Трэба біцца за сваю веру з гэтымі паганцамі!

Вандраваньне было досыць прыемнае. На кожнай станцыі Швэйк прыносіў у чайніку чаю, купляў булкі, сараквашу і смажаных курэй і запэўняў, што ўсё надзвычайна таннае. Усе тры качаліся на лавах, елі і спалі, і за кароткі час нават патаўсьцелі.

Пад канец чацьвертых сутак яны прыехалі ўвечары на нейкі асьветлены электрычнасьцю вялікі вакзал. Гаршына выскачыў паглядзець, дзе яны, і хутка вярнуліся са словамі:

— Браццы, мы тут на нейкі час застанемся на гастролі, перш чым ехаць далей. На ежу мы неяк заробім, а спаць будзем на вакзале.

Яны пайшлі ў залю 3-е клясы. Жандары ўважна пазіралі на іх, але пусьцілі, не затрымаўшы. У зале, поўнай салдатаў, якія сядзелі, ляжалі покатам і спалі, яны згубіліся як пылінкі ў моры.

Ніхто не зьвяртаў на іх увагі. Нейкі селянін зацікавіўся, куды іх вязуць. Міма прайшоў жандар і нават не запытаў, дзе іхны канвой. Праз дзесяць хвілін яны пачалі адчуваць сябе на вакзале, як дома.

— Браццы-таварышы,—многазначна сказаў Гаршына, вярнуўшыся ад кас у залю,—тут жандараў, як сабак нярэзаных, але яны ўжо свойскія. Потым, тут ёсьць буфэт. Да гэтага часу вы мяне кармілі, а цяпер я буду вас карміць. Я пачастую вас абедам у буфэце 1-й і 2-й клясы, хлопцы. З таго часу, як вы

трапілі ў Расію, вам так добра ня жылося, як сёньня. Пачакайце толькі хвілінку, пакуль адыйдзе цягнік.

Ці толькі празьвінеў трэці званок, ён павёў сваіх таварышоў да люстраных вакон першае клясы.

Там сядзела важная публіка, схіліўшыся над сьняжыстымі абрусамі—прыгожыя, убраныя дамы, гандляры ў хутрах, афіцэры ў залатых і срэбных пагонах. Але сярод іх бегалі туды і суды афіцыянты, якія выходзілі з-за порт'еры ў куту і разносілі стравы, пітво і начыньне.

— Яны сядзяць, пэўна, у тым куце,—прамармытаў Гаршына сам сабе, а ў голас сказаў:—Давай, хлопцы, пойдзем ў чалядню, бо ў салон я не магу вас папрасіць. Вы ня зусім шыкоўна апрануты.

Ён цьвёрдымі крокамі падаўся да цёмных дзьвярэй і адчыніў іх; яны ўвайшлі ў даўгі, відны калідор. Там ён знайшоў тое, чаго шукаў—у калідор з аднаго боку выходзілі адчыненыя вокны кухні, а з другога боку сядзелі афіцыянты, чакаючы свае чаргі ці адпачываючы.

— Пачакайце тут,—сказаў Гаршына сваім таварышом, пакідаючы іх каля дзьвярэй. Усе афіцыянты абярнуліся да яго; ён аддаў па-вайсковаму чэсьць і адрэкамэндаваўся:

— Я таксама афіцыянт. Ваш аўстрыйская колега.

Тыя абкружылі яго, пытаючы без асаблівага захапленьня, што яму тут трэба. А ён сказаў, што яго цягне да іх голас сэрца, што ў яго душа баліць, калі ён бачыць, як яны бегаюць узад і ўперад і падаюць гасьцём.

— Паўжыцьця-б я аддаў,—сказаў ён, выціраючы рукавом вочы,—каб мне давялося яшчэ раз узяцца за гэтую справу. Мяне талеркі прыцягваюць, як магнэс—жалеза, мае дарагія расійскія браты-афіцыянты.

Ён узяў талерку, паставіў яе на кончык пальца левай рукі і пачаў круціць яе правай, як турок. Расійскія колегі глядзелі на яго зьдзіўлена.

Потым ён схапіў, ня сунімаючы гутаркі, талеркі са стравамі, якія кухар ставіў на вакенца, і шчыльна заставіў імі ўсю руку ад далоні да плеча, а на іх яшчэ рад, пакуль у яго на руцэ не

ўтварылася цэлая піраміда. Афіцыянты зацялі ад страху дух, а Гаршына ў захапленьні сказаў:

— Вось так я-б хацеў іх разносіць (ён зрабіў некалькі шпаркіх крокаў па калідоры),—вось так я-б абыходзіў усе перашкоды, а так я-б ставіў талеркі перад гасьцямі на стол.

Ён зьняў дзьве талеркі, выцягнуў тыя, якія стаялі пад імі, перадаў іх галоўнаму афіцыянту, зноў запоўніў пустое месца і сказаў:

— А вось так я-б ішоў проста наперад, не зварочваючы ў бок.

І, нібы не зважаючы на цяжар, навалены на яго, ён узьлез на крэсла, і гэтак-жа лёгка спусьціўся на падлогу.

Афіцыянты так і войкнулі ад захапленьня перад гэткім спрытам. Потым яны схапілі па талерцы і пабеглі з імі ў залю, дзе іх чакала публіка, але ля дзьвярэй абарочваліся і казалі бягучы:

— Пачакай, колега, мы зараз!

Праз хвіліну яны ўжо вярнуліся і, выцягваючы з кішэняў брудныя, зашмальцаваныя рублёўкі, сказалі:

— На, вазьмі сабе. Гэта-ж сапраўдныя фокусы, што ты тут рабіў. Хочаш есьці? А твае таварышы таксама афіцыянты?

— Таксама,—сказаў Гаршына,—але яны падаюць піва. Піва ў вас тут, на жаль, няма, а то-б яны паказалі, як ў Аўстрыі падаюць піва.

Яны запрасілі палонных зайсьці і пачаставалі іх капустай з катлетамі і чорнай кавай, радуючыся сваім замежным гасьцём.

— Можа-ж здарыцца,—казалі яны,—што і мы пойдзем на вайну і таксама трапім у палон. Тады нас у Вэне гэтак-жа будуць частаваць.

Гэта была нязвычайна ўрачыстая вячэра, за якой Гаршына растлумачыў, як трэба падаваць стравы. Марэк казаў пра майстацтва наліваць віны, а Швэйк еў сьвіную катлету і ўсё гаварыў:

— Ну, як-жа я табе рустлумачу? Ты, напрыклад, ведаеш, як зямля круціцца? Ня ведзеш? Дык як-жа ты зразумееш, як у нас круцяць піва?

Банкет скончыўся тым, што Гаршына паказаў, як трэба складаць карту страў, выцягнуў сваю ўласную і даў ім зірнуць на яе.

— Вось гэта,—сказаў ён і ёсьць наша карта страў, а складзена яна так, што вашы жандары прымаюць яе за замежны пашпарт.

Ён не заўважыў, як шыкоўны малады чалавек, які ў гэты час ішоў з прыбіральні, падышоў да іхнага гуртка зірнуць, чым гэта ўсе там так зацікавіліся. Гэты малады чалавек раптам працягнуў руку да карты страў і ўраз схаваў яе сабе ў кішэню, а потым хутка выйшаў у калідор і зараз-жа вярнуўся з двума жандарамі.

— Усіх арыштаваць!—загадаў ён.—Шпэгі! Афіцыянтаў здаць у партовую ўправу, аўстрыйцаў—да комэнданта. Здаць пад расьпіску. Старанна пільнаваць. Я зараз пашлю вам падмацаваньне.

Такім чынам здарылася, што трое нашых замежных гасьцей проста з чыгуначнага буфэту трапілі ў канцылярыю ваеннага комэнданта гораду Растова-на-Доне, дзе іх прыняў і паставіў пад замок дзяжурны пісар, пасьля таго, як казакі ўсё ў іх адабралі, а саміх іх адлупцавалі бізунамі.

Калі за імі зачыніліся дзьверы іхнай камеры, у якой ня было нічога апрача аднаго ложку і парашы, палонныя няўцямна азірнулі адзін аднаго, тым часам, як Гаршына пахмура чухаў за вухам і пахмура гаварыў:

— А нас-жа абвінавачваюць у шпіянажы! Дрэнна з намі будзе. Цяпер мы ня выкруцімся ад вайсковага суду.

Марэк моўчкі пацісnуў плячыма. Швэйк выцягнуўся на ложку і па-філёзофску зазначыў:

— Усякі пачатак цяжкі, а канец вянчае справу. Вячэра ў нас была адменная. Але не кажы «гоп!», не пераскочыўшы.

У той час, як яго таварышы меркавалі, што з імі цяпер будзе, ўдалы ваяка Швэйк заснуў, і яму прысьніўся такі сон:

Сьнілася яму, што ён галоўны рэдактар «Кулінарнага агляду» і піша перадавую, у якой выкладае програму свайго часопісу. Сьліна пацякла ў яго з роту, пакуль ён абмяркоўваў, якія навіны ён будзе даваць чытачом, і цякла на паперу, калі ён канчаў свой артыкул словамі:

«Ня чытайце больш палітычных газэт! Выкіньце, як непатрэбнае, штодзенныя газэты ўсіх палітычных кірункаў! Адмоўцеся ад чытаньня ўсякіх авантурных романаў! Кіньце свае думкі пра апублікацыі аб сьмерці! Заплюшчыце свае вочы перад

абвесткамі аб жаданьні пашлюбавацца!.. Бо адзінае чытаньне, якое выклікае вясёлы і прыемны настрой, гэта наш «Кулінарны агляд!»

Ваенны комэндант гораду, казацкі генэрал Аўген Зьмітравіч Папоў, быў добры, асьвечаны чалавек. Гэта быў чыстакроўны расіец, і на ўсё на сьвеце ў яго быў адзін адказ: «Пасьпее!».

Таму ,калі яго ад'ютант раніцой сказаў яму, што, паводле рапарту дзяжурнага пісара, жандары затрымалі ўчора ўвечары на вакзале некалькі нямецкіх шпэгаў, якія былі пераапрануты ў аўстрыйскіх палонных і выдавалі сябе за іх, і аддалі іх пад загад комэнданта, ён яго спакойна выслухаў, а потым запытаў у пісара:

— Што, газэты ўжо прышлі? А арыштаваных на паёк залічылі?

— Так точна, ваша правасхадзіцельства!

Генэрал абярнуўся да ад'ютанта:

— Вы не глядзелі ўчора ў фарсе «Добра пашыты фрак»? Надзвычайная рэч! Я ледзь не памёр ад сьмеху!

І ён пачаў чытаць «Новое время» і «Русское слово», дзе з захапленьнем пісалася пра перамогі на каўкаскім фроньце, а пра становішча на заходным фронце коратка казалася: «Бяз зьмен».

А ў той час, як затрыманыя афіцыянты кляліся і бажыліся ў паліцыянцкай управе, што яны не займаліся шпіянажам, а сканфіскаваная карта страў разглядалася экспэртамі па замежных мовах, каб выявіць ці не зьяўляецца яна маніфэстам да расійскага народу,—Швэйк сядзеў на ложку, слухаў скаргі сваіх да краю зьбянтэжаных таварышоў і стараўся іх заспакоіць.

— У вайсковым статуце,—казаў ён,—напісана, што вайсковы чын ня лічыцца за звычайнага шпэга, а таму, калі яго зловяць, яго павінны расстраляць. Значыцца, павесіць нас ні ў якім выпадку ня могуць; мы маем права памерці геройскай сьмерцю, як гэта і трэба ўдалым ваякам. Гэта, брацца, ня тое, што з нейкім там Кржышкай, якога павесілі ў Вэне і ў якога ў Бэўроне быў публічны дом. Заўважылі, што ноччу туды хадзіў нейкі гарбаты сэрб; калі іх абудвых затрымалі, а сэрба распранулі, дык выявілася, што ў яго ў горбе схавана дзьвесьці кілё піроксіліну. Ён прызнаўся, што хацеў узарваць мост праз Бэроунку, каб

68-ы полк ня мог траліць у Сэрбію, бо гэтага палка сэрбы баяліся больш за ўсё.

Гаршына, які хадзіў па камеры ўзад і ўперад, спыніўся перад Швэйкам:

— Ну скажы, Швэйк, што ў цябе ў тваёй галаве? Хіба ты бачыў калі-небудзь чалавека, які-б насіў дзьвесьце кілё на сьпіне.

— А ў Пардубіцы,—казаў далей Швэй, нібы гэта не яго тычылася,—затрымалі аднаго польскага яўрэя, які прыехаў сюды чыгункай. Дык у яго быў пусты ўсярэдку кій, а ў ім пяцьдзесят кілё цыяністага калі. Ён хацеў атруціць ім ваду ў Лабе. Гэта зладзейства не адбылося дзякуючы дамыснасьці аднаго порт'е, які падняў кій, калі ён вываліўся з гаспадаровых рук, і зьвярнуў увагу жандара на тое, што кій надзвычайна цяжкі. Гэтага яўрэя павесілі потым у Карлове-Градцы!

Марэк заткнуў сабе вушы. Швэйк на момант сьціх, а потым, уздыхнуўшы, казаў далей:

— У Празе, перад вакзалам Франца-Іосіфа, затрымалі ноччу на лаве ў парку нейкага чалавека, які ўдаваў з сябе рускага. Дык у гэтага чалавека было ў кішэні больш за мільён пракламацый Мікалая Мікалаевіча, і яго таксама павесілі, бо ён ня быў вайсковы чын. Вайсковы чын павінен у кожным разе атрымаць толькі набой волава!

Швэйк абвясьціў гэта асноўнае правіла вайсковай справы, і твар яго зазьзяў.

— Вы сабе толькі ўявеце, панове! Вось нас прысудзілі да кары сьмерцю праз расстрэл... Палавіна роты салдат заводзяць нас на могільнік... Там даюць нам у рукі рыдлёўкі: «Капайце сабе магілы. Вы—шпэгі, і мы зусім не павінны працаваць на вас». Ну, бярэмся капаць, я вось так, пасярод, а вы па баках... Нам завязваюць вочы, становяць да сьцяны каля могілак, афіцэр камандуе: «Цэлься! Плі!» і ў нас выпускаюць тры залпы...

— Швэйк,—ня вытрымаў Гаршына,—глядзі, не навяшчуй. У такой кашы, як зараз, я яшчэ ніколі ня быў. Каб толькі ведаць, што можа выйсьці з такога глупства...

— Тое, што ты кажаш,—азваўся Швэйк,—нагадвае мне аднаго Франца Пеха з Разіцэ. Гэта быў дужа добры чалавек і таксама хацеў папрацаваць на карысьць і славу свайго народу. і паступіў у таварыства «ашчаднікаў». А нейкі профэсар пра-

чытаў ім лекцыю і паміж іншым сказаў: «Надзея сьвеціць нам толькі з боку старанных рук». І яшчэ, што на зямлі-б быў рай, каб усе здаровыя людзі, як сьлед працавалі і каб заўсёды ўва ўсім улічваліся вынікі. Франц Пэх, каб добра засвоіць сабе гэтыя асновы, загадаў падаць сабе пасьля лекцыі некалькі шклянак віна і пачаў разважаць аб выніках. «Што-ж,—думаў ён,— я працую мала, але профэсар, гэты агідны тыпус, працуе яшчэ менш, а ўсе людзі павінны працаваць! «Потым, калі ён дайшоў да моста Палацкага, бачыць: стаяць там два здаравякі і выстаўляюць рукі, просяць. Ён пачаў іх угаварваць: «Як вам ня сорам? Двое здаровых дзядзіноў, а жабрачаць. Працаваць трэба, каб палепшыўся народны добрабыт». Ну, яны палезьлі да яго з кулакамі і крычаць, каб ён змоўк, бо інакш яны паклічуць паліцыянта. А з другога боку ў іхную гутарку ўвайшлі нейкія акцызныя чыноўнікі, наш Франц Пэх і на іх раззлаваўся. «Лепш,—кажа ён,— вам было-б кінуць службу і працаваць. Бо трэба прадугледзіць усе вынікі!» Тады паклікалі паліцыянта, а ён і яму кажа: «Ну, пакажы, што ты сёньня зрабіў? Што ты сёньня зрабіў, каб зьберагчы народнае багацьце?»—«Пакуль што нічога,—адказаў паліцыянт,—але імем закону я вас арыштую». Павялі яго ў паліцэйскую ўправу, а там Пэх пачаў сьцьвярджаць, што ён толькі стараўся вярнуць усіх гэтых людзей на праўдзівы шлях і што няўжо нельга і гэтага зрабіць ў Аўстрыі. Нарэшце, яго цягалі-цягалі па судах і прысудзілі да трох тыднёвага зьняволеньня за абразу службовай асобы. Таму што ўсе вялікія справы пачынаюцца з дробязі, і нас таксама ня было-б тут, каб эўропэйскія дзяржавы не памяняліся нотамі. Якаянебудзь не захацела прыняць такую ноту ад другой, а мы вось за гэта цяпер і пакутуем.

Нарэшце растоўская паліцыя праз два тыдні выявіла, што ўся гэта гісторыя ёсьць непаразуменьне і што «дакумант» сапраўды звычайная карта страў. Тады паліцыя з адпаведным рапартам запытала вайсковую комэндатуру, якія вынікі даў допыт трох палонных, якія перададзены пад яе загад у сувязі з гэтай справай. Дзякуючы гэтаму генэрал успомніў пра трох арыштаваных, якіх ён яшчэ ня бачыў, і ён загадаў зараз-жа прывесьці іх да яго.

— Арыштаваныя тут, ваша правасхадзіцельства,—неўзабаве пасьля гэтага сказаў ад'ютант.

— Давай іх сюды!—загадаў генэрал.

— Ніяк нельга, ваша правасхадзіцельства,—сказаў ад'ютант.—Бруд, вошы... Яны тут ўсё запэцкаюць.

— Дармо,—махнуў рукой генэрал.

І крыкнуў сам у адчыненыя дзьверы:

— Вядзі іх сюды!

І вось злачынцы апынуліся разам са сваімі канвойнымі казакамі, якія стаялі за імі з голымі шашкамі, твар у твар са сваім судзьдзёй. Ад'ютант ня схлусіў. Два тыдні нямытыя, няголеныя, яны выглядалі страшна. Рыжая барада завівалася на барадзе ў Гаршыны, у Швэйка шчэць на шчоках тапырылася, як цьвікі, а на твары ў Марэка блішчэлі толькі зубы ды вочы.

Генэрал праглядзеў прынесеную яму з паліцыі паперу і кашлянуў:

— Хто-небудзь з вас гаворыць па-расійску? Ці вам трэба перакладчыка?

— Ні ў якім разе, ваша высокародзьдзе,—адказалі яны, як адзін.

— Правасхадзіцельства,—паправіў іх ад'ютант.

Генэрал павесялеў.

— Вы абвінавачваецеся ў тым, што, з мэтаю шпіянажу, укралі ў тутэйшым чыгуначным буфэце карту страў,—пачаў ён.—Укралі вы яе ці не?

— Ні ў якім разе, ваша правасхадзіцельства,—адказаў Гаршына, падштурхнуўшы локцем Марэка і Швэйка,—мы толькі выпадкова паднялі яе ў калідоры, і нам захацелася даведацца, што ядуць комэнданты ў Расіі, ці ядуць яны гусей, курэй, куранят і ўстрыц, як у нас.

— А ў Аўстрыю вы яе не хацелі паслаць? Ну, як-жа ў вас комэнданты добра ядуць?—працягваў свой допыт генэрал.

— Так, так,—пасьпяшыў адказаць Швэйк,—у нас комэнданты добра ядуць.

— А віно ў вас зараз ёсьць? І коньяк? І лікёры,—зацікавіўся судзьдзя.

Гаршына назваў шмат вінаў, лікёраў і каньякоў. Генэрал цмокнуў.

— Значыцца ўсё, як у нас? Як і да вайны?

— Так, як да вайны—адказаў Марэк, адчуўшы, што генэрал чакае адказу і ад яго.

А генэрал зрабіўся такі сумны, скрывіўся і жаласна праказаў:

— А ў нас усё гэта забаронена! Віно можна здабыць толькі сакрэтна і то за вялікія грошы. Так, вайна—дрэнная рэч, на вайне ўсім цяжка!

І, абярнуўшыся да ад'ютанта, ён загадаў:

— Гэта—прыстойныя людзі, якія ні ў чым не вінаваты. Яны зацікавіліся толькі, што ядуць комэнданты. Пашлеце іх у лазьню. А потым няхай завядуць у гарадзкую ўправу! Працу яны сабе знойдуць, бо яны—інтэлігентныя людзі і здолеюць у нас пакарміцца! Ну, ідзеце, хлопцы! Дык выпраўце іх абавязкова спачатку ў лазьню!

Палонным зьвярнулі адабраныя ў іх рэчы, і казак звадзіў іх у лазьню. Там яны памыліся, іх абстрыглі, пагалілі, далі ім чыстую бялізну, і Швэйк, які атрымаў ад сястры міласэрднай новую кашулю, ня мінуў выпадку закідаць яе комплімэнтамі:

— Ах, сястрыца! Якая вы прыгожая... Вы дужа падобны да аднае мае знаёмае, Марылі Новотні, якая гуляла з нашым капралам.

У бюро па адшуканьні працы казак здаў палонных старому недабачліваму пісару, якому нават двох пар акуляр не хапала, каб як сьлед бачыць. Калі казак штурхнуў іх у дзьверы і перадаў гэтаму чалавеку на подпіс квітанцыю, у якой той мусіў засьведчыць прыймо здадзеных яму трох палонных, ён пачаў бурчэць:

— Зноў мне прысылаюць нейкіх валацуг! Згарыце вы, з гэтай бандай! Адно і ведаюць, што прыводзяць да мяне нейкіх гіцляў!

— Мы не валацугі,—рэзка зазначыў Гаршына,—а палонныя аўстрыйцы. Мы самі славяне, чэхі і таму няма чаго нас зьневажаць! Мы самохаць перайшлі ў Расію.

Пісар пляснуў рукамі.

— Дайце вас абняць, галубочкі вы мае! І шмат вас такіх у вашай Аўстрыі? Брацці вы мае родныя! «Віце божи мир»!

— Ён кажа, што ўсюды ўжо божы мір,—штурхануў Швэйк Марэка пад бок.—Значыцца, нам няма чаго больш з ім размаўляць. Я еду дамоў!

І, не чакаючы нічые згоды, ён кінуўся да дзьвярэй.

— Куды, куды?—падскочыў да яго казак, хапаючы яго за мяшок.

— У Аўстрыю, да свае сям'і,—сказаў Швэйк,—хіба ты не чуеш, што ўжо замірэньне?

— Слухай ты, Швэйк,—засьмяяўся Гаршына.—Божы мір было сказана па-расійску і азначае «белы сьвет» а не «замірэньне», як па-чэску.

— Ну, добра,—пакорліва згадзіўся Швэйк.— У такім разе я застануся тут. Тут здарылася такое самае непаразуменьне, як і тады, як я быў яшчэ на вайне і ў нас у палку быў падпаручнік Шульц і вольнапісаны Пячонка. Падпаручнік дрэнна разумеў па-чэску, а вольнапісаны—па-нямецку. І вось аднойчы, калі падпаручнік...

Але Швэйку не давялося расказаць, што здарылася з падпаручнікам і вольнапісаным Пячонкам, бо пісар якраз скончыў выпісваць квітанцыю і хлопнуў пячаткай, і казак пайшоў назад. Пісар яшчэ раз прачытаў прысланую паперу і раптам схапіўся за галаву.

— Ды тут-жа не напісана, што з вамі рабіць! І не напісана, што вы вызвалены ад допыту і суду! Што-ж, вы хочаце атрымаць працу тут, у горадзе?

— Так точна, ваша высокародзьдзе,—адказаў за ўсіх Гаршына.

Пісар на хвіліну задумаўся.

— Добра! Ідзеце назад у комэндатуру і хай вам там выпішуць дакумат, каб я мог пасласць вас на працу.

У комэндатуры іх спаткаў ад'ютант, які вадзіў іх да генэрала. Пачуўшы, якое патрабаваньне паставіла гарадзкое бюро па падшуканьні працы, ён злосна закрычаў:

— Ды што яны там звар'яцелі? Хай вам там выпішуць пасьведчаньне, што для вас ёсьць праца, і я тады зараз-жа вас вызвалю ад вайсковае комэндатуры.

Праз дзесяць хвілін Гаршына перадаў гэты адказ старому Андрэяву ў бюро. Той ажно плюнуў.

— Цьфу, якія ідыёты! Як я магу даваць вам працу, калі вы вайсковыя чыны? Варочайцеся хутчэй туды назад, каб вам выдалі пасьведчаньні аб звальненьні.

Праз чвэртку гадзіны пісар вайсковае комэндатуры злосна стукаў кулаком па сталу і крычаў на палонных:

— Сказана вам па-расійску,... вашу маць, каб ён, стары дурань,... яго маць, выдаў вам дакумант! Скажэце вы яму, абармоту шэраму, што не дазваляецца, каб палонныя...

Яны пабеглі ў бюро, каб перадаць гэтыя словы пісару Андрэяву. Той пачаў пахмуры хадзіць па канцылярыі, гаворачы:

— Ну добра-ж, чакай! Назваў мяне шэрым абармотам, а сам хамуйла, законаў ня ведае і не разумее! Схадзеце яшчэ раз да яго і скажэце яму, каб ён пана-бога не спакушаў і старога царскага слугу ня крыўдзіў! А я, далібог, на яго скардзіцца генэралу буду! Ну, галубкі, ляцеце да тэтага сукінага сына! І каб ён зараз-жа выдаў вам дакумант.

Так яны адзінаццаць разоў «лёталі» ўзад і ўперад, а калі ўзыніміліся ў дванаццаты раз у канцылярыю вайсковае комэндатуры, Швэйк сказаў:

— Вось каб, што-дня па тузіну!

Пісар убачыўшы іх, ускочыў, як шалёны, са свайго месца; потым ён зваліўся ў крэсла і прахрыпеў:

— Сссьцерва!

Было відаць, што ён гатоў быў самлець. Але раптам ён яшчэ раз ускочыў; на вуснах у яго зьявілася пена, а ў руках апынуўся бізун, які ён неўзаметку выцягнуў з-за халявы. Палонныя кумільгам скаціліся па сходках, так заўзята ён на іх насядаў, і Швэйк пакрыўджана ўздыхнуў:

— Ну, канец забаве! Нават да тузіна не дацягнулі!

— Пойдзем, хлопцы, спаць на вакзал!—сказаў Гаршына.

Раніцою яны пазнаёміліся там з адным памочнікам капітана, які шукаў качагараў і грузчыкаў на сваё судно. Яны пайшлі разам з ім у гавань, тым часам, як стары Андрэяў пісаў рапарт, што тры палонныя аўстрыйцы, якія былі прысланы ўчора няма ведама чаму ў гарадзкое бюро для падшуканьня працы, за нач зьбеглі, пра што даводзіцца да ведама вайсковага комэнданта гораду з адначасовым паведамленьнем паліцэйскае ўправы для адшуканьня і затрыманьня арыштаваных. І падпісваючы свой рапарт, стары Андрэяў па-шчырасьці плюнуў:

— Цьфу! І ўся гэта цеганіна з-за нейкага ідыёта—пісара!

На параходзе «Дзьмітры», на які нанялася наша тройца, грузілі партыю кавуноў і мукі. Паводле згоды з капітанам, Марэк і Гаршына павінны былі выконваць абавязкі матросаў, а Швэйк працаваць за качагара, за што капітан абавязаўся плаціць ім у месяц па дванаццаць рублёў на ўсім гатовым і выдаць ім пэнсію за першы месяц наперад, каб яны маглі купіць сабе боты.

Так яны зноў накіраваліся ў горад, прычым кожны цісную у руцэ па дванаццаць рублёвак.

Толькі як сьцямнела, вярнуліся яны на судно, абутыя ў новыя боты. Гавань была поўна салдатаў і агентаў паліцыі, якія павінны былі папярэджваць усякія эксцэсы новабранцаў, якія дасягалі часам грандыёзных памераў.

Капітан ужо чакаў іх. Ён паказаў ім месца, дзе спаць, а са Швэйкам сышоў у качагарку, каб пазнаёміць яго з двума іншымі качагарамі, кіргізамі, якія не разумелі амаль ніводнага слова па-расійску.

Кіргізы сядзелі на падлозе ў маленькай каюце, поруч з качагаркай; паміж іх стаяла міска з варанай канінай і рысам. Капітан сказаў ім нешта, чаго Швэйк не зразумеў, а яны. не шманаючы, усё даставалі з міскі страву бруднымі, можа ніколі ня мытымі запэцканымі вугалём і машынным маслам рукамі. Нарэшце, яны зірнулі на свайго новага памочніка, і Швэйк, стараючыся быць далікатным, кінуў ім:

— Добрага здароўя, каравыя!

— Салям,—махнуў яму адзін з іх, вітаючыся, рукой.

— Ах, ты хочаш салямі? Чаму-ж не! У мяне ёсьць якраз добры кавалачак кракаўскае кілбасы, на бутэрброд,—адказаў ім па-чэску Швэйк, ня ведаючы, што «салям» азначае па-кіргіску «Здароў».

Ён выцягнуў з кішэні зашмальцаваны скрутак.

— Вось, глядзеце, хлопцы! Хоць гэта ня зусім салям ці чайная кілбаса, а кракаўская, але хай будзе за чайную!

Швэйк узяў нож, адрэзаў кавалачак, аблупіў і пачаў есьці. Кіргізы зірнулі на яго і адсунуліся са сваёй міскай далей ад яго.

— Ды вы мне не замінаеце,—ветліва сказаў ім Швэйк.— Месца ўсім хопіць. Хочаце пакаштаваць, таварышы? Яна нядрэнная, і перцу ў ёй хапае.

Ён выставіў руку з кілбасой і падаў ім знак рукой, каб яны адрэзалі сабе па кавалку. Але ад гэтага гэсту абудвы кіргізы адсунуліся да самай сьцяны.

Швэйк, думаючы, што яны не зразумелі яго запрашэньня, пайшоў за імі і пхнуў кілбасу аднаму кіргізу пад нос. Той злосна адштурхнуў яго са словамі:

— Не, сьвіньня, нячысты, чорны!

— Можа яно і так, што сьвіньня была чорная і брудная,— засьмяяўся Швэйк,—але кілбаса добрая, і ты можаш яе сьмела есьці. Іншыя людзі, важнейшыя за цябе, ядуць кілбасы нават з асьляціны; дык чаму-ж табе ня зьесьці сьвіньнінкі? Ды, апрача таго, адкуль ты ведаеш, што сьвіньня была канечна чорная?

І ён зноў выставіў руку з кілбасой да кіргізаў. Тыя ўскочылі, крыкнулі ў адзін голас:—Шайтан!—і выскачылі на палубу, адкуль зараз-жа пачуліся іхныя ўзрушаныя крыкі і голас капітана, які іх супакойваў.

— Чорт іх ведае, што ім ад мяне трэба,—сказаў сам сабе Швэйк, калі шум наверсе ўсё яшчэ ня суніма́ўся.—Я-ж іх частую, а яны на мяне, як сабакі!

Думка, што кіргізы не ядуць сьвінога мяса, ня прыходзіла яму ў галаву.

Праз нейкі час абудвы качагары вярнуліся і зноў пачалі калупаць бруднымі рукамі ў місцы з ежай. Швэйк управіўся ўжо лавячэраць і захацеў выкінуць кілбасную шалупу ў люк.

Ён адчыніў яго і кінуў скуркі, але ветрам іх аднесла назад, і частка трапіла кіргізам проста ў ежу.

— Шайтан!—Шайтан!—закрычалі яны, паказваючы пальцамі на міску, а Швэйк, думаючы, што яны абвінавачваюць яго, што ён зрабіў гэта знарок, пачаў іх супакойваць:

— Чаго вы па-праўдзе ўзьнімаеце гармідар за нейкую паскудную шалупінку? Няўжо вы такія грэблівыя, калі самі брудныя, як сьвіньні? Ну, добра, добра, ня крычы, я табе ўжо яе выцягну, калі ня хочаш так жэрці!

Ён устаў на калені перад міскай і, ловячы нажам шалупінкі з рысу, гаварыў далей:

— Вось, бачыш, я нават ня лезу ў тваю ежу сваімі лапамі. Я, брат, ведаю, як і што, і кожнага паважаю. Ды ты ня штурхайся,—сказаў ён аднаму качагару, калі той з жахам і злосьцю ў вачох, тузануў яго,—а то, дальбог, ня буду выцягваць!

Тады і другі качагар тузануў яго з другога боку. Швэйк ускочыў на ногі.

— Ах, ты біцца, татарская морда!

І ён штурхануў кіргіза ў грудзі. Той адказаў яму паўхалём, а другі кіргіз ударыў яго цяжкім кажухом па галаве. Гэта кропля перапоўніла чару швэйкавай цярплівасьці.

— Вось як вы ставіцеся да мяне, татарва. Цяпер я вам пакажу, як у нас у Празе працуюць!

Ён вырваў у кіргіза кажух і пачаў ім абараняцца. Цяпер у яго была досыць цяжкая зброя, і калі ён тузануў аднаго кіргіза ім па галаве, той захістаўся і ледзь ня страціў прытомнасьць, ажно другому прышлося падтрымаць яго. Швэйк заўважыў, што ён перамагае, і пусьціў кліч перамогі:

— Выходзь на аднаго! З усімі спраўлюся! Наша бярэ!

А кіргізы, нібы раптам зразумелі па-чэску, выскачылі на палубу. За імі сьледам бег Шэйк. Іншыя кіргізы, якія служылі тут-жа, сьпяшаліся на дапамогу сваім землякам, што выклікала рэакцыю з боку Марэка і Гаршыны. На палубе разьвінулася вялікая бойка. Яе спыніла паліцыя, якая прыбегла на тлум і крык. Па гэтых крыках яна даведалася, што ў бойцы бяруць удзел аўстрыйцы, затрымала іх і павяла з сабой, не зважаючы на капітанавы просьбы, каб палонныя аддалі яму боты, якія яны яму вінны. Капітан пабег за імі ў паліцыю і пачаў упрашаць прыстава, каб той загадаў палонным разуцца і аддаць яму боты. Але як выявілася, што затрымалі тых-самых аўстрыйцаў, пра якіх атрымалі ўвечары паведамленьне з вайсковае комэндатуры, у паліцыі была такая радасьць, што прыстаў, тарабанячы пальцам па стале, сказаў капітану:

— Ніяк нельга, бацюхна! Іх трэба завесьці да вайсковага комэнданта, а на вуліцы холадна і басанож ім ісьці не выпадае. Дый што-б падумала пра мяне яго правасхадзіцельства!!

А калі капітан і тут ня спыніў сваіх просьбаў, прыстаў сваімі ўласнымі рукамі выштурхаў яго за дзьверы.

Раніцой, калі ад'ютант сказаў генэралу Папову, што паліцыя затрымала і прывяла ўцекачоў-палонных, ён зусім засмуціўся.

— Што з імі рабіць? Яны ўсё будуць уцякаць, паліцыя будзе за імі бегаць, а я буду іх неяк караць! Навошта? Ах, якая дурная рэч—жыцьцё!

Неўзабаве яны зьявіліся перад ім. Генэрал падыйшоў да іх і соладка запытаў:

— Ну, як, галубкі? Ці добра вас спаткалі ў паліцыі?

— Ой, добра!—сарвалося з апухлых, разьбітых вуснаў Гаршыны.

— Так, у вас адменныя сінякі,—ласкава сказаў генэрал, пазіраючы на твар Марэка. Швэйк, не чакаючы запытаньня, коратка сказаў:

— У мяне ўся сьпіна пабіта, зад спелендраваны і ўсюдых гузы.

— Што-ж, у нас б'юць здарава!—самазадаволена зазначыў генэрал.—Ну, што-ж мне цяпер з вамі рабіць, хлопцы? Вось што: пашлю я вас у Сібір, у лягер. Сёньня-ж падрыхтаваць ім дакуманты,—сказаў ён ад'ютанту.

Праз пяць дзён наша тройца вылезла ў Пэнзе з кляснага вагону; за ёй ішлі два казакі, якія завялі палонных у канцылярыю. Дарога ішла паўз раскіданыя там і тут баракі, шыльды якіх Швэйк чытаў ужо колькі тыдняў назад. У канцылярыі канвойныя з імі разьвіталіся, а фэльдфэбель, які іх прымаў, даў палонным такую параду:

— На вакзале стаяць цягнікі з палоннымі, залязайце ў які хочаце—яны ўсе завязуць вас у Сібір.

А калі яны ўтрох ішлі адны на вакзал, Швэйк знайшоў знаёмую шыльду і, зірнуўшы навокал, радасна крыкнуў:

— Гэтая Расія зусім не такая ўжо і вялікая, як расказваюць, калі ў ёй можна двойчы на год вярнуцца на тое-самае месца. Пачакайце, хлопцы, мы яшчэ будзем тут адчуваць сябе, як дома!

10

У СІБІРСКІМ ЛЯГЕРЫ

Лягер для палонных у Сібіры быў падобны на сьметнікавуюскрыню для людзей—для салдат, якія ў сусьветнай бойні былі здадзены ў архіў, бо яны былі і для таго, хто іх узяў у палон, непатрэбныя, лішнія і малакаштоўныя. Салдат мае пэўную каштоўнасьць у кашарах, на фронце, у тыле; аб ім клапаціліся і ў шпіталях, каб зрабіць з яго прадзіраўленага цела як мага хутчэй новы бояздольны чалавечы матэрыял. Але, трапіўшы ў палон, ён выключаўся з машыны гісторыі, дзе кожнае колца чаплялася зубчыкамі за другое, і надоўга адводзіўся ў бок, як пастаўлены на запасную пуць да тупіку вагон са зламаным тормазам ці трэснутым бандажом.

Праўда, існавалі розныя «Чырвоныя крыжы»—арганізацыі, на абавязку якіх было клапаціцца, каб палонныя жылі хоць крыху ў людзкіх умовах. Але гэтыя арганізацыі абмяжоўваліся ў сваёй дзейнасьці адной папяровай вытворчасьці і тым, што рассылалі фотаздымкі.

У расійскіх лягерах для вайсковапалонных палонныя любаваліся на здымкі будынкаў, якіх яны ніколі і ня сьнілі, а пад гэтымі фантастычнымі будынкамі красавалася: «Інтэрнат для вайсковапалонных у Омску (ці Томску)». У лягерах атрымоўвалі здымкі вялікіх, прыгожых кухняў з вялізнымі казанамі, з мяснымі тушамі і з кухарамі ў белых хвартуках ды каптурох, зьнятыя ў нямаведама якіх санаторыях ці багатых готэлях, а пад імі было напісана: «Кухня ў лягеры вайсковапалонных».

Тым часам палонныя капалі сабе «зямлянкі»—пабудова, якая ўдавала з сябе нешта сярэдняе паміж склепам і халупай, дзе людзі ляжалі ў тры ярусы на голых дошках і танулі па калена ў

гразі, бо атмосфэра, у якой на чалавека прыходзілася менш за палавіну кубічнага мэтра паветра, была насычана выпарэньнямі, якія ападалі на падлогу і разьмякчалі яе.

Барак быў разьмеркаваны на пяцьсот чалавек. У ім стаяла шэсьць цагляных печак, але пры сарака градусах марозаў на ўсе печы давалася толькі пяць саўкоў вугалю. На ніжніх лавах людзі замярзалі, на верхніх—душыліся ад смуроду. Нязьлічоныя натоўпы ўсякіх гатункаў казюлек, ад тараканоў да шчыкавак, стала заселі ў драні, якой былі абабіты драўляныя сьцены. І было дзіўна, як гэта клапы, што абляпалі на паліцах хлеб, вытрымлівалі, ня губляючы прытомнасьці, аміячны пах, які набываў праз паўгадзіны хлеб, што прыносілі замарожаным.

Ніхто ніколі дакладна ня ведаў, колькі чалавек зьмяшчалася ў тым ці іншым бараку; расійцы ніколі не турбаваліся падлічыць, колькі ў іх у лягеры людзей. І, можа дзякуючы гэтаму, было выратавана жыцьцё шмат каму, хто-б інакш памер з голаду; бо калі ў бараку было трыста чалавек, а продуктаў давалі на пяцьсот, дык, калі нават палавіну распрадавала вартавая каманда, усё-ж дзьвесьце пяцьдзесят чалавек атрымлівалі поўны паёк, які, апрача хлеба, быў усё-ж немалы.

Палонныя з цягам часу навучыліся выкарыстоўваць усе слабыя бакі сваіх нагледачоў. Вайна ўдарыла па ўсіх іх і прыціснула іх, як цяжкі камень былінку, ня пускаючы да яе паветра і сонечную цяплыню. І вось, глядзіш, праз якіх два тыдні аўстрыец вылязаў праз няпрыкметную шчыліну на сьвет, а на яго галаве тырчала, нібы кветка, пакомчаная шапка з мядзяным вэнзэлем «Ф. І. І.».

*

Пастанавілі, што эшалён палонных, у які трапіў Швэйк са сваімі таварышамі, будзе накіраваны ў Омск. У ім было мала палонных проста з фронту; большасьць працавала ўжо ў сялян ці капала акопы ў расійскім тыле, і вось цяпер яны ехалі абшарпаныя, голыя, прастуджаныя і хворыя ў Сібір ці адпачыць і адужаць, ці памерці.

Уся лапікавая монархія мела сваіх прадстаўнікоў у аднэй цяплушцы. Людзі розных нацыянальнасьцяй, якія паўгода назад не зразумелі-б адзін аднаго, гутарылі цяпер паміж сабой нейкай

дзіўнай гаворкай, складзенай з усіх слоў, значэньне якіх запомнілася ў якой-небудзь мове.

Але больш за ўсё чулася лаянка. У цяплушцы густа павісла ў паветры заўзятая лаянка—па-чэску, па-сэрбску, па-мадзьярску, па-нямецку, па-італійску, па-польску. Кожны адпачываў душою, «закручваючы» «выразы» адзін мацней за аднаго, лаяў Расію і яе парадкі, і ў гэтым пытаньні панавала сярод усіх надзвычайнае адзінадушша і салідарнасьць, чаго ў Аўстрыі ніколі ня было.

Цягнік імчаўся па рэйках, як Ноеў каўчэг у часе патопу па вірох вады. І тым, якія сядзелі ў гэтым каўчэзе, заўсёды здавалася ,што вады меней і зноў набліжаюцца шчасьлівыя дні; бо на кожнай станцыі замест голуба з зялёнай галінкай ім насустрач ляцелі кабеты з кошыкамі вараных яек, са сьвінінай, са смажанымі курамі, качкамі, гусямі і зайцамі, і каштавала ўсё гэта, чым далей на поўнач, тым усё таней.

Таму, калі яны, выехаўшы з Пэнзы, ужо шостыя суткі былі ў дарозе і пераваліілі праз Урал, Швэйк на адной станцыі вярнуўся ў сваю цяплушку з сваім чайнікам увесь сьветлы і, ускінуўшы свае блакітныя вочы на поўнач, радасна сказаў:

— Калі мы праедзем яшчэ адзін месяц, нам будуць плаціць, каб мы толькі елі. Вось, зірніце, што я купіў на пятнаццаць капеек!

І ён паказаў двох вялікіх смажаных зайцоў, загорнутых у газэту.

— Калі мы прыедзем на месца, Марэк, дык ты мне скажы,— зьвярнуўся ён да таварыша.—Я напішу Балуну, каб ён перасяліўся сюды. Тут ён можа амаль дарма жэрці.

Мароз стаяў траскучы. На ўсіх станцыях палонныя кралі ўвугаль і дровы, і жалезная печ, якая стаяла сярод цяплушкі, заўсёды палілася. Людзі на верхніх лавах ляжалі голыя, а зьнізу крычалі:—Падкінь яшчэ, мы мерзьнем!—А калі хто-небудзь «са столі» спрабаваў протэставаць, што ў цяплушцы душыцца ад гарачыні, голас зьнізу заўсёды адказваў:

— Ну, дык зьлезь уніз, дурань, а мяне пусьці на сваё месца! Тады паслухаем, што ты скажаш.

Была зроблена сэнсацыйная вынаходка, што вошы, калі патрымаць кашулю над распаленай печкай, самі, без староньняе дапамогі, выпаўзалі з рубцоў і кідаліся ў агонь. З таго часу печ

зрабілася і ўдзень і ўначы крэматорыям для гэтых няшчасных многагногіх ахвяр чалавечае чульлівасьці.

У Кургане палонным далі тройчы крупнік з лапшы, прыгатаваны для нейкага вайсковага эшэлёну, які паслалі ў іншым кірунку. Дзьве порцыі палонныя здужалі, а на трэцюю не хапіла пораху. З другога боку шкода было адмаўляцца. Але перш чым было што-небудзь вырашана, крупнік абярнуўся ў лёд. Гэтым была вырашана проблема. Мерзлыя порцыі былі выкінуты з казанкоў, і старанныя ногі пабеглі па другія. Як толькі яны застывалі, іх таксама вымалі, і зноў ужо хто-небудзь бег на кухню здабываць яшчэ і яшчэ.

Праз гадзіну перад цяплушкай вырас цэлы шэраг такіх мерзлых перапечак, і на запытаньне, навошта гэта, Швэйк паважна тлумачыў:

— Мы зьбіраемся ў экспэдыцыю на Паўночны полюс, і таму робім сякія-такія запасы. Перш за ўсё—крупнік з лапшы ў кубіках. Дзе ўжо фірме «Маггі» з яе бульёнамі ісьці супроць нас!

Калі да цягніка падалі паравоз, лядні былі ўжо складзены ў груд у самым нізе пад лавамі, і кожны, хто хацеў зьесьці мясного крупніку з лапшы, адбіваў кавалак лёду і растапліваў яго ў казанку над печкай, адганяючы тазарышоў, якія займаліся выпальваньнем вошай, каб гэта ня трапіла ў крупнік, і ён ня выйшаў занадта густы...

У Омску палонных чакала спатканьне, якое шмат чаго абяцала. Ноччу іхны цягнік быў пераведзены на запасную пуць; раніцой, а шостай гадзіне, канвой вытурыў іх з цяплыні на траскучы мароз, а дзевятай гадзіне ім дазволілі зноў вярнуцца ў цяплушкі, бо афіцэр, які мусіў іх прыняць, так і не зьявіўся. Толькі пад абед пад'ехалі санкі, з якіх выйшаў захутаны ў цяжкую хутру тоўсты афіцэр з чырвоным тварам і, паказваючы на сялян, якія ехалі на санках са станцыі, загадаў:

— Затрымаць іх! Прыгнаць сюды!

Ён паставіў палонных па чатыры ў рад, пералічыў іх і, ня спускаючы вачэй з іхных ног, абверчаных анучамі ці ў ботах без падноскаў, паказаў рукой на санкі:

— Сядай, хлопцы! Да лягеру далёка—больш чым тры вярсты! Пеша вам не дайсьці!

Палонныя зашыліся ў салому; афіцэр, убачыўшы што ўсе месцы заняты, паслаў салдат, каб прывесьці яшчэ сялян і нагружаў далей іхныя пустыя сані жывым зьмесьцівам цяплушак.

Пад канец канвойныя палезьлі ў цяплушкі і вынесьлі адтуль нейкія дзіўныя скруткі ў шэрых лахманох—жывыя тулавы бяз ног, бяз рук, людзей з выпаленымі вачыма, з расьсечанымі тварамі, з пакрыўленымі, скручанымі сьпінамі. Іх склалі, нібы дровы, на санкі, і афіцэр, які з жахам глядзеў на гэтыя рэшткі людзей, узьняў руку і крыкнуў:

— Божа! Што нарабіла вайна! Але, дармо, хлопцы, хутка будзе замірэньне, і тады вы паедзеце дамоў, да жонкі, да дзяцей!

І ён не зразумеў, чаму абрубкі на санях раптам узьняліся, зноў адкінуліся назад, уздрыгнулі і не пераставалі дрыжэць, калі санкі пераехалі ўжо праз рэйкі і сяляне хрысьціліся ад страху.

Потым ён сеў у свае санкі, выехаў наперад і скамандваў:

— Рухай! Мы едзем у лягер, хлопцы; там вам будзе добра!

Хутка яны прыехалі да шырознага абгароджанага месца, сярод якога стаяў вялікі барак. За ім была відаць чарада хатак з маленькімі, бруднымі вокнамі.

Салдаты склалі скалечаных проста на сьнег, а здаровых павялі ў канцылярыю, дзе іх перапісалі. Да скалечаных-жа падыйшлі коні, зусім зашаранелыя і ўкрытыя лядняймі, якія зьвінелі пры кожным русе. Яны абнюхалі іх, спыніліся і нібы пачалі грэць іх сваім дыхам.

Убачыўшы гэта, Швэйк зазначыў:

— Ну, што-ж, гэта жывёла, якая ніколі не зразумее перавагі чалавека. Яна ня ведае, што гэта—эўропэйская культура і цывілізацыя!

Перапісаных людзей паразводзілі па бараках, і расійскі унтэр-афіцэр, які праводзіў іх, паказаў ім на прыбітыя да кожнага барака дошкі.

— Вось, хлопцы, кожны ў сваю групу!

Па гэтых дошках было відаць, што тут сабралася ўся аўстрыйская армія. Гэты факт лякомічна сьцьвярджаўся надпісамі: «Чэхі», «Немцы», «Сэрбы» і г. д.

Гаршына першы ўвайшоў у барак і крыкнуў у цемру:

— Гэй, хлопцы, хопіць у вас месца на трох?

— Ды хоць на трыццаць,—адказала сотня галасоў.—Адкуль вас чорт прынёс? З фронту? Ці скора замірэньне?

— Скора! У той-самы дзень, як яго падпішуць,—сур'ёзна адказаў Гаршына.

— Ня чмуры, брыда!—зноў грымнула з цемры.

— Тут пахне аптэкай,—зазначыў Швэйк, узьлязаючы сьледам за Гаршынам на лаву, тым часам, як цяжкое паветра прымусіла Марэка закашляць, а поруч з ім нехта злосна буркнуў:

— А ты-б здагадаўся захапіць з фронту супроцьгазавую маску. Ці ты можа, думаеш, што цябе тут будуць абпырскваць одэколёнам ці духамі?

— Гэта было-б нядрэнна,—адгукнуўся Швэйк.

— Дык табе, дурню, трэба было быць за генэрала ці, прынамсі, палкоўніка,—адказаў нечы голас.—Тым жывецца лепш. Кусманэк [1]), напрыклад, у Петраградзе, і павінен выпіваць у дзень па пяць літраў сьпірытусу, каб лепш захавацца. Так, так, з афіцэрамі тут зісум інакшая справа!

Гэта прамова кончылася глыбокім уздыхам. З боку пачуўся піскьявы голас:

— Было-б досыць, каб ты быў нават за падпаручніка. Калі мы стаялі ў Пікушыне, там стаяла пяць нашых малодшых афіцэраў. Жылі яны хто ў папа, хто ў акушоркі, хто дзе, і расійская казна выадвала ім па пяцьдзесят рублёў у месяц, дык у іх толькі і было на думцы, што выпіўка ды жанчыны. Пападзьдзя, фэльчарыха, настаўніца, усе, ад каго ня пахла гноем, прыходзілі да іх у госьці і банкеталі да раніцы. Напіваліся ўшчэнт, а адзін, калі мы з тэй вёскі выходзілі, застрэліўся.

— А як яго хавалі: з музыкай?—заклапочана запытаў Швэйк, а піскьявы голас абурана адказаў:

— Езус-Марыя, што ты за ідыёт! Я-ж кажу, што ён застрэліўся п'яны!

— Відаць, ён дужа разнэрваваўся,—азваўся Швэйк, паўзучы ў цемры на голас.—З ім здарылася тое-самае што з профэсарам матэматыкі, які жыў на Ячменнай вуліцы ў новым доме, дзе капітальныя сьцены таўшчынёй у адну цагліну. Побач з ім жыў адзін чыноўнік, які пусьціў да сябе кватарантку, консэрваторку, якая цэлы дзень грала на раялі. Дык наш профэсар праз два тыдні пайшоў, купіў сабе браўнінг і...

---

[1]) Генэрал, комэндант Перамышлю, які здаў цытадэль расійцам.

Швэйку не давялося доўга гаварыць. Нехта крыкнуў: «Давайце сьпяваць!»—даў «ля», і ўвесь барак здрыгануўся ад хору моцных рэзкіх галасоў, ажно лавы трэсьліся і шклянкі дрыжэлі:

Маці сьлёзы не давалі
Слова праказаць...
Гвдавала, а цяпер вось
Гоняць ваяваць!

„Не забудзь мяне і бацькі.
Едзь у добры час!
Будзем мы чакаць, калі ты
Вернешся да нас!“

І на ворага пашлі мы
Жорсткаю вайной,
За каханую радзіму
Сталі мы сьцяной.

Людзі гінулі, другія
Йшлі ім наўздагон.
Нас аднойчы выпадкова
Узялі ў палон.

Потым нас усіх пагналі
У Сібір якраз.
Казакі і сьнег навокал...
Хто тут знойдзе нас?

Край і маці ўжо ня бачыў,
Здэцца, шмат гадоў...
Ах, калі, калі-ж мы зможам
Рушыцца дамоў?

Хор дасьпяваў да канца. Швэйк захапленна пляскаў у ладкі, а чалавек з піскьлявым голасам абвёў усе ложкі пагардлівым зіркам і сказаў:

— Гэта ўсё хлопцы з Моравіі. Недарма кажа іхная народная песьня: «Якіх коняй нараджае твая зямля».

— Гэй ты там, не задавайся, анархіст,—крыкнуў нехта зьнізу.—Глядзі, каб мы табе не паказалі, дзе ракі зімуюць. Вы-ж, чэхі, у байцы нікуды ня варты.

— А вось я ведаў аднаго чэха,—сказаў Швэйк, схіліўшыся з лавы,—дык у яго быў аптовы гандаль паперай, а адзін моравец быў у яго за парабка.

— Хочаш дастаць па мордзе, сьвіньня паросная?—зараз-жа прагучэла рэпліка зьнізу.—Ды вы-ж, вядома, усе дзяржаўныя здраднікі! Дайце-тку яго сюды, я з яго катлету зраблю!

— Таварышы,—пачаў упрашаць Швэйка чалавек з пісклявым голасам,—лезь ты, калі ласка, на сваё месца. А так вы яшчэ ўчэпіцеся адзін у аднаго, і тады арханголы вас абудвых адлупцуюць бізунамі.

І ён паказаў рукою ў кут, куды падала сьвятло ад лямпы ў вартавым памяшканьні. Рыпнулі дзьверы; у калідор, хістаючыся, выйшаў дзяжурны і сказаў:

— На пагулянку станавіся! Наперад! Арш!

Ён адшпіліў шырокі, тоўсты скураны пояс і пачаў зганяць ім палонных з лаў за дзьверы. Чалавек з піскдявым голасам нахіліўся да Швэйка і, лічучы сябе за ягонага інфарматара, растлумачыў яму:

— Ён п'яны. Яны цэлы дзень п'юць політуру і дэнатур. Яны нас абкрадаюць. Зараз нас будуць лічыць, колькі пайкоў хлеба нам атрымаць.

— Гэй, капралы, пастаўце сваіх людзей!—скамандваў дзяжурны, і «дзясяцкія» паставілі перад ім сваіх падначаленых, дакладаючы:

— Два ў наяўнасьці, трое бяз ботаў, адзін без парток, адзін бяз шынэлі і адзін на працы. Усяго дзесяць чалавек.

Дзяжурны з задаволеным тварам паставіў рысачку ў сваёй тоўстай запісной кніжцы і перашоў да наступнай групы. Там дзесяцкі таксама пералічыў сваіх таварышоў, і, нарэшце, дзьве сотні палонных вырасьлі паводле гэтай аўстра-расійскай бухгальтэрыі ў пяцьдзесят два дзесяткі.

Дзяжурны падлічыў рысачкі ў сваёй кніжцы і пачаў правяраць лік наяўных груп. Але ці таму, што на дваццацёх з нечым ён зблытаўся, ці таму, што ў яго язык заплятаўся, ці таму, што ў гэтым змроку ў яго лічбы расплываліся ў кніжцы,—ён лічыць так і ня кончыў, а пагардліва кінуў:

— М-мм, на месца! Лажыся, хлопцы!

На самай сярэдзіне барака чадзела маленькая вісучая лямпа, пад якой прымасьціліся гульцы ў карты і разьбяры алюміневых пярсьцёнкаў. Гульцы спрачаліся, алюміні рыпеў пад напілкам, і Гаршына сказаў:

— Братцы-таварышы, няўжо-ж мы ляжам спаць, не вячэраўшы? Дайце мне хоць некалькі капеек, я зараз зьбегаю ў краму!

— Ня думай, што табе прыдзецца спаць,—зьвярнуўся да яго сусед, вытрасаючы ў калідоры свае порткі.—Блохі табе ўсё-роўна заснуць не дадуць, пакуль ты да іх ня прывыкнеш. А клапоў на табе няма? Калі няма, дык ты, браце, шчасьлівы чалавек! У мяне ўсё цела, як у агні. Нібы я ляжу на крапіве.

— А скалечаныя ўсё яшчэ на двары,—паведаміў Гаршына, калі вярнуўся, ляскаючы зубамі ад холаду.—І да гэтага мароз, як на Паўночным канцавосьсі.

— Значыцца, уначы месяц будзе ў выглядзе крыжа, раз так холадна,—загаварыў сусед з правага боку, сьцелячы на лаве куртку.—Так, няма чаго казаць, добрая тут мясьціна.

— Ён выняў увесь хлеб са свайго хлебнага мяшка і паклаў яго на паліцу, а мяшок паслаў вышэй за куртку, каб не ляжаць галавой проста на дошках. Лёгшы, ён уздыхнуў і жаласна заскігаліў:

— Таварышы, ці дасьцё веры вы мне, калі бачыце мяне ў такім становішчы, што ў мяне на радзіме вялікі хутар у семнаццаць гэктараў зямлі? Ці дасьцё веры, што ў мяне жонка грае на роялі, што ў нас тры пакоі і два нікэляваных ложкі адзін ля аднаго? Ці дасьцё веры, што ў нас падушкі—да самай столі? Ці скажаце вы, што я толькі ў чэрвені жаніўся, а ў жніўні быў ужо ў Расіі? Я сваёй жонкай наогул яшчэ не пакарыстаўся, а што гэта за жанчына, я да вясельля ня ведаў.

— Дрэнная твая справа, браток,—спагадліва сказаў Швэйк. Цяпер табе ўжо мала чым прыдзецца пакарыстацца на белым сьвеце. Вось у цягніку расказвалі, што абвешчана такая пастанова, каб палонных не абменьваць. Мы, значыцца, застаемся тут, а расійцы—у нас. Дык выходзіць, што тут і там прыдзецца адно памяняцца на жонак!

— Ня можа гэтага быць!—спалохаўся сусед.—У мяне-ж удварэ электрычная малатарня.

Ён задумаўся і ў сумненьні паківаў галавой. Потым сеў на лаве і ўрачыста абвясьціў:

— Я Карэл Худэчак з Ніжне-Льхоты. І я сваё яшчэ вазьму. Калі прыду дамоў, дык вазьму жонку да сябе ў ложак, закідаю вокны гноем, замкну вароты і дзьверы і два тыдні нікога ня буду да сябе пускаць.

І ў яго вільготных ад сьлёз вачох загарэўся маланкай дзікі шал.

— А я,—пачуўся пісклявы голас,—адразу, як прыду дамоў, пастаўлю на пліту казан вады, і вымыюся ў карыце. Нічым я так ня радуюся пасьля сканчэньня вайны, брацды вы мае, як чыстай, добра выгладжанай бялізнай. Яна так дзівосна пахне!

— Я лічу, што так вось да вясны ўсё будзе скончана,—сказаў нехта з групы ценяў, якія скакалі па сьцяне,—і што, калі пасьпеюць вішні, мы будзем ужо ўдварэ. Я папрашу зрабіць мне цэлую міску варэньнікаў з чорных вішняў, якіх у мяне так многа ў садзе, і каб масла пусьцілі як найбольш. Жонка мая служыла за кухарку ў свае радні, у папа; дык яна, я вам скажу, так гатуе, што вы і ня бачылі такога.

Піскдявы пачаў ззаду за імі прыладжвацца да сну; шчоткай, у якой амаль уся вывалілася шчэць, ён вычысьціў пад сабой лаву, і расклаў на ёй усю сваю вопратку, лаючы Аўстрыю, Расію і ўвесь сьвет. Потым ён асьцярожна лёг, але амаль зараз-жа ўскочыў.

— Езус-Марыя! Гэта-ж немагчыма! Не пасьпеў я легчы, як гэтыя падлюгі, блохі, скачуць па мне і кусаюцца, нібы ўсяго мяне колюць голкамі! Ой, брацды! Гэта-ж горш, чым калі-б чалавеку пусьціць у цела электрычны ток!

Ён пачаў чысьціць шчыліны паміж дошак трэсачкай і выкалупаў адтуль крыху гразі, якая раптам аджывілася і з якой ва ўсе бакі паскакалі блохі. Тады ён, апусьціўшыся на калены, ў маленьні склаў рукі і сказаў:

— Гэта нясьцерпна! Дзіўна, як гэта яны мне яшчэ вачэй ня выелі!—і, блукаючы поглядам па кроквах страхі, з рыданьнем у голасе дадаў:—Не, я гэтага ня вытрываю, я задаўлюся, каб іх, падлюг, пяруп папабіў!

Ён зьняў з сябе порткі і кашулю, вытрас адно і другое, не зважаючы на протэсты жыхароў ніжэйшых паверхаў, якія крычалі яму, каб ён пакіуў свае скарбы сабе, бо ўнізе гэтага дабра досыць, і палез голы, як быў, на лаву паміж Швэйкам і Марэкам, цягнучы за сабой свой хлебны мяшок.

— Таварышы,—сказаў ён, крыху ўзвысіўшы свой голас і ўрачыста выцягваючы з мяшка некалькі бутэлечак і шклянак,— вось зірнеце, я разводжу чужаедаў на навуковых асновах. Я, кажаў той, займаюся сельскагаспадарчым разьвядзеньнем дробнае жывёлы. Тут у мяне,—ён узьняў угару бутэлечку з цёмнага шкла,—клапы, злоўленыя ў Чыце; яны сядзяць тут у мяне ўжо

адзінаццаць месяцаў і ўсё яшчэ поўзаюць, хаця пассыхаліся ў нейкую луску. Вось, калі ласка, зірнеце!

Ён страсянуў бутэлечку і патрымаў яе супроць лямпы. Сухая луска зашасьцела ў бутэлечцы, і гаспадар іхны, сьмяючыся сказаў:

— Галодныя яны—жах! Дваццаць год жыцьця я-б аддаў, каб мог зьвязаць Вільгэльма і насыпаць іх яму ў ложак.

— Ну, нашым старым яны таксама не пагрэбвалі-б,—адгукнуўся Худэчак,—хоць яму больш спадабалася-б у ложку якая-небудзь артыстачка. Вось ужо трэба праўду сказаць: ён сабе глытае такія смачныя кавалачкі, а мы, салдаты, тут у Сібіры толькі аблізвайся. Разумееце, я мала болей як месяц быў жанаты, як уся гэта брыдота пачалася. Эх, як-бы мы з жонкай цалаваліся!..

Ён склаў губы сардэчкам і пачаў так цмокаць, што Швэйк яго спыніў:

— Досыць, хопіць расцмокаўся, як парася.

— А вось тут, сябры мае,—казаў далей пісклявы,—у мяне вошы. Я іх набраў у цягніку, і тут ёсьць розныя. Зьбіраць іх дапамагаў мне Фэрда Кохаут, і ў мяне іх роўна дзьвесьці грам. Ім тры месяцы ад роду і я кармлю іх хлебам. Гэтым самым адкідаецца пашыраная думка, што нібы вош—мясажэрная жывёла, драпежнік. Яна—толькі чужаед, які харчуецца, як і буржуазія, чужымі сокамі.

Ён узьняў бутэлечку да самых Швэйкавых вачэй і зьвярнуў яго ўвагу на багацьцё свае колекцыі.

— Усё гэта—адборныя экзэмпляры. Кожны з іх—з агрэст увелькі. У тыя часы іх было шмат; вось гэту партыю мы ўдвох сабралі за паўгадзіны. Фэрда Кохаут нават напісаў мне аб гэтым на ўспамін вершы ў альбом.

Ён зноў палез у мяшок, выцягнуў адтуль падраны, зашмальцаваны блёкнот, папоркаўся ў ім і даў яго, разгарнуўшы Марэку:

— Вось прачытай голасна, яны ня дрэнныя. У хлопца быў талент! Ён застаўся ў вёсцы з салдаткай...

Успамінай пра мяне, мой таварыш каханы,
Як ішло ў нас з блыхамі і вошшу змаганьне.
Павытрэсвалі шмат іх той ночкай бяссоннай,
А найлепшыя ўсё-жткі былі ў кальсонах...
Расіянкі былі і прусачкі былі там,
І турэцкія нават з вясёлым іх спрытам,—

прачытаў Марэк, трымаючы блёкнот ля агню. «На ўспамін аб Фэрдынандзе Кохауце, узводным 56-га пяхотнага палку з Седлеца пад Гарой Кутнай».

— У мяне ёсьць вершы і ад іншых таварышоў,—пахваліўся Пісклявы.—Вось, напрыклад, вершы, дзе падпісана: «На добры ўспамін ад твайго адданага сябра Язэпа Поспішыля, абаронца Перамышля і краўца ў Рэбовідзе пад Колінам». Адным словам, можна-б было наладзіць цэлы літаратурны вечар.

— Што-ж, такія добрыя вершы ня кожны напіша,—сказаў Швэйк, аддаючы блёкнот назад гаспадару.

Пісклявы з новай бутэлечкай у руцэ, пагардліва плюнуў.

— Яшчэ як! Добрыя рэчы робяцца толькі з голаду! А тыя поэты, якія пішуць пра прыгожых паненак, пра месяц, бэз, які цьвіце на Лаўрэнавай гары, усё—глупства!

Агаласіўшы такі строгі прыгавор над поэзіяй і лірыкай, ён зноў страсянуў сваю бутэлечку.

— Вось тут, шаноўная публіка, у мяне ёсьць вошы, над якімі я рабіў якія-колечы досьледы. Так, напрыклад, я іх на працягу паўгадзіны варыў, але гэта іхнаму здароўю не пашкодзіла. Клоп, наадварот, гатаваньня ня вытрымлівае. Таму і ашпарваюць ложкі варам. За тое ўшчуваю клапоў холадам. Пры дваццацёх градусах яны бегаюць, каб сагрэцца, пры трыццацёх яны зьбіваюцца ў гурт і лезуць адзін на аднаго; а калі я выставіў іх на цэлую ноч пры саракаградусным марозе, дык ад іх толькі порах застаўся. Як кажуць: «От праха взят и во прах обратишся!»—прадэклямаваў ён; убачыўшы-ж, што нехта пад ім уэьдзеў на басаногі пантоплі і накінуў на плечы шынэль, каб зьбегаць у прыбіральню, ён аддаў яму сваю бутэлечку і папрасіў:—Будзь ласкаў, пастаў яе на прыгалку, каб паглядзець, што будзе з імі заўтра!

Потым ён апрануў порткі, зашпіліў кашулю і сказаў:

— Нельга іначай, таварышы. Вось я тут дурэю, але з большай ахвотай я-б завыў воўкам...

— Сьмейцеся, сьмейцеся, сябры мае,—уздыхнуў Худэчак, гледзячы на Гаршыну, які нешта лавіў у сябе на нагах,—але я не павінен успамінаць пра дом. Нікэляваны ложак, белыя пухавікі, і жонка там адна-аднэй... А я тут сярод вас на голых дошках...

І Худэчак гучна пацягнуў носам паветра.

— Гэта мяккія дошкі,—паспрабаваў супакоіць яго Швэйк,— і голыя яны былі заўсёды. На дошках валасы не растуць.

— Але яны мяне цiснуць!—пiснуў чужаедавод.—Вось зiрнеце, што ў мяне зрабiлася ад гэтых праклятых дошак.

Ён зноў спусьцiў порткi, паказаў свае сьцёгны i павярнуўся на бок. Потым схапiў руку Гаршыны i паклаў яе на iх.

— Што, добрыя мазалi? Га? Каб было вiдней, дык убачылi-б, што яны пералiваюцца ўсiмi колерамi вясёлкi. Ведаеце што? Калi правiльная тэорыя Дарвiна, дык нашы дзецi народзяцца простымi як лiнейка, каб iх нiчога ня цiснула, калi яны будуць спаць на голых дошках.

Ён пакалупаў пазногцем мазалi i самазадаволена заўважыў:

— Ды яны ў мяне цяпер такiя, як гарбы ў вярблюда.

У барак увайшоў адзiн з вартавых i крыкнуў:

— Дзевятая гадзiна! Ляжаць цiха! Гасi сьвятло!

Нехта пагасiў лямпу, i лавы патанулi ў непрагляднай цемры. Пiсьмявы ў адказ на салдатавы словы паслаў яму наўздагон лаянку i палез праз галовы сонных, на сваё месца. Але хутка зноў пачуўся яго голас:

— Таварышы, раскажэце што-небудзь са свайго жыцьця. Ты там, навiчок, якi з Прагi, пачынай. Як цябе завуць?

— Швэйк Язэп,—адгукнуўся той.—Я тут з Марэкам з 91-га палку. Быў на фроньце. Дык вось, брацы, было гэта ў часе манэўраў, калi...

I словы, якiя доўга стрымлiвалiся дагэтуль, пацяклi з Швэйка, як вада з ставу, калi адчынiш застаўкi. Усе вакол сьцiхлi, ляглi на жывот, абаперлiся лакцямi ў дошкi i абхапiлi галовы рукамi. Апавяданьнi Швэйкавы перапынялiся толькi паасобнымi сказамi накшталт: «Так, у бацькi было тры сыны,»—«... ёй было год трыццаць, i яна ўсю ноч пратрымала мяне ля сябе»—«...вось прынцып i кажа: «Прынцэса Залатыя кудры, падаруй мне свой чаравiк,»—«... я яму кажу: «Ты хочаш быць чэхам, а робiш такую брыду» i раз яго па мордзе!» —«... дык гэта-ж зразумела, гэта змаганьне мiжнароднага капiталу,»—«... што-ж, паступiм у iхнюю армiю, а яны будуць ваяваць да таго часу, пакуль нас усiх не паб'юць,»—«... а ты ня чухайся, бо iнакш яны табе ўядуцца пад скуру»,—«...калiб я зрабiў яе цяжарнай, яе-б аддалi за мяне, i мне-б ня трэба было цяпер клапацiцца аб ёй».

У вакно сьвяціў месяц. Неба было цёмнасіняе, паветра—такое чыстае і халоднае, што бліскала месячнае сьвятло, якое пераламлялася ў ім у выглядзе крыжу. А ў бараку, сярод двухсот пяцьдзесяцёх чалавек, якіх зьвяла разам вайна і сьляпы выпадак, ішлі палітычныя спрэчкі, расказваліся анэкдоты, перадаваліся любоўныя прыгоды, і людзі, ня бачучы адзін аднаго, узаемна прызнаваліся ўва ўсім, што было ў іх па судох, з крэдыторамі, з начальствам, з жанчынамі...

І гэта была такая ідылія і так поэтычна, нібы сцэна з якога прачулага фільму «з жыцьця нашых шэрых герояў».

*

За вайсковага комэнданта Омску, пад ведамам якога знаходзіўся і лягер палонных, быў палкоўнік Клягэн, з бальтыцкіх немцаў. Гэта быў паджылы чалавек, сумленны служака і наскрозь салдат. Тая акалічнасьць, што ён сам быў немец, не засталася, пэўна, бяз уплыву на яго адносіны да палонных. І ня ён, а паводзіны саміх палонных спрычыніліся таму, што яго сымпатыі да іх раптам астылі. Дадзеная палонным свабода руху і магчымасьць што-кольвечы зарабіць, зрабілася ў адных свабодай жабрачыць, а ў іншых, якія мелі магчымасьць зарабляць грошы ці прымаць іх ад шалапутных жанчын, абярнулася ў нахабнасьць і провокацыйныя адносіны да ўсяго расійскага, якім яны з свайго заходня-эўропэйскага погляду страшэнна пагарджалі.

Да комэнданта пачалі прыходзіць скаргі, што палонныя займалі ў тэатрах самыя дарагія месцы, зьяўляючыся туды з непрыстойнымі жанчынамі, чым абураліся расійскія матроны, якія хацелі агарадзіць сваіх дачок ад такой грамады. Расійскія афіцэры скардзіліся, што палонныя пераплочвалі рамізьнікам, каб перабіць іх у афіцэраў, ня гледзячы на тое, што тыя іх нанялі раней. Праз паліцыю прыходзілі скаргі ад гандляроў, што палонныя цягнуць з рынку ўсё, што дрэнна ляжыць...

Такім чынам палкоўнік быў прымушаны раз-по-раз падцінаць крыльлі палонным, якія занадта ўжо вырасьлі, нават у параўнаньні з агульнавядомым расійскім дабрадушшам і гасьцiннасьцю, і, нарэшце, зрабіць тое, што даўно ўжо было зроблена па ўсёй Расіі і Сібіры: замкнуць палонных ў іхным лягеры.

Аднак ён і надалей застаўся прыхільны да іх, і яго клопаты

аб іх былі дужа сумленнымі. Ніводзін афіцэр, ніводзін фэльдфэбель ніколі ня быў упэўненым, што перад ім ня зьявіцца раптам, як з-пад зямлі, палкоўнік Клягэн, які абавязкова загадае весьці яго да палонных і запытае іх, ці атрымалі яны мыла і бялізну, якую ён загадаў ім выдаць, уласнымі рукамі зважыць хлебныя пайкі, а на кухні праверыць колькасьць пакладзенага ў страву мяса і прыправы і пакаштуе страву. І за кожны выяўлены крадзеж у яго была адна кара: адсылка на фронт!

— Калі ты умееш абкрадаць палонных, галубок,—казаў ён, кпліва пасьмейваючыся,—дык ідзі і паваюй з імі і на фроньце!

На няшчасьце для палонных ён зваліўся з каня і нешта дужа пашкодзіў сабе; дактары ня выпускалі яго з хаты, дазваляючы яму толькі рэдка калі, дый то на кароценькі час, бываць у канцылярыі. Уся зграя чыноўнікаў хутка зразумела, што цяпер і на іхнай вуліцы кірмаш, і комэндатура ў Омску за адзін тыдзень зрабілася такая-самая, як усюдых у Расіі. Пачалася новая эра,—эра пад лёзунгам: «Рабуй і ня бойся!» Палонных абкрадалі на бялізьне, абутку і вопратцы, на муцэ, крупах, мясе і мыле; самавольна павялічвалі цэны ў крамах, якія дастаўлялі палонным усё неабходнае; у палонных на кожным кроку што-небудзь адбіралі, і баракі зрабіліся разбойніцкімі гнёздамі.

У той дзень, як Швэйк трапіў пад загад палкоўніка Клягэна, таму сказалі, што прышло паўтары тысячы палонных аўстрыйцаў. Той зірнуў у падрыхтаваную на заўтра ведамасьць і загадаў:

— Выдаць кожнаму палоннаму па кавалку мыла за сьнежань...

— Прабачайце, ваша правасхадзіцельства, за студзень,—зазначыў ад'ютант, перагортваючы каляндар.

— Не, за сьнежань,—рэзка падкрэсьліў палкоўнік.—Загадайце, каб лазьня была падрыхтавана з раніцы. З гарнізону мыцца будзе толькі батальён, які ідзе на фронт. З сёмай гадзіны пускаць у лазьню толькі палонных. Колькі трэба ім выдаць бялізны? У нас бялізны хопіць?

— Так точна, ваша правасхадзіцельства!—ляснуў шпорамі ад'ютант.

Каб не спазьніцца ў лазьню, палонных пабудзілі а палове пятай і выгурылі іх на двор. Да шостай яны хадзілі на трaскучым марозе па дворы і пераступалі з нагі на нагу перад замкнутай канцылярыяй; потым зьявіўся фэльдфэбель і выдаў ім па

кавалачку мыла, пасьля чаго вартавыя павялі палонных, кожны барак паасобку, за дзьве вярсты ад гораду ў лазьні. Па дарозе іх дагнаў ордынарац палкоўніка, які перадаў дадатковы загад— даць палонным магчымасьць вымыць сабе бялізну, покуль іхную вопратку будуць дэзынфэктаваць.

Але ў лазьнях былі яшчэ расійскія салдаты, і палонным зноў не заставалася нічога іншага, як скакаць з нагі на нагу і махаць рукамі, каб ня зьмерзнуць. Нарэшце, праз дзьве гадзіны, усім скалелых людзей пусьцілі, і ўнтэр-афіцэр, які загадваў лазьнямі, падаў каманду:

— Ну, хутка распранайся! Вады засталося мала!

Падганяючы палонных паясом па мяккіх частках, ён загадаў вынесьці ўсю вопратку ў калідор і пусьціў іх у памяшканьне, з якога валіла пара. Палонныя ледзь узяліся за ражкі, як ужо за імі апынуўся другі расійскі ўнтэр-афіцэр і таксама пагнаў іх пасам у другія дзьверы, так што яны нават не пасьпелі хоць раз абліцца вадой.

Такім чынам атрымалася магчымасьць сказаць па тэлефону палкоўніку, які якраз абедаў, што ўвесь лягер палонных пабыў у лазьні. Палкоўнік зараз-жа вярнуўся да свае жонкі, маладой, прыгожай блёндынкі, са словамі:

— Любая, калі табе так патрэбны кравец, дык выберы сабе такога мастака сёньня-ж у лягеры. Гаўрыла Міхайлавіч цябе правядзе. Людзі сёньня пабылі ў лазьні, чыстыя, і таму можна не баяцца мець з імі справу.

Але жонка яго скрывілася і адказала:

— Як вы далікатны! Мэрсі, мой друг! Але кравец ня так ужо мне патрэбны. Я пачакаю, пакуль вы здолееце пайсьці са мною. Вы-ж пойдзеце ў лягер з дэлегацыяй Чырвонага Крыжу? Добра было-б, каб у ёй быў хто-небудзь з маіх знаёмых, напрыклад, мая сяброўка Лялечка.

Успамін пра гэту сяброўку, з якой яна ў інстытуце была ўпэўнена, што ніводзін юнкер ці корнэт ня ўмеў цалавацца так, як іхны духоўнік, паважны інстытуцкі бацюшка,—расчуліў маладую жанчыну да таго, што яна кінулася цалаваць свайго старога, шчыра шкадуючы, што ён ня мае здольнасьці таго бацюшкі...

Тым часам у лягер прышла новая партыя палонных. Каля барака стаяла група расійскіх салдат; доктар і афіцэры ўвайшлі ў барак.

З вечара калекі былі перанесены ў пусты барак, і сьляпыя, бязногія і бязрукія кінуты бяз догляду, бяз дапамогі, бяз стравы на ніжніх лавах. Яны змовіліся паміж сабой і ўласнымі сіламі перабраліся на верхнія. І вось адтуль салдат бяз рук і бяз ног зваліўся ўніз, тварам у гразь, і задушыўся.

Марэк і Швэйк прасунуліся разам з іншымі ў гэты барак. Рукі і твары скалечаных былі чорныя ад процьмы галодных блох, якія абляпілі іх, сабраўшыся на банкет з усяго барака. Над нябожчыкам схіліўся расійскі вайсковы лекар, торкаючы яму на невашта градусьнік у пусты рукаў і лаючыся, што градусьнік дрэнна паказвае. Потым лекар зьдзеў шапку, выцер лоб і пахмура сказаў:

— Ён, здаецца, яшчэ ня зусім памёр. Яго магло-б выратаваць штучнае дыханьне. Але як гэта зрабіць, калі ў яго няма рук?

*

Швэйк зірнуў на лекара і на нябожчыка і пачаў папракаць нябожчыка:

— Вось бачыш, што выйшла з таго, што ты дазволіў на фронце адбіць сабе абедзьве лапы. Вось і памірай цяпер бяз лекарскае дапамогі і штучнага дыханьня! Хіба цябе, дурня, у школе ня ўчылі, што кожная рэч можа на што-небудзь іншым разам прыдзецца і што таму яе трэба берагчы?

— Маўчаць!—крыкнуў лекар, і салдат пачаў выпіхаць Швэйка і Марэка з барака. Лекар застаўся яшчэ на хвіліну пры нябожчыку і, зірнуўшы на афіцэраў, заклапочана сказаў:

— На бліжэйшай мірнай конфэрэнцыі трэба будзе падаць прапанову ўдасканаліць гранаты такім чынам, каб яны адрывалі рукі не далей локцю. Як гэта магло здарыцца, каб навука, як вось у гэтым выпадку, была бясьсільная і людзі паміралі?

У другім бараку пісклявы запэўняў, што іхны таварыш знарок скончыў самагубствам, а гэта, уласна гаворачы, лепшае, што можна зрабіць у гэтай праклятай вайне...

*

У бараку дні ішлі за днямі, аднастайна шэрыя, як брудныя каралі на матузку. Людзі амаль ня былі знаёмыя адзін з адным, бо па-за «дзясяткай» ня мелі ні з кім зносін. Дзень праходзіў

у паляваньні за чужаедамі, у апавяданьні пра падзеі на фронце і ў абмяркоўваньні вайсковага становішча паводле афіцыйных паведамленьняў, з якімі штодзенна зьяўляўся ў лягер хлопчык-газэтчык.

Толькі добрыя апавяданьні ці наогул цікавыя людзі карысталіся некаторай вядомасьцю. Вакол іх зьбіраліся, калі пачынала цямнець, і такім чынам у бараку ўтварыліся групы з рознымі інтарэсамі і палітычнымі поглядамі. Адны зьбіраліся толькі там, дзе расказвалі анэкдоты, іншыя групаваліся вакол пісклявага, які быў падобны на гарачую бомбу, якая во-во выбухне ад нецярплівасьці.

Швэйк таксама набыў вядомасьць сваімі прыказкамі і раптам пачаў адчуваць сябе як дома. Гаршына бегаў у краму, апрануў цывільную вопратку, каб чараваць расійскіх калег у рэсторанах сваім спрытам і вяртаўся адтуль нагружаны булкамі, кілбасамі, чаем і тытунём, зьберагаючы такім чынам грошы, якія так і сыпаліся пры недахопе гарачай стравы.

А Марэк прыцісьнуты аднастайнасьцю і гразьзю, моўчкі мардаваўся і шмат думаў. Ён быў здольны цэлыя дні марнаваць з пісклявым, які так і не сказаў, як яго завуць і адкуль ён, але быў начытаны і бывалы чалавек. Ён умеў гутарыць і сур'ёзна, і ня было сумненьня, што яго сьмех быў гумар шыбельніка.

Разам з тым Марэка дужа мучыў раматус. Ногі ў яго балелі, у руках нясьцерпна калола, а калі ён неяк паскардзіўся на сваю хваробу пісклі̇ваму, той сказаў:

— У мяне таксама ўсюдых коле. Заўтра мы пойдзем на прыём да лекара.

Іх агледзелі тры лекары,—адзін расіец і два аўстрыйцы, кончыкамі пальцаў асьцярожна дакранаючыся да брудных, апухлых кален і сьцёгнаў. Потым яны загадалі:

— Ідзеце туды! Фэльчар вас натрэ мазьзю, і ўвесь боль мінецца!

На зэдліку сядзеў фэльчар, які выконваў загады лекароў. У адной руцэ ён трымаў бутэлечку гліцарыны, а ў другой—брудны камяк ваты, якой ён націраў усё што трапіцца пад руку.

Калі хто-небудзь адмарожваў ногі, ён іх націраў. Хто прыходзіў за лекамі ад галаўнога болю, той ішоў з валасамі, па якіх гліцарына цякла за каўнер. Калі балелі зубы, ён мазаў ватай па твары, пры катары страўніка змазваў пуп, пры запаленьні сярэд-

няга вуха, націраў вушы, а ў сыфілістычныя язвы на вуснах, уціраў гліцарыну, як поп, які робіць саборваньне. Увогуле, рабіў усё, што мог!.. Перад ім станавілася чарада пацыентаў, якіх накіроўвалі да яго лекары, а пісар, абліваючыся потам, пытаўся:

— У якім годзе радзіўся? Халасты ці жанаты? З чаго памерлі бацькі? Ня ведаеш? Колькі братоў і сёстраў памерла і з чаго? За жыцьцё нічым не хварэлі?

Сабраўшыя ўсе такія каштоўныя для статыстыкі веды, якія лекары падавалі ў Чырвоны Крыж, каб мець уяўленьне, як часта ў салдата, у якога трыццаць год назад памерла ад дыфтэрыі двохгадовая сястра, бываюць прыступы раматусу ці ў якой сувязі знаходзіцца гэта зьява з якой-небудзь яшчэ даўнейшай прычынай,—пісар перадаваў іх людзям навукі; а гэтыя, на падставе іх канстатавалі, што ў ніжэйшага чына, які паказаў ім свае брудныя ногі ці зьедзены вошамі і абсыпаны чырвонымі пухіркамі жывот, сапраўды нешта нядобра і накіроўвалі яго да фэльчара Паньцялея Цімахвеевіча, каб ён нацёр іх сваімі унівэрсальнымі лекамі з чароўнае бутэлечкі.

Такое міжнароднае супрацоўніцтва лекараў давала шмат чаго навуцы, бо дзякуючы яму можна было пазнаёміцца з рознымі сыстэмамі тэрапіі. Вайсковыя лекары ў Аўстрыі лячылі ўсё нутранымі сродкамі, тым часам, як іхныя расійскія колегі трымаліся пераважна надворных сродкаў, накшталт націраньня гліцэрынам.

Калі абудвы аўстрыйцы вярнуліся ў барак і піскклявы пачаў крычаць, што чым больш чалавек вучыўся, тым большая ён скаціна, а Марэк агледзіўся, што ў яго гліцарына пацякла з парток у боты, да іх падыйшоў Швэйк і, вымазаўшы сабе рэшткамі гліцарыны рукі, упэўнена сказаў:

— Справа ў тым, што ў дэлегацыі, якая зьбіраецца нас наведаць, ёсьць адна вельмі важная жанчына, і таму пажадана, каб у нас быў чысты і прыемны колер твару. Гэта жанчына нічога не разумее ў раматусе, але яна зьверне ўвагу на тое, ці добра мы кормімся, і вось увесь сэнс у добрым уражаньні, якое пакіне чысты выгляд.

І, патануўшы ў ружовых пэрспэктывах, палонныя пачалі чакаць таго нябёснага анёла, якога пасылала ім у спацяшэньне д а р а г а я бацькаўшчына.

ЗЬМЕСТ

Стар.

1. Швэйк вучыцца расійскай мове 5
2. Царністы шлях 23
3. У Кіеве 47
4. У Дарніцы 64
5. Экспэдыцыя ў глыбіню Расіі 82
6. На працу 99
7. Народная мэдыцына 126
8. Сугляды і вясельле 136
9. Швэйкаў анабазіс 157
10. У сібірскім лягеры 185
